Зьмітрок Бядуля

ЯЗЭП КРУШЫНСКІ

РОМАН

БЕЛАРУСКАЕ ДЗЯРЖАЎНАЕ ВЫДАВЕЦТВА
МЕНСК — 1929

ЗЬМІТРОК БЯДУЛЯ

ЯЗЭП КРУШЫНСКІ

РОМАН

КНІГА ПЕРШАЯ

БЕЛАРУСКАЕ ДЗЯРЖАЎНАЕ ВЫДАВЕЦТВА
МЕНСК — 1929

Надрукавана ў друкарні
Беларускага
Дзяржаўнага
Выдавецтва

Заказ № 220. 3.000 экз. Галоўлітбел № 1185.

I

Злажы пальцы ў кружок, настаў перад вокам, як шкелка з акуляр, і зірні.

Усё вакол нібы намалявана.

Лес, стромкі, густы, застыглай грамадою кучаравіцца на краі мутнаватай бляхі неба.

Водаль шырачэзнай посьцілкай расплылося жаўтаватае жытняе поле. Сьвежай зелянівою, нібы густая мяккая шэрсьць, разгарнуліся вузкія палоскі аўса. Бліжэй да вёскі на шараватых агародах раскінуўся нэндзны бульбоўнік, які, здаецца, толькі нядаўна, пасьля дажджу, выскачыў з глебы.

Хаткі невялічкай вёскі абтрушаны зьверху бруднаватай саломай. Над імі кружацца вераб'і, крычаць на розныя галасы і часта апускаюцца на зямлю шукаць спажывы.

На дарозе стаіць селянін.

Такога часам можна бачыць на малюнках. Вочы—вузенькія, загостраныя, бліскучыя ільдзінкі. Барада—прыклеены жмуток пакульля. Чупрына—насунуты кавалак аўчыны. Яна брындзьлямі вісіць з-пад старой барашкавай кучмы. Кажуронак—замыцганы, у дзірках рознага выгляду і памеру. З гэтых дзірак вылазяць, як мышы, каўтуны сіваватай шэрсьці.

Старому і ўлетку холадна пасьля вялікага дажджу. Ён дрыжыць і ў кажуху. Часта прыціскае руку да правай шчакі, нібы яму баляць зубы.

Дарога прарэзана каляінамі, патузгана і пакалечана калёсамі, у глыбокіх выбоінах. Яна зьвязвае селяніна, як вяроўкай, з усім сьветам, далёкім ад гэтай глухой мясьціны, нібы казка, нібы няясны сон.

Чаго-чаго ня бачыў тут стары за капу гадоў! Усё-ўсё запісана ў яго памяці, нібы выразана сцызорыкам на гладкай бярэзіне.

Дарога для старога—газэта, кніга, унівэрсытэт, тэатр.

Вельмі часта тут можна бачыць падарожнікаў. Кожны з знаёмых і незнаёмых баіць старому аб усім, што на сьвеце дзеецца. Кожны з іншага рэшата прасейвае сваю гутарку. Стары зьбірае думкі людзкія, як жабрак скарынкі. Ён убірае іх у сябе, нібы сухое поле сьвежы дожджык.

Многа дзесяткаў гадоў ведае селянін гэту дарогу. Тут жыў яго бацька, дзед. Тое, што стары бачыў і чуў тутака да гэтага лета 1924 году, не зьмясьцілася-б у вялікай кнізе.

І цяпер селянін чакае, можа хто праедзе можа хто наведаецца... А то нуда, як моль, заела. Суседзі даўно ўжо надакучылі. У кожным з іх ён бачыць, як у люстэрцы, самога сябе. У іхнай гутарцы чуе ўласны водгаласак.

Стары наставіў вушы, як дзьве трубкі, схіліў галаву ў бок дарожнага бязбрэжжа—і давай прыслухоўвацца з вялікай рупнасьцю да далёкіх гукаў, да ледзь прыкметнага шуму.

Здавалася, што гэта доктар прыслухоўваецца да стукатаў сэрца хворага чалавека.

Селяніна ахапіла вялікая смага—паслухаць рэха ні-то блізкага, ні-то далёкага сьвету...

Ён стаяў, як анямелы. Ня рухаўся з месца.

Прыслухоўваўся.

Нарэшце, нешта ўлавіў...

Няясныя гукі людзкога голасу. Хлюпат конскіх ног па топкай грэблі. Рупатлівае чопканьне па гразі.

Па старым твары, між пісанінай глыбокіх зморшчын, зацьвіла, расплылася ледзь прыкметная ўсьмешка.

Няясныя гукі жывых істот здаваліся яму надзвычайна прыемнай музыкай, нявідочным концэртам з замураваных туманнай вільгацю далячынь.

Нядоўга разважаючы, стары пабрыў туды—на гукі і галасы. Адняў руку ад твару. Забыўся, што зубы ныюць.

Ногі ў прасторных атопках рухаліся лёгка і мерна. Нібы поўным крокам за сахою дыбае араты.

З кожным крокам голас з далячынь рос яму насустрач разам з вільгацю дажджлівага дня.

На выгане біліся два пеўні. Яны ўвайшлі ў такі газарт бітвы, ажна пер'я з іх сыпалася ва ўсе бакі, нібы з парванай падушкі. Разыйдуцца, наскочаць адзін на аднаго, стукнуцца моцнымі дзюбамі і давай скубсьці. У іх адна мэта—павырываць адзін у аднаго пер'е-вопратку, каб голымі гуляць-спацыраваць па нудным выгане.

У іншы раз стары спыніўся-б і доўга сачыў за гэтай пятушынай бітвай з вялікай зацікаўленасьцю, са смакаваньнем, з крытыкай, з падбухторваньнем. Цяпер нават увагі не зьвярнуў на такое дармовае прадстаўленьне: ён бачыў сягоньня гэты бой ужо тры разы.

Ён шыбаў наперад на людзкія галасы на паратунак ад маркоты.

Спачатку пабачыў няясную плямку. Пасьля высоўваўся конь, каламажка, чалавек на высокім сядзеньні ў каламажцы, другі—пры кані.

Стары праццёр вочы, каб пільней углядацца, каб яшчэ здалёку пабачыць, каго сустрэне на сваю пацеху.

Яшчэ ярчэй выступалі перад яго вачыма на гразкай грэблі каламажка і двое людзей.

Часам так ва сьне паўстаюць вобразы—спачатку мутныя, неакрэсьленыя, а пасьля такія жывыя і яркія, што на доўгі час не забываюцца.

Ён падышоў блізка, як гаспадар, як уладар гэтай мясцовасьці.

— Во то-та-ж!

Яму здавалася, што сказаў вельмі ціха, але вышла так гулка, ажна чуваць было на сто крокаў вакол.

Гэтыя словы былі сказаны з такою пэўнасьцю і рашучасьцю, нібы ён вырашыў неразгаданую цікавую загадку.

— Во то-та-ж!—перадразьніў яго фурман, які трымаў каня за аброць, чырвоны здаравяка гадоў пад трыццаць,—чаго крычыш!

— Я ня крычу, а кажу!—апраўдваўся селянін яшчэ галасьней.

— Чаму грэблю ня правіце?

— А я тут адзін рукі пад яе падлажу, ці што?

Конь па бруха ўграз і ня мог выцягнуць каламажкі.

Стары гэтаму ня зьдзівіўся. Застаўся вельмі спакойным. На гэтым месцы ён бачыў такія прыгоды тысячы разоў. Гэта для яго было старым, надакучлівым трафарэтам.

Ва ўсіх тутэйшых коняй ногі і бруха назаўсёды абрасьлі карою гразі, што служыць жывёле як-бы тэрыторыяльнай адзнакай.

Грэбля цёнгля ладзіць такія кпіны і над сваімі, і над падарожнікамі без усялякай розьніцы.

Фурман ляскаў па кані пугаўём, замарыўся, спацеў.

Конь тузгаўся, рваўся, вочы крывёй наліліся. Нарэшце ён прысеў задам у балотнай кашы, нібы кот на падушцы, і ня мог выбрацца з топкага месца.

Конь цяжка соп і азіраўся навакол вільготнымі вачыма, шукаючы паратунку.

Тут стары вышаў з роўнавагі супакойнасьці:

— Гэй, чалавека, ачмурэў, ці што? Навошта жывёліну мардуеш?

— А што?—ажывіўся фурман,—мо' паможаш? Ты вазьмі каня пад аброць, а я па ім—пугай!

— Э-гэ-гэ-гэ-э-э! Вучоных вучыць? Дык ты тут першы раз едзеш, ці што? А калы навошта ляжаць—во! Гэта-ж нашы струмэнты!

Стары паказаў на кучу жэрдак, што ляжалі водаль.

Яны былі таксама, як і тутэйшая жывёла, да паловы ў гразі: спэцыяльна для выцягваньня вазоў з балота.

Селянін з гордай усьмешкай глядзеў на «струмэнты».

Фурман спачатку не разумеў, а пасьля стральнуў сабе заскарузлым пальцам у ня менш заскарузлы лоб.

— Ах ты, чорт! Не дагадаўся!

Стары жыва ўзяўся за камандаваньне—не ўпяршыню:

— Вось трэба папрасіць дзядзьку, каб з воза зьлез, ці што. А то каню цяжка.

«Дзядзька», які ціха сядзеў на возе, заёрзаў на месцы, але нічога не сказаў.

За яго загаварыў фурман:

— Ды яны запэцкаюцца ў гразі.

— Нічагуткі. Можна «іх» вынесьці з гэстай жыжы, ці што.

Стары зарупіўся і з захованай няпрыязьню зірнуў у бок седака.

— Не, не, таварышы, што вы?!—запротэставаў «дзядзька» на возе.

— Так як вы мой пасажыр,—загаварыў фурман да седака,— я вас далжон даставіць сухім.

Пры гэтых словах фурман рашуча падышоў блізка да каламажкі.

«Дзядьзку», відаць, пераканаў просты довад фурмана. Абапёрся рукамі аб сядзеньне і падняўся.

Фурман схапіў яго на рукі і вынес на сухое месца, паставіў асьцярожна, нібы вялізную шкляную бутыль.

«Пасажыр» быў гадоў пад сорак. Круглы твар калераваўся бліскучым сінім дымком у тых мясцох, дзе шмаравалі па ім брытвай. Вызначаліся пульхныя губы. Вочы былі зацягнуты павалокай лянівай рахманасьці. У руце ён трымаў новы портфэль.

Ён стаяў на сухім месцы, як на востраве ў моры. Паглядаў навокал з тупою нудою.

У гэты час селянін і фурман падсунулі калы пад каламажку, прыпаднялі яе і крыкнулі разы два каню:

— Гэй, косю! Но-о! Каб цябе ваўкі! Па-а-дла! Но-о-о!

Конь лёгка выбраўся з гразкага месца.

Слова «пасажыр» глыбока ўрэзалася селяніну ў памяць.

— Значыць, па-са-жыр! А-га-а-а!

У думках стары паўтараў гэтае слова шмат разоў, аж пакуль не дабраўся да яго «праўдзівага» сэнсу:

... Пасе-жыр! Лоўка! Зноў зьявіліся ў нас такога роду людзі, ці што? Няйначай—панок.

Селянін зірнуў на «пасажыра» з асаблівай зацікаўленасьцю, але ўбачыўшы ў яго руцэ портфэль, супакоіўся.

Людзей з портфэлямі ён за апошнія гады наглядзеўся шмат, бо часта хадзіў на сходы ў сельсавет. Гэтыя людзі самыя цікавыя штукі гавораць. Некаторыя з іх сыплюць такімі мудронымі словамі, ажна галава хадыром ходзіць.

Старому заўсёды здавался, што ўвесь спрыт іх гутарак, уся моц іхных дзеяў зьвязана з портфэлямі ў адно, нібы лапці з аборамі.

Наглядзеўся ён іх многа—і людзей і портфэляў: рознага выгляду, гатунку і колеру.

Усе яны (людзі, а не портфэлі) па-рознаму гаварылі.

Усе яны (портфэлі, а ня людзі) былі рознай таўшчыны—і пузатыя, і худыя. Іх выгляд гаварыў аб зьмесьце, аб значнасьці сваіх гаспадароў.

Гаварылі гэтыя людзі аб такім жыцьці, аб якім дзяды толькі ў байках калісьці чулі.

Селянін пачаў лічыць па пальцах:

Уначы будзе сьветла, як удзень—«лектрафіскацыя». Аб такіх жар-птухах, як быў яшчэ малым, ад бабулькі чуў.

Самалёты будуць людзей насіць над воблакамі—ёсьць такі Кашчэй-чараўнік, які ў байцы каршаком лунае над зямлёю.

Нейкія «тарарахтары» будуць поле араць, а селянін толькі паглядай ды пагульвай, ды люльку піпкай. Такія фокусы таксама ў байках дзеюцца. Вось «агромон» прывёз-бы нам такі «тарарахтар»!

Часам чалавек з пяці скур вылязае, як павень змокне, пакуль усё растлумачыць.

Стары ўяўляе сабе—нібы бачыць, як гарадзкі «раратай» скідае з сябе скуру за скурай, гаворачы перад вяскоўцамі надзіва мудроныя штукі.

Калі ён, стары, аднаго разу «раратаю» казаў, што аб гэтым усім у старасьвецкіх байках даўно ўжо гаворыцца, дык той адказаў: «байкі—гэта людзкая хвантазія, а тут рэяльна, матэрыялізма!».

Стары тады ажна спалохаўся гэтых слоў. Яны здаваліся яму назвамі страшных нявідочных зьвяроў.

Аднаго разу такі самы «раратай» прывёз некалькі вазоў добрага насеньня, дык у таго ў портфэлі былі якраз ня мудроныя рэчы, а рукавіцы.

Той гаварыў зусім проста—без «хвантазіі», без «рэяльна» і без «матэрыялізмы».

А другі з гэтых самых, які малодшага сына селяніна ў нейкі рабфак забраў (дай яму, бог, здароўе, бо дзяцюк вучыцца), дык зусім портфэля ня меў.

Думкі аб людзях і портфэлях мільганулі ў галаве селяніна раптоўна—як маланка ў рабінавую ноч. Хутка ён адарваўся ад іх—глядзеў на «пасажыра», з портфэлем, як на сваю новую кнігу, якую будзе сягоньня чытаць. Ён будзе ўдумвацца ў кожнае слова «пасажыра», будзе лавіць гукі голасу, кожны рух рукі,

жмураньне вачэй і ўсе многазначныя мігапісы на твары гарадзкога чалавека.

Аднак, ня гледзячы на такую зацікаўленасьць, стары глядзеў на «пасажыра» з апаскай:

... Гэтаму нельга верыць...

Зноў занылі зубы. Ён крутнуў галавою, адганяючы ад сябе зубны боль, як надакучлівага авадня. Пачаў сваім камэртонам спробваць новы інструмант:

— Пэўна, дзядзька заначуе ў нас?

— Можна!—сказаў «пасажыр» лагодным аксамітным тонам.

Фурманка пад'ехала да «пасажыра». Ён асьцярожна ўлез у каламажку.

Фурман сьцебануў каня.

Сонца вырвалася з-пад ваўняных хмар і накасурылася на ваколіцу загарэлым тварам. Полымя заходу заяскравілася на вяршынах лесу, запаліла салому на хатках і агністымі скурамі невядомых зьвяроў расьцілалася па зямлі. Паветра паружавела, пераліваласа празрыстым вінам. Па гразі ішло з поля невялічкае вясковае стада—таксама ружовае ад заходняга сонца. Усе каровы былі па бруха ў закарэлай гразі.

— Ну й гаспадары!—зьдзівіўся фурман.—У вас асобная парода жывёл. А з гэтай гразі вы, мабыць, спэцыяльны сыр на продаж робіце.

— Ат!—адмахнуўся селянін, як ад кусьлівай мухі.—Досыць жартаваць, ці што?

Золата заходу, бліснуўшы на сьпінах кароў, заіграла на твары і портфэлю «пасажыра» апошнім зьзяньнем.

Надыходзілі змрокі. Яны павольна насоўваліся на ваколіцу, сіняватымі пластамі нагортваліся над лесам. Расьлі цені, выцягваліся ўздоўж па абшарах лугоў і палёў. Паўставала цішыня вечара. Задумёнасьць адзіноты лунала над палямі. Тупат стада і скрыпы каламажкі як-бы зусім не перашкаджалі гэтай цішыні—яшчэ больш вызначалі яе.

Селянін ішоў побач з каламажкай і вёў гутарку пакуль-што толькі з фурманам: скуль і куды едуць.

«Пасажыр» наставіў каўнер і скомкаўся ў новым паліце.

Селянін час-ад-часу касурыўся на профіль «пасажыра».

Цямнела з кожнай хвілінай.

Каля сваёй хаты стары спыніў фурманку і адчыніў скрыпучыя вароты двара.

Фурман пакіраваў у браму.

З хаты на двор выскачыла старая гаспадыня.

— Гэй маці,—заклапаціўся гаспадар,—запалі лучыну, ці што?

З зуседніх двароў высунуліся зацікаўленыя людзі.

— Нехта прыехаў да Цыпрука Ярэмчыка!—перадавалася з вуснаў у вусны.

У гэты час стары Цыпрук ня ведаў, дзе дзецца з сваёй шчырай гасьціннасьцю.

Гасьцей было трое: «пасажыр», фурман і конь.

Першым чынам ён падышоў да каня. Пагладзіў яго, падсунуў руку пад хамут, памацаў, ці не спацеў, памог фурману распрэгчы і бягом кінуўся пад гумно. Прынёс ахапак сьвежага сена.

На людзей Цыпрук зьвярнуў увагу ўжо толькі тады, калі конь стаяў пад паветкай недалёка ад дрывотні і спакойна хрумсьціў пахучае сена.

«Пасажыр» яшчэ сядзеў на каламажцы ў нейкай поўдрымоце.

— Калі ласка, у хату пойдзем, ці што?—зьвярнуўся да яго Цыпрук нясьмелым голасам.—Пане таварыш!

«Пасажыр» штосьці мэкнуў нявыразнае і паволі зьлез з каламажкі.

Фурман схапіў за ім жоўты чамаданчык.

Пашлі ў хату.

— У вас праўдзівая электрыфікацыя,—пажартаваў «пасажыр».

Цыпрукова «электрыфікацыя» чадзіла і дыміла.

На чорных сьценах і на стале мільгалі фантастычныя цені. Малы сьветлагаловы хлопчык, унук Цыпрука, стаяў каля стала і трымаў у руцэ запаленую лучыну.

Звычайнае месца лучыны было над прыпечкам у шчыліне, спэцыяльна выкалупанай для гэтага. Але ў чэсьць гасьцей хлопчык сьвяціў пры стале.

Каля печы дыміла другая лучына. Асьветленае месца выглядала пытаемным падзямельлем. Куты хаты трохі скрадваліся. Іх у ценю ня відаць было. Здавалася, што тут вялікі прастор, што ён разыходзіцца ў нявідочнай далі, а толькі маленькія

часткі яго асьветлены лучынамі, нібы пры вогнішчы на полі ўночы.

Хлопчык, акружаны яркім златаблескам лучыны, выглядаў напружным і ўрачыстым. Вызначаліся яго ільняныя валасы, сінія, спалоханыя вочы з пашыранымі зрэнкамі. Уся ўважлівасьць хлопчыка была скіравана на агонь лучыны. Ён цікаваў за пералівамі аганька, за маленькімі зьмейкамі полымя з такой павагаю, нібы ад гэтага залежаў лёс усяе хаты. Як толькі абвугліцца трохі лучына, хлопчык зараз-жа сьціраў вугольле другой лучынай і стараўся трымаць лучыну так, каб агонь сьвяціў роўна—бяз перабояў.

Увайшоўшы ў хату, «пасажыр» спачатку заўважыў толькі гэтага хлопчыка і невялікія дзьве пляміны сьвятла. Пустое, душнае паветра біла ў нос моцным пахам сьвежага кажуха, чалавечага поту і кісьляціны ад астаткаў яды, якая зьбіралася ў цэбры каля печы. «Пасажыр» паморшчыўся, пакруціў носам і стаў сярод хаты. Нібы ён заблудзіўся і ня ведаў, дзе спыніцца.

Цыпрук рупліва падскочыў.

— Садзецеся вось тут!

Стары паказаў на шырокі тапчан каля стала.

Госьць азірнуўся па бакох, сеў і палажыў портфэль каля сябе.

Звыкшыся трохі з асьвятленьнем хаты, «пасажыр» заўважыў, што на ложках і каля печы сядзяць і стаяць у цяню рознага ўзросту і выгляду члены вялікай сям'і селяніна—дзеці і ўнукі. Яны маўчаць і ў напружанай зацікаўленасьці глядзяць на яго з цёмных куткоў.

Фурман паставіў перад ім на лаве дарожны чамадан.

— Трэба павячэраць і—спаць!—казаў «пасажыр» да фурмана.—Заўтра чуць сьвет паедзем у Курганішча да Крушынскага.

Стары Цыпрук лавіў кожнае слова негутарлівага «пасажыра», каб зразумець, па якіх справах едзе. Якраз гэтымі днямі сюды павінен прыехаць з гораду таварыш наконт дзяльбы лесу на будову. Відаць, ня той.

«Мабыць, у часе вячэры што-кольвечы выведаю ў яго».

— Маці! Маці!—крыкнуў стары да жонкі,—можа тав... пану таварышу сьвежага малачка дасі, ці што?

— Дзякую! У мяне свае харчы з сабою,—адказаў «пасажыр» і давай распакоўваць чамадан.

Ён раскладваў на стале розныя пакуначкі, бутэлечкі, нож і відэлец, белую сарвэтку, маленькую сарвэтачку і іншыя рэчы. Усё гэта раскладвалася паволі, у строгім парадку. Можна было падумаць, што госьць рыхтуецца наладзіць тут балюшку на чалавек дзесяць.

«Пасажыр» зьняў з сябе паліто, палажыў на тапчан і давай разварочваць пакуначкі з такой павагай і асьцярожнасьцю, нібы з сваіх пястуноў-дзяцей здымае дарожную вопратку: і закрасаваліся на белай сарвэце смажаная курыца, сыр, масла, яйкі, радыска, соль і перац у пудэлачках, булкі, булачкі, бутэлька з наліўкамі, бутэлька нарзану і нават бутэлька з малаком.

Усё гэта стаяла абцёртае і бліскучае.

«Пасажыр» займаўся сваім дарожным буфэтам з шчырым захапленьнем. Ён нават забыў, што многа пар вачэй пільна паглядаюць на яго з розных куткоў хаты. Адпала ранейшая застыгласьць і замкнёнасьць яго твару. У вачох зьявіўся жывы блеск. Увесь ён стаў паваротлівым, рухавым. Прытульнасьць стала, нібы ў люстэрцы, адбілася на яго круглым твары. Нават адценьне дабрадушша і гульлівасьці замільгала ў яго вачох. Здавалася, што хоча расказаць сьмехатлівы анэкдот, але чамусьці стрымліваецца.

Меншую сарвэтку ён прыладзіў пад бараду да шыі і грудзей, нібы рыхтаваўся галіцца. Прыняўся за яду. І гутарлівасьць зьявілася.

— Я вось агроном,—адрэкамэндаваўся ён перад гаспадаром,—а агрономы любяць пад'есьці!

— Аг-ра-мон!—нібы паправіў няправільнасьць вымовы «пасажыра» стары Цыпрук,—аг-ра-мон, вось што! ага-а!

Стары як-бы ўрэшце дагадаўся, у чым рэч. Кплівым вокам зірнуў на «аграмона». Наслухаўся і «аграмонаў» за апошнюю пару гадоў. Ведае ён пра многапольлі, лубін, канюшыну.

... Сярод аграмонаў ёсьць такія, што ня сеюць і ня жнуць, а хлеб смачны ядуць,—падумаў стары і схапіўся рукою за шчаку: ныў зуб.

У адказ на яго думку агроном накінуўся на смажаную курыцу і наліўкі.

Хлопчык-электрыфікацыя мяняў лучыну за лучынай. У яго быў такі спрыт, што агрономаўскі дарожны буфэт быў увесь час асьвечаны роўным сьвятлом.

На гэты раз на стале старога Цыпрука, як на экране ў кіно, паказвалася сытасьць і здаволенасьць.

Агроном еў, мяняў пакуначкі і пасудзінкі адно за адным з мэтодычнаю акуратнасьцю і стараннасьцю. Пры гэтым чытаў цэлую лекцыю па сельскай гаспадарцы.

Хлопчык-электрыфікацыя, як зачарованы, глядзеў яму ў самы рот, аблізваўся, глытаў сьліну.

Ня лекцыя агронома яго захапляла, а тыя смачныя кавалкі, што «дзядзя» глытаў з прагнасьцю чалавека, які тры дні галадаў.

— Мама! булачку!—застагнала ў поцемках малое дзіцё.

— Ціха, ты!

Дзіцё залівалася ў плачу, а кабета біла яго, прыгаварваючы:

— Во табе... во табе! во табе!!

Агроном у гэты час расьпісваў перад гаспадаром трактар і высьмейваў старасьвецкую саху.

— Але як-жа ты яго купіш?—пытаўся селянін.

— Грамадою, цэлай грамадою!—казаў агроном запэўняючым тонам, запіваючы гэтыя словы малаком,—трэба весьці гаспадарку так, як хутаранін Язэп Крушынскі. У яго культурная гаспадарка. Я цяпер туды еду.

— Трактар, адборнае насеньне, многа жывёлы, шмотпольле—вось адзіны паратунак для сялянства!—рэзюмаваў сваю лекцыю агроном. Ён выціраў губы сарвэткай.

— Усё гэта сьвятая праўда!—згадзіўся стары Цыпрук,—але сіл на гэта няма. А нашы мужыкі яшчэ вельмі ўпарты народ. Вось што! А хто-ж ён, гэты Язэп Крушынскі?

— Селянін, як усе сяляне, але разумны чалавек!

Агроном прыбіраў са стала пустыя бутэлькі і пасудзіны. Гэта ўсё зноў заварочваў у паперу і клаў у чамадан з ранейшай акуратнасьцю.

Увесь час каля маленькага ваконца на дварэ мітусіліся зацікаўленыя суседзі. Калі-ні-калі якая-колечы з іх прыклейвалася носам да шкла і паглядала ў хатку.

— А цяпер спаць!—кончыў агроном сваю гутарку.

— Можна вот тут на лаве, а то і на сене, ці што?

— Лепш на сене!

— Маці, дай кажух і пасьцілку!—закамандаваў гаспадар.

Агроном адзеў паліто. Узяў у рукі портфэль і чамадан.

Гаспадар павёў яго на сена і хутка вярнуўся. Фурман агронома зірнуў на яго і засьмяяўся шчырым сьмехам.

— А цьфу! ці што?—плюнуў стары Цыпрук,—такога аграмона першы раз у жыцьці бачу. Гэта-ж дзіцё плача булачку, а ён хоць-бы што, ну й сьвіньня!

— А хвор быў гаспадара гарэлкай пачаставаць!—падбухторваў фурман.

— Ліха яго бяры з яго гарэлкай! Чаму ён цябе, свайго фурмана, не пачаставаў?

— Ён сам толькі з пачастункаў жыве. Па ўсіх кулацкіх хутарох і фальварках яго частуюць.

— Так. Хто бярэ, той не дае,—па-філёзофску сказаў гаспадар.

— Няўжо-ж ня бачыш, што гэта панок, панскай косткі?—як-бы апраўдваў агронома фурман.

Стары махнуў рукой.

— Маці!—крыкнуў ён,—дай вячэраць! Хоць з чалавекам пагутарым, ці што!

II

Агроному кепска спалася.

Ён часта абуджаўся, кідаўся з боку на бок. Нешта кусала яго.

... Няўжо блохі ў сене? Як гэта «мужыччо» ўмудраецца апаганіць такое мурожнае пахучае сена?

Але хутка дагадаўся, у чым рэч. Блохі былі ў сялянскай пасьцілцы і кажуху.

Ён адкінуў на бок гэтыя рэчы, лёг проста на сена і прыкрыўся сваім палітом. Але спаць усёроўна ня мог. Аглядаўся па бакох.

Цёмна. Ён нават ня можа сабе ўявіць, як выглядае пуня.

Яму пачало здавацца, што, як у хаце, і тут з усіх куткоў на яго глядзяць мужыцкія вочы—прыкрыя, пранізваючыя...

... Чаго добрага, чамадан нехта ўкрадзе. І што мяне накруціла тут начаваць?

Занепакоены агроном ускочыў, намацаў чамадан і палажыў побач з сабою разам з портфэлем.

Аднак, месца сабе не знаходзіў. Падлажыў левую руку пад галаву.

У самае вуха затуркаў гадзіньнік. Ён быў прышпілены да рукі вузкім раменчыкам.

Стукат мэталёвага сэрца гадзіньніка вельмі непакоіў:

— Тур-тур-тур-тур.

У гэтым аднагуковым слове тоненькіх спрунжын адчувалася маленькая хрыпотка: нібы ў чалавека, які застудзіў горла. Хрыпотка надавала таемны сэнс бязупыннаму турканьню. Здавалася агроному, што часы яго дабрабыту лічаныя. Нехта нявідочны бязьлітасна за ім цікуе, вядзе падрахунак усім яго дзеям і ўчынкам. «Нехта» выкрые яго перад людзьмі. У яго зьменіцца постаць, твар, голас. Ён стане ня тым, якім ёсьць цяпер.

Вельмі палохаўся агроном гэтага «нехта», ненавідзеў усёй істотай. Ён сарваў гадзіньнік з рукі і палажыў у кішэнь штаноў.

Турканьне, хоць заглушанае, але чуваць было. У змрочнай цішыні гадзіньнік гаварыў:

— Ён... ён... ён... ён..:

Нібы з лёгкім стогнам, з ледзь прыкметным водгаласкам раздавалася гэтае слова, калола вострым шылам.

Агроному пачало здавацца, што ён сам маленечкі, як саломінка, як травінка, а слова «ён» расьце, пераходзіць у гучны крык, у звон, аглушае, чаруе, гіпнотызуе, запаўняе сабою ўсе куткі цёмнай пуні. Можна ўтапіцца ў гэтым крыку, нібы ў глыбокім возеры.

Ён падняўся ў другі раз, выняў гадзіньнік з кішэні, палажыў у чаравік і зарыў яго глыбока ў сене. Тады ў поўдрымоце пачало яму здавацца, што сам расьце; ад галавы да ног—некалькі сажняў. Прыкра ад такога казачнага росту. Яшчэ болей спалохаўся; у яго раптоўна пачала расьці барада—калматая, чорная, здрадная.

Ён мацае рукою гладка выгалены твар, зьнімае з яго валасінкі калючага сена.

Заснуў. Хутка зноў прачнуўся ад няпрыемнага сну.

... Мабыць, замнога еў перад сном.

Ён сьніў, што вакол яго шэпчуць:

— Вось ён... вось ён... вось ён...

Адусюль тыкаюць на яго пальцамі. Людзей ён ня бачыць. Толькі паадзіночныя пальцы мільгаюць у паветры ў яго бок. Блішчаць вочы.

Кідаецца з боку на бок. Сена шорхаецца пад ім:

— Вось ён... вось ён...

... Няўжо-ж баяцца гэтых двух слоў? Ці-ж яны такія страшныя?

Першым чынам, пасьля рэволюцыі ён зголіў бараду. Ніхто яго не пазнае. Па-другое, гэта было далёка ад Беларусі. Ранейшыя знаёмыя яго тут ня сустрэнуць. Даўно гэта было—у завірусе 1905 году. Але, ня гледзячы на ўсё гэта, вось ужо некалькі гадоў як часта над настарожаным вухам чуе шэпт:

— Вось ён... вось ён...

Пасьля рэволюцыі 1917 году ён выехаў далёка з роднага гораду М... і жыве пад чужым прозьвішчам. Удалося набыць фальшывы пашпарт, дзе запісана Іван Мацьвеевіч Шапавалаў.

Аднак, яшчэ па сёньнешні дзень ён добра памятае сваё праўдзівае імя і прозьвішча: Антон Сяргеевіч Мятлоў.

— Вось ён... вось ён...

Гэта значыць, не цяперашні Іван Мацьвеевіч Шапавалаў (голены, круглы агроном), але Антон Сяргеевіч Мятлоў (малады чалавек з чорнай аксамітнай бародкай).

Цяжка было спачатку з новым дакумантам і новым абліччам. Як ад цырульніка прышоў дахаты, дык Аграфена Макараўна (яго жонка) спалохалася, у роспачы рукі заламала:

— Ты, Аньцік, звар'яцеў? Гэта-ж цябе не пазнаць. Нашто бараду зголіў?

Яго вельмі ўзрадавалі словы: «гэта-ж цябе не пазнаць!» Але разам з радасьцю была і няпрыемнасьць. Жонка приставала да яго, навошта гэта зрабіў, калі з бародкай ён прыгажэйшы.

Некалькі тыдняў жонка лемантавала над ім, шкадавала згінуўшую бародку. Шмат было ўжыта красамоўства, пакуль угаварыў жонку, што барада была не да твару.

Ён апавядаў жонцы легенду пра «вечнага жыда»—сваю ўласную легенду-быль.

Ён сам, дзякуючы аксамітнай бародцы і худому твару, перажываў гэту легенду:

З барадой быў вельмі падобным да сэміта. З гэтай прычыны на сваіх плячох пераҗыў «историю евреев» у царскія часы. Пры пагромах пасьля 1905 году яго ня раз білі, як «жыда». Аднаго разу нават ледзь ад сьмерці выратаваўся.

У часы працэсу Бэйліса яго называлі «Бэйлісам».

Пры імпэрыялістычнай вайне—«нямецкім шпіёнам».

У цягніку аднаго разу да таго над ім кпілі, што хацелі выкінуць з вагона, калі цягнік імчаўся поўным ходам: думалі, што ён «жыд».

Выратоўвалі кожны раз толькі дакуманты.

— Досыць насіць гэтае жыдоўскае абліччча! Многа здароўя і прыкрасьцяй каштавала бародка...

— Дык чаму-ж ты, Аньцік, не абгаліўся яшчэ тады? Цяпер гэта зусім непатрэбна! Ніхто-ж цяпер яўрэяў не чапае!

— Вось якраз тады я лічыў патрэбным пераҗываць усе жудасьці гэтага народу, каб глыбей разумець яго нядолю, каб не адыходзіць ад слабага. Цяпер гэта лішняе.

Прайшло трохі часу і жонка звыклася бачыць мужа з голеным тварам.

— Ты, Аньцік, падобен цяпер да актора. Усе акторы безбародыя!

З барадою справа была наладжана добра. Тады вылезла на верх яшчэ цяжэйшая бяда: жонка яго называла «Аньцік» у той час, калі (паводле дакуманту) яна павінна яго называць «Ванька».

Агроному прыходзілася двойца: ва ўстановах, на вуліцы, з новымі знаёмымі ён быў Іванам Мацьвеевічам, а дома перад жонкай—Антонам Сяргеевічам.

Трэба было мець вялікую напружнасьць думкі, каб часта пертварацца ў іншую асобу. Часам сярод новых знаёмых, калі хтосьці скажа «Іван»—ён адварочваўся, думаючы, што гэта адносіцца да яго. А дома, бывала, часам як жонка скажа «Антон», дык не зьвяртаў увагі, нібы не яго завуць.

— Што ты, Аньцік, аглух?—дзівілася жонка.—Рэволюцыя на цябе кепскі ўплыў зрабіла. Ты стаў нейкім грубым. Я цябе заву, а ты не адклікаешся.

— Выбачайце, дарагая, я задумаўся і ня чуў.

— Над чым ты думаеш, калі без цябе ўсё абдумана?

— Кепская ў цябе, Аньцік, прывычка так задумвацца. Гэта ўжо не ўпяршыню. Ты, Аньцік, мэлянхолікам зрабіўся.

Ён стараўся рознымі жартлівымі слоўцамі затушоўваць жончыны заўвагі, пачынаў гутарку на іншую тэму.

Жончына слова «Аньцік» калола яго нявідочнымі голкамі, пранізвала сэрца, торгала нэрвы. Ён кожны раз пры гэтым слове імпэтна адварочваўся, ці няма чужога ў пакоі.

Выходзячы з хаты, ён пакідаў «Аньціка» ў сьценах кватэры, нібы хатнюю сьвітку. На вуліцы быў Іванам.

— Я—Іван, Іван Мацьвеевіч!—кожны раз паўтараў ён у думках некалькі разоў, паглядаў з апаскай па бакох, каб часам не натрапіць на знаёмага з таго гораду, дзе быў Антонам Сяргеевічам... Мацаў рукой свой голены твар.

... Ніхто не пазнае. Сама жонка ледзь пазнала, калі першы раз агаліў бараду...

Па-за сьценамі сваёй кватэры ён стараўся мяняць паходку, манеры, гесты. Ва ўстановах нават голас перайначваў: гаварыў гарлавым басам, выціскаў словы адрывіста, ненатуральна, нібы вечна трымаў у роце неразжованыя гарошыны.

Заўсёды пры знаёмстве выразна выгаварваў: «Іван Мацьвеевіч Шапавалаў!» і такім тонам, нібы кліча Шапавалава сабе на дапамогу ад нявідочных ворагаў, якія яго апанавалі.

А спачатку сваё новае імя і прозьвішча гаварыў хутка, мармочучы пад нос, як-бы саромеўся няпрывычных слоў. Бывала, што новы знаёмы не пачуе і пытаецца ў другі раз:

— Як? Як? Выбачайце, не дачуў.

На такога чалавека ён глядзеў з падазронасьцю і прывучаўся гаварыць сваё імя заўсёды голасна.

Паходку і манеры раз назаўсёды зьмяніў пасьля аднаго прыкрага выпадку: ён ішоў па вуліцы зусім спакойна і забыўся пра сваё новае імя, ажна нехта з-заду крыкнуў:

— Пачакайце, Антон Сяргеевіч!

Ён уздрыгнуўся і хацеў ужо спыніцца, але ўспомніў, што ён Іван Мацьвеевіч і пасунуўся далей.

Зямляк (гэта быў блізкі сусед з роднага гораду) нагнаў яго і пасяброўску палажыў яму руку на плячо, але як глянуў яму ў твар, дык папрасіў прабачэньня:

— Выбачайце, паходка так напомніла мне аднаго знаёмага Антона Сяргеевіча, ажна я аклікнуў вас, але ў таго барада.

— Бываюць памылкі,—сказаў агроном зьмененым голасам і ўвесь пакрыўся халодным потам.

З таго часу ён зьмяніў увесь ранейшы надворны выгляд.

Ён стараўся пераіначыцца да таго, каб родны бацька ня мог яго, Івана Мацьвеевіча, зблытаць з Антонам Сяргеевічам.

Ён пачаў зварочваць увагу на самыя драбніцы свайго абыходу: трэба зрабіць так, каб нічым ня быць падобным да ранейшага сябе. Насіў іншую вопратку. Зьмяніў характар пісьма. Дзеля гэтага пачаў пісаць пяром «рондо». Падпісваўся раней неразборліва: «А. С. Мят...» з рознымі круцёлкамі, а цяпер—«Іван Мацьвеевіч Шапавалаў»—поўнасьцю, выразна, літару ў літару, дзіцё магло чытаць.

У канцылярыі ўсе дзівіліся на яго «почерк», які выглядаў орыгінальным і харашэйшым за друкаванае. Почарк Івана Мацьвеевіча служыў прыкладам для дробных чыноўнікаў.

Гэта ўсё было па-за сьценамі сваёй кватэры.

Пры жонцы ён зноў накіроўваў усю сілу, каб стаць дарэволюцыйным «Аньцікам». Трэба было ў сваёй кватэры быць ранейшай істотай, з ранейшым голасам, манерамі і ўсімі іншымі адзнакамі Антона Сяргеевіча.

Такая двуіснасьць даводзіла яго да таго, што пачаў марнець, сохнуць і нідзе сабе месца не знаходзіў. Ён ня меў магчымасьці прасіць да сябе гасьцей, або пайсьці куды-колечы з жонкаю ў госьці ці ў тэатр, бо магла здарыцца няпрыемная блытаніна між «Антонам Сяргеевічам» і «Іванам Мацьвеевічам».

Жонка заўважыла, што яе «Аньцік» стаў нейкім дзіўным чалавекам, што з ім чыніцца нешта благое.

Колькі яна ні наракала на сваё замкнёнае жыцьцё, на тое, што жыве, як у вастрозе,—нічога не памагала. Муж быў вельмі ўпарты. Нават роднай жонцы баяўся адкрыць сакрэт, што ён цяпер не Антон Сяргеевіч, а Іван Мацьвеевіч: яна ня ведала яго дзейнасьці і да рэволюцыі. Апрача таго, пры малых дзецях гэтага нельга было рабіць. Яны вельмі зьдзівіліся-б, калі-б маці, яго называла новым імем.

Даходзіла ў іх да вельмі прыкрых гутарак, да сварак. Жонка не пазнавала свайго ранейшага любага «Аньціка». Як-бы хто яго падмяніў.

— Можа ты тут каханку маеш? дык кажы. Навошта таіць.

— Якія ў мяне могуць быць каханкі? Я-ж па вечарох заўсёды дома бываю.

— Жонка на яго недаверліва паглядала.

— Мала там, у Наркамземе, гэтых стрыжаных машыністак! Слухай, Аньцік, нам трэба сур'ёзна пагаварыць.

Гэтае «сур'ёзна пагаварыць» паўтаралася бадай кожны дзень. Але ён заўсёды адкладваў «сур'ёзную» гутарку.

У той-жа час новыя знаёмыя, таварышы па службе, часта прыставалі да яго:

— Ванька, чаму ня ходзіш да нас у госьці і чаму да сябе ня просіш?

«Ванька» чырванеў, бянтэжыўся.

— Бачыце, у цяперашнія часы, калі рэволюцыя толькі заваёўваецца, калі многа крыві льлецца, не да гасьцяваньня.

Пры гэтым ён рабіў кожны раз такі посны выгляд, што знаёмыя адставалі.

Горш было з жонкай.

Аднаго разу пасьля «сур'ёзнай гутаркі» з ім яна паехала з дзяцьмі ў глыб Расіі да сваіх старых бацькоў на некалькі месяцаў, абяцала часта пісаць адтуль лісты.

На другі дзень пасьля гэтага ў яго зьявілася новае занепакоеньне: лісты.

... Прозьвішча Мятлоў будзе красавацца на канвэртах яе лістоў. Паштавік якраз прыходзіць сюды а гадзіне адзінаццатай раніцою, калі мяне, былога Мятлова, няма дома. Вось тут і пачнецца новая блытаніна. Паштавіку скажуць, што ў гэтай кватэры жыве не Антон Сяргеевіч Мятлоў, а Іван Мацьвеевіч Шапавалаў.

... Небясьпечна блытаць гэтыя імёны і прозьвішчы, небясьпечна ставіць іх побач.

... Трэба, каб Антон Сяргеевіч Мятлоў быў выкрэсьлены навекі-вечныя з памяці людзей, нібы такі ніколі і не радзіўся. А то колькі людзей будзе чытаць гэты адрас. Чаго добрага, натрапіцца такі, хто дасканала ведае маё мінулае.

Мароз праходзіў па сьпіне.

... А калі жонка пачне ва ўстанову пасылаць лісты з запытаньнем, дзе дзеўся Антон Сяргеевіч Мятлоў, які займаў такуюта пасаду? Яшчэ падазронасьць зьявіцца ў таварышоў? Пачнуць шукаць гэтага нібы-та незнаёмага чалавека.

Галава хадыром хадзіла.

... Што рабіць? Навошта адпусьціў жонку? Няхай-бы тут сядзела. Гэта-ж ад раптоўнай радасьці вызваліцца на некалькі месяцаў ад цяжкай ролі быць падзеленым на дзьве асобы я забыўся аб сытуацыі з лістамі.

Цяпер яшчэ болей жыва, чым да гэтага часу, ён бачыў у сваім уяўленьні бурны 1905 год. Ён тады—малады студэнт, Антон Сяргеевіч Мятлоў, быў арыштаваны з іншымі таварышамі з сакрэтнага сходу соцыялістых-рэволюцыянэраў. На допытах жандарскі афіцэр абыходзіўся з ім вельмі ветла, проста як родны бацька. Пачаў яго, студэнта, шкадаваць, што такі малады чалавек назаўсёды можа загубіць сябе. Дзіўна зрабілася тады на душы Антона Сяргеевіча.

... Жандар мяне шкадуе, а я сам сябе не шкадую...

Таварышоў выслалі на вечную ссылку ў Сібір. Ён астаўся дома.

Да высылкі сядзеў у турме разам з імі.

— Між намі ёсьць здраднік...—часта шапталіся тады яго таварышы.—Сьледчы ведае такія рэчы, аб якіх мог дазнацца толькі ад сябра нашай партыі...

Усе пагдядалі тады адзін на аднаго з падазронасьцю, пранізвалі недаверліва вачыма. І ён, Антон Сяргеевіч, рабіў падазроныя вочы і горача, абураны, пытаўся:

— Хто? Дзе ён?

На яго выкрыкі таварышы адказвалі стрыманым сьмехам. У гэтым сьмеху адчувалася такая агіда (яму здавалася, што да яго), якой ён ніколі ў жыцьці не забудзе... Нават і цяпер, калі хто так сабе засьмяецца пры ім, яму робіцца прыкра.

Усё гэта ён успомніў пры паездцы жонкі.

... Што рабіць?

І ў яго зьявіўся раптоўны плян.

Зьліквідаваў свае справы, папрасіў водпуск, сабраў хатнія рэчы, вопратку і бялізну да апошняга шматка, запакаваў у скрынкі і паслаў да жонкі. У дадатак тэлеграма пад прыдуманым прозьвішчам:

«Антон Сяргеевіч раптоўна памёр ад запаленьня мазгоў. Мы яго праз дзень пахавалі. Пасылаю вам яго рэчы. Шчыра выказваю свой жаль. Сідараў».

... Цяпер жонка сюды ня прыедзе і ня будзе мяне шукаць...

Жудасна стала тады на сэрцы Івану Мацьвеевічу. Да вечара (да адыходу цягніка, на якім яму трэба было абавязкова кудысьці паехаць) ён сядзеў у апусьцелай кватэры. Швэндаўся з кута ў кут і меркаваў: вось хутка жонка атрымае тэлеграму...

... «Ён памер ад запаленьня мазгоў»,—будзе думаць яна.— Вось чаму ён апошнія часы быў нейкім дзіваком і мэлянхолікам. Мазгі яшчэ тады былі ў яго не ў парадку,—дагадаецца яна і пачне сваім бацьком апавядаць, як ён трымаўся ўвесь час, якім ён быў заўсёды устрывожаным, зьбянтэжаным. «А я сварылася з ім, а я падазравала, што ён вядзе шашні з машыністкамі, а я... такая благая: паехала ў госьці ў той час, калі мне трэба было быць пры ім...» Жонка будзе рукі ламаць да хрусту пальцаў. У яе вачох затуманіцца вялікае гора і роспач.

Жаль агарнуў Івана Мацьвеевіча да Антона Сяргеевіча.

Ён ціха заплакаў.

.... Не. Будзе ня так. У такім выглядзе жонка будзе выяўляць сваё гора пазьней, калі страшны боль усьцішыцца. Спачатку будзе вось як: жонка прачытае першыя словы тэлеграмы. Яна выпадзе з яе дрыжучых пальцаў... (Ён жыва ўяўляў яе ружовыя дрыжучыя пальцы).

... Жонка бухнецца на падлогу. Падбяжыць маленькі хлопчык Мішка, зьдзівіцца, што мама раптам заснула на падлозе. У пакоі пачнецца беганіна, перапалох. Усе даведаюцца, што я памёр. Жонка будзе ляжаць на ложку ў няпрытомнасьці. Яе пачнуць паіць разнымі кроплямі, валяр'янкай. Ва ўсіх кутках кватэры падымецца плач. Маленькая, пухленькая Люська пачне пляскаць у ладкі і кожнаму гаварыць: «Папка памёль... папка памёль... Ён цяпер у бозенькі...» Так дзед ёй растлумачыць аб маёй сьмерці.

Іван Мацьвеевіч жыва бачыў перад нутраным зрокам усё гэта. Яму тады здавалася, што чуе прыглушаны плач сваіх родных і блізкіх.

Ён закусваў губы. Стараўся сьціскваць зубы так шчыльна, каб яны прыкра не барабанілі адзін аб адзін. Ком падступіў пад горла. Агроном прыціснуўся лобам да шкла вакна, каб трохі ахаладзіцца.

Сонечная вуліца выглядала мутнай.

... Чаму людзі такія туманныя, як-бы пад вадою?

Ён доўга стаяў нярухомым ля вакна.

... Ці ня лепш будзе, калі цяпер паеду да жонкі і аб усім ёй раскажу.

... Не! Ня можа быць! Яна тады адрачэцца ад мяне. Будзе яшчэ горш. Мне прыдзецца яшчэ болей асьцерагацца яе. Усё-роўна страціў жонку. Мы памёрлі адзін для аднаго.

... Няможна... няможна...

Іван Мацьвеевіч у той-жа дзень вечарам паехаў на новае месца.

Там зараз-жа лёг у шпіталь. Хварэў на гарачку.

— Антон Сяргеевіч памёр! Жыве Іван Мацьвеевіч!—крычаў ён у няпрытомнаесьці на ўсю палату.

Як ачуняў, дастаў новую пасаду раённага агронома ў глухім мястэчку Шапалевічы, недалёка ад граніцы. На гэтай пасадзе знаходзіцца ўжо некалькі год. Увесь час стараецца ўвасабляцца ў новага чалавека—Івана Мацьвеевіча. Цяпер гэта яму шмат лягчэй, чым тады, калі жыў з жонкай, і яму трэба было дзяліць сябе на дзьве часткі паміж Іванам Мацьвеевічам і Антонам Сяргеевічам.

Цяпер ён цалкам Іван Мацьвеевіч!

Дзеля гэтай мэты ён спакойна абдумаў новы мэтод працы над сабою.

... Тут патрэбна мастацкая творчасьць. Трэба стварыць новага чалавека, навюткага, якога яшчэ ня знаў да гэтага часу.

Іван Мацьвеевіч захапіўся гэтай ідэяй. Тое, што раней было яму няпрыемна і цяжка, цяпер зрабілася надзвычайна цікавым. Гэта ня толькі з практычнага боку, а нават з пагляду псыхолёгічна-мастацкага экспэрымэнту.

... Пісьменьнікі пішуць романы, аповесьці. Маляры і скульптары даюць вакольнае, прапушчанае праз прызму сваёй мысьлі і эмоцыі. Тое самае робяць актёры на сцэне. А я вось папробую новую форму мастацтва: тварыць новага чалавека з самога сябе, з тэй самай жывой гліны ляпіць новую фігуру...

Іван Мацьвеевіч над гэтай проблемай доўга думаў. Зусім па-інакшаму пачаў чытаць мастацкую літаратуру, па-новаму прыглядацца да людзей, вывучаць драбнейшыя рыскі іх характараў, выгляду, учынкаў.

Ён зьбіраў, такім чынам, матэрыял для свайго новага чалавека, для яшчэ ня зусім аформленага Івана Мацьвеевіча.

Ён вёў орыгінальны дзеньнік: ня ў запісах на паперы, а ў памяці. У дзеньніку концэнтраваў у адно ўсе раскіданыя часткі свайго твару—новага чалавека.

1. Выкінуць з памяці ўсё мінулае. Ён толькі цяпер нарадзіўся.

2. Зьмяніць свой выгляд і характар.

Вось асноўны сэнс дзеньніка Івана Мацьвеевіча.

Вакол асноўнага сэнсу, нібы мяса вакол шкілету, было густое пляценьне розных падрабязгаў і рысаў новага чалавека. Усё гэта разгалінавалася ў пэўную тэорыю, якую ён пачаў ужываць да сябе са строгай акуратнасьцю.

Першым чынам, каб забыць аб усім мінулым, трэба жыць у новай мясцовасьці, у новых абставінах рэчаў і людзей, з новым нутраным зьместам.

Па-другое, каб зьмяніць свой выгляд, ён насіў іншага пакрою вопратку, іншы фасон шапкі і абуцьця. Апрача таго, стараўся растаўсьцець. (Ён быў да гэтага часу вельмі худы).

Каб забыць аб жонцы і дзецях, аб якіх міжволі часта думаў, ён стараўся запоўніць мозг і пачуцьці новымі ідэямі. Ужо адна думка аб стварэньні новага чалавека патроху выпіхала з яго нутра ўсё ранейшае. Але паколькі гэта было зьвязана з «ранейшым» праз ланцуг контрастаў, дзе для ўзмацненьня новай тэорыі прыходзілася ставіць перад фокусом вачэй на адным пункце сваё жыцьцё і «да» і «пасьля» гэтага часу,—ён прымушаны быў выклікаць у сваім уяўленьні «ранейшае».

Прайшоў першую стадыю новатворчасьці і пачаў прыдумваць наркотычны спосаб затуманеньня ў памяці ўсяго таго, што там жыло да гэтай апошняй мяжы.

Спосаб быў хутка знойдзены: ён даў мазгом новую працу—савецкія анэкдоты. Зьбіраць і прыдумваць анэкдоты на тэму дня, на кожную новую політычную падзею, на ўсе галіны савецкага будаўніцтва, на вядомых правадыроў партыі. Тут было вялікае поле для своеасаблівай творчасьці.

Анэкдоты былі ў пэўнай афарбоўцы: у выяўленьні ўсіх слабых бакоў савецкага ладу, быту, дасягненьняў. Анэкдоты былі свайго роду эпопэяй пасьля кастрычнікавых часоў, але ў праламленьні—абразкі ў крывым люстэрцы. Высьмейваньне ўсяго існуючага, новага ў гэтых анэкдотах было ўзброена вострымі шпілечкамі гумару, было аздоблена нахабнымі рыскамі. Нахаб-

шчына была ў анэкдотах тым стрыжнем, якім у амэрыканскіх кіно-фільмах зьяўляюцца акробатычныя трукі і каханьне між «ім» і «ёю». Без такога стрыжня, паводле Івана Мацьвеевіча, анэкдоты ня мелі-б душы, былі-б нуднымі.

Іван Мацьвеевіч разказваў свае анэкдоты па-мастацку, артыстычна. Сам ніколі ня ўсьміхаўся пры гэтым, а вакол—рогат. Слухачы—у захапленьні.

Усё вакольнае, усю працу ва ўстановах, савецкае будаўніцтва Іван Мацьвеевіч уяўляў сабе, як адзін доўгі-доўгі анэкдот.

Яго анэкдоты, як асаблівага роду вусная творчасьць, вельмі хутка распаўсюджваліся па ўсіх канцылярыях і ўстановах, на нявідочным самалёце пераплывалі тысячы вёрст, запаўнялі ўсе гарады СССР. Часам у прыемнай нечаканасьці варочаліся назад да Івана Мацьвеевіча новыя, палепшаныя варыянты яго ўласнай творчасьці. Па ўсім Саюзе яны корэктаваліся, шліфаваліся да мастацкай вастраты і спэцыфічнай зграбнасьці.

Гэтая жывая, усесаюзная школа апрацоўкі надавала ахвоты да тварэньня новых анэкдотаў. Іван Мацьвеевіч сыпаў іх цэлымі томамі. Аднак, баючыся, каб анэкдоты ня скіроўвалі ўвагу на яго, як на няпрыхільніка да савецкай улады, ён расказваў іх не ад сябе, але ад трэцяй асобы («ад нейкага чуў»), расказваў толькі добрым знаёмым.

Дзякуючы такой гумарыстычнай творчасьці, у яго зьявіўся апэтыт. Ён пачаў прыкметна таўсьцець, расьці ўшыркі.

Анэкдотысты часта глядзеў на сябе ў люстэрка і цешыўся: твар круглы, ружовы, грудзі выпукліліся, рукі зрабіліся пухкія, з ямачкамі, як у кабеты. Зьмяніўся выраз вачэй, губ. Рухі яго набылі павольнасьць, паважную марудлівасьць.

Іван Мацьвеевічператварыўся ў дабрадушнага «дзядзьку» з портфэлем, зрабіўся чалавекам нібы-та адкрытым, шчырым, якога ўсе любяць, паважаюць, сябруюць з ім, надакучаюць рознымі справамі, патрэбнымі і непатрэбнымі.

Тут зьявілася ў Івана Мацьвеевіча новае пытаньне: з якімі людзьмі весьці знаёмства і сяброўства?

Гэтае пытаньне стала ў яго, пасьля такой мэтаморфозы, рубам і нечакана. Ён—папанька і маманька нованараджонага Івана Мацьвеевіча—задумваецца на тым, як прабіць шлях у жыцьці свайму пястуну.

Тут патрэбны добрыя пэдагогі, якія вымуштравалі-б Івана Мацьвеевіча, паказалі-б яму новы шлях жыцьця, увялі-б у новую эпоху падрыхтаванага, спрактыкаванага, шустрага і кемнага, каб ён не загубіўся ў новым бурлівым жыцьці, нібы пылінка пад ветрам.

Перад ім паўстала вельмі цяжкая задача.

Трэба быць і няпрыкметным, а разам з тым орыгінальным, выдатным, расьці ўгару, павышацца па савецкай лесьніцы. Гэта значыць, забясьпечыць дабрабыт Івана Мацьвеевіча. Трэба, не нажываючы ворагаў, быць цьвёрдым у працы і рабіць кар'еру трапна і спрытна.

... Гэта ўсё залежыць ад таго, з кім ты знаёмы, з кім вядзеш сяброўства.

Спачатку ён думаў выходзіць у людзі па «пролетарскай» лініі—думаў набыць пролетарскую вопратку, абшарпаную, рваную (па вопратцы сустракаюць) і, такім чынам, пачаць выслужваньне перад начальствам. Аднак, хутка раздумаў.

... Гэта выглядала-б, што я маскуюся, што я фальшывы чалавек. Я магу такім спосабам выклікаць да сябе недавер'е. Гэта не гадзіцца. Так многія робяць. Лепш, калі я буду адзетым па-эўропэйску. Падумаюць, што я з-за межаў прыехаў. Напрыклад, з Амэрыкі, дзе працаваў у падпольным рэволюцыйным гуртку, і адтуль выслалі ў Расію пасьля рэволюцыі.

Аб гэтым ён ня раз у анкетах пісаў (нават трохі ангельскую мову ведае).

... А галоўнае (Іван Мацьвеевіч доўга разважаў аб «галоўным»)—трэба ўмець ладзіць з начальствам. Начальства—усемагутна. Начальства можа ўмагіліць, можа і падняць чалавека на вышэйшую ступень радасьці і дабрабыту.

Але ў даным выпадку цяперашняму Івану Мацьвеевічу цяжэй было шмат, чым ранейшаму Антону Сяргеевічу, чыёй практыкай «новы чалавек» карыстаўся.

Даўней начальства было моцнае, нярухомае, нібы скала, не мянялася дзесяткамі гадоў. А цяперашняе начальства—няпэўнае, будынак на пяску: ускалатне бура зьездаў і выбараў—і няма старога, прыручанага начальства. Ты працаваў, стараўся, а раптам—пачні спачатку! Увіхайся перад новым начальствам.

Ігра з начальствам была ў Івана Мацьвеевіча надзвычайна «тонкая», «дэлікатная» (як яму здавалася).

Ён стараўся вывучаць нораў начальства ва ўсіх падрабязгах, выведваў слабыя струны яго, каб граць, як добры музыка, на гэтых струнах, ці яны палітычнага, ці іншага характару. Напрыклад, калі начальнік быў семянінам, ён абавязкова знаёміўся з сям'ёю начальніка, вывучаў тады і капрысы, і слабасьці яго жонкі, каб часам тут дапамагчы, чым трэба. Калі начальнік быў ярым палітыкам, ён сам стараўся быць у курсе палітычных спраў, каб умець з ім гутарыць на палітычныя тэмы. Калі ў паветры ўстановы адчувалася, што начальнік моцна трымаецца, тады кожнае слова і поўслова начальніка былі для яго законам. А калі начальства мянялася—перад новым начальствам востра крытыкаваў старое, папярэдняе і гэтым заўсёды выйграваў, трапляў у тон.

З начальствам гаварыў зусім па-інакшаму, чым са сваімі звычайнымі саслужыўцамі і знаёмымі. Гутарыць з начальствам было асобным талентам. Як толькі ўваходзіў Іван Мацьвеевіч у габінэт начальніка, дык адразу ўвесь мяняўся, мяняўся да апошняга ледзь прыкметнага руху. Ён тады пачынаў гаварыць таемнымі шаптушачкамі і ўсё аглядаўся па баках, на сьцены і на дзьверы, як-бы баючыся няпрошанага вуха, і ў той-жа самы час відаць было, што хоча, каб гэтае «няпрошанае вуха» абавязкова прыслухоўвалася да яго гутаркі з начальствам:

... Няхай усе бачаць, што я з начальнікам за панібрата, трымаюся з ім, як роўны з роўным.

Пры гэтым выразы яго круглага, заплыўшага твару мяняліся з кожным словам: чаргаваліся нібы рознакаляровыя электрычныя лямпачкі, сполах, пашана, зьдзіўленьне, здаволеньне, роспач, шчасьце і іншыя самыя процілеглыя адчуваньні яго сэрца. Міміка была надзіва багатая. Рукі спрытна хадзілі ў розныя бакі, выраблялі свае арыгінальныя круць-верці. Ня гледзячы на таўшчыню, цела яго хісталася, гнулася нібы гумалястыкавае. Здавалася, што Іван Мацьвеевіч адносіцца з бязьмежнай пашанай, з шчырай адданасьцю нават і да нежывых рэчаў, нават да паветра ў габінэце начальства.

Вітаўся з начальствам вельмі элегантна, рабіў сваім тулавам у адзін і той самы час дзьве замысловатыя фігуры на падабен-

ства пытальніка і клічніка—вось так «?!». Гэтай нямой сцэнай ён даваў зразумець сымболічна наступнае:

— Што ў вас чуваць? Маю гонар апавядаць вам нешта надта цікавае!

Калі начальнік лічыў сябе беларусам, тады Іван Мацьвеевіч ужываў свой беларускі слоўнік: «як», «добра», «дзякую» і «выбачайце». Гэтыя чатыры словы аздаблялі яго расійскую гутарку, нібы замысловатыя ўзоры шырокі кялім.

Калі начальнік ня меў прыхільнасьці да «белмовы», тады Іван Мацьвеевіч стараўся высьмейваць гэту «тарабаршчыну».

Яго голас рабіўся надзвычайна мэлёдыйным. Кожны сказ закругляўся трымя ломамі-клічнікамі на такі лад: «!!!», трымя качаргамі-пытальнікамі—«???». На словы начальства ён адказваў таемным паяском многакроп'я: «............».

Гмыкаў нявыразна, калі ня ведаў добра погляду начальніка аб гэтай рэчы.

У канцы гутаркі ён заўсёды акцэнтаваў кропку велічынёю ў стог і пасьля элегантнага рэвэрансу ціханька, як мыш, высоўваўся з габінэту начальніка.

Іван Мацьвеевіч умеў абыходзіцца з начальствам, а таксама ўмеў трымацца і з звычайнымі людзьмі. У апошнім выпадку ён прымаў вельмі паважны выгляд: мала ўжываў рухаў, міміка на твары замірала, вочы рабіліся нявыразнымі, а гутарка, без усялякіх знакаў прыпынку, пачыналася без пачатку і канчалася без канца. Толькі анэкдоты свае расказваў бяз розьніцы між начальствам і звычайнымі людзьмі. Аднак, для начальства падбіраў анэкдоты «ідэолёгічна вытрыманыя».

Адносіны да кабет.

Гэта было адным з балючых пытаньняў Івана Мацьвеевіча. Справа ў тым, што жонку сваю ён і цяпер любіў, а каб забыць яе, трэба было зьвязацца з іншымі кабетамі. Гэта адзінае лякарства, якое можа вылечыць чалавека. «Кабетай ад кабет лячыся»,—разважаў Іван Мацьвеевіч. Але... (тут было маленькае «але») кожная жанчына, як на ўмысьне, напаміналі аб жонцы і выклікала непажаданыя ўспаміны. Дзеля гэтага ён адлажыў гэту справу на нявызначаны час.

І вось такім чынам аформляўся патроху новы чалавек Іван Мацьвеевіч—мастацкі твор Антона Сяргеевіча.

Хоць вельмі рэдка, але здаралася, калі ён сядзеў задумёны адзін у пакоі, да яго наведваўся стары знаёмы.

«Той» меў, прыблізна, такі выгляд: худы, стройны, з палкімі чорнымі вачыма, з чорнай сэміцкай бародкай. «Той» заглядаў Івану Мацьвеевічу ў вочы з вялікай скаргай і нема маўчаў. Але ў таемнай маўклівасьці госьця Іван Мацьвеевіч чытаў:

— Каін, дзе твой брат Абэль?

Тады з глыбіні істоты падымалася жудасьць, расла, як вільготны туман над балотам у цёплы дзень.

— Вось ён... вось ён...—шэпчуцца знаёмыя.

Так яму здавалася.

Калі ў такія хвіліны да яго хто-колечы раптоўна заходзіў, ён уздрыгваў усім целам і чакаў нечаканай катастрофы.

— Што? Як?

— Ну, і нэрвовы-ж вы чалавек, Іван Мацьвеевіч!

Яго вочы былі яшчэ затуманены няпрыемным нутраным відовішчам. Ён выціраў іх беленькай хустачкай і, убачыўшы, што гэта сябар, з цяперашніх знаёмых, спакойна казаў:

— А, гэта вы, просіма, калі ласка!

— Я чуў, што ў вас, Іван Мацьвеевіч, новы запас анэкдотаў.

І анэкдотамі ён заглушаў таемнае запытаньне:

— Каін, дзе твой брат Абэль?

III

Праз шчыліны пуні прабіваліся залатым дротам праменьні сонца. Агроном прачнуўся на сене, ўскочыў, дастаў з чамадана ручнік, мыла і вышаў.

Цёплая, летняя раніца.

Ад учарашняга пахмурнага дажджлівага надвор'я і знаку няма. Неба чыстае—без адзінай хмаркі, нібы з сіняватага празрыстага шоўку. На розныя лады зьвіняць птушкі. Шостая гадзіна.

... Заспаў я. Далёка яшчэ, пакуль дабяруся да Крушынскага, гадзіны 3—4 язды. Прыдзецца доўга галадаць, бо чамадан пусты.

Каляровы, бліскучы матылёк шчакатаў яму лоб. Заспаны агроном хацеў яго злавіць, але матылёк высьлізгнуў спаміж яго пухкіх пальцаў і замільгаў высока над яго галавою.

Усё вакол выглядала ня так, як учора вечарам.

Сялянскія хаткі былі прыветны, прытульны. На блізкай лагчыне яшчэ клубіўся туман. Пахла сьвежай травою і сялянскім дваром. Спэцыфічны пах біў у ноздры агронома. Ён моршчыўся і праклінаў у душы «мужыцкую цемнату». Загадаў фурману запрэгчы каня і падышоў да студні мыцца.

Гаспадыня прынесла драўлянае вядро, абросшае ўнутры цьвільлю. Нават вядро пахла «тым самым», што так дразьніла чулыя ноздры агронома.

Мыўся хутка, фыркаўся, цёр са злосьцю далонямі гладкі твар. Быў нездаволены:

... Без сьняданьня паеду.

Фурман запрог каня.

Агроном накінуў на плечы паліто, забраў портфэль і чамадан, на хаду разьвітаўся з гаспадыняй (стары ўжо працаваў на полі) і сеў у каламажку.

Рыпнулі калёсы па вуліцы маленькай вёскі. Пара сабак хрыпла брахнулі і адрывіста змоўклі.

Фурманка апынулася сярод поля і лесу.

Якраз такую летнюю раніцу Іван Мацьвеевіч бачыў шмат гадоў таму назад зусім у іншым месцы.

Тыя самыя старыя бярозы віселі зялёнымі галінамі над вузкай лясной дарогаю, як русальная дзівосная арка. Той самы вільготны пах, зьмешаны з водырам траў, шчакатаў нос і горла. Тое самае чыліканьне нявідочных птушак у лясной гушчэчы. Тая самая паласа неба над галавою. Падобна ўсё—да драбнейшых рысак пэйзажу. Нават і цені па дарозе на тлустай сакавітай траве. Нават кветкі-дмухаўкі пульхнымі белымі галоўкамі растуць на гасьцінцы між калюгамі, і дзікая канюшына пахне мёдам. Тыя самыя «сабачыя грыбы» тырчаць бледна-жоўтыя на кволых высокіх сьцяблох.

Як цяпер—і тады тарахцелі калёсы па карчох на лясной дарозе, кідалася і стагнала драўляная каламажка па жылістых бурых карэньнях сьпілаваных дрэў.

І тут на некаторых пнёх, якія стаяць каля самай дарогі, сьцёрта паласа кары да самага белага мяса. Дубовая вось трэцца аб гэтыя незагоеныя раны дрэва, вырывае адтуль ледзь прыкметны сьвежы пах, зьмешаны з пахам калёснай мазі.

Тая далёкая раніца стаяла цяпер жыва перад яго вачыма, уваскрасіла настроі і пачуцьці маладога тады студэнта Антона Сяргеевіча. Ён гасьціў у таварыша на дачы.

Аграфена Макараўна, сястра таварыша (якая потым вышла за яго замуж), называла яго Аньцікам, гладзіла пальчыкамі яго чорную чупрыну, жартаўліва шчыпала яго за маленькую чорную студэнцкую бародку.

Чуласьці дзяўчыны былі яму прыкры. Ён стараўся не аставацца адзін на адзін з гэтай тонкаю, як сьцябло маладога жытняга коласа, дзяўчынаю.

... А пасьля...

Івану Мацьвеевічу было цяжка, балюча ад гэтых успамінаў моладасьці Антона Сяргеевіча.

Ён ехаў з ёю да чыгуначнай станцыі за пяць вёрст ад дачы. Такая была дарога, як цяпер...

Яму тады было прыемна ад трасяніны каламажкі па лясных карчох і карэньнях, бо Аграфена Макараўна моцна трымалася за яго левай рукою. Агонь пранізваў яго цела. Ён хваляваўся, хацеў адціснуць яе ад сябе. Аграфена Макараўна ўсю дарогу да станцыі жартавала, сьмяялася, называла яго «соцыялістым». Вочы яе вабілі сінім бяздоньнем.

Іван Мацьвеевіч уздрыгануўся.

— Ці хутка мінем гэты лес?—трывожна запытаўся ён у фурмана.

— Яшчэ вярсты тры з гакам.

Каб затушаваць успаміны, Іван Мацьвеевіч уставіўся вачыма ў шырокую сьпіну фурмана. Глядзеў на яго шэрую сьвітку з самадзялковага цьвёрдага сукна і сачыў за «божай кароўкай», якая поўзала марудна па сьвітцы, нібы па нейкай шэрай пустэчы.

Сонца расло ўгару.

Цені на дарозе вузелі, зьнікалі. Бліскучыя кроплі расы на траве высыхалі.

Іван Мацьвеевіч пачаў адчуваць голад. Шчыра гэтаму абрадваўся: адчуваньне голаду прагоніць няпрошаныя ўспаміны юнацкіх гадоў.

Як мінулі лес і выехалі ў поле, яму зусім весела стала.

Дарога была гладкая. Не трасло.

Мітусіўся ледзь прыкметны ружовы пылок. Моцна пахла канюшынай. Сонца сьляпіла вочы. У небе зьвінелі жаўранкі. Ваколічная радасьць летняга дня запаланіла настроі агронома.

Ён зьняў паліто і палажыў на калені.

— А каб учора ня было дажджу, дык тут пылу, пылу, проста дзецца няма дзе!—выказаў фурман у голас сваю думку.

— Так, так...

Фурманка ехала сьпешна на хутар Крушынскага, пад назваю «Кurганішча».

Хутар знаходзіцца на баку ад шырокага з Кацярынінскімі бярозавымі прысадамі гасьцінцу за дзьве вярсты ад Драздоў і Дзятлаў.

Іван Мацьвеевіч задумаўся аб Драздох і Дзятлах, якіх ён добра ведаў з гутарак Язэпа Крушынскага.

Дразды і Дзятлы ня птушкі, а людзі пад прозьвішчамі Драздовічы і Дзятловічы. Там ні то адна вёска, ні то дзьве.

Паводле паданьняў сівых дзядоў, калісьці прыехалі туды ў непраходны векавы лес два чалавекі—адзін Драздовіч, другі Дзятловіч. Яны пабудавалі ў лесе хаты і давай вакол выкарчоўваць месца пад пахату.

Ішло пакаленьне за пакаленьнем. Не агледзеліся ўнукі і праўнукі, як памёрлі іхныя дзяды, першыя насельнікі глухой лясістай мясцовасьці, як лес расчысьціўся і даў прастор на цэлую вёску. Людзі перамаглі гэты лес, і ад яго гнілых карчоў нават знаку не засталося: над мурожнымі сенажацямі сьпявалі птушкі, гучэлі русальныя песьні дзяўчат. На пахаці лаяліся між сабою мужыкі. На некаторых выкарчаваных мясцох пачынаў расьці новы лес—ельнічак-маладняк.

Адну палову вёскі займалі Драздовічы, а другую—Дзятловічы. А звалі і людзей, і вёску проста: «Дразды і Дзятлы».

Гэта было, як кажуць старыя дзяды, яшчэ пры паншчыне. Драздовічы і Дзятловічы ў аднаго пана (яго ўнук, пан Семашкевіч, цяпер жыве ў Варшаве) адбывалі прыгон.

А калі, яшчэ ў тыя старасьвецкія часы, вёску трэба было запісаць у воласьці толькі аднэй назвай, дык вышлі вялікія спрэчкі.

— Няхай вёска завецца Драздоўшчына!—казалі Дразды.

— Няхай вёска завецца Дзятлоўшчына!—казалі Дзятлы.

Пісар на гэта ня даўся:

— Трэба, каб абодва прозьвішчы былі склеены ў адно слова. Гэта штука сур'ёзная і мудроная. Што напішаш пяром, ня вырубіш тапаром!

Думалі абодва плямёны, Дразды і Дзятлы, і дадумаліся:

— Няхай вёска завецца Дроздадзятлаўшчынай! — казалі Дразды.

— Няхай вёска завецца Дзятладроздаўшчынай! — казалі Дзятлы.

На бяду Дразды і Дзятлы былі вельмі ўпартыя людзі. Кожны стаяў на сваім.

Справа пачынала высьвятляцца пры кулачнай бойцы.

На шчасьце, знайшоўся паратунак ад бяды.

Пісар, накінуўшы на іх гэту бяду, прыдумаў і паратунак.

Справа ў тым, што хаты Драздоў і Дзятлаў былі аддзелены між сабою прыроднай мяжою—бурлівай рэчкаю бяз назвы.

— Дык няхай,—казаў пісар,—па адным баку рэчкі завецца «Дразды», а па другім—«Дзятлы».

Выйграў ад гэтай Салімонавай мудрасьці і пісар, бо піў гарэлкі ўдвойчы—ад Драздоў і ад Дзятлоў—і меў іншыя пачастункі ўдвойчы.

А двое плямён, нібы гусакі, пазіралі адны на адных — Дразды на Дзятлаў, а Дзятлы на Драздоў. Гэты афіцыйны падзел іхнай мясцовасьці на валасной паперы пісарскім пяром іх яшчэ болей разрозьніў. Гэткім чынам, яны жылі сабе пасобку шмат гадоў. Між сабою ніколі не радніліся, вечарынак разам ня ладзілі, а толькі служылі па ўсёй ваколіцы жывым календаром:

— Пятроўка, дзякаваць богу!—гаварылі людзі,—Дразды з Дзятламі на кірмашы пабіліся.

— Пара жыта жаць! Дразьдзіхі і Дзятліхі сярпамі парэзаліся!

У валасьці на сходах яны таксама шыпелі адны на адных:

— Драздухі!—дразьніліся Дзятлы.

— Дзятлухі!—адгукаліся Дразды.

З аднаго канца вёскі быў выган Драздоў, з другога канца— Дзятлаў. Скаціну яны ня пасьвілі разам: мелі двух пастухоў.

Асаблівасьць іх плямённых адзнак можна было прыкмячаць і па іхным выглядзе. Дзятлы ў большасьці былі высокія,

ценькія цёмна-валосыя і каравокія, а Дразды—нявысокія, плячыстыя, русавалосыя і сінявокія. Але, ня гледзячы на гэтую надворную розьніцу, яны былі вельмі падобны адны на адных у складзе жыцьця, у пачуцьцях няпрыхільнасьці між сабою.

У кожнага з гэтых плямён быў свой правадыр, які лічыўся нават судзьдзёю ў воласьці.

— Нашыя разумнікі!—гардзіліся Дразды і Дзятлы пакрасаю сваіх вёсак—роданачальнікамі.

Дразды мелі свайго Пранука. Клічка яго была Галава, бо ён быў кароценькі, тоўсьценькі і насіў заўсёды, і ўлетку, і ўзімку, вялікую шапку-«сібірку» з кудлатай авечкі. Ён быў агульным бацькам Драздоў. Трэба было купіць на кірмашы каня, карову, парсюка, дык не абыходзілася без Галавы. А калі ён што-колечы казаў, дык ужо было аман: ніхто супроць яго не адважваўся і пікнуць. Меў ён ад сваіх Драздоў вялікую павагу і ня меншую выпіўку: то хрэсьбіны, то хаўтуры, тут ён кумам, там—сватам, а ўсюды—свой ды яшчэ самы першы з сваіх.

— Каму па каму, а мне два камы!—гаварыў ён часта, седзячы на прызьбе суседа, плюючы ў бок.

Дзятлы мелі свайго Сымона. Яго клічка—Сухарукі. Левую руку яму адціснула калода ў лесе. У Дзятлаў граў ён тую самую ролю, што Галава ў Драздоў. Ён быў доўгі, як жэрдка, і худы. Меў і ён сваю пастаянную прыказку: «Альбо рыбка, альбо піпка».

Сухарукі розьніўся ад Галавы тым, што гарэлкі зусім не каштаваў, за што Дзятлы, не бяручы пад увагу і яго мудрасьць, лічылі яго яшчэ большым калекай, чым за пакалечаную руку...

Дзіўна было тое, што Галава з Сухарукім, якім трэба было быць найгоршымі ворагамі, былі, наадварот, найлепшымі прыяцелямі.

Вясковыя іх не маглі зразумець.

— Чорт злучыў нашага Галаву з гэным Дзятлішчам!—бурчэлі Дразды.

— Нехрысьць ажаніў нашага Сухарукага з тым Дразьдзюком!—скардзіліся Дзятлы.

Але ні першыя, ні другія не маглі іх разлучыць.

— Пішы «прапала»,—казалі Дразды.

— Вышэй пупа не падскочыш!—гаварылі Дзятлы.

Абодва плямёны паставілі крыжык на гэтай справе. Іхныя роданачальнікі заставаліся шчырымі прыяцелямі.

Галава і Сухарукі мелі шмат супольнага ў сваіх характарах: абодва палохаліся пісаных паперак і бліскучых гузікаў.

— Чаго ў іх няма (і ў паперках, і ў гузіках)—падаткі, нядоімкі, праўка дарог і мастоў, рэкрутчына, суды і яшчэ гібель такіх прысмакаў.

Так роданачальнікі Драздоў і Дзятлоў часта характарызавалі паперкі і гузікі.

Роўныя былі абодва роданачальнікі і па сваёй адукацыі: на страшных паперках падпісваліся крыжыкамі. Таксама абодва сыпалі прыказкамі, нібы гарохам, і вельмі любілі на начлегах баяць байкі.

Начлегі заўсёды пачыналіся пасьля касьбы на балоце. У цёплую летнюю ноч звычайна блішчэлі на лузе два вогнішчы. На адным беразе рэчкі (яна прарэзвала як вёску, таксама і вялізны балотны луг) начавалі Дразды, на другім—Дзятлы. Пры вогнішчах начлежнікі сьпявалі песьні. У песьнях на баку Дзятлаў выкпіваліся Дразды, на баку Драздоў высьмейваліся Дзятлы.

Але як толькі Галава або Сухарукі пачыналі казку, рабілася ціха. Хрыплая «тальянка» спыняла свае мізэрныя тоны, змаўкалі працяглыя сьпевы дзяўчат.

У слухачоў пры вогнішчах цямнелі вочы. Пры спынках баечнікаў чуваць было, як прагавітыя коні тупалі па мокрай лагчыне путанымі нагамі, як шчыпалі траву.

Часам ветрык дзьмухаў па вогнішчах, мігцелі галавешкі цэлымі снапамі іскраў, палалі смалістыя карчы, шыпелі, як жывыя. Полымя расьцілалася па баках чырвонымі абрусамі і асьвячала на момант доўгую паласу сумнага скошанага лугу, волава рэчкі, густыя лазьнякі і калматыя вольхі.

Доўга пасьля казак начлежнікі не маглі спаць пад цёплымі кажухамі. Доўга пазіралі на паўночнае сіта зорак у небе...

Вызначаліся Дразды і Дзятлы мянушкамі, якія давалі адны адным: Арцём Рабы, Міхась Кудлаты, Марыля Крывая, Зьмітро Дзярыгорла, Баўтрук Нюхайла.

Каляндарнае імя заўсёды вісела на калку, як лішняя хамуціна, а мянушка, дадзеная спрытным брахуном, ужывалася да самай доўбні. Кемнае слаўцо, надзетае на галаву чалавека, як

новая шапка, характарызавала яго вельмі трапна. Некаторыя з сялян так прывыклі да сваіх мянушак, што лічылі за абразу, калі хто іх называў хрышчоным імем.

Гэтыя плямёны ня былі між сабою сьмярцельнымі ворагамі. Няхай хто чужы закране на рынку Дзятла пры Драздох ці Дразда пры Дзятлах, дык вочы выдзеруць за суседа.

Недалёка ад іх жыла яшчэ адна асоба—Сымон Чарнюк, і тут суседзі мелі вечную прычапку за што сварыцца: Дразды казалі, што Сымон Чарнюк да іхнай вёскі належыць, а Дзятлы ўпіраліся, што да іхнай.

— Сымонка,—часам пыталіся Дразды:—скажы па чыстай праўдзе, чаго варты гэтыя дохлыя Дзятлугі? Шальмяцы, дый толькі!

— Да каго вы сябе раўнуеце? Вы іх за падпярэзіну падаткнеце!—гаварыў па «чыстай праўдзе» Сымон Чарнюк.

Радаваліся Дразды.

— Чарнючок,—казалі Дзятлы—ты-ж не абы-хто! Гукні нам па шчырым сумленьні, ці-ж не дарма жуюць хлеб на зямлі гэтыя паскуднікі—Дразьдзюкі? Гадзюкі яны, каб перадавіліся, дай, божанька!

— Яны вам раўня, як сьвіньня да каня!—сыпаў Сымон Чарнюк па «шчырым сумленьні».

Цешыліся Дзятлы.

Сымон Чарнюк меў здольнасьць задавольваць усіх.

Сымон Чарнюк жыў у маленькай хатцы ў ельнічку—у нэўтральным месцы між Драздамі і Дзятламі.

Узіму хатка Чарнюка была завалена вялікай гурбай сьнегу і яе бадай ня відаць было. Улетку яна аздаблялася ў зяленіва, як маладуха. Чаго-чаго толькі ня было на дзядзінцы: палын, мак, крапіва, мухаморы, маліньнік, сьвіныя яблычкі, а на страсе—на пагніўшых мялінах нейкім дзівам буяў рэдкі авёс.

Зваўся Сымон «Чарнюком» таму, што быў заўсёды запэцканы сажай. Відаць, ня мыўся з таго часу, калі бабулька маленечкага выкупала ў начоўках.

Яго праўдзівае прозьвішча было Крушынскі. Ён быў высокі, ценкі, з кручкаватым носам, з чорнымі, як вішні, вачыма, без барады і вусоў. Яму можна было даць і сорак, і шэсьцьдзесят год. Сваю абсмаленую бравэрку ён ніколі ня здымаў з плеч. На

яго раменнай каліце заўсёды вісеў сцызорык. Быў Крушынскі-Чарнюк бондарам і варажбітом. Любіў прарочыць благое:

Курыца запяяла—нядобрае нешта будзе.

Заяц дарогу перабег—няўдача.

Віхор круціцца ў полі—ліха надыходзіць.

Крушынскі-Чарнюк часта гаварыў пра гібель, голад і канец сьвету.

Сам ён сур'ёзна рыхтаваўся да «сканчэньня сьвету» і голаду: спаў у труне, якую змайстраваў сабе насьмерць. Хатка і сенцы былі ў яго завалены розным запасам: мукою, хлебнымі сухарамі, сушанай бульбай, сушанымі яблыкамі, гарохам, грыбамі і іншымі харчамі. Усё гэта было насыпана ў кублох, скрынках, цабэрках, начоўках, карытах, гаршкох, гладышох. Толькі каля печы быў пусты куток.

Гэтыя запасы, як Дразды і Дзятлы памятаюць, ён зьбіраў дзесяткамі гадоў.

— Запас бяды ня чыне,—казалі адны.

— На чорны дзень,—казалі другія.

У апошнія гады, калі ня лічыць калматага злога сабакі і галагуцкага пеўня, які быў каралём усіх курыц Драздоў і Дзятлаў, бяз розьніцы плямён, у Чарнюка ніякай сям'і ня было.

Жонка ў яго памерла маладою. Астаўся жвавы чорненькі сынок Язэпка. Малога забраў да сябе багаты дзядзька, які меў у Менску свой дом і вялікі рэсторан. Для васьмігадовага хлопчыка пачалося тады зусім новае жыцьцё. Спачатку горад яго вельмі напалохаў сваім выглядам і грукатам. Нават аднаго разу пехатою да бацькі ўцёк. Бацька завёз яго назад у горад, прыгразіў, што калі ўцячэ ад дзядзькі, дык кіне яго сабакам.

Язэпка прымірыўся. Пачаў звыкацца з новымі абставінамі жыцьця. Дзядзька аддаў яго ў школу вучыцца. Пры гэтым казаў:

— Падвучышся чытаць і пісаць, а пасьля ў рэсторане рахункаводам зраблю. Галоўным чынам, напірай на рухункі. Лічбы—гэта ўсё на сьвеце. Бяз лічбаў чалавек—не чалавек. З лічбамі, калі яны ў тваёй галаве будуць лётаць і гудзець, як камары, зажывеш, братку, па-панску.

Бадай кожны дзень дзядзька праводзіў перад ім філёзофію лічбаў. Часта экзаменаваў:

— Кажы, братку, калі ў маім рэсторане чалавек зьеў абед, які каштуе 40 капеек, а госьць даў 50 капеек, дык колькі трэба даць рэшты?

Язэпка маўчаў.

— Эх, братку, ты яшчэ зусім дурны.

Калі дзядзька праз некаторы час пытаў тое самае ў другі раз, Язэпка асьмялеў і адказаў толькі два словы:

— Ня ведаю.

Калі праз некаторы час гэтае самае гаварыў, Язэпка глядзеў на дзядзьку і ўсьміхаўся.

— Чаго?

— Кхі-кхі,—душыўся сьмехам Язэпка,—паабедаў чалавек, а плаціць павінен госьць. Няхай чалавек і плаціць.

— Чалавек і госьць—адно і тое самае. Той чалавек, хто прыходзіць у мой рэсторан паабедаць, ёсьць мой госьць.

— Калі ён дзядзькін госьць, дык зусім не павінен плаціць за абед.

— Не, братку, гэта там, у вас на вёсцы, госьці ня плацяць за яду. У горадзе ў рэсторане плацяць. У мяне, братку, двеякага роду госьці. Хто прыходзіць у мой рэсторан—плаціць за яду. А хто прыходзіць у мой дом, той ня плаціць.

— Такія госьці, што павінны плаціць,—скрытыкаваў Язэпка рэсторанных гасьцей,—зусім ня госьці, а чалавекі.

— Востры ты хлапчук!—пахваліў дзядзька Язэпку,—але ў горадзе па-далікатнаму абыходзяцца. У нас кожны чалавек, які заходзіць у рэсторан, называецца гасьцём.

— Дзякую за такую далікатнасьць і гасьцёвасьць,—зазлаваўся падзіцячаму Язэпка.

— Гэта ўсё лічбы, братку, лічбы!—сьмяяўся дзядзька.— Аднак, колькі трэба даць госьцю або чалавеку рэшты з 50 кап., калі ён зьеў на 40?

— Вядома, дзесяць!

— Во! З цябе будзе толк.

Дзядзька радаваўся і купіў за гэта Язэпку новую шапку.

Пасьля такіх рэчавых доказаў сваіх посьпехаў Язэпка шчыра налягаў на «лічбы». Ён яшчэ слаба ўмеў чытаць, а па «лічбавых справах» быў першым у клясе.

З дзяцьмі дзядзькі ён нічога супольнага ня меў. Яны вучыліся зусім у іншых школах. А ён вучыўся спэцыяльна для рэсторану.

Язэпка нават спаў асобна ў нейкай цёмнай каморцы, еў на кухні. Маючы трынаццаць гадоў, ужо быў пры рэсторане. У восемнаццаць—галоўным бухгальтарам у дзядзькавым рэсторане.

Дзядзька быў надзвычайна здаволены сваім спрытным пляменьнікам:

— Ты, братку, якраз у мяне ўдаўся!

Як надышла вайна, дзядзька прымасьціў пляменьніка дзесятнікам у дарожным атрадзе.

Язэп Крушынскі насіў дзесятніцкія срыбныя пагоны на плячах яшчэ пры Керанскім. Увесь час вайны гэты дарожны атрад будаваў масты і правіў дарогу якраз у ваколіцы Драздоў і Дзятлаў. Ён быў там сваім чалавекам. Яго землякі працавалі на дарозе, вазілі калоды з лесу, капалі падзённа зямлю і вельмі радаваліся:

— Свой начальнік! Сымонавага Чарнюка сын!

Пры першых бальшавікох Язэп Крушынскі (ужо бяз срыбных пагонаў) ажаніўся з дачкою лясьнічага, паннай Ганнаю, у маёнтку Курганішчы пана Семашкевіча, недалёка ад Драздоў і Дзятлаў.

Яго бацька, Сымон Чарнюк, нават на вясельлі ня быў. Ён жыў сваім ранейшым, адзінокім і дзівосным жыцьцём чалавека, які «ведаецца з нячыстай сілай».

Крушынскі багата пачаставаў на вясельлі Драздоў і Дзятлаў. Трое сутак яны гулялі на яго грошы і пасьля вясельля.

— Вы-ж мае бацькі! Я-ж на вашых руках выгадаваўся. З кім мне весяліцца, калі ня з вамі?

Крушынскі быў з імі за панібрата.

За ўвесь час завірухі розных окупацый, розных уладаў ён быў як-бы апякуном Драздоў і Дзятлаў, іхным адвакатам пры немцах, пры паляках.

Пры паляках ён адкупіў маёнтак Курганішча ў пана Семашкевіча за многа пачак новенькіх мікалаеўскіх пяцісотак—«кнак».

Пан Семашкевіч зараз-жа паехаў у Варшаву, а Крушынскі зрабіўся гаспадаром Курганішча.

Маёнтак, праўда, быў за часы вайны вельмі запушчаны і абяднелы. Жывёлы ў ім было мала. Лепшы лес пашоў на будаваньне мастоў. Курганішча мела выгляд не маёнтку, а фальварку.

Крушынскі быў і здаволены сваёй купляй, і нездаволены. Ён адчуваў, што быць цяпер гаспадаром вялікага абшару зямлі— тое самае, што быць гаспадаром ветру ў полі. Курганішча было і яго ўласнасьцю і не яго.

Яшчэ пры першых бальшавіках Драздьі і Дзятлы, якія разрасьліся ў вялікую вёску, адчувалі недахоп зямлі і лесу. Яшчэ тады векавечны пляменны падзел адышоў на задні плян, а на першы выступіў новы падзел—на багатых і бедных.

Гэта трывожыла Крушынскага.

Ён часта езьдзіў у Менск: «што там чуваць?»

Толькі ў гэты час ён зрадніўся з дзяцьмі апякуна-дзядзькі, які памёр пры немцах. Часта з імі гутарыў на тэму «Што чуваць?»

Стрыечныя браты, адзін доктар, а другі адвакат, таксама цікавіліся гэтым пытаньнем.

— Што газэты пішуць?—пытаўся ён у сваякоў.

— Мы ў газэты ня верым. Што ў вас там на вёсцы гавораць?

Аднаго разу пасьля такога «што чуваць» Крушынскі адважыўся на вельмі круты і арыгінальны ўчынак. Ён пашоў да Драздоў і Дзятлаў (да самых бедных і безьзямельных) і заявіў ім:

— Вы можаце ісьці ў мой лес і выбіраць пні на новыя хаты! Заворвайце маю зямлю, як сваю ўласную! Забярыце Курганішча, а мне пакіньце вакол будынкаў плошчу толькі ў 50—60 дзесяцін і кавалак лесу! Ведайце, што я стаю за савецкую ўладу! Палякаў выганім!

Сяляне паднялі Крушынскага на «ура». Пачалася праца: паехалі ў лес і на поле.

Пры дзяльбе зямлі Крушынскі стараўся ўраўняць усіх, каб ня было бяднейшых і багацейшых.

Учынак новага ўладара вялікага абшару зямлі хутка дайшоў да польскай улады. Сялянам забаранілі карыстацца зямлёй і лесам Курганішча. Некаторых добра адлупцавалі.

Да Крушынскага пашлі з вобыскам і арыштавалі як «бальшавіка». Двое паліцыянтаў павялі арыштаванага ў Менск.

Аднак па дарозе яму ўдалося ўцячы.

Некалькі месяцаў ён хаваўся ў лясох і часам уночы наведваўся да сваіх Драздоў і Дзятлаў, у якіх быў вялікім героем і сваім чалавекам.

Пры савецкай уладзе, пасьля ўцёкаў польскага войска, ён астаўся на лепшай зямлі Курганішча, і ад вялікай прыязьні Дразды і Дзятлы выбралі яго ў сельсавет, дзе ён быў сакратаром.

Бednякі забудаваліся на зямлі Курганішча. Вырасла тут некалькі хутароў.

Крушынскі, ніколі не працаваўшы па сельскай гаспадарцы, за адно лета налаўчыўся працаваць ня горш за суседзяў. Спачатку надзвычайна захапіўся гэтай працай. Але хоць у яго было некалькі работнікаў, ня мог здолець заворваць усю зямлю і зрабіў новы падзел зямлі сярод сялян—аддаў ім яшчэ з дзесятак дзесяцін. Ён пакінуў сабе самы лепшы кавалак, дзе завёў узорную культурную гаспадарку. Яго гаспадарка карысталася вялікімі ільготамі і розным падтрыманьнем мясцовай улады.

IV

Касьба ў Крушынскага была кожны раз сьвятам для Драздоў і Дзятлаў. Тут табе і смачная яда з выпіўкай, і добрая плата чым хочаш—збожжам, грашмі. Яны свае лужкі няскошанымі пакідалі, а з вялікай ахвотай ішлі з касамі і граблямі ў Курганішча. Праца заўсёды адбывалася пры паднятым настрoі: сьпявалі песьні, перакідваліся жартамі і адчувалі сябе не як на падзённай рабоце, а нібы ў гасьцёх. Пасілкавацца ім прыносіла на поле сама гаспадыня пры дапамозе дзяўчат-служак. Насілі ў спарышох, гладышох і кошыках. Тры разы елі на сенакосе: абед, полудзень і падвячорак, сьняданьне і вячэру—у хаце гаспадара.

За доўгімі шнурамі жыта, за шырачэзным полем канюшыны, у пярэмешку з палосамі аўсоў, цягнуўся мурожны луг далёка ўшыркі і ў даўжыню аж да самага альхоўніку ў лагчыне.

На гэты раз касіў і сам Крушынскі. Ён прыходзіў заўсёды на работу з мэтаю паказваць падзёньнікам добры прыклад у

працы. Гаспадар у расхрыстанай кашулі, бяз шапкі стаяў на гэты раз самым апошнім у лініі касцоў.

— Асьцярожна, ногі парэжу! Хутчэй! Хутчэй!—крычаў ён заліхвацкім голасам, наганяючы касца.

А касец жартаваў:

— Хлопцы! шыбчэй! а то гаспадар нам усім ногі парэжа. Ён лепш за ўсіх косіць!

Касцы пусьціліся на выперадкі. Праца пашла шпарка. Праз некалькі хвілін гаспадар спацеў, пачаў адставаць.

Раздаўся гучны рогат касцоў.

— Перадышка!—закамандаваў гаспадар.—Хлопцы, курыць! У мяне менскія папяросы!

Касцы абступілі яго цесным колцам.

Ён частаваў усіх «менскімі папяросамі». З яго пот цурком ліў. Касцы жартавалі.

— Гэта з няпрывычкі!—казаў касец гадоў трыццаці, сухарлявы, з зажмуранымі ад сонца вачыма.

Яго голас быў упэўнены, аўторытэтны. Ён славіўся як першы касец па ўсёй ваколіцы.

— Да касьбы трэба прылаўчацца змалку,—казаў ён тонам настаўніка.—Я добра касіў, калі быў яшчэ пятнаццацігадовым хлопцам. І бацька мой быў першым касцом у вёсцы, і дзед. Гэта лоўкасьць вялікая—касіць гладка, хутка, ды каб яшчэ не змарыцца! О-го! Дайце мне яшчэ двух касцоў, як я, дык мы ўвесь луг за два дні скосім!

— Ну, ты не мані! Лопнеш хіба, а ня скосіш!—пакрыўдзіўся адзін пажылы селянін, нізенькі, шырокаплечы, з калматай рыжай бародкай.

— А-я-яй! Так і скосіш за два дні!—падхапілі ўсе.

Загаварыў касецкі гонар і ў іх.

Першы касец кпліва звузіў вочы на грамаду касцоў і зноў сказаў спакойным тонам:

— Я касою граю, як пісар пяром усёроўна. Мне толькі добрая каса патрэбна! Ужо некалькі год як зьбіўся з добрай касы—укралі. Каб вы ведалі, што гэта была за каса! Каб вы ведалі!

Касец зірнуў на альхоўнік насупроць сонца, потым адвярнуўся і расшырыў вочы. У іх адбіваўся шчыры сум і ўглыбленьне ў думках ад гэтага няпрыемнага ўспаміну.

— Што гэта была за каса...—паўтарыў ён аслаблёным голасам,—што за каса...

Голас яго перайшоў у шэпт, у жальбу.

— Яна, бывала, проста маслам мажа па траве. Яе і ня чуваць, як косіць.

— Годзе табе маніць!—артачыўся той-жа селянін з рыжай бародкай.

Касец, не зьвярнуўшы на гэта ўвагі, гаварыў далей тым-жа жалабным тонам:

— Яна (каса), бывала, рэжа траву ціха-ціха. Вось як муха праляціць. Табе здаецца, што ня косіш, а так сабе—забаўляешся. Яе бадай і вастрыць ніколі ня прыходзілася. Чым больш косіш, тым больш вострай робіцца яна.

Касец гаварыў аб «ёй», як аб нейкай мары, як аб недасьціглым ідэале.

— Яна, бывала, у чужых руках ані не касіла, ну, як трэска ўсёроўна. Шморг, шморг, а яна хоць-бы што. Не бярэ дый годзе!

— Маніш!—крыкнулі з грамады.

Тут касец павесялеў і загаварыў зноў аўторытэтным тонам:

— Каса, як той конь. Мае свае норавы. Трэба яе добра ведаць. Трэба прылаўчацца да яе, трэба ўмець абыходзіцца з ёю. А то ў дзесяты пот яна цябе загоніць. Аднаго разу, пасьля вечарынкі, я позна спаў. Раптам нехта штурх мяне ў бок. «Уставай!»—крычыць бацька,—«схадзі на луг, пакасі трохі!» А мне спаць да зарэзу хочацца. «Зараз, кажу, пайду!» і зноў сплю. Бацька сьцягнуў мяне з ложка. Я зазлаваўся, схапіў касу (тую самую, што ўкралі) ды на луг. Да абеду скасіў увесь луг. Прыходжу дахаты. «Тата, кажу, гатова!» «Што гатова?» пытаецца ён. «Луг, кажу, скасіў!» А луг гэты на добрых трох касцоў, а то і чатыры павінны касіць ад цямна да цямна. «Што ты, апундырыўся?!»—зьдзівіўся бацька.—«Ня можа быць!» Бацька пабег на луг—пракосы ляжаць сьвяжуткія, роўненькія, скасіў так, што проста выгаліў. «Ну, і чэрці ў тваіх руках!»—пахваліў бацька. «Ня чэрці, а каса добрая!»—кажу я. Ніколі яе не забуду, гэтай касы! Укралі, зладзеі.

Касец зноў стаў сумны і задумёны.

— Маніш!—крыкнуў рыжабароды.

Касец не зьвярнуў увагі. Маўчаў.

— Яно-то праўда,—згадзіўся, нарэшце, рыжабароды,—касу трэба ўмець шанаваць. Але болей усяго трэба ўмець выбіраць касу.

Уся ўвага была цяпер зьвернута на рыжабародага.

Ён паглядзіў паважна бараду і пачаў апавядаць:

— Гэта было ўжо даўно. Некалькі гадоў мне ўсё не шанцавала на косы. Што ні купіш—дрэнь!—Ламака, а не каса! Пасьля касьбы плечы баляць: то яна тупая, гэтая каса, то цяжкая нейкая! Вось ніяк ня мог узьбіцца на добрую касу. Неяк зімой аб гэтым забудзеш, а як надыходзіць вясна, дык нешта ў сярэдзіне цябе ўжо сасе. А як ужо тыдні два да Пятроўкі, дык галава—хадыром! Бяда мне з касою. Хоць ты ваўком завый. Зазлаваўся я і пашоў пехатой (кабыла ў той дзень ажарабілася) у Радашковічы да Бэркі. Трасца тваёй мацеры!—кажу яму:— хоць лопнеш, хоць здырдзішся, а дасі мне добрую касу, бо жыцьця няма. Хоць ты галавою ў пятлю лезь! Таргавацца з табою ня буду, дам на дзесяць, ну на пятнаццаць капеек даражэй. «Рэхт!» сказаў Бэрка: «дам табе касу. Доўга будзеш Бэрку помніць. Рэхт!» Выкінуў ён мне цэлы жмут кос і давай сам выбіраць. Дык ліха яго ведае, гэтага Бэрку! На глянц глядзеў, дзьмухаў, выбіраў, пробваў на звон. Урэшце, выбраў адну. Кажа: «На!» Я—туды, я—сюды. Хачу сам пробваць. «Ня трэба пробваць», кажа Бэрка, а вазьмі! Хочаш—плаці, хочаш—не плаці! Ты на Бэрку,—кажа Бэрка,—кепскага слова ня скажаш!»

Селянін трохі спыніўся. Зацмокаў губамі, нібы толькі-што нешта смачнае зьеў.

— Браткі мае! Што гэта была за каса! Да магілы памятаць буду! Ну, каб мне далі за яе пяць рублёў, ну дзесяць, яй-права, не аддаў-бы. А думаеце ахвотнікаў ня было? О-го-го! Гэта была не каса, а чорт ведае што! Праўда, яна любіла нейкія спэцыяльныя мянташкі. Бэрка заўсёды дастаўляў. Касіла яна ў мяне нешта гадоў дзесяць. Аж пакуль зрабілася вузенькай, ну, як сярпок. А ўсёроўна—бярэ і бярэ! Вось люба ёй рэзаць гэстую траву. Косіш, а нават ня думаеш, што нейкую работу робіш. Аднаго разу касіў так, задумаўся, пачаў вачыма, як той кажа, мух лавіць, ажна раптам дзынк! Рассыпалася каса на тры кавалкі... На камень трапіла. У мяне тады, паверыце, у сэрцы нешта дзынкнула ад болю. Тады, трасца яго мацеры, як

зазлуюся я на гэты камень, як бэнцну яго босай нагою, так бэнцнуў, ажна ў мяне ў вачох пацямнела. Пасьля гэтага цэлы тыдзень кульгаў. Сабраў я кавалачкі касы і панёс дахаты. Вось Яўхім тут, ня дасьць зманіць. Ён яшчэ цяпер голіцца абломкам тэй самай касы.

Яўхім пагладзіў свой твар і сказаў:

— Скрабуся, як бачыш, дачушкай тваёй дзесяцігадовай касы!

Рыжабароды ўздыхнуў ад усяго сэрца:

— З таго часу не магу ўзьбіцца на людзкую касу!

Тут умяшаўся Яўхім:

— Вось мне дык сапраўды ніколі на косы не шанцавала, ажна пакуль не дайшоў да розуму: пазычыў касу ў чалавека, якому шанцавала. Касіў я гэтай пазычанай касою нешта гады тры. Потым (каб таго воўк зарэзаў) нехта ўкраў у мяне гэту касу.

— Ну?!—усхапіўся адзін з касцоў спачуваючым голасам,— і ў цябе ўкралі?

— Вось табе і «ну», вось табе і «тпру»! і ў мяне ўкралі,— паўтарыў Яўхім і хітра ўсьміхнуўся.

— Але, як-жа-ж ты,—запытаўся першы,—касіў пазычанай касою аж тры леты.

— Рукамі касіў. Бач, пазычыў тады, калі гаспадар ня бачыў.

— Вось як!—усхапіўся першы.—Ці ня ты гэта ў мяне ўкраў?

— Што?!

— То!

— Дразьдзюк!

— Дзятлюк!

У адзін міг Драздцы і Дзятлы падзяліліся на два фронты і хацелі прадэманстраваць тут-жа на сенажаці сваю традыцыйную кулачную бойку.

Крушынскі іх ледзь супакоіў, паабяцаўшы чуць не для ўсіх Драздоў і Дзятлаў купіць новыя косы.

Баляда аб косах скончылася мірна. Касцы зноў узяліся за працу. Сонца пякло патыліцы. Скошаная трава выдавала хмельны пах.

Крушынскі хутка пабег на гумно. Яму трэба было ўсюды пасьпяваць: і на сенажаці, і на полі, і на гумне, і ў хаце.

Сягоньня ў яго быў сапсуты настрой. Ён пачаў успамінаць, што гэтаму паслужыла прычынай.

Ага! Учора з бацькам родным, з Чарнюком, пасварыўся.

Колькі разоў ён гаварыў бацьку, каб кінуў сваю закураную хатку, каб яму, сыну, сораму не рабіў варажбою, каб перабраўся ў Курганішча. Упарты стары. Ня хоча і думаць аб гэтым. Бацька напрарочыў яму такога ліха, аж страх.

Ад таго самага часу, калі ён яшчэ малым хлопчыкам застаўся жыць у багатага дзядзькі ў Менску, дык бадай парваў усялякія зносіны з бацькам. Праўда, спачатку засумаваў у Менску і пехатой уцёк да хаты. Але яго пацягнула тады не да бацькі, а да месца, дзе была матка, дзе ён жыў у дзівосных абставінах бацькавых запасаў на «чорны дзень».

Маці—ціхая, напалоханая кабета—вельмі песьціла Язэпку. Ціхачом ад бацькі брала з патаемных кублаў сушаныя яблыкі для сынка. Язэпку тады здавалася, што смачнейшых рэчаў на сьвеце няма. Смак гэтых сушаных яблык, назапашаных бацькам к дню «скончэньня сьвету», ён яшчэ і цяпер памятае. Увесь час у Менску ў рэсторане дзядзькі, дзе было многа гарадзкіх смачных цястак, цукерак, крымскай і загранічнай садавіны, Язэп памятаў сушаныя яблыкі. І цяпер іх любіць. Жонка спэцыяльна для яго сушыць.

Паводзіны сына ня вельмі падабаюцца Сымону Чарнюку. Па-ягоным, сын павінен быў рабіць запасы на «чорны дзень», а то ніякага толку няма.

Успомніўшы сварку з бацькам, Крушынскі трохі паморшчыўся.

... Нічым бацьку задабрыць нельга: ня хоча стары пакідаць сваіх «запасаў». У Курганішчы жыць ніколі ня згодзіцца.

Ён пусьціўся бягом у гумно.

... Гэтымі днямі прыдзецца быць у Менску. Куплю для Драздоў і Дзятлаў паабяцаныя косы.

Ужо другі год як у яго працуе воўначоска. Зімой стаіць у маленькай хатцы побач з лазьняй, а летам яна прымайстравана да малатарні. Паглядзеў, як ідзе праца. На гумне стаяла некалькі фурманак з воўнай. Каля вазоў тупаліся бабы. Воўначоска гудзела монотонным прыдушаным гудам. Гэты шум быў для яго вуха прыемнай музыкай. Крушынскі любіў «фабрыку». У яго галаве ўвесь час, нібы пчолы, роіліся мары аб «фабрыках».

Ён марыў аб тым, каб пабудаваць у Курганішчы паравы млын разам з невялічкім тартаком.

Ён ускочыў у будыніну паглядзець, як працуе машына, і нарабіў крыку на баб:

— Чаму вы мне не казалі? Машыну трэба пачысьціць! Стойце!

Спынілі працу. Ён сам узяўся за чыстку машыны спэцыяльнымі шчоткамі. Кончыўшы з гэтым, пашоў у другі будынак, дзе поўным ходам працавала другая «машына». Яе мэталёвы рытмічны стукат яшчэ здалёку чуваць было. Тут працаваў ужо другі дзень местачковы кравец Мотка. Хаця ён жыў у мястэчку, але быў сялянскім краўцом. Хадзіў ад вёскі да вёскі з машынай за плячыма і з вялікімі ножніцамі ў руках. Тоўстым драўляным самадзялковым аршынам Мотка вельмі спрытна бараніўся ад сабак.

Цяпер Мотка спыніўся на некалькі дзён у Крушынскага, дзе шыў вопратку для аднаго з рабочых Курганішча.

Яшчэ месяцы два таму назад сам Крушынскі езьдзіў у сваты з сваім рабочым да аднэй дзяўчыны. Трэба было яшчэ да жніва наладзіць вясельле.

Крушынскі апекаваўся над сваімі рабочымі. Сам прымаў удзел у наладжваньні іхнага сямейнага дабрабыту.

— Чаму, Мотка, у пакоях не працуеш?—запытаўся Крушынскі.

— Там сьпякота вялікая.

— Працуй тут!—даў яму Крушынскі спозьнены дазвол і прылёг у цяньку на кулёх леташняй саломы.

Мотка шыў для рабочага шлюбны гарнітур—фрэнч і «філігей» (галіфэ).

Рыгор (жаніх) часта заходзіў да яго на прымерку і на «вайну».

Ён вёў з старым краўцом бязьлітасную вайну за кішэні. Яму вельмі хацелася, каб у «хрэнчы» былі кішэні. Мотка артачыўся і ўсялякімі стратэгічнымі спосабамі адгаварваў Рыгора ад кішэнь—ад гэтага «гарадзкога баламуцтва».

Мотка ўжо дваццаць пяць гадоў краўцом. Славіцца па ўсёй ваколіцы, як добры майстар. Але ў яго профэсіі ёсьць адна маленькая трагедыя—ніяк не налаўчыўся рабіць кішэнь. Гэтая мудроная штука па сягонешні дзень засталася па-за межамі

яго мастацкасьці. Дзеля гэтага ў Моткі з кожным годам расьце і павялічваецца шчырая ненавісьць да кішэнь. Ён іх крытыкуе рознымі спосабамі, з надзвычайнай злосьцю.

— Ну, на якое ліха табе патрэбны кішэні?—пытаецца Мотка ў Рыгора.

— Як на якое ліха? Усе цяпер носяць кішэні. Так палагаецца!

— Што? Па закону палагаецца?

Мотка ўваходзіць у злосьць і пачынае даводзіць Рыгору непатрэбнасьць гэтых абрыдлых, паганых, чуць не контррэвалюцыйных кішэнь.

— Скажы мне, Рыгорка, такую штуку! Ну, новошта табе гэтыя кішэні даліся? Навошта? Ідзеш працаваць на поле— бярэш торбачку! Едзеш на кірмаш—бярэш торбачку з харчамі! Навошта табе кішэні?

З застыглым запытаньнем у вачох Мотка глядзіць на зьбітага з панталыку Рыгора.

— Новошта табе кішені?

І Мотка дае адказ на сваё запытаньне:

— Хіба красьці думаеш і крадзенае ў кішэні хаваць?..

— Я—ня злодзей. Ховай, божа, я—ня злодзей.

Голас Рыгора сарамлівы.

Мотка ўсьміхаецца ў сваю рэдзенькую казьліную бародку. Ён перамог сваімі довадамі.

Пад рытмічны стукат краўцовай машыны Крушынскі заснуў на пругкай саломе. Але не пасьпеў праспаць і пяці хвілін, як прыбегла яго маленькая дачушка і давай тармашыць абедзьвюма ручкамі.

— Татка! Татка! уставай!!

Крушынскі ўскочыў.

— Што, Настачка, трэба?

— Агроном прыехаў. Пытаецца, дзе татка.

— Аг-ро-но-о-ом! Вось як!

Сьпешнымі крокамі ён пашоў дахаты.

За ім пабегла, падскокваючы на аднэй назе, маленькая дзяўчынка.

V

Агроном тут бываў часта.

У яго зрокавай памяці, з кожным новым прыездам у Курганішча, і вонкавы, і нутраны выгляд панскага дому адлюстроўваўся ўсё ярчэй і ярчэй. Усе драбніцы і ледзь прыкметныя асаблівасьці дому жыва маляваліся перад яго вачыма.

Іван Мацьвеевіч, каб затушоўваць сваё ранейшае жыцьцё (пэрыоду бытаваньня Антона Сяргеевіча), стараўся набірацца новых думак і ўражаньняў. Такім мэтодам ён выкрэсьліваў з сваёй памяці ўсё старое. З гэтай мэтай ён углыблёна ўзіраўся ва ўсё вакольнае, уважна і пільна прыслухоўваўся да гутарак людзей. Навастрыў свае пачуцьці да таго, што яны былі падобны да надзвычайных шаляў, якія ўмелі паказваць розьніцу вагі паміж двума валаскамі.

Вонкавы выгляд дому яшчэ і цяпер навяваў лірызм старасьветчыны. Высокі дах з двума белымі комінамі, гладка абцёсаныя сьцены з «нямецкімі вугламі», вялікія вокны, ганак з дубовымі габляванымі слупамі-колюмнамі гаварылі аб старадаўным комфорце зьбяднелага пана або ўзбагацелага шляхціца.

Дом высіўся горда на пагорку ў цэнтры абшарнага дзядзінцу. Сасновыя сьцены, ня гледзячы на пяцідзесяцігадовы век, былі яшчэ моцныя. У шчылінках крышылася, нібы сухі воск, сасновая смала, якая не выдавала паху ўжо некалькі дзесяткаў год. У некаторых вокнах яшчэ цэлы былі старыя шыбы. Калісьці празрыстае шкло цяпер зацягнула тоненькай рознакаляровай плеўкай. Такія колеры можна часта бачыць на стаячай вадзе балотных рудавак. Ганкам дом пільна ўзіраўся ў службовыя будынкі, якія ў форме падковы стаялі на краі дзядзінцу ў застыглым драўляным сутулым паклоне. З другога боку дом быў затулены старым запушчаным садам.

Душа панскага дому болей усяго адчувалася ўнутры—у пакоях.

«Салён» для гасьцей быў у тым выглядзе, як пакінуў яго колькі год таму назад пан Семашкевіч, і, мабыць, не зьмяніўся зусім у працягу апошніх хоць-бы дзесяці год да выезду пана.

На сьценах віселі шматкамі старыя шпалеры з выцьвілымі кветкамі. У куце стаяў у высокай, ад падлогі да столі, ясянёвай шафе стары гадзіньнік. Шафа напамінала сабою вежу ў мінья-

туры, мела багатую разьбу зьмешаных стыляў. Цыфэрблят гадзіньніка быў патрэсканы, і адзіная ўцалелая стрэлка заўсёды паказвала шэсьць гадзін.

Гадзіньнік служыў цікавай забавай для дзяцей Крушынскага. Яны хаваліся ў шафе, нацягвалі ўверх масяндзовыя гіры, што віселі на моцных ланцугох з тоўстага дроту, і пускалі ў ход цяжкі маятнік.

Астатнім старэцкім форсам гадзіньніка было званіць заўсёды дванаццаць разоў. Яго матэматычная здольнасьць застыгла ў такой апостальскай лічбе.

Гэта вельмі весяліла дзяцей.

Працяглы мэлянхолічны звон з ноткаі захаванай урачыстасьці расплываўся па ўсім вялікім дзядзінцы Курганішча. Да звону прыслухоўваўся вельмі ўважліва і маўкліва рымскі папа, Пій X, які езуіцкімі ўглыблёнымі вачыма глядзеў з старога пажоўклага портрэту. Бронзавыя барэльефы Касьцюшкі і Адама Міцкевіча аздаблялі сьцяну па абодвых бакох Пія X ў строгай сымэтрыі. Яны не зварочвалі жаднай увагі на цырымоніял гадзіньніка. У мэталёвых тварах ня было жыцьця, не адчувалася ілюзія руху. Барэльефы гэтых знакамітых людзей нагадвалі мёртвыя маскі.

Невядомымі мастакамі выразна была нададзена маскам адна толькі веліч. Кожная бронзавая рыска падкрэсьлівала строгую веліч усяго твару да прымітыўнага шаржу. Мастак, відаць, хацеў такім чынам паказаць веліч польскага народу.

Каля сьцен вялікага «салёну» цясьніліся маленькія столікі. На іх стаялі бронзавыя і гіпсавыя статуэткі пастушкоў, рыцараў і розных жывёл. Падаконьнікі былі густа застаўлены вазонамі. і вокны затулены імі, нібы фіргавкамі з расьлін і кветак. У самы сьветлы сонечны дзень у «салёне» гойдаўся поўзмрок і адчуваўся халадок, зьмешаны з ледзь прыкметным прыкрым салодкаватым пахам.

Тут знаходзіліся яшчэ дзьве рэліквіі панскай старасьветчыны: вялізная канапа, з якой тырчэлі ўверх праз парваны малінавы плюш вострыя спружыны, нібы мэханізм сапсутай машыны, і старое аблупленае фортоп'яна.

— І мы калісьці былі пышнымі і бліскучымі,—як-бы гаварылі гэтыя рэліквіі.

Іван Мацьвеевіч заўсёды любіў адпачываць у «салёне».

Як толькі з сонечнага дзядзінца ўваходзіў у гэты пакой, яму здавалася, што знаходзіцца ў нейкіх катакомбах. Містычны настрой заўладаў ім.

— Я тут адпачываю душою,—гаварыў ён Крушынскаму.

Тут Іван Мацьвеевіч аддаваўся прыемнаму суму і велічы адвечнасьці. У яго пачуцьцях расло, нібы ў маці да пакалечанага дзіцяці, хваравітае замілаваньне да мізэрных абломкаў старых часоў. Гэтае адчуваньне разьмякчала яго, рабіла яго чулым. Старасьвецкія рэчы: разьбітае фортоп'яна, дрындушкі на століках, арнаманты на гадзіньніку, портрэт папы, здаваліся яму надзвычайна прыгожымі. Ён адчуваў да іх нейкую крэўнасьць. Ён вёў з імі сьпірытычныя гутаркі, забываючы пры гэтым аб сваім новым «я»—аб Іване Мацьвеевічу. Тады над ім брала верх старое «я», навеянае паветрам і выглядам лірычнага «салёну».

Яму недаступна кожны раз лез у памяць адзін старасьвецкі вальс. Мэлёдыя вальсу гіпнотызавала, уладала ім і даводзіла да нястрыманай жаласьлівасьці. Ён пачынаў ціханька сьпяваць, перабіраць пальцамі, парываўся да сапсаванага музычнага інструманту, ледзь стрымліваўся. Нават на сапсаваным інструманце ён баяўся выклікаць гэту мэлёдыю да жыцьця, баяўся нават аблупленых сьцен. Калісьці яго жонка іграла гэты вальс.

... Не. Я павінен хоць раз, хоць тут, зноў пачуць захаваную балючасьць, выклікаць мінулае. Я зараз кінуся да фортоп'яна...

Але кожны раз жывыя істоты перабівалі яго настрой.

Яны як-бы наўмысьня не давалі доўга сядзець у самоце, доўга быць у палоне затаёных, нязнаных лятуценьняў. Гарэзьлівыя людзкія галасы разьбівалі мары Івана Мацьвеевіча, разрывалі іх у шматкі, нібы вецер тоненькую, кволую павуціну.

«Салён» запаўняўся жартамі, смехам. Гэта зусім не гарманавала з вакольнай абстаноўкай.

Дзеці Крушынскага пасьля дванаццацізвоннай музыкі гадзіньніка лічылі абавязковай гасьціннасьцю сыграць на разьбітым фортоп'яне «марш» у чэсьць госьця.

Дзьве маленькія, вёрткія дзяўчынкі з заядлай стараннасьцю барабанілі па клавішах. На гэтую дзікую какафонію заўсёды прыбягалі, нібы на пажар, усе хатнія: і старая матка пані Ганны, жонкі Крушынскага, і маладая гаспадыня, і хатнія працаўніцы, і пастух, калі гэта было ў гарачы поўдзень, і нават людзі з дзядзінцу.

Крушынскі і Іван Мацьвеевіч рагаталі да ўпаду.

Ад «музыкі» зьвінелі шыбы ў вокнах, і ў жудаснай прыемнасьці напаміналася жыцьцё ранейшых паноў-уладароў былога маёнтку Курганішча.

У іншых пакоях гэтага дому ўжо адчуваўся дух новага гаспадара—Крушынскага. Стаяла новая мэбля, купленая нядаўна ў Менску: сталы, ложкі, крэслы, шафы. Старыя шпалеры былі сарваны са сьцен. Замест іх сьцены ўжо другі год красаваліся белымі лучынамі, якія былі прыбіты для новага тынку. Ад лучын пахла маладым дрэвам. Пах сьвежага лесу ўліваў у гэтыя пакоі бадзёрасьць аднаўленьня і дашчэнту сьціраў сьляды былых жыльцоў. Усё часу ня было Крушынскаму закончыць рамонт дому.

«Салён» быў пакінуты ў ранейшым выглядзе, дзякуючы Івану Мацьвеевічу.

— Няхай салён застаецца маленькім панскім музэем!—гаварыў часта агроном.

Гэта, паводле яго погляду, уваходзіла ў плян культурнай гаспадаркі Курганішча.

Назву «музэй» ведалі ўсе хатнія, нават дзеці. Меншая дзяўчынка Крушынскага выгаварвала «мзей», што вельмі сьмяшыла Івана Мацьвеевіча.

Ён і называў дзяўчынку «Мзей».

— Мзей! хадзі ка мне. Я пагушкаю цябе на назе!

Мзей за гэта вельмі крыўдзілася на «дзядзю».

— Мяне завуць Ейка (Лёлька), а ня Мзей. Я мамцы сказу!

Дзяўчынка скардзілася маме:

— Мамка! дзядзя мяне заве Мзей. Я не хацу!

Усе сьмяяліся, а яна пачынала плакаць.

Тады «дзядзя» супакойваў яе цукеркамі.

Такія «дзядзькаўскія» адносіны да дзяцей вельмі чулілі Крушынскага і яго жонку. Сяброўства мацнела.

Ня было выпадку, каб Іван Мацьвеевіч выяжджаў з Курганішча без «адрэзу» шэвіоту ці драпу самага лепшага заграцічнага вырабу. Агроном заўсёды быў апрануты ў новыя вопраткі.

Па сваёй далікатнасьці агроном ня пытаўся ў Крушынскага, скуль ён гэта ўсё дастае, але гаспадар аднаго разу сам вытлумачыў:

— Мне дапаручана ў гэтым раёне лавіць контрабанду. Я дастаю ад мытніцы ўзнагароду таварам кожны раз, калі мне ўдаецца цапнуць каго-небудзь з гэтай хэўры.

— Нашто вы мне аддаеце?

— Сам карыстацца гэтым не хачу. Я лаўлю контрабанду толькі ў парадку грамадзкага абавязку.

— Дык няхай-бы ня бралі гэтых нагарод, калі так справа стаіць?

— Бачыце, Іван Мацьвеевіч, жонка прымушае. Часам жонка са сьвету зводзіць чалавека.

На гэта Іван Мацьвеевіч расказаў цэлую сэрыю анэкдотаў пра жонак камісараў.

— А контрабандыстыя могуць вас забіць за такую дзейнасьць.

— Не баюся іх,—усьміхнуўся Крушынскі.

Іван Мацьвеевіч, вывучаючы людзей, каб часам цікавую рыску іхных характараў і манер надаць свайму новаму «я», нібы культурную прышчэпу да дзікай ігрушы, вельмі цікавіўся Крушынскім, як тыпам.

З кожным разам портрэт Крушынскага ў яго ўспрыманьні станавіўся ярчэйшым: надаваліся новыя штрыхі, новыя фарбы.

Іван Мацьвеевіч як-бы піша партрэт свайго сябра на палатне. Стараецца запамінаць кожнае слова, сказанае Крушынскім, усе яго развагі, погляды на існуючы дзяржаўны лад, яго ўчынкі.

З гэтай мэтай часта «цягне за язык» гаспадара. Такім чынам, Іван Мацьвеевіч мае яго поўную вусную анкету.

Крушынскі часта апавядаў Івану Мацьвеевічу аб самім сабе, маляваў свае дзіцячыя гады. З урыўкаў склаўся поўны малюнак чалавека.

Урыўкі жыцьцёпісу Крушынскага заўсёды пачыналіся з трафарэту:

«Аднаго разу...»

«Часам бывала...»

«А то была такая гісторыя...»

З такіх кавалачкаў—ні то споведзі, ні то ўспамінаў,—нібы з валокнаў, ткаўся кялім з розынмі ўзорамі жыцьця Крушынскага.

Ён апавядаў гладка, бяз ухабін. Відаць, ня толькі Івану Мацьвеевічу, а многім чытаў кнігу свайго быцьця.

Праўда, ён жыў у багатага дзядзькі ў Менску і мог набрацца буржуазных настрояў, мог сапсавацца, але багатыя людзі, калі знаходзішся пад іх апекай (тлумачыў Язэп Крушынскі), даводзяць да таго, што ты пачынаеш іх ненавідзець і набіраешся агіды да іх.

Іван Мацьвеевіч добра памятае вусную анкету Крушынскага з урыўкаў гутаркі. Ён прыводзіць гэтыя ўрыўкі ў хронолёгічны парадак. Пры гэтым прапускае рознастайныя варыянты адных і тых самых прыгод.

«Аднаго разу, гэта было ў першыя дні майго прыезду ў Менск, маёй цётцы не спадабалася, як я ем. Я тады сядзеў пры адным стале з усёй сям'ёю дзядзькі. Цётка ўвесь час скоса на мяне паглядала: моршчылася, нэрвавалася. Мяне зьбіла з панталыку абстаноўка пакою: багатая дубовая мэбля, буфэт, нібы хорам, белы, як сьнег, абрус на вялізным стале, талеркі з малюнкамі, срэбныя лыжкі і відэльцы, розныя міскі, місачкі і іншыя прылады да яды, прызначэньня якіх я ня ведаў. Я быў ашаломлены гэтым усім, забыўся пра голад і толькі думаў аб адным: як-бы хутчэй вызваліцца ад гэтай мукі—есьці пад поглядам цёткі ў такіх царскіх, як мне тады здавалася, абставінах. Я нейк сьціснуўся ў камячок, каб менш месца займаць пры стале. Я стараўся хутчэй есьці, думаў, што такім чынам зараз вызвалюся і пабягу ў іншы пакой. Гэтым я нарабіў сабе горшае ліха. На маю галаву пасыпаліся, як асеньні дождж, цёткіны заўвагі:

— Не сьпяшы так: пажару няма ў хаце!

— Што так сёрбаеш? Ад вясковых сьвіней, мабыць, навучыўся?

— Лыжку, як сякеру, ня трымай!

— Не барабань відэльцам па талерцы!

«Сваім злосным, пісклівым голасам цётка сыпнула мне адразу нешта з дзесяць запаведзяў аб тым, як трымацца пры ядзе, як есьці.

«Я развівўся ад дзіва. Еў восем гадоў у сваіх бацькоў і ня дрэнна еў, а зусім ня ведаў, што есьці ня ўмею. Што называецца, быў няпісьменным у ядзе. Я пачаў тады ўспамінаць пра абед у роднай закуранай хаце. Маці нальле ў міску стравы, а мы ўсе чабалдых дрыўлянымі лыжкамі ў адну міску. Я лічыў вышэйшым форсам барабаніць лыжкай аб міску. Я гэта рабіў

так лоўка, што проста маршы іграў. Бацькі толькі цешыліся і сьмяяліся, гледзячы на сынка.

«Успомніўшы гэта, мне проста плакаць захацелася. Такой смачнай здавалася мне посная матчына зацірка. Так прыемна было проста пальцамі браць у нядзелю блінцы з шырокага сасновага тапчана і глытаць-глытаць, як гусак усёроўна. Маці мяне пры гэтым зусім не муштравала, сьмяялася, падсоўвала самыя смачныя кавалкі.

«А вось пад наглядам цёткі яда мне ў горла ня лезла. Я дрыжэў ад страху і ня ведаў, што рабіць. Ня ведаў, што есьці— вялікая навука. Я з зайздрасьцю паглядаў, як ядуць мае стрыечныя браты—хлапчукі бадай адных гадоў са мною. Я іх пачаў малпаваць. Адзін хлопчык мяне так пры гэтым ушчыпнуў за нагу пад сталом, ажна я крыкнуў, падскочыў на месцы і... разьбіў талерку.

«Яшчэ цяпер памятаю гэту телерку з залатым абадком, з кветкамі па краёх, а ў сярэдзіне кітаянка, у шырокіх нагавіцах з маленечкімі ножкамі, касавурыла на мяне вочы. У аднэй руцэ яна трымала веер, а ў другой—букет кветак. Вельмі ў памяць урэзалася. Я ня так шкадаваў тады талерку, як гэту дзіўную кітаянку, якая мне вельмі спадабалася.

«Я, разумеецца, адразу выскачыў на кухню. У той-жа дзень я пехатой уцёк дахаты. Калі бацька мяне назад прывёз у дом дзядзькі, дык еў ужо на кухні, дзе мне было шмат лепей. Да кухаркі я адчуваў большае сваяцтва, чым да дзядзькавай сям'і. Яна мяне не муштравала. Яна мяне нават шкадавала, спачувала, называла сіратою. Нас радніла пролетарскасьць. Я гэта толькі цяпер уцяміў».

Іван Мацьвеевіч заўсёды даваў свае тлумачэньні ў такім сэнсе, што пролетарскасьць Крушынскага ідзе ад самога маленства бяз крывых ліній, проста, як струна. Гэта пролетарскасьць урасла карэньнем у яго псыхолёгію. Выхаваньне ў доме багатага дзядзькі толькі загартавала яе.

Такімі заўвагамі ён паддаваў Крушынскаму ахвоты плясьці далей свае ўспаміны, з якіх з кожным разам яшчэ ярчэй блішчэла на яго галаве, паводле выразу Івана Мацьвеевіча, «чырвоная пролетарская шапачка».

«Часам бывала так,—уваходзіў Крушынскі ў натхненьне,— што проста жыць болей неўмагату было ў дзядзькі. Гэта было

тады, калі я вучыўся ў школе. Дзядзька ахвотна купляў мне розныя кніжкі, даваў вопратку з плеч маіх стрыечных братоў. Ён паддаваў мне ахвоты добра вучыцца, падкупліваў смачнымі рэчамі з рэсторану. Вёў са мною гутаркі на розныя тэмы. Галоўным чынам расказваў аб сваіх дзіцячых гадох, калі сам быў вельмі бедны, аднак вышаў у людзі, пасутпіў лёкаем у адзін рэсторан. «Пасьля вунь якім багачом зрабіўся»!—хваліўся мне кожны раз дзядзька.

— Ты за мяне шчасьлівейшы,—казаў часта дзядзька,—бо з малых гадоў сыты, абуты, адзеты і вучышся. Старайся добра вучыцца.

«Дзядзька часта мяне настаўляў, каб ня браў кепскага прыкладу з яго дзяцей, якія галуздаюць і ніякай ахвоты ня маюць да навукі. Дзядзька называў «навукай» і чытаньне па складох, і «закон божы», і «чыстапісаньне».

«Спачатку я вельмі шчыра адносіўся да яго бясед і настаўленьняў. Вельмі добры ў мяне дзядзька,—думаў я. Але хутка зразумеў, у чым справа. Дзядзька рыхтаваў мяне для свайго рэсторану. Ён хацеў як найхутчэй выгадаваць для сябе шчырага, таннага, адданага слугу. Сваіх дзяцей ён рыхтаваў у адвакаты і дактары. Вось чаму ён мне заўсёды гаварыў «ня браць з іх кепскага прыкладу» і як найхутчэй «канчаць навуку».

«Хочаш ня хочаш, а мусіў я ісьці па тэй дарозе, куды мяне накіроўваў дзядзька. Хутка я зразумеў розьніцу між сабою і стрыечнымі братамі. Я скончыў гарадзкое вучылішча і застаўся ў дзядзькавым рэсторане, а яны вучыліся ў гімназіі і рыхтаваліся да унівэрсытэту. Паміж намі была пракапана глыбокая канава. Я адчуваў, што яны—дзеці багатых бацькоў, а я жыву на ласцы. Ласка гэта была ня толькі тады, калі я вучыўся ў школе, яна адчувалася нават у той час, калі я ўжо ад восьмай гадзіны раніцы да трэцяй уночы сядзеў над рахункамі ў рэсторане.

— Вось ты цяпер свой хлеб ясі,—часта гаварыў дзядзька,— ты ўжо самастойны чалавек, бо я цябе на ногі паставіў, адразу паставіў. Стукнуў балванам аб падлогу, а стаіць чалавек. Табе ня трэба было раней быць лёкаем.

— А ці лёкай ня свой хлеб есьць?—пытаўся я ў дзядзькі.

— Свой то свой, але не ганаровы, а лёкайскі хлеб,—гаварыў дзядзька.

— Ён-жа таксама працуе. Нашто ганьбіць працу лёкая?— абураўся я.

— Як сам будзеш мець рэсторан і ў цябе будуць лёкаі, тады і ты будзеш ганьбіць іх,—казаў дзядзька і паморшчыўся.

— Дык дзядзька самога сябе ганьбіць, бо дзядзька сам лёкаем быў. А ці-ж цяпер дзядзька ня лёкай свайго багацьця?— пытаўся я.

— Глядзі, Язэп, ты праз меру разумны. Глядзі, з цябе нічога ня выйдзе, калі ты гэтакі. Ня ведаеш, што трэба ганьбіць, а што хваліць. Чым быць лёкаем у другога, лепш мець іх у сябе. Пры гэтым дзядзька ківаў на мяне строга круглым і бліскучым, нібы сасіска, пальцам.

«Я ня ганьбіў лёкайскую працу, бо сам быў добрым лёкаем у дзядзькі. Я атрымліваў у яго мізэрную пэнсію. А ён увесь час гаварыў, што я многа грошай яму каштаваў, пакуль вывеў у людзі. Цяпер павінен у яго рэсторане адпрацаваць. Ён быў вельмі хцівы на грошы.

«Я бліжэй быў з лёкаямі, чым з дзядзькавай сям'ёю. Так, буржуазны дом дзядзькі быў мне агідным. Я выбраўся з цёмнай дзядзькавай каморкі і наняў себе пакой у аднаго шаўца за пяць рублёў у месяц, а харчаваўся ў рэсторане. За харчы дзядзька ў мяне адлічваў палавіну пэнсіі. З кожным годам службы ў дзядзькі я ўсё больш загартоўваўся ў сваіх поглядах аб буржуазіі. Я нават зорганізаваў аднаго разу забастоўку ў дзядзькавым рэсторане».

Крушынскі з замілаваньнем да самаго сябе расказваў, як наладзіў калісьці забастоўку:

«Я выпрацаваў на нашым сакрэтным сходзе цэлы шэраг патрабаваньняў. Як мы гэта падалі дзядзьку, дык ён раззлаваўся.

— Зьмяю грэў я за пазухай! Выгадаваў цябе, а вось як ты мне дзякуеш!

«І лёкаі таксама людзі!»—артачыўся я.—Многа клопату нарабіў я тады. Ён прагнаў з рэсторану ўсіх служачых, як «сапсутых людзей», набраў новы штат. Быў я тады неспрактыкаваны ў такіх справах. Ранейшыя служачыя бадзяліся бяз службы. Галадалі. Ніхто не хацеў іх прыняць на працу. Яны мяне праклiналі. Я прасядзеў тады ў вастрозе некалькі месяцаў. Сам дзядзька на мяне данос падаў. Ледзь упрасіў яго пасьля

гэтага зноў прыняць мяне на службу. Абяцаўся быць ціхім і адданым яго справе».

Гэтая частка вуснай анкеты Крушынскага была самай яркай. Тут яго «чырвоная шапачка» героічна мітусілася. Гэты эпізод меў некалькі варыянтаў. Адзін пярэчыў другому. З прычыны гэтых пярэчаньняў Іван Мацьвеевіч рабіў свае вывады аб пролетарскім выхаваньні гаспадара Курганішча.

...Прыдзе воўк і зьесьць чырвоную шапачку,—жартаваў у думках Іван Мацьвеевіч.

«А то была такая гісторыя»,—пачынаў Крушынскі новае апавяданьне з свайго жыцьця.

Ён з захапленьнем апавядаў аб тым, як рабіў фокусы ў рахунках, быў вельмі спрытным у лічбах і краў грошы ў дзядзькі.

— Я ня краў,—апраўдваўся ён,—а браў, браў дзеля таго, каб раздаваць бедным. Быў я тады багаты на розныя фантазіі. Ладзіў такія балі на гэтыя грошы, ажна пыл дыміў. Жулікі і абадранцы гарадзкія балявалі са мною.

— А чаму проста не раздавалі грошы бедным, чым частаваць іх выпіўкамі?—спытаўся ў яго Іван Мацьвеевіч.

— Бачыце, Іван Мацьвеевіч, каб я простым чынам раздаваў бедным людзям грошы, дык карысьці ня было-б з гэтага. Я хацеў паказаць ім нікчэмнасьць жыцьця багатых людзей. Балюшкі я ладзіў з вялікім шыкам, каб адбіць у іх, у бедных, ахвоту да такога жыцьця, да баляваньня. А разам з тым я будзіў іх такім чынам да бунтаў супроць буржуяў, супроць тых, якія вечна так балююць.

— Орыгінальны спосаб пропаганды,—сьмяяўся Іван Мацьвеевіч.

— Я калісьці быў здольным на такія штукі. Грошы так сабе не даваў. Гэта-ж былі ня дзядзькавыя грошы, а народныя. Дзядзька эксплёатаваў сваіх служачых, скуру лупіў з сваіх «гасьцей» у рэсторане. Я ня меў права так сабе раздаваць гэтых народных грошай, а балюшкі з мэтай пропаганды супроць буржуяў—калі ласка!

...Прыдзе воўк і зьесьць чырвоную шапачку,—жартаваў у думках Іван Мацьвеевіч.

— А бывала часам як накінешся на кнігі, дык глытаеш іх, усёроўна як смачныя клёцкі або як п'яніца гарэлку. Многа я ў

Менску калісьці чытаў. Вельмі шмат. Трэба лічыць на пуды. Ад кніг розныя думкі зьяўляюцца. Фантазія расьце.

— Што, напрыклад, вы чыталі, Язэп Сымонавіч?—зацікавіўся Іван Мацьвеевіч інтэлектуальным багажом Крушынскага.

— Чытаў усё, што толькі ў рукі пападалася. Як быў малы, вельмі любіў казкі чытаць аб асілках, красунях, аб чараўнікох і іншых дзівосных штуках. Як падрос, чытаў Майн-Рыда, Жуль-Вэрна. Потым вельмі любіў Гогаля і Дастаеўскага. Чытаў усё, што пападалася пад рукі. Шмат чытаў рэволюцыйных кніжачак.

— Што болей усяго вам у гэтых кнігах падабалася?—рабіў формальны допыт Іван Мацьвеевіч.

— Мне падабаліся ўсялякія прыгоды. Галоўным героем у кожным романе я заўсёды лічыў самога сябе. Мне здавалася, што гэта я сам вандрую па розных тропічных лясох, страляю ў львоў, тыгрысаў, сланёў. А то я бываў лютым піратам на караблі, дзікім разбойнікам. Часам зьяўляўся рыцарам і царэўну вызваляў з зачарованага лесу, з сьпячага царства. Мне заўсёды здавалася, што прымаю самы чынны ўдзел ва ўсіх гэтых цікавых прыгодах, і сумаваў, калі прыгоды героя канчаліся няўдачна, радаваўся, калі герой браў верх. Наогул мяне захапляла кожная драбніца ў апісаньнях. Часам цэлымі начамі чытаў. У стрыечных братоў у Менску было многа кніг. Пад уражаньнем цікавага роману я знаходзіўся часам некалькі дзён. Пераймаў манеры галоўнага героя. Аднаго разу купіў капялюш з шырокімі палямі толькі дзеля таго, што такі капялюш насіў адзін герой, які біўся з індзейцамі ў амэрыканскіх прэрыях. Вывучаў напамяць мудроныя гутаркі прыдворных з «Тайн Мадрыцкага двара» і дзівіў часам сваіх таварышоў кніжнай, дзівоснай бяседай. Кіно таксама давала мне шмат духоўных харчоў. Цяпер я мала чытаю. Няма калі. Некалькі пудоў кніг у куфры запакавана. Дзеці падрастуць—няхай чытаюць.

Крушынскі папулярызаваў таксама сваю партызанскую чыннасьць пры польскай окупацыі.

— Так, так, Язэп Сымонавіч,—згаджаўся з ім Іван Мацьвеевіч,—у вашых руках вельмі добрая візытная картачка. Але трымайце яе на здароўечка, сабе на славу і гонар, а на страх людзям. Візытная картачка даражэй за грошы.

— Якая візытная картачка?!

— Пролетарская...

Іван Мацьвеевіч хітра ўсьміхнуўся.

Крушынскі смаліў папяросы адну за аднэй і з самазадаволенасьцю глядзеў на агронома.

— Ну і заядлы вы курэц! Папяроскі з зубоў не выпускаеце.

— Прывычка.

— А вам знаёмы вагоны з надпісамі «для некурящих»?

— Паганыя вагоны, ліха на іх!

— Такія вагоны для заядлых курцоў, як вы, Язэп Сымонавіч, заўсёды зьяўляюцца нейкімі карцарамі, месцам пакуты на ўвесь час язды. У такіх вагонах жанчыны надзвычайна строгія, а большасьць мужчын таксама дыму не пераносяць. Усе «некурящие» неміласэрна шпігуюць за тымі, хто курыць. Хай толькі ў купэ замітусіцца дымок, дык пачынаецца галас і гвалт на ўвесь вагон: «хто курыць»?, «зараз кондуктара пазаву!», «будзеце штрафу плаціць!», «тут курыць няможна!», «вагон для «некурящих»! і шмат іншых такіх выкрыкаў. Пачынаюцца вохі і ахі. Кашляюць нават тыя, хто ніколі ня кашляў. Проста не вагон, а шпітальная палата, дзе ўсе хворыя атручаныя нікотынаю. Але курцы таксама народ упарты. Хоць у пятлю пойдзе, толькі з папяросай у зубах.

— Ого!—узбудзіўся Язэп Крушынскі,—я сам колькі разоў трошніцы плаціў за курэньне ў такіх вагонах! Пролетарскай жалезнай мятлой трэба вымятаць з нашай рэспублікі вагоны з дошчачкай «Для некурящих».

— Дык вось,—усьміхнуўся Іван Мацьвеевіч,—быў раз такі выпадак. У вагоне «для некурящих» сядзеў заядлы курэц, вось як вы. Смаліў у засос папяроску за папяроскай. Ніякай увагі на протэсты пасажыраў!

— І я заўсёды так раблю!

— Паслухайце, Язэп Сымонавіч, што далей было.

— Пэўна, нарваўся на штраф?

— Пачакайце. Насупроць курца сядзеў чалавек сярэдніх гадоў, з густой шэвэлюрай сіваватых валасоў, з маленькай бародкай. Гэты пасажыр паглядаў на курца і бліскаў вачыма ад злосьці. Нарэшце, ня вытрымаў і зьвярнуўся да курца з просьбай ня курыць. Курэц хоць-бы што. «Прашу ня курыць»!—зьвярнуўся той у другі раз. Курэц ані мірг! Яшчэ з большай стараннасьцю пускае круцёлкі дыму, фарсіць, вырабляецца. Тады той нэрвовы

пасажыр, выведзены з цярплівасьці, са злосьцю палез рукой у кішэнь, палез з такой мінай, нібы зараз застрэліць пасажыра...

— Выхваціў браўнінг?—зацікавіўся Язэп Крушынскі.

— Выхваціў адтуль візытную картачку і падаў курцу. Курэц, смокчучы папяроску, зірнуў адным вокам на картачку. На ёй было надрукована «Лев Давідавіч Троцкі».

— Ой,—крыкнуў Язэп Крушынскі,—ну, і папаўся няшчасны курэц!

— Пачакайце. Курэц палажыў картачку ў кішэнь камізэлькі і спакойна закурыў новую папяроску. Тут таварыш Троцкі не сьцярпеў і паклікаў кондуктара. Строгі кондуктар падышоў да курца. Курэц горда выняў з кішэні візытную картачку таварыша Троцкага і тыкнуў кондуктару ў самыя вочы. Кондуктар спалохаўся, па-вайсковаму выцянуўся, аддаў чэсьць і папрасіў прабачэньня. «Я пакажу яму гэ... гэ... гэнаму з бародкай, які вас непакоіць!»—сказаў бравы служака. «Ня трэба! Ну яго...»—вялікадушна махнуў рукою курэц і запаліў новую папяроску.

— Лоўка!

— Вось і візытная картачка, бледнатвары брат мой!—сказаў Іван Мацьвеевіч і зірнуў у чырвоны твар Язэпа Крушынскага з хітрай усьмешкай.

— Такой-жа хітрай усьмешкай адказаў Крушынскі Івану Мацьвеевічу.

VI

— Іван Мацьеевіч!

— Язэп Сымонавіч!

І два прыяцелі трасьлі рукі адзін аднаму з імпэтам цыркавых барцоў. Зазіралі адзін аднаму ў вочы, ветла, горача, з дабрадушнай хітрыкай, з нямым запытаньнем «што чуваць?»

Гаспадыня тупалася каля стала, рыхтавала сьняданьне: шчупленькая, тоненькая, рухавая, яна ставіла на стол сыр, масла, яйкі, малако, вэндліну, каўбасы, бліны з верашчакай і іншыя вясковыя продукты. Выбягала з пакою, зноў прыбягала, клапацілася, сьпяшыла. Яна рыхтавала сьняданьне для госьця. Яна была зьбянтэжана.

— Іван Мацьвеевіч галодны!—сказала яна мужу з дакорам і бліснула на яго злоснымі вачыма.

Голад Івана Мацьвеевіча заўсёды надаваў жывой рупнасьці і клапатлівасьці жонцы Крушынскага.

— Гэта не навіна, што я галодны, чаго непакоіцца? Я заўсёды галодны. У мяне галоўны лёзунг—есьці, есьці і яшчэ раз есьці!

— Вы пакуль што, Іван Мацьвеевіч, сілкуйцеся! А я—зараз!

Гаспадар шырока махнуў рукой перад сталом, як-бы знаёміў гасьця са сваім сталом, і бомбай выскачыў за дзьверы.

— Я сапраўды галодны, ой, галодны!—прастагнаў Іван Мацьвеевіч,—і гаспадара не дачакаюся.

— Не чакайце! сьнедайце, калі ласка! Выбачайце, што не зрабіла для вас лепшага сьняданьня!—сказала гаспадыня ў роспачы,—выбачайце за вясковыя простыя пачастункі!

Іван Мацьвеевіч не чакаў. Ён пачаў частавацца яшчэ за поўхвіліны да яе запрашэньня.

Гаспадыня глядзела на яго з рэлігійным захапленьнем, з замілаваньнем маткі, якая корміць сваё любае дзіця.

— Ежце! Ежце!—уторыла яна сардэчны акомпанімэнт да яго шчырага чваканьня.

— Ежце! Ежце!

Іван Мацьвеевіч еў. З кожным кавалкам яды ў яго павялічваўся апэтыт, вырастаў у надмерную велічыню. Еў моўчкі з такім відам, што, здаецца, каб цяпер хто пад вакном з гарматы страляў, дык не зьвярнуў-бы ўвагі, можа нават і ня чуў-бы.

Гаспадыня падсоўвала яму смачнейшыя кавалкі, з пяшчотай заглядала ў твар, як на хворага, якому дае лякарства, і ўсё паўтарала ў розных пералівах голасу:

— Ежце! Ежце!

— Во гэта вазьмеце! Во тое!

Яна радзіла, што брацьь, лiтасьці прасіла.

У Івана Мацьвеевіча рот напханы і тым, і другім.

Гаспадыня гардзілася, што яе продукты, яе вырабы яму да смаку. Яна разумела, што ён рассыпаўся-б у пахвалу яе таленту, але рот заняты блінцамі...

— А во папробуйце сала! Сала пакаштуйце...

Сала нарэзана вострым нажом у шырокія лісткі—ружовыя, празрыстыя, прыемна пахучыя.

Гаспадыня падсунула сала бліжэй да Івана Мацьвеевіча, села насупроць яго, паставіла вострыя локці на стол, ушчаміла галаву рукамі ў сумнай задумёнасьці і давай ціхім голасам апавядаць госьцю эпопэю пра япрука:

— Япрук важыў дзесяць пудоў. Я кажу гаспадару—шкада калоць. Няхай яшчэ трохі адкорміцца. Няхай яшчэ... А божа-ж мой, дзе-ж гэта мой запрапасьціўся? Чаму не нясе? Дык мы думалі гэтага япрука...

Гаспадыня раптам ускочыла з месца і замітусілася па хаце.

Крушынскі паказаўся ў дзьвярах. Нёс бутэльку «Пілсудчыны».

— Заўсёды спозьнішся!—ня выцерпела гаспадыня,—эх, ты!

У гэты час на стале былі толькі ўбогія астаткі яды.

Іван Мацьвеевіч паглядзеў на гарэлку і войкнуў:

— Ёсьць закуска—гарэлкі няма. Прынесьлі гарэлку—няма закускі. Самаарганізавацца трэба, Язэп Сымонавіч!

— Заўсёды з самага пачатку трэба гарэлку прынесьці!—уставіла пэдагогічную параду гаспадыня.

— Калі я ня мог,—апраўдваўся Крушынскі.—Ведаеш, што далёка схавана. А якраз там круціліся чужыя людзі. Трэба было асьцерагацца. У мяне цяпер ёсьць цікавы плян. Няхай гаспадыня прынясе новыя закускі. Вось мой плян!

— Плян! Плян!—жартаваў Іван Мацьвеевіч,—цяпер у дзяцей ёсьць новая забава. Гульня ў плян.

— Што гэта за гульня?—зацікавіўся гаспадар.

— Гульня такая: дзеці складаюць плян.

— Ну, а пасьля?

— А пасьля яго ня выконваюць.

— Мы выканаем,—сьмяяўся Крушынскі, наліваючы з другой бутэлькі.

— Не!—артачыўся Іван Мацьвеевіч,—пакуль гаспадыня прынясе закускі, гарэлкі ня будзе. А потым, пакуль вы яшчэ гарэлкі прынясеце, Язэп Сымонавіч, зноў ня будзе закускі, бо я-ж не дачакаюся... І так на доўгі час, на многія гады, аж да прыбыцьця пазаклясавага чалавека на нашу грэшную плянэту.

Крушынскі наліваў сьпешна ў шклянкі.

Сьпешна пілі.

Гаспадыня бягом пусьцілася па закускі.

Праз некалькі хвілін вярнулася гаспадыня. Яна зірнула на стол і спалохалася:

— А божачка! Калі справіліся выпіць? Без закускі?

— Калі я закусваў бяз выпіўкі, дык магу выпіць без закускі. Такая бяссыстэмнасьць у мяне ўвайшла ў сыстэму. Стаўце, гаспадыня, закуску на стол!—бравым голасам скамандваў Іван Мацьвеевіч.

Гаспадыня зноў ставіла на стол, а гаспадар зноў пашоў у патаемнае месца па гарэлку...

Іван Мацьвеевіч закусваў з ранейшай рупнасьцю. Кроплі поту блішчэлі на яго ілбу.

Гаспадыня тут-жа перад ім разрэзала на тоненькія лісточкі тоўсты кавалак сала і складвала акуратненька ў стопку.

Іван Мацьвеевіч мэлянхолічна зірнуў на гэту работу і клаў у рот лісток за лістком.

— Ведаеце, пані гаспадыня,—сказаў ён лагодным голасам,—гэтая беларужовая стопка нарэзанага сала нагадвае мне прыгожанькі томік поэзіі, лірычнай старасьвецкай поэзіі. Ну, напрыклад, томік сонэтаў Петраркі. Гэта так прывабна, так хораша, так смачна, што проста аблізваешся.

— А хто такі Петрарка?—зацікавілася гаспадыня,—камісар які?

— Не,—засьмяяўся ціха Іван Мацьвеевіч,—гэта ў Італіі быў калісьці такі чалавек. Ён любіў чужую жонку, жонку аднаго купца, буржуйку пекную любіў. І вось у чэсьць гэтай жанчыны ён пісаў сонэты—вершы такія. Ведаеце: траляляляля, траляляляля! І так чатырнаццаць разоў!

— Чатырнаццаць разоў?! Гэты Пятрок чатырнаццаць чужых жонак любіў, чатырнаццаць купчых! Іван Мацьвеевіч, вы не такі сапсуты чалавек, як той італьянскі Пятрок...

— Не Пятрок, а Петрарка,—сьмяяўся шчыра Іван Мацьвеевіч,—і не чатырнаццаць жонак ён любіў, а пісаў вершы. Кожны верш у чатырнаццаць радкоў. А гэткіх вершаў напісаў многа, многа!

— Вось бедненькі,—шчыра пашкадавала гаспадыня.—Каб я пачаставала яго салам з Курганішча, дык ён-бы не вар'яцеў. Жартачкі, так многа пісаць! А божанька! Гэта-ж проста страх бярэ!

— Каб частавалі яго такім салам, дык сапраўды быў-бы здольным чатырнаццаць чужых жонак палюбіць,—падміргнуў да гаспадыні агроном гульлівымі п'янымі вачыма.

— Ой,—спалохалася гаспадыня,—я вас пачынаю баяцца.

— Няма чаго баяцца,—сьмяяўся Іван Мацьвеевіч,—вось Язэп Сымонавіч кулямёт нясе!

У дзьвярах паказаўся гаспадар, і бутэлька тырчэла з яго кішэні.

— Што? Зноў закускі няма?

— Мы будзем закусваць вершамі,—сказаў Іван Мацьвеевіч, паказваючы на сала.

— А гарэлка па-вашаму проза?

— Гарэлка таксама—вершы, таксама—поэзія, ого!

— Па-вашаму, Іван Мацьвеевіч, і сала—вершы, і гарэлка—вершы. Мабыць, трохі ня так. У беларускім тэатры ў Менску я чуў, што вершы гэта ня проза, а проза гэта ня вершы.

— Пасьля такіх навуковых доказаў,—сказаў пакорліва Іван Мацьвеевіч,—згаджаюся прызнаць гарэлку—поэзіяй, а сала—прозай. Вось вам, Язэп Сымонавіч, і першая тэорыя літаратуры на беларускай мове!

— Ого! які вучоны!—зьдзівілася гаспадыня.

— Яшчэ профэсарскі тытул у Менску дадуць вам,—жартаваў Крушынскі.—Гэта-ж мой стрыечны брат улажыў кніжачку для дзяцей, і яго цяпер усе завуць «профэсарам». Нават у газэце чытаў «профэсар Крушынскі». Гэта сын майго дзядзькі.

— Профэсарам дык не, але крытыкам зраблюся!—сказаў Іван Мацьвеевіч.

— На гэта, выбачайце мяне, Іван Мацьвеевіч, у вас здольнасьці ня хопіць. Вы ня ўмееце лаяцца. Другі мой стрыечны брат пачаў вершы пісаць, дык скардзіцца на крытыкаў. Кажа, што вельмі лаюцца, ну, як апошнія хуліганы.

— І гэтаму можна навучыцца,—не паддаваўся Іван Мацьвеевіч.—Дарэчы казаць, я ўжо трохі сапраўды літаратурай займаюся.

Іван Мацьвеевіч цяжкім крокам пасунуўся ў «салён», прынёс адтуль свой портфэль і дастаў з портфэля газэту.

— Якія-ж навіны хочаце чытаць?—апатычна запытаўся Крушынскі.

— Навіны цікавыя. Глядзеце!

Іван Мацьвевеіч разгарнуў газэту і паказваў здалёк Крушынскаму.

Гаспадар доўга ўглядаўся асалавелымі ад дзіва вачыма. Між пэтытным густым слупком тэксту красаваўся невялічкі портрэт круглага дзядзькі з лысінай, з вусамі.

— Лысіна якраз мая!—крыкнуў Крушынскі.

— Усе лысіны адна да аднэй падобны, як галоўкі капусты,— уставіла сваё крытычнае слова гаспадыня.—Хто чым, а ён заўсёды сваёй лысінай хваліцца.

— Нажаль, у нас лысіна не выкарыстоўваецца, — сказаў Іван Мацьвеевіч.—У Амэрыцы на лысінах рэклямы наклейваюцца.

Крушынскі, як зачараваны, падсунуўся бліжэй да газэты.

— І падпісана «Язэп Крушынскі», і мае вусы! Глядзі, жонка, мае вусы!

— Няўжо-ж!?—зьдзівілася гаспадыня.—За якія ласкі боскія? Можа верш напісаў?

— А за такія ласкі, што Язэп Сымонавіч вядзе культурную гаспадарку!—сказаў аўторытэтна Іван Мацьвеевіч. Гэта вам ня верш, а проза. Без такой хлебнай сельска-гаспадарчай прозы ня пісаліся-б і вершы! Ну вось, скажам, хоць-бы такі твор.

Іван Мацьвеевіч чытае на сьпеўны лад:

> «Гаспадарка Язэпа Крушынскага знаходзіцца ў 45 вярстах ад Менску, у былым маёнтку Курганішчы. Крушынскі— селянін, які прымаў чынны ўдзел у партызанскім руху пры польскай окупацыі. Ён яшчэ ў 1905 годзе распаўсюджваў рэволюцыйныя проклямацыі і быў ранены ў Менску на барыкадах, сядзеў у турме за арганізаваньне забастовак на фабрыках і заводах. Наогул рэволюцыйнае мінулае Крушынскага досыць багатае».

— Правільна!—узрадаваўся Крушынскі.—Так яно і ёсьць, Іван Мацьвеевіч.

Іван Мацьвеевіч пераходзіць на мінорны тон, чытае хітрамудрыя табліцы аб разьмеркаваньні зямлі па ўжытках, севазвароце, будоўлях, сельска - гаспадарчых машынах, жывёле і іншае.

У канцы ён задэклямаваў з патосам, з багатай мімікай твару, з выкрутаснымі сьмешнымі гестамі і крыўляньнямі:

«Язэп Крушынскі прымае ўдзел у грамадзка-культурным жыцьці суседняй вёскі «Драздоў і Дзятлаў», зьяўляецца сябрам сельсавету і розных культурных організацый ваколіцы. Гаспадарка Курганішча носіць характар культуры і зьяўляецца прыкладам для вакольнага насельніцтва. Узорную культурную гаспадарку вядзе пад кіраўніцтвам агронома Івана Мацьвеевіча Шапавалава».

З кожным новым словам, які дэклямаваў Іван Мацьвеевіч з друкаванага тэсту, Крушынскі рос, вырастаў у сваіх вачох да нябывалых памераў.

— Жонка! Трэба сьвянціць портрэт! Прынясі яшчэ бутэльку!

— Досыць! Хіба вечарам, Язэп Сымонавіч!—запротэставаў Іван Мацьвеевіч,—не магу болей.

— Можа, вы нездаровы, Іван Мацьвеевіч?—шчыра занепакоіўся Крушынскі.—Чаму адмаўляецеся?

— У мяне такая хвароба, як у таго чалавека, які зьядаў за сьняданьне па тры фунты хлеба. Аднаго разу яму падалі на стол пяць фунтаў. Ад сьняданьня асталося з поўфунта хлеба. Чалавек спалохаўся: падумаў, што нездароў, бо ня мог сваёй порцыі зьесьці. Ён лёг у пасьцель і стагнаў. Падняўся з ложка толькі тады, калі гаспадыня паведаміла, што памылкова, замест трох фунтаў, палажыла пяць.

— Але-ж трэба портрэт сьвянціць!—не адставаў Крушынскі.—Гэту газэту выпішу з Менску аж сто экзэмпляраў. Буду раздаваць суседзям. Дайце мне гэту газэту, Іван Мацьвеевіч! Я выражу артыкул з маім портрэтам і ў салёне на сьцяне наклею.

— Вазьмеце, калі ласка. А я пайду іграць на вашым старым інструманце. Пасьля сьняданьня душа музыкі захацела. Калісьці добра іграў! Трэба ўспомніць старое.

Іван Мацьвеевіч гэта прагаварыў з такой рашучасьцю і адвагай, нібы ён казаў, што калісьці добра рэзаў людзей або краў коняй з стайні, нібы «ўспомніць старое» было вялікім праступам...

Ён пашоў у «салён».

Хутка пачулася адтуль гучная музыка. Сапсутае фортоп'яна мучылася-стагнала. Агроном пачаў іграць нейкі старасьвецкі вальс. Струны інструманту былі расстроеныя, дзеля чаго вальс

меў вялікія перапынкі ў форме нязьвязных гукаў, якія рэзалі слух і няпрыемна білі па нэрвах. Але прыкрае ўражаньне было ўзнагароджана вельмі прыемнымі ўрыўкамі мэлёдыі. Мілагучныя, вабныя і стройныя ўрыўкі вырываліся з хаосу бязладу на волю як-бы з ланцугоў. Дысгармонія і гармонія дапаўнялі адна адну, служылі аднэй мэце, каб разумець розьніцу між імі. Кожны музычны сказ, вырваны такім чынам з какафоніі, нібы залатая макавінка з груды пяску, яскравіўся, набываў захаваны глыбокадумны трагізм, быў лёгкі для ўспрыйманьня і вабіў самога музыку.

Крушынскі з жонкай, дзеці і ўсе хатнія сабраліся ў «салёне» і ўважна слухалі.

Відаць было, што пальцы агронома маюць навык да музыкі. Ніхто з хатніх ня ведаў гэтага старасьвецкага інструманту ў часы яго блеску. Ён служыў на забаву для малых дзяцей. Толькі цяпер жартаўлівы інструмант хоць страшна зайкаўся, але вырабляў зусім нежартаўлівыя штукі пад пальцамі Івана Мацьвеевіча.

Нешта падобнае да гэтага інструманту ўсе заўважылі і ў самога Івана Мацьвеевіча. Зьмяніўся і ён увесь. Такім яго тут ніхто ня бачыў. Твар збляднеў. Вочы мелі зусім новы выраз.

Здавалася, што ён глядзіць кудысьці далёка-далёка, бачыць перад сабою зусім ня папу рымскага на сьцяне, а нешта нявідочнае, на многа міль адгэтуль. На яго твары ў гэтыя хвіліны зьявіліся такія зморшчыны, якіх раней ніхто ня бачыў. Ва ўсім целе адчувалася захаваная напружнасьць.

Здавалася, што чалавек хоча выскачыць з няпрыемнай чужой скуры, хоча вырвацца з нечых моцных рук—і ня можа. На твары яго напісана пакута і боль.

А пальцы выраблялі свае выкрутасы, па-вар'яцкаму скакалі па клавішах—часам па касьцяных, а часам па аблупленых брудна-дрыўляных, якія тырчэлі, як гнілыя зубы паміж здаровымі і бліскучымі.

Іван Мацьвеевіч быў так захоплены нечым сваім унутраным, што не зварочваў увагі на расстроеныя струны.

... Аднак, шуміць у галаве,—падумаў ён,—замнога выпіў.

Але хутка контрольны цэнтр мазгоў і нэрваў разьмяк, расплыўся, як дым. Па організьме прайшлі наскрозь гарачыя голкі. Іван Мацьвеевіч устрапянуўся. Нехта накіроўваў яго

думкі і настроі ў захаваны куток, куды ён даўным даўно не заглядваў.

... Дзеці, мабыць, падрасьлі, жонка пастарэла. Няўжо-ж яны забылі аба мне—аб «нябожчыку» пад назваю Антон Сяргеевіч?

— Аньцік...—пачуў ён далёкі голас да болі роднай жанчыны.

— Папка...—раздаваўся дзіцячы кліч, мілагучны, жаласьлівы. У яго слыхавой памяці ясна зычэлі знаёмыя галасы—жонкі і дзяцей. Нехта круціў перад ім кіно-стужку з карцінамі, нехта злы і ўпарты. Іван Мацьвеевіч жмурыў вочы, моршчыўся, комкаўся і ня ведаў, дзе дзецца. А ў гэты час пальцы скакалі па клявіятуры...

... Гэты вальс калісьці жонка іграла, Аграфена Макараўна...

Ком падступіў да горла. Хацелася выць, падняць дзікі, вар'яцкі крык.

... Трымайся, Іван Мацьвеевіч. Выкінь з галавы Антона Сяргеевіча... Так крыкнуў у думках да самога сябе.

Рвануўся з месца. Адскочыў ад фортэп'яна, як ад накалёнага да чырвона жалеза.

Выцер белай хустачкай пот з твару.

— Ну, і граеце, Іван Мацьвеевіч!

— Вось музыка!

— Даль-бог, любата!

— А я чуць не забыўся. Маю для вас, Язэп Сымонавіч, новы цікавы анэкдот!

Ён азірнуўся па бакох з апаскаю, з жулікаватай усьмешкай:

— Пры кабетах не выпадае.

Іван Мацьвеевіч і Крушынскі вышлі ў другі пакой.

Пасьля кароткага шушуканьня пачуўся гучны, здаровы рогат Крушынскага.

— Го-го-го! Ну, і ліха-ж яго ведае! Го-го-го!

У той час, калі Іван Мацьвеевіч расказваў гаспадару вясёлыя анэкдоты, ускочылі ў «салён» адзін за адным два чалавекі, адзін высокі, другі нізкі—Галава і Сухарукі, старэйшыя з плямён Драздоў і Дзятлаў. Яны былі вельмі ўстрывожаныя, зьбянтэжаныя, шукалі вачыма кагосьці.

— Дзе гаспадар?—сказаў Галава.

— Пане Язэпе!—крыкнуў Сухарукі.

Крушынскі вышаў да іх.

У чым справа, суседзі?

— Каму па каму, а мне два камы!—адрапартаваўся Галава.— Дзятлы Драздоў забіваюць.

— Дразды Дзятлаў перадушаць!—паведаміў у сваю чаргу Сухарукі.—Мне што-ж: альбо рыбка, альбо піпка!

Галава і Сухарукі з роспачы ня ведалі, што рабіць, зірнулі адзін на аднаго, потым на ўсіх хатніх і спынілі вочы на Крушынскага.

Яны шукалі ратунку.

— Ліха ня возьме іх! Сто гадоў да рэволюцыі вашы Дразды і Дзятлы біліся, яшчэ сто гадоў біцца будуць. А біцьцё ім толькі на здароўе памагае!

— Ой, пане суседзе, каламі б'юцца!—застагнаў Галава.

— Глузды выпусьцяць, кішкі вытрыбушаць!—войкнуў Сухарукі.

— За што б'юцца?—зацікавіўся гаспадар.

— За сенакос!—сказаў Галава.

— За панскі лужок каля плёсы!—дадаў Сухарукі.

— Іван Мацьвеевіч!—крыкнуў Крушынскі.

З другога пакою высунуўся агроном.

— Вы трохі пасьпіце пакуль што, а я пайду мірыць Драздоў і Дзятлаў!

Крушынскі вышаў на дзядзінец.

За ім пашлі Галава і Сухарукі.

Яны накіраваліся нацянькі праз хмызьняк да таго лужка ля рэчкі, дзе цяпер біліся Дразды і Дзятлы.

Дразды і Дзятлы хоць ня так часта, як даўней, але не пакідалі старадаўняй традыцыі—біцца. Бяз гэтага было-б вельмі нудна, бяз гэтага жыцьцё застоілася-б, як вада ў сажалцы. А за што біцца заўсёды было: дзяльба лесу, сенакос, паша, патрава, карова чыя шкоду наробіць. Але, галоўным чынам, яны біліся за гонар. Прычыны былі толькі пацеркамі, якія нанізваліся на нітку гонару, хмельнага, як старое віно. Калі зірнуць глыбей, дык яшчэ па-за гонарам хаваўся галоўны дурнап'ян вечных боек паміж двума плямёнамі. Называць гэта можна хіба мастацтвам для мастацтва—змаганьне для самога змаганьня. Самы процэс бойкі хутчэй усяго служыў і мэтай. Гэта было як-бы

лазьняй, у якой Дразды і Дзятлы парыліся, мыліся і мелі вялікую прыемнасьць. Бойка асьвяжала кроў, улівала бадзёрасьць.

Праўда, пасьля Кастрычніка пачаўся быў у іх падзел на багатых і бедных і бойкі набывалі новы сэнс: ад пляменнай розьніцы яны перайшлі ў новыя формы няпрыязьні—экономічнага характару, але клясавае пачуцьцё ў іх ня мела патрэбнага разьвіцьця. На гэта былі розныя прычыны і перашкоды. Мудрагельны, сплецены ланцуг крэўнасьці (дзядзькі, браты, кумы і іншага роду сваяцтва) быў гэтаму галоўнай перашкодай. Кулак-дзядзька ўціхамірыць часам злосьць пляменьніка-бедняка пудам жыта ці асьмінай бульбы. Багаты кум заткне глотку беднага кума тым, што дасьць яму каня на дзень, каб гной вывозіць на поле. Такія ўчынкі былі як-бы падсьвядомым (а можа нават і сьвядомым) спосабам самаабароны ў багатых. Гэта памагала.

Але самым галоўным у імкненьні да роўнасьці, у стушоўваньні кулакоў і беднякоў, у стварэньні надклясавасьці была політыка Крушынскага ў сельсавеце.

Сельсавет знаходзіўся пад яго ўплывам увесь час. Крушынскі стараўся даваць усім заробкі, як і чым толькі мог. Па-ягонаму выходзіла, што беднякі—гэта тыя з сялян, якія не стараюцца, ня дбаюць аб сабе, запушчаюць гаспадарку. «Беднасьць,—гаварыў ён,—цягне да гультайства, абібоцтва. Бядняк і апошнюю сваю капейку гатоў прапіць, не шануе яе. Чым больш грошай хто мае, тым больш дрыжыць над рублём. Трэба быць багатым, каб шанаваць грошы».

Такая тэорыя была ў Крушынскага ў адносінах да іншых. Што тычыцца самога сябе (ён раскідваўся грашмі), дык ён гэта рабіў «на карысьць грамады».

Ён стараўся выхоўваць у беднякоў пашану да грошай. Толькі тады яны перастануць быць беднякамі. Але каб наладзіць дабрабыт, роўны для ўсіх, зноў-жа патрэбны грошы. Для гэтай справы варта і трэба папрацаваць. Спосаб здабываньня грошай? Дзеля такой важнай соцыяльна-экономічнай мэты ўсе спосабы магчымы. Патрэбна толькі моцная спайка, каб гэтыя спосабы былі вялікім сакрэтам.

Крушынскі абкружыў сваю «маленькую рэспубліку» (так ён называў той кавалачак тэрыторыі, які знаходзіўся пад яго ўплывам) мяжою сакрэту. Калі ўсё будзе наладжана тут паводле яго

пляну, калі роўнасьць паміж людзей ваколіцы Курганішча будзе давядзена да ідэалу, тады ён паднясе «сваю рэспубліку» ў падарунак савецкай уладзе. «Яго рэспубліка» будзе маленькаю мадэльлю вялікай рэспублікі будучыні, як маленькая мадэль новай машыны, новай вынаходкі.

«Мяжа сакрэту» вакол «рэспублікі» Крушынскага была досыць моцная. Ня было, разумееца, ні слупоў, ні капцоў на гэтай мяжы, ні ўзброенай варты, а нешта, як яму здавалася, мацнейшае, больш пэўнае і сталае. Ён так абставіў справу, што хто-б «з-за межы» не апынуўся на абшары зямлі гэтай «рэспублікі»—той пападаў пад уплыў яго тэорыі... Крушынскі так увіваўся каля «замежніка», так яго агітаваў, што «замежніку» ўжо ня было выгады выкрываць сакрэтаў «рэспублікі», бо гэтым нашкодзіў-бы самому сабе.

Такім чынам, была створана як-бы свая «замежная палітыка», саваё «міжнароднае становішча»—у раённым цэнтры, у акруговым. Нават у самой сталіцы—у Менску былі яго людзі, яго прыяцелі, якія дапамагалі ў справах «рэспублікі», працавалі на яе карысьць.

У «палітграмаце» Крушынскага галоўнай, самай яркай тэзай было:

... Змаганьне.

... Каб змагацца, трэба быць рэвалюцыянэрам.

... Рэвалюцыянэры зробяць рэвалюцыю.

... Рэвалюцыя давядзе людзей да шчасьця.

Адно слова «рэвалюцыя» давала Крушынскаму натхненьне ва ўсіх яго дзеях і ўчынках. Яно служыла як-бы жалезнай восьсю, на якой трымаліся калёсы «рэспублікі».

Слова «рэвалюцыя» было ў яго нейкім ясным сонцам, у праменьнях якога ён даўно грэўся. Яно было атулена поэтычнай традыцыяй пятага году. Крушынскі пашыраў яскравыя легенды аб тым, як у 1905 годзе ён раздаваў праклямацыі, як быў падстрэлены каля вагзалу ў Менску, калі многатысячная грамада чакала царскага маніфэсту.

Знак на левай руцэ яшчэ і цяпер застаўся ў яго ад гэтага стрэлу. Івану Мацьвеевічу—аднаму з самых таленавітых сваіх паслоў «па-за межамі рэспублікі»—ён аж тры разы паказваў сваю рану, «заслужанасьць перад рэвалюцыяй». Гэтую эмблему рэвалюцыянэра ён папулярызаваў, шмат каму паказваў.

— Каб на адзін вяршок правей папала куля, дык трапіла-б у самае сэрца, і мяне даўно на сьвеце ня было-б!

З гэтага трэба было ўжо дагадвацца, што адзін вяршок выратаваў цэлую «рэспубліку». Такі нязначны выпадак, сьмешны капрыс лёсу, а мае вялікае гістарычнае значэньне.

VII

— Хутчэй, суседзе, а то перарэжуцца, перадушацца!—сказаў Галава.

— Чуеце? Чуеце?—спытаўся Сухарукі і тармашыў Крушынскага за руку.

На хвіліну ён з двума бацькамі Драздоў і Дзятлаў спыніўся ў невялічкім густым бярэзьніку.

Усе наставілі вушы.

У цень, у вільгаць бярэзьніку прыносіліся глухія чалавечыя крыкі. Ляманты Драздоў і Дзятлаў зьліваліся ў адно дзікае войканьне, у жудасны звон. Паміж мужчынскімі басавымі галасамі чуваць былі жаночыя пісклівыя лаянкі.

— Мабыць, Дразды натаўкуць Дзятлаў,—сказаў Галава.

— Пэўна, Дзятлы выпусьцяць юху Драздом,—дадаў Сухарукі.

— Усе цэлыя застануцца. Няхай трохі пацярэбяць косьці!—пафілёзофску ацаніў гэту падзею ў сваёй «рэспубліцы» Крушынскі.—Рэволюцыянэры павінны змагацца! Я чытаў калісьці ў нейкіх проклямацыях такія словы: «Змагайся—зможаш!» Правільна было там напісана.

Яны вышлі з бярэзьніку ў сонечны прастор лугу.

Птушкі сьпявалі, як заўсёды. Сонца пазвычайнаму сьвяціла. Рэчка блішчэла. Але на сенажаці адбывалася сур'ёзная гістарычная падзея: поле бітвы разгортвалася ва ўсёй красе і магутнасьці.

Спачатку, на сьвежае вока, здавалася, што гэта ідзе нейкая гульня. Чалавек за чалавекам гоніцца. Некаторыя на жарт дужацца. Мігцяць у паветры калкі. Бабы адцягваюць мужчын. Дзьве грамады людзей то разыдуцца адны ад адных, то сойдуцца, сплятуцца, зьмяшаюцца ў жывую чалавечую кашу.

Не, гэта ня гульня. Гэта Дразды з Дзятламі б'юцца.

Не, гэта ня гульня. Бабы войкаюць. Мужчыны лаюцца.

Не, гэта ня гульня. Вочы ў людзей дзікія, валасы ўскудлачаныя, грудзі расхрыстаныя.

Косы тырчаць водаль, блішчаць на сонцы ў два шэрагі сталёвых вострадзюбых істот.

З аднаго боку косы Драздоў, з другога—Дзятлаў.

Касамі, праўда, хутчэй можна было-б вырашыць пытаньне: «хто каго», але кос шкода. Чаго добрага, ні за што, ні пра што, і каса на кавалачкі раздасца. А Дразды і Дзятлы гаспадары не абы якія—шануюць сваё дабро.

Калы, а болей усяго кулакі—самая ганаровая зброя ў Драздоў і Дзятлаў. Гэта зброя засталася ім у спадчыну ад дзядоў і прадзедаў. Яна зьяўляецца неофіцыйным гербам і цяперашняй невялічкай «рэспублікі».

Арэна бойкі з прыходам Крушынскага з двума бацькамі плямёнаў ажывілася.

Удзельнікі бойкі заўважылі іх і лічылі патрэбным не паконфузіць сябе перад людзьмі.

Важна было ня тое, за *што* біцца, але *як* біцца.

«Як біцца» было старым мастацтвам Драздоў і Дзятлаў.

Лужок быў кавалачкам сенакосу ў поўдзесяціны паміж сенажацямі Драздоў і Дзятлаў. Ён урэзаўся клінам у іхную зямлю яшчэ з старых часоў. Ён лічыўся раней уласнасьцю пана Семашкевіча.

Доўгія гады Дразды і Дзятлы судзіліся з Семашкевічамі за гэты кавалак. Тады політыка вымагала, каб яны разам адстойвалі свае права. А цяпер, калі новы гаспадар Курганішча некалькі год таму назад надзяліў ім большую частку зямельных абшараў Семашкевіча, дык ня зусім ясна вызначыў гэты лужок, пакінуў спрэчным. «Маленькае спрэчнае пытаньне ў рэспубліцы ня шкодзіць»,—меркаваў ён.—«Спрэчка не дае людзям драмаць. Улівае ажыўленьне ў застыглую кроў мірнага жыцьця».

За гэты лужок Дразды і Дзятлы штогод б'юцца.

Крушынскі заўсёды прысутнічае пры гэтым плямённым рытуале і захапляецца характвом жыцьця...

Пасьля ён іх мірыць.

Усё канчаецца лагодна. Усе здаволены яго пастановай.

З няменшым захапленьнем глядзіць на бітву Галава і Сухарукі.

Як адстаўныя генэралы, яны ўспамінаюць старыя часы, калі яшчэ іхныя равесьнікі біліся за гонар плямён.

А равесьнікі іхныя—сівенькія дзяды—цяпер водаль стаяць з аднаго і з другога боку. Стаяць і крычаць старчымі слабымі галаскамі:

— Ты яго ў бок! У бок!

— Во так! Во гэтак! Во! Во!

— У вока ня бі, сабачы сын! Няможна ў вока! Выб'еш!

— У патыліцу ня можна, разбойнік! заб'еш!

У іх існуюць адвечныя правілы аб тым, як біцца. Аднак, ня гледзячы на старыя законы Драздоў і Дзятлаў: адны адных не пакалечыць, заўсёды з поля бітвы яны выходзяць з лаўрамі героізму—заплыўшыя вочы, паломаная рабрына, выкручаны палец і апухлыя твары. Таксама некалькі кварт «чырвонай юшкі» застаецца на полі бітвы.

Галава і Сухарукі глядзяць на «тэатр ваенных чыннасьцяй» і ад перапоўненага настрою частуюць адзін аднаго тытуном...

— Ты майго тытуну папробуй!—кажа Галава.

— А чым мой горшы?—артачыцца Сухарукі.

— Не! Ты майго папробуй!

— Ты раней майго пакаштуй!

Тыцкаюць тытун адзін аднаму ў самыя грудзі.

— Ну, сып у люльку!

— Я-ж цябе частую!

У Галавы загарэліся вочы, сыплюць маланкамі ў бок Сухарукага.

У Сухарукага зазьвінелі ноткі злосьці ў голасе.

Урэшце, яны абмяняліся тытуном. Задымілі люлькі.

Крушынскі смаліць папяроску за папяроскай. Ня ведае, што з сабою рабіць, дзе дзецца ад вялікай радасьці.

... Дзятлы і Дразды яшчэ добра біцца ўмеюць. У яго «рэспублыцы» люд жыве кіпучым жыцьцём...

— Во-о-ох! Во-о-ох!—стогне зямля.

— Гэ-э-э! Гэ-э-э!—зьліваюцца ўсе крыкі ў нешта адно зьвярынае, дзікае.

Ва ўсіх азьвярэлыя твары. І ў тых, хто прымае гарачы, чынны ўдзел, і ў тых, хто наглядае і паддае ахвоты падбухторваньнем.

Гарацъ разьюшаныя твары. Вочы запалены дзікім агнём.

І ў Крушынскага такі самы выраз твару. Ход бітвы адлюстроўваецца і на ім.

Бабы—Дразьдзіхі і Дзятліхі—аддзяліліся ад мужчын і давай весьці змаганьне між сабою «духоўнымі мячамі»: пачалі сыпаць адны на адных кулямётамі лаянак. Тэкст лаянак вельмі багаты. Па камандзе яны пачалі ілюстраваць свой тэкст: авангарды бабскага войска і з аднаго, і з другога боку адвярнуліся адны да адных сьпінамі ў адзін міг, у мігаценьне вока (у гэтай стратэгіцы вялікае значэньне мае «хто раней»), і нагнуліся. Закасалі спадніцы...

— На!—раздаўся ліхі крык Дзятліх.

— На!—войкнулі ў гэты самы час і Дразьдзіхі.

Адваротныя бакі мэдаляў Дразьдзіх і Дзятліх гарэзьліва бліснулі на сонцы...

Адно і тое самае з абодвых бакоў.

Гэта не здавальняла. Дразьдзіхі і Дзятліхі выгукнулі ў стылю «здрам-жалам» адзін магутны дзеяслоў...

Пажарышча твараў, пагрозы, крыкі, ляманты.

Два плямёны—Дразды і Дзятлы—вышлі з роўнаvагі жыцьця, скінулі з сябе вопратку штодзеншчыны. Паветра, здавалася, было накалена, нагрэта да кіпеньня ад такога настрою, ад такіх учынкаў.

Нарэшце, з абодвых франтаў пачыналі як-бы «выбываць з строю».

Людзі змарыліся, засапліся. Глядзелі адны на адных і выдавалі нейкія хрыплыя гукі:

— Гу-у-у!

— Гэ-э-э!

Ад вялікай злосьці аднялася ў людзей мова.

Дразды і Дзятлы вярнуліся да становішча сваіх дагістарычных пра-пра-прадзедаў.

— Гу-у-у!

— Гэ-э-э!

Трохі адсапліся, і гісторыя чалавецтва зрабіла скок ад часоў пячэрнага чалавека да эпохі казачных былін.

Вышлі, высунуліся наперад два асілкі.

Адзін з боку Драздоў—плячысты і кароткі. Звалі яго Міхась Бочка. Другі з боку Дзятлаў—высокі і тонкі. Звалі яго Арцём Слуп.

— Во-во-во!—казалі Дразды.

— Так-так-так!—згадзіліся Дзятлы.

Пакуль што, апрача аднагукавых слоў, у іх яшчэ ня было іншых сродкаў выказваць сваю згоду на такі спосаб вырашэньня спрэчнага пытаньня.

Кожны год, калі вялася ў іх спрэчка, каму касіць лужок, дык вырашэньне пачыналася масавай чыннасьцю і канчалася індывідуальнай. Ход гістарычных падзей разьвіваўся тут у адваротнай форме.

Кожны год яны прыдумвалі новыя спосабы бойкі, новыя мэтоды. Эволюцыйны ход разьвіцьця паказваў тут свае неадменныя законы.

Бывала так.

Калі перамагаў Плячысты і Кароткі, Дзятлы хадзілі цэлы год панурыя і маўклівыя. Дразды сьвяткавалі перамогу.

Калі браў верх на полі бітвы Высокі і Тонкі, Дразды апускалі галавы. Дзятлам было цэлы год мора па калена.

І вось...

Сёлета...

— Хто каго?

Міхась Бочка сунуўся на Арцёма Слупа.

Арцём Слуп лез на Міхася Бочку.

— Хто каго?

Пагрозна блішчэлі цёмныя вочы ў Арцёма Слупа. Ён зьмерыў імі ворага зьверху ўніз—з галавы да ног.

Жудасна лыпаў сьветлымі бірузовымі вачыма Міхась Бочка. Ён зірнуў на ворага зьнізу ўверх—з ног да галавы.

— Наш маху ня дасьць!—думалі Дразды.—Шырокаплечы Бочка на тры кавалачкі разаб'е, як зьмяю, гэтага Дзятлюка!

— Наш возьме верх!—разважаў у думках кожны з Дзятлаў.—Высокі Слуп закоціць драздоўскую Бочку на край сьвету!

На арэну бітвы прыбеглі і тыя Дразды і Дзятлы, якія працавалі на сенакосе Крушынскага.

Яны трапілі якраз на самае цікавае, як-бы на смачную закуску бітвы.

— Хто каго?

— Ці Бочка Слупа, ці Слуп Бочку?

Слуп і Бочка змагаліся «па-божаму»: на кулакі.

Надыходзілі.

Разыходзіліся.

Елі вачыма адзін аднаго.

— Сьцеражыся, Бочка!

— Глядзі, Слуп!

Гонар двух пляменаў залежаў цяпер ад асілкаў.

Два чалавекі трымалі ў сваіх кулаках славу двух пляменаў і гордасьць маленькай «рэспублікі».

Крушынскі падышоў бліжэй.

Шалі справядлівасьці ён павінен трымаць у сваіх руках моцна і строга.

Тут павінна быць об'ектыўная крытыка—справядлівая, чэсная. Нельга прымаць пад увагу абліваньне балотам гарачых крытыкаў з лягераў зацікаўленых бакоў.

Ні Дразды, ні Дзятлы ня могуць быць шчырымі судзьдзямі ў пытаньні «хто каго»? Дразды цягнуць у свой бок, а Дзятлы— у свой.

— Хто каго?

Ад гэтакага «хто каго»? зноў стагнала зямля, войкала больш, чым раней, калі біліся грамадою, бо цяпер уся ўвага была зьвернута на Бочку і Слупа.

Кожны грук кулака здаваўся гарматным стрэлам. Тупат ног аддаваўся ў вушох вялікім стукатам.

Бітва двух асілкаў доўга цянулася. Няроўны рост праціўнікаў гэтаму быў прычынай.

Бочка мерыўся даць па галаве Слупу, а трапіў у жывот.

Слуп рыхтаваўся сыпнуць Бочцы па мазгаўніцы, а яго кулак гудзеў у пустым паветры.

Каб «пудлу ня даць», кожны з іх павялічваў свой спрыт. Кожны стараўся сьцерці свой фізычны мінус у гэтай справе тэхнічным плюсам. Каб згладзіць розьніцу росту, Бочка падскокваў угару, а Слуп згібаўся.

Кожны з іх пры гэтым перахапляў мерку і не пападаў у прыцэл.

Бочка падскокваў, і яго кулак жаўранкам круціўся над галавою Слупа.

Слуп згібаўся, і яго рука хлюпалася аб моцны жывот Бочкі.

— Го-го-го!—рагаталі Дразды.

— Га-га-га!—сьмяяліся Дзятлы.

Яны зусім страцілі сур'ёзнасьць.

Ня тое было з Крушынскім. Ён быў сур'ёзным арбітрам.

— Ціха!—крыкнуў ён на грамаду.

Слуп скрыгатаў зубамі.

Бочка пыхцеў, як паравоз.

Яны глядзелі адзін на аднаго няпрытомнымі, налітымі крывёю вачыма.

На момант абодва сьціхлі, як-бы аб нечым пабочным задумаліся.

А раптам...

Раптам яны зьмянілі тактыку бою.

Сашчапіліся ў адно.

Ніхто і не заўважыў, як гэта здарылася.

Бочка абхапіў Слупа за бакі, сьціснуў яго магутнымі рукамі, як жалезнымі абцугамі.

Слуп сашчаміў жылістымі рукамі галаву Бочкі.

Гэта былі страшныя абоймы. Ні то абоймы вялізнай дружбы і прыязьні, калі зараз людзі добрыя пачнуць цалавацца, ні то абоймы страшнай нянавісьці і сьмерці.

Але шыя Бочкі была, як дубовая калода, а бакі Слупа—як з чыгуна вылітыя.

Ніхто не паддаваўся.

— Душы, душы яго!—крычалі Дзятлы.

— Валі яго, валі!—раўлі Дразды.

— Г-г-гэ!

— Г-г-гэ!

І Слуп, і Бочка выдавалі адзін і той самы гук.

— Г-гэ-э!—рвалася з глыбіні моцных грудзей двух асілкаў.

Доўга кружылі карагод на адным месцы.

Нарэшце...

Крутнуў сваёй моцнай галавой Бочка, вырваў яе з рук Слупа, тузгануўся ў адзін і другі бок і... т-р-р-ах!

Слуп, нібы крыло ветранага млыну, закружыўся і грукнуўся вобземлю.

— Ой!—застагналі Дзятлы.

— Ага! ага!—узрадаваліся Дразды.

Слуп, як спрунжына, зноў ускочыў на ногі.

— Во! во! во!—паддавалі Дзятлы бадзёрасьці Слупу.

Напружнасьць дайшла ва ўсіх да таго, што жылы, як вяроўкі, выступалі на чырвоных тварах.

— Го-о-оп!—паднялі Дразды трубны крык перамогі.

Бочка трапіў якраз кулаком у вісок Слупа.

Асілак паваліўся і як-бы адразу заснуў, раскінуўся рукамі і нагамі, нібы на шырокай пасьцелі пасьля цяжкай працы.

Фінал бітвы вышаў яскравы і драматычны.

У мінулым годзе перамога была на баку Дзятлаў.

Сёлета пяршынства заваявалі Дразды.

Сам «лёс» справядліва дзеліць гонар паміж плямёнамі. Ён дзеліць гэты гонар па чарзе паміж Драздамі і Дзятламі.

Чэмпіёнам «рэспублікі» застаўся Бочка.

— Арцёма забілі! Забілі Арцёма! Людцы, ратуйце!

Туды і сюды, нібы кавалкі сьнегу, мітусіліся белыя хусткі ўстрывожаных баб.

Арцём Слуп ляжаў на стоптанай траве ў цэнтры грамады. Рукі раскіданы крыжам, далоні з растапыранымі крывымі мазалістымі пальцамі. Ногі разьняты цыркулем. Адшліфаваныя пяткі колеру чыгуна тырчэлі людзям на паказ. Выгляд слупа бяз слоў гаварыў Драздом і Дзятлам аб мізэрнасьці і хвілёвасьці чалавечай сілы.

Галава Арцёма Слупа была ўскінута. Выпуклялася цёмнажоўтая шыя, нібы падстаўленая пад нож разьніка. Чорная густая чупрына зблыталася з сьвежай травою. Пад сонцам пёкся твар—бледны, з зачыненымі вачыма. Па твары была разьліта надзвычайная супакойнасьць і незацікаўленасьць да ўсяго, што робіцца вакол. На лоб апусьціўся блакітны, кволы матылёк...

Мужчыны адразу абмяклі, апусьцілі рукі і аднэй грамадой (і Дразды, і Дзятлы) стоўпіліся вакол Арцёма Слупа. Яны былі цяпер зьбянтэжаныя, сарамлівыя, маўклівыя і ня ведалі, што рабіць.

Чалавечы выгляд і чалавечае пачуцьцё зноў відаць у абліччах Драздоў і Дзятлаў. Няма ніводнага злоснага твару. З вачэй сьвеціцца дабрата, празьмерная чуласьць.

Над лугам сьпяваюць птушкі, зьвіняць з нейкім захапленьнем. Пахне трава. Толькі цяпер Дразды і Дзятлы гэта заўважылі.

Арцёміха прычытвае над мужам, галосіць у поўны голас:

— А божа-ж мой! А людцы добрыя! Што-ж гэта сталася?

Дразды і Дзятлы маўчаць.

— На каго-ж ты, Арцёмка, пакідаеш мяне з дробнымі дзеткамі?

Арцём Слуп ляжыць спакойна без усялякага спачуваньня да лямантаў жонкі.

Толькі бабы ў знак згоды выціраюць вочы хусткамі і праклінаюць луг:

— Каб ён скрозь зямлю праваліўся гэты чортаў луг!

— Вечна кроў людзкая льлецца на ім!

— Каб яго сухавеі завеялі!

— Ціха вы, сарокі!—крыкнуў Крушынскі.—Прынясеце скарэй вады!

Па ваду пабег Міхась Бочка.

Ён прынёс поўную шапку вады і бухнуў на галаву Арцёма Слупа.

Арцём Слуп скрывіў губы і расплюснуў вочы. Блакітны матылёк пасьпеў выратавацца, узьняўся, закружыўся на месцы і плаўна замільгаў над галовамі Драздоў і Дзятлаў...

Міхась Бочка шчыра засьмяяўся:

— Го-го-го! Што чуваць на тым сьвеце?

Арцём Слуп лупіў вачыма ва ўсе бакі і сапраўды ня ведаў, дзе ён і што з ім. У вушох зьвініць. Неба падае на яго галаву лёгкай пасьцілкай. Недзе высока-высока над ім, вышэй летняга неба, стаіць грамада людзей.

— Яшчэ вады!—закамандаваў Крушынскі.

Зноў па ваду пабег Міхась Бочка. Ён гэта рабіў вельмі рупна і ахвотна.

Арцём Слуп глядзіць вакол сябе асалавелымі вачыма.

Міхась Бочка прынёс вады ў жбанку, напаіў Арцёма Слупа і зноў запытаўся:

— Што чуваць на тым сьвеце?

Толькі цяпер Арцём Слуп апамятаўся і сеў.

Успомніў, што тут здарылася, пачырванеў і мармытнуў сабе пад нос брыдкую лаянку.

— Што чуваць на тым сьвеце?—не адстае Бочка.

— На тым сьвеце мой бацька на тваім смалу возіць!—злосна сказаў Слуп і, як ні ў чым ні бывала, ускочыў на ногі...

Дразды і Дзятлы дружна гутараць між сабою, нібы нічога ня здарылася.

Усе глядзяць на здратаваны лужок.

— Шкада, дабро змарнавалася,—кажа Галава.

— Пэўна на два вазы сена стапталі,—дадае Сухарукі.

Яны зноў абменьваюцца тытуном.

Хвала пераможнікам!

Гора пацярпеўшым!

Вось выкрыкі, якія, нібы вострыя стрэлы, пранізваюць сівыя тысячагодзьдзі і б'юць у самае сэрца юнага «сягоньня».

Іншых законаў, здаецца, нельга спадзявацца і ў «рэспублікі» Крушынскага.

Але ў гэтай «рэспубліцы» ўмеюць накіроўваць плынь у адваротны бок, адважваюцца выступаць супроць законаў прыроды: слабейшы застаецца правым.

Трэба ўмець быць моцным, каб аддаць у падарунак праваты слабаму. Трэба ўмець заўважаць праз грубасьці жыцьця хараство дабраты і чуласьці.

Крушынскі ўмее.

Урачыстым голасам ён гаворыць Драздом і Дзятлам:

— Луг вы, суседзі, зараз-жа скасеце, а сена трэба аддаць Арцёму Слупу! Два гарцы самагону на гэту справу я даю.

— А ўсё-ж мы такі перамаглі,—кажуць Дрозды.

— Эх, вы! Для каго сена косіце? Для нашага!—адказваюць ім на гэта Дзятлы.

Зазьвінелі косы, зашорхалі па траве. Пачалі касіць лужок...

Арцём Слуп камандуе ўсімі. Ён на гэты раз гаспадаром.

Міхась Бочка, як вінаваты, працуе пад камандай Слупа болей усіх іншых касцоў старанна і паслухмяна.

У часе касьбы, ня гледзячы на тое, што Дразды і Дзятлы працуюць навыперадкі, аднак не змаўкае гамонка аб нядаўнай бойцы.

Цяпер загаварылі ва-ўсю пустыя брахуны.

Гэтага гатунку людзей у Драздоў і Дзятлаў многа.

Брахуны-Дразды даказвалі сваю правату, а брахуны-Дзятлы—сваю.

Брахунамі ў большасьці былі тыя, хто рукамі ніякага ўдзелу ў бойцы ня прымаў, а былі так сабе—з боку-прыпёку. Яны займаліся толькі «тэорыяй».

Адны гаварылі, што бойка павінна адбывацца чэсна, без падвохаў.

Другія казалі, што ў бойках галоўную ролю грае спрыт, а ня сіла.

Кожны з брахуноў даводзіў:

— Каб я камандаваў бойкай, дык вельмі добра ўсё скончылася-б.

Як гэта «добра ўсё скончылася-б» і чаму цяпер кепска скончана, ніхто з брахуноў ня тлумачыў. У душы кожны з іх зайздросьціў Арцёму Слупу.

— Нямаведама за якія «пролетарскія» заслугі яму застаўся гэты лужок.

Два брахуны (адзін Дзяцел, другі Дрозд) вялі цяпер між сабою заядлую бойку:

— Ты цецярук!

— А ты мышыны хвост!

— Контррэволюцыянэр!

— Ад такога чую!

Не кулакамі і не каламі біліся яны.

Языкі—самая прыстойная зброя.

Дразды і Дзятлы падбухторвалі да лаянкі сваіх брахуноў.

Галава і Сухарукі дазваляюць брахуном не касіць.

Брахуны вызвалены ад «грамадзкай працы», каб выконваць гэты-ж абавязак лаянкай.

Такі слоўны турнір веселіць касцоў абодвых лягераў.

Вясёласьць дапамагае ў працы.

VIII

У «рэспубліцы» Крушынскага ёсьць і «нацменшасьць».

Гады два таму назад пераехаў сюды стары каваль Лейба з сям'ёю. Раней Лейба жыў у мястэчку, але Дразды і Дзятлы хацелі мець свайго каваля. Каваль патрэбен быў і ў Курганішчы, бо там «машынабудаўніцтва» з кожным годам павялічвалася.

Крушынскі вызначыў для каваля кавалак зямлі; далі лесу на будоўлю, талакою пабудавалі хату, кузьню,—і «рэспубліка» ажыла. Ваколіца Драздоў і Дзятлаў аздобілася новым музычным інструмантам: звон малаткоў аб жалеза.

Ажыўляліся вечарынкі ў Драздоў і Дзятлаў, бо ў каваля былі дарослыя дзеці—сын Рахміська і дачка Мэра. Яны аку-

ратна хадзілі на ўсе вечарынкі і забаўляліся разам з вясковай моладзьдзю. Ня раз біліся маладыя Дразьдзюкі і Дзятлюкі за Мэру.

Стары каваль з сынам часам месяцамі працавалі ў Курганішчы. У Крушынскага была свая кузьня як для ўласнай гаспадаркі, таксама для заробкаў. Ён прадаваў сялянам павозкі на жалезных восях; гаварыў, што робіць гэта не для гандлю, а з тэй мэтай, каб суседзі мелі добрыя павозкі.

Кончыўшы справу з лужком, Крушынскі накіраваўся да каваля. Трэба было нарыхтаваць сярпы да жніва і паправіць пару панарадаў для возкі сена.

Кузьня Лейбы стаяла насупроць хаты на пагорку. І кузьня, і хата былі беленькія, новыя. Яшчэ пахлі сьвежай смалою.

Крушынскі быў зьдзіўлены, што з кузьні не раздаецца звычайнага звону. Падышоў бліжэй—кузьня зачынена. Прайшоўшы праз невялічкі, не абгароджаны дзядзінец, абросшы густа крапівою і палыном, ён увайшоў у хату.

І пабачыў нязвычайны, дзівосны абразок. Каваль Лейба качаўся па зямлі і стагнаў. Сівая барада была ўскудлачана. Вочы—няпрытомныя, дзікія. Вакол старога бянтэжылася ўся сям'я. Жонка плакала і ў роспачы рукі ламала. Дзеці глядзелі спалоханыя і стрывожаныя. Толькі старшы сын, Рахмілька, спакойна сядзеў на лаве і маўчаў.

Мэры ня было ў хаце.

— Што такое? Што здарылася?—шчыра занепакоіўся Крушынскі.

Стары Лейба сеў на падлозе і ўтаропіўся заплаканымі вачыма ў Крушынскага.

— Лейба, што з табою? Якая бяда?

— Каб я лепш галаву сваю скруціў у той дзень, калі перабраўся ў гэту хату! Няхай той дзень будзе чорным днём у маім жыцьці! Няхай той дзень будзе праклятым навекі-вечныя! Гэты дзень напоўніў мае вочы эгіпэцкай страшнай цемрай. Ужо ня будзе для мяне сьветлага дня! Ня будзе... ня будзе... Божы гнеў над маёй галавою вісіць... божы гнеў...

Стары гаварыў з біблійным патосам. Пералівы голасу аддавалі трагізмам прарока Езакіэля, які аплакваў зруйнаваны хорам Саламонавы.

Усе хатнія анямелі ад страху.

Вочы Лейбы блукалі па сьценах хаты, глядзелі насупроць і нічога ня бачылі.

— Што? Якое няшчасьце?

Каваль не адказаў на запытаньне. Ён грозна крыкнуў на жонку:

— Ты, ты ва ўсім вінавата! Матка павінна глядзець за дзяцьмі. Я-ж казаў, што вечарынкі да дабра не давядуць!

— Ці-ж я загадвала ім па вечарынках цягацца? Ці-ж я іх выпраўляла? Ці-ж я...

Старая заплакала, прыпёрлася галавою да цялесьнікаў і білася ў конвульсіях.

— Мамэ... мамэ...—крычалі спалоханыя дзеці...

Крушынскі стаяў на адным месцы і ня ведаў, што рабіць.

— Якое няшчасьце здарылася ў вашай хаце?—зноў запытаўся ён.

Каваль падняўся на ногі. Стаяў высокі і грозны. Няпрыязна зірнуў на Крушныскага, нават нянавісьць мільганула ў яго вачох.

— Няшчасьце! Няшчасьце!—перадразьніў ён Крушынскага.

Крушынскі яшчэ больш зьдзівіўся і адступіў на крок ад старога.

Лейба падышоў бліжэй, схваціў яго абедзьвюма рукамі за правую руку і пачаў трасьці.

— Няшчасьце! Няшчасьце! Каб ўсе няшчасьці, якія толькі ёсьць на сьвеце, скласьці ў адно, дык мае ўсёроўна пераважыць...

— Кажы, Лейба, толкам, у чым справа? Дачка памёрла?

— Горш!

— Атруцілася?

— Яшчэ горш.

— Можа зацяжарыла ад якого хлапца?

— Яшчэ горш...

— ???

— Яна... яна жэніцца з Марцінам Дразьдзюком. Вечарынкі ўсё гэта нарабілі. Мэра да яго сягоньня ўцякла. Я толькі рвануў яе за валасы. Уцякла.

— А нашто было рваць за валасы?

— Як нашто? За гэтае самае! Гэта-ж вялікі грэх. Шкадую, што малатком па галаве ня даў, шкадую, што насьмерць не забіў. Менш грэху было-б.

— Суседзе, нашто глупства пляцеш? Лепш вясельле гуляць будзем! Запішам іх у сельсавеце, і няхай жывуць!

— Ї я тое самае кажу!—засьмяяўся Рахмілька.

— Ціха ты! Чорт! Шэйгец! Гой!

Стары затупаў нагамі і кінуўся было з кулакамі да Рахмількі.

— Заб'ю! Ты яшчэ зубы шчэрыш?

Рахмілька адскочыў у бок.

— Каму вясельле, а мне хаўтуры! Гадуеш дзяцей, няньчыш, а потым яны ад цябе адыходзяць. Віхор-вецер з карэньнямі дрэвы вырывае, далёка-далёка ўносіць.

Стары Лейба давай рваць сівыя валасы, пачаў войкаць бяз слоў.

— Вось так ад раніцы...—заплакала старая,—звар'яцець можна.

— Ціха, Лейба,—пачаў лагодным голасам Крушынскі.— Няшчасьце не такое вялікае. Гэта-ж цяпер зусім новы сьвет, настаў, новыя парадкі пашлі. Мэра зьвязалася з добрым хлапцом. Будуць слаўна жыць. Гэта-ж другі бацька на тваім месцы радаваўся-б.

— Ай... ай... Не гавары... На літасьць боскую не гавары...

— Твая дачка ня першая і не апошняя. Сотні цяпер такіх. Ды што я кажу сотні—тысячы, дзесяткі тысяч.

— Але мне, бацьку, ад гэтага не лягчэй,—стагнаў Лейба.

Аднак, ён пачаў патроху супакойвацца. Сеў на лаву, папрасіў сесьці побач з сабою Крушынскага, і вочы ў яго трохі палагаднелі. Пагладзіў бараду, хацеў нешта сказаць, але стрымаўся. Некалькі разоў ўсё парываўся гаварыць. Кожны раз скоса зірне на Крушынскага і нічога казаць не адважыцца. Потым палажыў руку на плячо Крушынскага.

— Язэп...

— Што, суседзе?

— Можа, ты-б мне памог... Я і пасагу шкадаваць ня буду... Маю дзьвесьце рублёў... Аддам Марціну... Ты, Язэп, з ім пагавары... Тады сораму мець ня буду...

Ён шапнуў Крушынскаму на вуха некалькі слоў:

— Няхай толькі Марцін не баіцца. Рапарацыя лёгкая... Тады родным сынам будзе мне, бліжэй за роднага. Ведаеш, такія жыдоўскія хрэсьбіны наладзім.

Лейба паглядаў на Язэпа і чакаў ратунку.

Доўга Крушынскі стрымліваўся. Зірнуў на Рахмільку. Рахмілька міргнуў да яго.

І гучны рогат пакаціўся ад сьцяны да сьцяны.

Сьмяяліся і Рахмілька і Крушынскі.

Стары анямеў на месцы ў сваім, ні для кога незразумелым, вялікім горы. Ён сядзеў, як аглушаны доўбняй па галаве. Здавалася, што гучны сьмех не даходзіў да яго вушэй...

Нейк не па сабе зрабілася Крушынскаму ад такога выгляду старога. Ён змоўк. Твар яго зрабіўся сур'ёзным. Кіўнуў галавой да дзяцюка і вышаў з хаты.

Рахмілька выскачыў зараз-жа за ім.

— Вось што, Рахмілька, глупства гэта ўсё. Бацька супакоіцца. Ты мне сягоньня ўночы патрэбен. Як сьцямнее, будзеш мяне чакаць там, пад гумном.

— Добра.

Рахмілька быў адным з «дыплёматычных кур'ераў» Крушынскага. Свае сакрэтныя справы Крушынскі заўсёды праводзіў праз спрытнага Рахмільку.

«Нацменшасьць» прымала чынны ўдзел у самых сур'ёзных справах «рэспублікі».

— Значыць, да вечара?

— Вечарам пабачымся!

Крушынскі пашоў пыльнай вуліцай.

З-за вугла Марцінавай хаты паказалася кавалёва дачка Мэра.

Яна сярэдняга росту, тонкая і лёгкая. Чорныя валасы «стрыжка» роўнай лініяй вызначаюць тонкую шыю. Контраст колераў шыі і валасоў вельмі рэзкі, ад чаго Крушыскаму валасы Мэры здаюцца яшчэ болей чорнымі, а шыя болей белая. Чорнае з белым заўважалася і ў вопратцы Мэры. Яе твар таксама нейкае дзіўнае злучэньне чорнага з белым. На бледным твары вызначаюцца чорныя бровы і вочы. Тонкія губкі так сьціснуты, што замест іх—толькі вузенькі шрам.

Мэра падбегла да Крушынскага.

— Вы былі ў бацькоў?

— Быў.

Ён зірнуў ёй глыбока ў вочы.

У яе вачох столькі жальбы і такі выраз болю, ажна нешта кранула яго за сэрца.

— Як яны там? бацькі...

Мэра глядзіць на яго з доўгім запытаньнем. У яе вачох блішчаць сьлёзы.

— Нічога, супакояцца.

Тон Крушынскага лагодны, бацькаўскі.

— Мне іх так шкода...

— Перамелецца ўсё гэта—мука будзе. Выжывуць.

— Я іначай рабіць не магла.

— І вельмі добра зрабіла. Марцін лоўкі хлопец. Але бацька хоча, каб Марцін наладзіў сабе хрэсьбіны па-яўрэйску.

Крушынскі ўсьміхнуўся.

Мэра пачырванела.

— Бацькі мае хочуць свой гонар абараніць. Яны толькі сябе шкадуюць.

— А ты сябе шкадуй. І усё будзе добра.

Крушынскі вельмі цікавіўся жыцьцём «нацменшасьці» ў сваёй «рэспубліцы». Ён вёў барацьбу з дробнымі праявамі антысэмітызму, што калі-ні-калі адчуваліся сярод старых сялян. Ён даводзіў кожны раз пры выпадку, што ніякай розьніцы няма паміж яўрэямі і хрысьціянамі. Але праз некаторы час ён зразумеў, што такой гутаркай толькі робіць адваротны ўплыў—розьніца павялічваецца... Тады ён аб гэтым зусім кінуў гаварыць.—Лепш абмінаць гэтае пытаньне,—падумаў ён,—тады яно само сабою зьнікне.

Часам ён рабіў заўвагі суседзям, калі чуў ад іх выраз «горш жыда», калі іхныя дзеці лаяліся словамі «жыд—халамід». Ён гэта стараўся тлумачыць мякка, асьцярожна, каб не ўгнявіць. Пры гэтым вёў пропаганду ў тым сэнсе, што «жыд» такі самы чалавек, як усе іншыя.

Зьверху такім чынам было гладка. Крушынскі адчуваў прыемнасьць для самога сябе ад уласных слоў. Але, калі ён пачынаў капацца ўнутры гэтага пачуцьця, дык заўсёды выплывалі на ўзьверх: «а ўсё-ж такі»... Усё-ж такі такой блізкасьці да Лейбы ў мяне няма, як да якога-колечы Дразда або Дзятла. Нават да Рахмількі няма, хоць апошні ведае ўсе мае сакрэты.

Крушынскі адкрыў у сябе выпадкова гэта пачуцьцё, калі аднаго разу казаў сыну каваля: «ты Рахмілька, да жыда не падобны». Гэтым ён шчыра хацеў пахваліць Рахмільку, аднак, заўважыў па вачох Рахмількі, што той пакрыўджаны. Тады

Крушынскі задумаўся над гэтай пахвальбою—над сваімі словамі і зразумеў, што гэтым зганіў «жыдоў». Як-бы ён, Крушынскі, ні агітаваў супроць антысэмітызму, аднак, у яго глыбока ўнутры ёсьць гэтае «а ўсё-ж такі...»

Крушынскі вярнуўся дахаты. Івана Мацьвеевіча сустрэў на дзядзінцы. Твар у агронома быў заспаны. Ён сам нёс з лядоўні збан халоднага квасу.

— А я да гэтага часу спаў, Язэп Сымонавіч.

— Па твары відаць, Іван Мацьвеевіч. І вельмі шкадую, што не пашлі са мною. Шмат цікавага пабачылі-б.

Іван Мацьвеевіч піў квас з збана і на момант закрыў гліняным збанам свой твар ад Крушынскага.

Адсапнуўся.

— Ой, добры квас. Па маім рэцэпту зроблены. Цікавае, кажаце?

— Зноў Дразды і Дзятлы пабіліся.

— Гэта ня цікава. Вечна адно і тое самае. Я-ж сам тры разы бачыў.

— А мне вельмі падабаецца. За такое прадстаўленьне два гарцы самагону абяцаўся даць. Няхай балююць.

— І бойка, і самагон—гэта ўсё гнілы, стары быт. Чаму вы гэтым захапляецеся, Язэп Сымонавіч?

— Вось вам побач і новы быт. Жыдовачка, дачка Лейбы каваля, пабралася з адным хлапцом—з Драздоў.

— Чаго добрага, Дразды і Дзятлы і за гэта біцца пачнуць, як старажытныя грэкі за прыгожую Гелену,—сказаў Іван Мацьвеевіч і зноў прыгарнуўся да збана з халодным квасам.

— Мабыць, да гэтага ня дойдзе,—засьмяяўся Крушынскі.— У каваля падрастае другая дачка. Тая пажэніцца з Дзятлам.

Іван Мацьвеевіч выпіў квас да дна і з заклапочаным відам зноў пашоў у лядоўню.

— Я зараз, Язэп Сымонавіч. Пачакайце!

Іван Мацьвеевіч хутка вярнуўся з новым запасам квасу.

— Ага, ледзь не забыўся, Язэп Сымонавіч. Гэта-ж вунь на ганку свайго новага знаёмага пакінуў. Адзін стары. Вельмі падобны да Льва Талстога.

— Гэта-ж і ёсьць наш «Леў Талстой»! Вы, Іван Мацьвеевіч, да абеду з ім паталкуйце, а я пайду да касцоў. Пагаварэце з ім. Ён нават кнігі піша. Пасылае ва ўсе рэдакцыі, толькі нідзе ня друкуюць.

Крушынскі пабег на сенакос.

Іван Мацьвеевіч сеў на ганку каля старога дзеда, які ветліва ў яго запытаўся.

— Напіліся кваску?

— Выпіў і вам прынёс.

Іван Мацьвеевіч паставіў збан на ганку, дзе на газэце стаялі дзьве шклянкі.

Стары з сур'ёзнай паважнасьцю наліў з збана квасу ў абедзьве шклянкі.

Яму па выгляду было гадоў за шэсьцьдзесят. Сівыя валасы на галаве, доўгая жаўтавата-белая барада, сіваватыя бровы над маленькімі шэрымі вачыма надавалі старому выгляд патрыярха. Суцэльнаму ўражаньню перашкаджалі сялянскі кароткі пінджак, з шэрага самадзялковага сукна, і старыя боты.

Іван Мацьвеевіч, аглядаючы сівога дзеда, дваіўся ў сваіх пачуцьцях і адносінах да яго.

Зірне на твар дзеда, поўны старасьвецкай адухоўленасьці, і пачынае да яго зварочвацца на «вы» з павагай, з сваёй прывычнай далікатнасьцю і ўслужлівай чуласьцю. Гляне на вопратку старога, і пачынае казаць яму «ты», робіцца апатычным, незацікаўленым, і нават стыль гутаркі ў яго мяняецца. З складанай інтэлігенцкай формы сказаў ён пераходзіць на больш простыя словы. То падымаецца ў настроі, то апускаецца.

Глядзіць старому ў твар і пачынае гутарку:

— Дык вы кажаце, вандраваць любіце, маеце прывычку наглядаць над жыцьцём. Так. Чалавек вышэйшага калібру,—ну, скажам, надчалавек па Фрыдрыху Ніцшэ,—толькі так і павінен рабіць. Трэба стаяць вышэй дабра і зла. Дабро і зло існуе толькі ў агульным чалавечым стадзе. Праўда, гэта не па-марксыцку, але...

Раптам, зірнуў на сялянскую вопратку «Льва Талстога».

— Але ведаеш, дзядзя, дай, вып'ем квасу!

А вось, далікатна, элегантна чокаецца з «Львом Талстым». У Івана Мацьвеевіча зьявілася такая ўрачыстасьць на твары, нібы яны п'юць шампанскае.

Гэта было выклікана прыгожай барадой старога, на якую агроном выпадкова зірнуў у гэтую хвіліну.

— Вашы словы няясныя,—пачаў «Леў Талстой», паважна выціраючы вусы пасьля квасу,—тоісь, я хацеў сказаць, ваша гутарка наконт дабра і зла і аб стадзе (я разумею людзкім) адвакацкая, гэта значыць—мудрая. Наслухаўся я многа ізмаў. Але ўсё гэта адзін папізм! Так.

— Як гэта так?—вытарашчыў вочы Іван Мацьвеевіч.

— А так, папізм!

«Леў Талстой» пагладзіў бараду і глыбокадумна ўсьміхнуўся.

— Ну проста! папізм! ад слова поп! рэлігія! вера!

«Леў Талстой» блішчэў вачыма і казаў далей:

— Вера вышэй усяго на сьвеце! Я хацеў сказаць, што людзі ўсе моляцца богу. Тоісь, нават і нерэлігійныя моляцца. Я сам папом ня веру! Не прызнаю папізму!

Ноткі злосьці чуліся ў яго голасе.

Іван Мацьвеевіч лыпаў вачыма. Ён акінуў «Льва Талстога» выпытваючым поглядам з ног да галавы, пацiснуў плячыма і сказаў:

— Вельмі блытана гаворыш. Я ня ўцяміў сэнсу вашых слоў.

— Бяда ў мяне!—усхапіўся «Леў Талстой».

— Якая бяда?—спачуваюча запытаўся Іван Мацьвеевіч.

— Бяда ў тым, што я думаю адно, а гавару другое.

— Як гэта так? Вы ня шчыры?!

— Не, ня тое! проста не магу выказваць сваіх думак. Прывык усё на паперы пісаць. Дваццаць гадоў быў пісарам у земскага начальніка.

— Вось як! Гэта зусім іншае! А як вы аб веры сказалі? Я там ня ўсё зразумеў з тваіх разважаньняў.

— Я сказаў, тоісь я хацеў сказаць, што рэлігія ў чалавека жыве і па сягоньнешні дзень. Ці ён поп, ці ён рэволюцыянэр. Кожны з нас камусьці моліцца, перад нечым і нейкім на каленях стаіць.

— Так... цяпер разумею. А я чуў, што вы наогул пішаце, нават у рэдакцыі пасылаеш свае творы.

— Ёсьць гэты грэх у мяне...—уздыхнуў «Леў Талстой».— Чытаў я Льва Талстога, Дастаеўскага. Ёсьць шмат чаго такога ў іх, тоісь, я хацеў сказаць, разумныя былі людзі. А я—так! я

пішу. Вось трэба будзе калі зьезьдзіць у Менск у рэдакцыю і запытацца, чаму яны ня друкуюць.

— А што вы тут робіце?

— На воўначоску прыехаў. Тоісь, баба мая, я хацеў сказаць, прыехала. А я—так сабе. Тоісь, ня баба прыехала на воўначоску, а прывезла воўну на воўначоску. А я вось, прыкладам, маю тут свой альбом. Думаў, розныя людзі бываюць у Курганішчы, часам ня горш рэдакцыі якой. Я вам зараз прынясу свой альбом.

«Леў Талстой» падняўся з ганку і пашоў на гумно. Праз некалькі хвілін ён нёс адтуль вялікую, тоўстую кнігу поўаркушнага формату.

— Вось мой альбом. Вазьмеце з сабою ў Менск. Друкуйце там. Тоісь, я хацеў сказаць, ня друкуйце. Гэта значыць, перадайце там у рэдакцыю. Так. Можа што надрукуюць. А я цяпер вельмі заняты. Тоісь, баба мая вельмі занятая. Гэта значыць, што баба лаецца. Я хацеў сказаць, мне трэба ехаць. Так. Бывайце здаровы!

— Бывай! Бывайце здаровы!

«Леў Талстой» хутка пабег на гумно.

Адтуль чуваць быў жаночы крык:

— Не марудзь там, памяло сівое! Каб ты здырдзіўся, дай божанька! каб ты...

Іван Мацьвеевіч з зацікаўленасьцю разгарнуў на ганку альбом «Льва Талстога».

Верх кожнай старонкі альбому меў такі друкаваны тэкст:

Время посещения земским Начальником Волостного Правления	Замечания Земскога Начальника при посещении Волостного Правления	Отметки

На першай старонцы было напісана:

АЛЬБОМ
Красный сон мужыка
Н. Н. К.

Но как мужик
Я думал так:
Я был богат—
Щитал на миллионы;
Я был не рад;
Глупее быть вороны.

Я попривык
Жить на пятак,
Ворочай миллионы
Рабочий пиши законы,
Мужик глупее вороны.
Нет...

... Ì вершы піша,—усьміхнуўся Іван Мацьвеевіч,—а здаецца з кулацкім душком. Пабачым, што далей напісана.

Іван Мацьвеевіч перагортваў старонку за старонкай.

... Ì пчалярствам чалавек займаецца. Некалькі старонак аб пчолах напісана.

... А вось цэлая колекцыя грашовых знакаў ад мікалаеўскіх марак часоў вайны аж да апошніх—савецкіх.

... А вось хроніка падзей ваколіцы «Льва Талстога».

... А вос нейкія прытчы ў евангельскім стылі.

... Разважаньні аб папізьме.

... Цэлы сьпіс лекавых траў. Да некаторых і лацінская тэрмінолёгія прыпісана.

... Вялікі артыкул пад назваю: «Почему я не коммунист».

... Многа старонак пра Язэпа Крушынскага.

Іван Мацьвеевіч пералістваў альбом і надзвычайна цешыўся.

... Гладкі канцылярскі почарк, але вельмі няпісьменна пісана. Відаць, «Леў Талстой» быў простым перапішчыкам у земскага начальніка. Часам недрукаванае вартней за друкаванае. Вельмі орыгінальны чалавечы дакумант. Тут сказы, аднак, не такія блытаныя, як у жывой гутарцы «Льва Талстога».

... Можа што і для сябе карыснага знайду ў гэтым альбоме.

З поля ішоў Крушынскі. Іван Мацьвеевіч яго заўважыў, падняўся з ганку, панёс кнігу ў дом і схаваў у сваім чамадане.

... У вольны час дома буду чытаць.

У дзьвярах паказаўся Крушынскі.

— Давайце абедаць, Іван Мацьвеевіч! Агляд гаспадаркі будзеце заўтра рабіць!

— Так. Гаспадарка ваша не каза—ад мяне не пабяжыць. Пасьпеем і заўтра.

IX

Дзяўчаткі Крушынскага, Настачка і Мзей, займаліся рыбацтвам. У апошнія дні гэта было іх галоўнай забаўкай.

Праўда, рыбацтва—хлапцоўскі промысел, але сямігадовая Настачка і чатырохгадовая Мзей увесь час забаўляліся з хлопчыкамі і перанялі ўсе іх манеры, усю кемнасьць і спрыт маленькіх мужычкоў. Разам лазілі на дрэвы, разам разьбівалі птушы-

ныя гнёзды, пільнавалі дробных куранятак і качак ад каршуноў і наогул знаходзіліся ўвесь час у кампаніі хлопчыкаў.

Пасьля вялікага працоўнага дня дзяўчаткі Крушынскага заўсёды варочаліся дахаты падрапаныя, параненыя, мокрыя, запэцканыя ў рудаўках і лужах. Прыносілі з сабою жаб, яшчарак, птушак, вожыкаў.

Часам кідалі на матку гэтым дабром, каб паглядзець, «як мамка пужаецца».

Пані Ганна пішчэла ад страху. Дзеці сьмяяліся.

Пані Ганна была вельмі нездаволена паводзінамі дзяцей. Бывала, на цэлы дзень не адпускала іх ад сябе, каб яны не сябравалі з вясковымі «хамамі», каб не навучаліся ад «іх» брыдкіх слоў і ўчынкаў.

У часы такіх «арыштаў» дзяўчаткі вельмі сумавалі, плакалі і адмаўляліся ад яды. Галадоўкай ламалі ўпартасьць маці. Пані Ганна не магла даць рады. Скардзілася мужу. Ён сьмяяўся, радаваўся, што ў яго дачушак хлапцоўскі нораў.

— Якраз у мяне пашлі. І я такім у маленстве быў.

— Але-ж яны дзяўчаткі!

— Я ў гэтым невінаваты. Калі няма хлапцоў, дык няхай дзяўчаткі гадуюцца як хлопцы.

— Сапсуюцца дзеці. Што з іх будзе? Што з іх будзе?

— Нічога кепскага ня станецца. Трэба толькі даць ім волю, тады будзе добра.

— Волю, волю!—перадразьніла яна мужа пісклівым галаском.—Ліха наробіш гэтай воляй. Нават дарослыя людзі распусьціліся ад тваёй волі. Табе на галаву лезуць. Зараз курам і індыкам волю дасі.

— Захачу—і дам. Не твая бабская справа.

Так заўсёды канчалася гутарка паміж Крушынскім і жонкай аб выхаваньні дзяцей і волі.

Гэтае пытаньне паднесьлі на грамадзкі суд Івана Мацьвеевіча.

— Цікава, што скажа Іван Мацьвеевіч: ці мая праўда, ці твая?—гаварыла пані Ганна.

Пры гэтым яна пазірала на Івана Мацьвеевіча, як на збаўцу, як на чалавека шляхетнага, вучонага, які добра разумее, што яна, пані Ганна, мае рацыю.

— А праўда, няхай Іван Мацьвеевіч вытлумачыць табе, што ты дура, што ты нічога ня цяміш у выхаваньні дзяцей, ні бэлмэса не разумееш.

Сказаўшы гэта, Крушынскі хітра міргнуў Івану Мацьвеевічу.

Агроном павінен быў вырашыць вельмі цяжкую проблему, нават не адну, а некалькі.

Ён разважаў сам з сабою:

... Калі, паводле майго вырашэньня, права будзе за гаспадаром, тады гаспадыня пачне на мяне касавурыцца. А гэта справа нявыгодная, бо ніхто, як пані Ганна, так ня ўмее карміць смачнай і сытнай ежай. Калі яна возьме перавагу, паводле майго прысуду, тады Язэп Сымонавіч ня будзе мець на мяне добрага вока. Гэта будзе яшчэ горш. Калі іх абодвых вінавaціць і зрабіць так, каб я асудзіў іх—гэта зусім не гадзіцца. Зьб'еш іхны гонар—і мой пацерпіць.

Такія развагі прамільгнулі ў думках Івана Мацьвеевіча хутка, у мігаценьне вока.

— Па-мойму,—сказаў ён павольна, расьцягнута і кожнае слова шліфаваў, нібы дарагі камень, і спынкі між словамі цадзіў, як малако праз цадзілку,—па-мойму, Язэп Сымонавіч гаворыць праўду.

Пані Ганна выставіла на яго пару зьдзіўленых і пакрыўджаных вачэй.

Крушынскі зазьзяў ад радасьці іківаў галавою ў знак згоды.

— Справа ў тым,—гаварыў далей Іван Мацьвеевіч,—што дзецям, бязумоўна, патрэбна воля. Гэта раз. А па-другое, нельга іх адрозьніваць ад іншых дзяцей. Трэба выхоўваць у іх адмаленства пачуцьцё колектыву, сяброўства, бойкасьці, адвагі. Трэба, каб дзеці, ці хлопчыкі, ці дзяўчынкі, загартоўваліся і целам, і думкамі. Словам, Язэп Сымонавіч у даным выпадку разумна разважае.

Пані Ганна стрэльнула на Івана Мацьвеевіча атрутаю злосных вачэй.

Крушынскі спагадліва кіўнуў агроному і пальцамі правай рукі зрабіў жонцы доўгі нос ў знак перамогі, сказаўшы адно толькі слова—кплівае, абражаючае, атруйлівае:

— А-г-га.

Іван Мацьвеевіч спакойным дасьледчым вокам зірнуў у адзін і ў другі бок: правяраў на практыцы эфэкт сваіх слоў, праўдзівасьць сваёй тэорыі.

... Так. Я не памыліўся.

І дзеля таго, што не памыліўся, яму стала вельмі прыемна. Яшчэ раз зірнуў на Крушынскага і на паню Ганну, яшчэ раз упэўніўся, што яго тэорыя правільная: выразы іхных твараў застыглі ў тых характарных масках, якія ён на іх насунуў сваімі развагамі.

Яму было вельмі цікава глядзець цяпер на Крушынскіх. Нібы гэта ён сваёю рукою намаляваў два портрэты. Нібы пані Ганна і Язэп Сымонавіч—яго ўласныя творы.

Гэты досьлед заняў у яго зноў-жа толькі частку хвіліны. Ніякіх спынкаў у гутарцы ня было.

І вось ён пачаў гнуць кій у другі бок:

— Але калі мы будзем разважаць глыбей, калі мы ўнікнем у самую істоту справы выхаваньня дзяцей, дык выйдзе, што пані Ганна дарэчы гаварыла. Дай дзецям волю, пусьці іх бяз дагляду—сапсуюцца. Дзіцё за свае ўчынкі не адказвае. Цяпер наконт сяброўства з іншымі дзяцьмі, у даным выпадку з дзяцьмі суседніх сялян. Факт, што сялянскія дзеці гавораць брыдкія словы. Яны заўсёды запэцканыя, брудныя. Факт, што яны не раўня да вашых дзяцей. А кепскаму заўсёды лягчэй навучыцца, чым добраму. Кепскае сяброўства шкодна і для дарослых. На мой погляд, пані Ганна мае рацыю.

Іван Мацьвеевіч зноў давай правяраць новы эфэкт: нібы граў на музычным інструманце і прыслухоўваўся пры гэтым, ці не фальшывіць.

Не фальшывіць.

Муж з жонкаю памяняліся ролямі.

Ён паглядзеў на Івана Мацьвеевіча як на здрадніка, як на шальмяца самага нізкага гатунку.

Яна кінула спагадлівы ўзрок шчырай удзячнасьці на Івана Мацьвеевіча, а свайму мужу вярнула яго тавар у дубальт: зрабіла яму нос доўгі-доўгі—не на пяць пальцаў, а на ўсе дзесяць...

Тут Іван Мацьвеевіч у поўнай меры адчуваў сваю ўладарнасьць над людзьмі: ён перарабляе чалавека паводле ўласнага

хаценьня; надае двуногаму формы паводле свайго капрысу ня менш таленавіта за бога, які стварыў Адама і Эву.

Гордасьць блішчэла ў яго вачох.

Ён пакіраваў шалі чалавечых пачуцьцяў у адзін бок, у другі; нацешыўся сваёй ігрою злосна, па-разбойніцку—і годзе. Цяпер трэба наладзіць роўнавагу. Роўнавага—гэта залаты якар жыцьця. Роўнавага—жалезна-бэтонны мост чалавечага дабрабыту.

Кароткія спынкі, якія Іван Мацьвеевіч даў раней Язэпу Крушынскаму, а пасьля—пані Ганьне для таго, каб кожны з іх часова цешыўся сваёй перамогай над другім, хвілёвасьцю займалі ня больш часу, чым шыпеньне гарачага папяроснага акурка, кінутага ў лужыну: акурак, акунуты ў вільгаць, пшыкне разок і змоўкне. Толькі бледны дымок пакружыцца над ім і расьсеецца ў нявідочнасьць.

Ён пачаў тушыць акуркі:

— Так. Але тут такая справа, што калі праў адзін, дык гэта яшчэ ня значыць, што другі ня праў. Правы і Язэп Сымонавіч, і пані Ганна. Насы выстаўляць адзін аднаму, выбачайце, зусім лішняя турбота. Можна і бяз гэтага... І абодва вы няправы...

Крушынскі і яго жонка ў гэту хвіліну сапраўды выглядалі, як патушаныя папяросы. Напружнасьць перамогі аднаго над адным аслабла ў халоднай вадзе разважаньняў іхнага прыяцеля. Яны цяпер абодва няпрыязна глядзелі на Івана Мацьвеевіча. Ён зьбіў аўторытэт кожнага з іх.

— Толькі ня крыўдуйце на мяне, мае дарагія!—прасіў літасьці агроном.

— Калі ласка, калі ласка!

— Проша, проша!

— Як муж бяз жонкі—ня муж, а жонка бяз мужа—ня жонка, бо адзін надае сабою годнасьць і магчымасьць другому, таксама і правата кожнага з вас, пані Ганна і Язэп Сымонавіч, можа быць праватою моцнай, практычнай і жыцьцёвай, калі яны будуць зложаны разам у адно. Як гэта зрабіць? А зусім проста. Язэп Сымонавіч кажа, што дзеці павінны мець волю, павінны гуляць разам з мужыцкімі дзецьмі, бо цяпер зусім іншы час настаў—вельмі правільна. Пані Ганна даводзіць, што ад сялянскіх дзяцей навучацца вашыя шляхетныя дзеці брыдкіх учын-

каў, што лішняя воля сапсуе дзяцей—згодзен і з гэтым. Дык зноў-жа, як зрабіць, каб усё было добра?—А вос як: выбраць з сялянскіх дзяцей самых лепшых, ну, скажам, тых, якія маюць багацейшых бацькоў... Наняць для іх разам з вашымі настаўніцу (у Менску многа такіх знойдзецца, якія да вас у Курганішча ахвотна паедуць), і яна зоймецца выхаваньнем. Пад наглядам настаўніцы будуць ня толькі вучыцца, але і забаўляцца ў пакоях або ў полі разумна і карысна.

Гэты проект спадабаўся і Крушынскаму, і пані Ганьне. Такое меркаваньне перакінула кладку па канаве, пракопанай між імі частымі сваркамі аб выхаваньні дзяцей.

Выбар настаўніцы зноў-жа выклікаў цэлы шэраг пытаньняў, меркаваньняў і спрэчак. У сувязі з гэтым разгортваліся новыя кругавіды.

Першым чынам, настаўніца ў хаце—гэта ня хатняя працаўніца, ня кухарка, ня жнейка і не пастушка. Мала таго, што ёй трэба даць асобны пакой, а ня куток у пакоі, прыдзецца ўсім у хаце падцягнуцца, перайначыць хатні быт, глядзець зусім іншым вокам за сабою, каб ня было сорамна перад гарадзкой дзяўчынай. Апрача таго, прыдзецца пакласьці трохі энэргіі, пакуль яна зробіцца сваім чалавекам—шчырым сябрам сям'і.

І вось будучая настаўніца (контроль сямейнага ладу Крушынскіх) прымусіла Язэпа Крушынскага, паню Ганну і Івана Мацьвеевіча аб многім думаць кожнаму паасобку і разважаць разам.

Язэп Крушынскі думаў:

— Які ў мяне густ? Ад гэтага залежыць выбар настаўніцы. Галоўным чынам, яна павінна быць маладою. Гэта—першая карысьць ад жанчыны. Па-другое, яна павінна быць прыгожай. Гэта—добры дадатак да яе маладосьці. Тут я мушу даць адказ на запытаньне аб маім гусьце: блёндынка, шатэнка, чарнявая, брунэтка, бялявая, голас, манеры, фігура і гэтак далей, і гэтак далей.

Перад уяўленьнем Язэпа Крушынскага праходзіла цэлая галерэя знаёмых дзяўчат, якія яму падабаліся. Некаторых ён кахаў. З іншымі меў прыязныя зносіны. З нямногімі былі ў яго самыя блізкія, самыя прыемныя хвіліны ў жыцьці. Ён праверыў такім чынам свой мужчынскі густ і прышоў да пэўных вывадаў.

— Харaство кабет не аднолькавае і вельмі багата па сваёй рознастайнасьці. У мяне ў гэтым пытаньні погляды вельмі шырокія.

Ён круціў элегантныя вусы і многазначна ўсьміхаўся, думаў аб багатых пэрспэктывах, якія чакаюць яго ў сувязі з настаўніцай.

Пані Ганна меркавала:

— Самае лепшае, калі настаўніца сярэдніх гадоў, няпрыгожая, а то—павер мужчынам: мой Язэп вельмі лёгкадумны, зноў наробіць мне сораму, як у мінулым годзе са служанкай. Калі настаўніца сталая кабета, тады яна будзе вучыць дзяцей і богу маліцца. А то прыходзіцца мне самой кожную раніцу з імі малітвы казаць. Абавязкова настаўніца павінна быць каталічкай.

Іван Мацьвеевіч разважаў:

— Курганішча набудзе новыя прывабы. Мне куды прыемней стане часам пабыць тут некалькі дзён, калі фальварак аздобіцца маладой і прыгожай дзяўчынай.

Хоць побач з такой думкай яго трохі палохала будучая чараўніца палёў і лясоў Курганішча. Яна напомніць яму аб ранейшай жонцы. Але зусім магчыма, што якраз прыгожая дзяўчына будзе для яго душэўнай раны гаючымі лекамі.

Свае думкі ўголас выказала адна пані Ганна (толькі частку думак).

— Настаўніца павінна быць сярэдніх гадоў і каталічкай, каб вучыла дзяцей богу маліцца.

Спрэчкі аб рэлігійным выхаваньні былі кароткія. Язэп Крушынскі—бязбожнік.

— Апрача таго,—сказаў Язэп Крушынскі,—сярэдніх гадоў настаўніцу не дастанеш, бо яна або замужняя, або ўдава з дзецьмі. Такая, калі нават згодзіцца паехаць, дык толькі на некалькі месяцаў і то будзе вечна думаць аб сваёй сям'і. Гэта перашкодзіць заняткам.

— Няхай маладая дзяўчына,—згадзілася пані Ганна з мужчынскай лёгікай мужа,—але, прынамсі, трэба дастаць ня лялечку, ня прыгожанькую, а то...

Пані Ганна спынілася і паставіла пры слове «то» многакроп'е.

Язэп Крушынскі адчуў гэтае многакроп'е на сваёй сьпіне нібы калючы жвір.

Івану Мацьвеевічу здалося, што пані Ганна ў гэтую хвіліну заглядае ва ўсе сакрэты і яго душы, чытае яго грэшныя думкі і перачытвае, нібы стары дзяк псалтыр, надрукованы буйнымі літарамі.

Толькі адну хвіліну пані Ганна зірнула на мужа і агронома. Яна давяла сваю думку да канца:

— ... а то настаўніцы ў галаву не палезе выхаваньне дзяцей, бо адбою ня будзе мець ад тутэйшых хлапцоў, ад пагранічных вайскоўцаў, якія часта ў нас бываюць.

Сваім важным довадам супроць прыгожай дзяўчыны пані Ганна пашкодзіла самой сабе, бо дала магчымасьць Язэпу Крушынскаму зараз-жа адкінуць гэты довад. Ён гэта зрабіў вельмі таленавіта, красамоўна і з вялікім натхненьнем:

— Во, во, жонка, дзякую, што напомніла... Якраз такая дзяўчына і патрэбна. Яна павінна ўмець прываблівадь мужчын. Чытаў я калісьці «Тайны Мадрыцкага двара», «Шпіёнку кайзэра Вільгельма» і многа іншых цікавых гісторый і зразумеў вялікую сілу прыгожых жанчын. Прыгожая жанчына—сталёвы кручок, на які бярэцца самая тлустая рыба. Прыгожая жанчына за кулісамі трону кіруе дзяржавай. Прыгожая жанчына адыгрывае вялікую ролю ў справах любой краіны. Прыгожая жанчына акутвае залатой павуцінай самых разумных людзей—і гарачых юнакоў, і сівых мудрацоў.

Такое частае паўтарэньне слоў «прыгожая жанчына» вельмі прыкра адбівалася ў вушох пані Ганны, нібы шпількі калолі яе жаночае самалюбства. Яна часта папраўляла хустку, выбівала з-пад яе жмуток рэдкіх бялявых валасоў і станавілася ў позу. Гэтым бяз слоў гаварыла:

— А чым-жа я ня прыгожая жанчына?

Язэп Крушынскі ў хмелі красамоўства не заўважыў выразнай позы жонкі і разьвіваў далей думку аб прыгожай жанчыне. Ён перайшоў ад абстрактнага да конкрэтнага:

— І маёй маленькай рэспубліцы патрэбна прыгожая жанчына. Часам нейкае ліха здарыцца—выратуе прыгожая жанчына, наша будучая настаўніца... Часам... але што доўга аб гэтым гаварыць.

Дэталізаваць свае думкі Язэп Крушынскі лічыў нетактоўным перад гасьцём.

Справа была вырашана.

У самы блізкі час трэба будзе прывесьці з Менску маладую настаўніцу для дзяцей. У сувязі з гэтым кожны з удзельнікаў нарады па-свойму маляваў пэрспэктывы Курганішча.

Дзеці забаўляліся на полі каля рэчкі. Гэта было пасьля абеду. Крушынскі і Іван Мацьвеевіч ляглі адпачыць.

Сонца зьнізілася. Каля лесу прытуліўся густы цень. Настачка і Мзей забаўляліся каля рэчкі: разам з вясковымі дзецьмі «лавілі рыбу».

Мзей мела на гэту справу свой самастойны погляд: ракушак называла мянтузамі, «жабіны начовачкі»—плоткамі, а даўгаватыя каменчыкі—шчупакамі. Маленькіх плотачак, якіх часам удавалася хлопчыкам злавіць у «невадзе» (у кашульцы), Мзей называла зьмейкамі.

Старшая сястрычка, Настачка, ёй ня раз рабіла заўвагі голасам сталага чалавека:

— Дурненькая, гэта ня зьмей, а плотачка!

— Зьмей,—артачылася Мзей.

— Плотачка.

— Зьмей.

— Плотачка, плотачка, плотачка!

— Зьмей, зьмей, зьмей!

Кожная заставалася пры сваіх поглядах. Спрэчкі гучэлі пустымі словамі.

— Я не хацу каб п'ётацка,—настойвала Мзей,—я хацу, каб зьмей. Але гэты зьмей маенечкі, маенечкі. А вось зьмей вякі, ст'яшны... уй...

Мзей называла «вякім ст'яшнім зьмеем» тонкі дубец. Яна махала ім у паветры і крычала:

— Зьмей, зьмей, ст'яшны...

Дубец гнуўся. Яна кінула яго на зямлю, адскочыла ў бок і давай шчыра крычаць:

— Настачка, баюся зьмея!

— Дурненькая, гэта-ж ня зьмей,—супакойвала Настачка матчыным голасам,—гэта-ж кіёчак.

— П'яўда?

Мзей засьмяялася і зноў узяла ў рукі тонкі дубец.

— Кінь, кінь! Гэта зьмей!—жартавалі хлопчыкі.

Мзей зноў кінула дубец з такім страхам, нібы трымала гарачы вугаль.

— Не палохайце малую!—залемантавала Настачка, тулячы да сябе Мзей,—а то я заплачу і мамцы скажу.

Кончыўся фокус фараонаўскіх жрацоў з кіем і зьмеем.

Хлопчыкі зноў браліся «лавіць рыбу». Плёхкаліся ў вадзе і настаўлялі кашулькі, як рыбалоўныя сеткі.

— А цяпер будзем сушыць кашулі,—падаў адзін з кампаніі новы проект.

Дзеці пусьціліся на ўзгорак, на даўно ўзораны курган.

— Будзем у пяску качацца, дык кашулькі хутка высахнуць!—параіла Настачка.

Усе доўга качаліся ў пяску.

— Ага, грошык знайшла!—узрадавалася Настачка.

Яна знайшла ў пяску старадаўнюю монэтку.

— Давай, хлопцы, капацца ў пяску, знойдзем і мы!—сказаў галоўны «рыбалоў» Язэпка.

— Давайце, давайце!—узрадаваліся дзеці,—знойдзем скарб.

— Сымон Чарнюк казаў, што тут скарб захованы,—пацьвердзіў Язэпка.

Дзеці старанна капаліся ў пяску. Знайшлі некалькі чарапкоў, пацеркі, заіржавелыя масяндзовыя цацкі.

— А мой бацька,—пахваліўся Язэпка,—малаток каменны тут знайшоў. Усё тут ёсьць!

Да мокрых кашуль дзяцей прыстала многа пяску.

— Ой, маці біць будзе!—падняла трывогу Настачка.— Хадзем купацца. А тады пойдзем у лясок шукаць скарбаў. Дзед гаварыў, што і ў лесе многа скарбаў.

Дзеці з вялікім запасам розных цацак у руках зноў пашлі купацца.

Пасьля купаньня Настачка зрабіла «экспэртызу» над вопраткамі дзяцей.

— Цяпер самая злосная мама ня будзе мець да чаго прычапіцца!—сказала яна.

Усе накіраваліся ў лес.

— Дзеці, глядзеце!—задзівілася Мзей.—Вунь маенечкі конік, маенечкі, мае-енечкі... Вось гэстачкі, як паец.

Мзей паказала велічыню коніка—выставіла на паказ свой тоненькі пальчык.

Па сіўцы пасьвілася кабыла з жарэбчыкам.

Дзеці пагналіся за «маленечкім конікам». Кабыла пачала злосна стрыгчы вушамі, кінулася на дзяцей.

Яны ўцяклі.

— Вось і лясок.

Маленькая Мзей яшчэ ні разу тут ня была.

Яна ішла ціха, азіралася па бакох з такой зацікаўленасьцю, нібы ўваходзіла ў казачныя палацы або ў нязьведаны, дзіўны край. Каб быць болей харобрай і адважнай, яна тулілася да «вялікай» Настачкі, якую лічыла надзвычайным аўторытэтам:

«Настачка ўсё ведае»...

У ляску бялеюцца стромкія бярозкі. Дзе-ні-дзе, як стагі сена з завостранымі вярхамі, стаяць прысадзістыя елкі. Яны ледзь рухаюць цёмназялёнымі лапкамі. Месцамі дрэвы гуртуюцца шэрагамі. Між імі пратоптаны сьцежкі, і лясок выглядае паркам з роўнымі прысадамі, насаджанымі людзкімі рукамі. Месцамі, нібы шчаціна на аграмадным япруку, тырчаць маладыя зарасьнікі, красуюцца тоненькія дубочкі. Часам сустракаюцца гушчэчы. Там цёмна і ў вечным ценю пахне вільгацю.

Самы адважны хлопчык, Язэпка, водзіць дзяцей па вытаптаных сьцежках. Тлумачыць на кожным кроку:

— Вось бачыце—гэта муравельнік. Але мурашкі кусаюцца, блізка падыходзіць нельга. А вось зайцава шчаўе. Можна есьці.

Дзеці пробуюць кіслую траўку.

— А вось гэта—мядовая кветка. Трэба смактаць.

Дзеці смокчуць дзяцельнік.

— Я вам пакажу месца, дзе сунічкі растуць і мухаморы,— хваліцца Язэпка.

Сьпяваюць птушкі. Дзе-ні-дзе мігацяцца матылькі, гудзяць мухі.

Дзеці з цікавасьцю прыглядаюцца і прыслухоўваюцца. Раней яны толькі здалёк бачылі гэты лясок. Ён стаіць як-бы адгароджаны ад лугу і ўсёй ваколіцы вабнай таямніцай, недаступным замчышчам, дзе, паводле казак старых бабулек, жыве калматы, страшны лясун з лютай ганьнёю ваўкоў.

Дзеці шчыра вераць у гэтыя байкі.

Ніхто з іх не адважыўся-б адзін пайсьці. Але Язэпка не баяўся: часта тут бываў.

Лясная казка палохае і прываблівае да сябе дзяцей. Як маладыя зьвяркі, яны нюхаюць паветра. Пах лесу казлыча ноздры і павялічвае настрой казачнасьці.

Густыя папаратнікі, невядомыя расьліны, з вялізнымі чырвонымі, як-бы акрываўленымі, лістамі, чорныя карчы, падобныя здалёк да скорчаных зьвяроў, да людзей у розных позах, будзяць дзіцячую фантазію.

Дзесьці ў кустох ляшчыны плача птушка.

Дзеці прыслухоўваюцца да лясных галасоў, да шэпту і скрыпу дрэў, ідуць глыбей у лес—у самыя чароўныя куткі. Звычайны дубовы лісток, засохлае скрыдлачка матылька дзівіць іх тут сваімі цудамі і хараством. На дубовым лістку, нібы на руцэ чалавека, знаходзіцца цэлая пляцёнка жылак: многа-многа, дробненьніх-дробненькіх. Каб заплюшчыць вока і глядзець доўга на гэтыя жылкі (як робіць Настачка), дык яны нагадваюць вялізны густы лес... А то падобны да цікавай прыгожай тканіны.

Настачка ірве лісткі.

А якая прыгожая цацка—скрыдлачка матылька. Гэтулькі колераў, столькі бліскучых залатых крапінак, сініх вочак і празрыстых галіначак на гэтым скрыдлачку—не надзівішся...

Тое, што дзеці каля сваіх хат на кожным кроку бачаць ды не заўважаюць, тут у лесе выпукляецца, набывае надзвычайную яркасьць і прывабнасьць. Цікавыя рэчы адганяюць страх, цягнуць у глыб лесу, у нябачаныя таямніцы...

Жаласьліва стогне птушка. Шушукаецца лісьцё на дрэвах. «Шу-шу-шу»...—шапацяць тысячы вуснаў.

«Квох-квох-квох»,—квохча нешта ў лужыне.

— Баюся,—ціха кажа Мзей.

— Ня бойся, маленькая,—супакойвае Настачка.—На табе птушынае малако!

Настачка нагінаецца, адрывае траўку пад назваю «птушынае малако». З сьцяблінак мяккай расьліны паказваецца густы і белы, як малако, сок.

— Гэта маяко п'юць птушкі?—цікавіцца Мзей.

— Птушкі.

— І я хацу піць.

— Няможна—горка. Фэ.

Настачка вырывае траўку з рук Мзей.

— Тады я зноў буду баяцца!

— Ня бойся, маленькая. Кажы малітву, як мамка вучыла, і ня бойся.

— А як казаць маітву?

— Кажы: «мёйца, сына і духа сьвятога...»—дыктуе Настачка.

Мзей пачынае гаварыць:

— Казы мёйца...

— Дурненькая!—перапыняе Настачка,—не кажы «казы мёйца», а кажы проста «мёйца».

— П'ёста мёйца...

Настачка торгае плечыкамі ад нецярплівасьці:

— Не кажы «п'ёста мёйца», а кажы «мёйца».

Мзей тарашчыць на сястрычку спалоханыя вочы, складвае набожна ручкі і кажа тоненькім галаском:

— Не казы п'ёста мёйца, а казы...

Настачка тупнула ад злосьці босай нагой і давай перадразьніваць Мзей:

— Казы... казы... Тут няма коз, іх ваўкі зьелі ў лесе.

Мзей затраслася ад страху:

— Баюся ваўкоў... Хацу да мамы...

— Няможна да мамы. Трэба скарб шукаць у лесе!—строгім голасам крычыць Язэпка.—Ня трэба маліцца, дык і страху ня будзе. Мой старшы брат, кажа, што цяпер няможна богу маліцца. Цяпер людзі ня моляцца. Толькі чэрці моляцца... .

— Чальцей баюся...—захныкала Мзей.

— Заплюшч вочкі, туліся да мяне і ня будзеш баяцца!—раіць Настачка.

Мзей шчыльна туліцца да сястры і плюшчыць вочы.

— Цяпель не баюся...

— А вось тут будзем шукаць скарб!—камандуе Язэпка і паказвае на кучу яловых лапак і хварасьцінак.—Дзеці, усе за працу.

Пачалі рупна адкідаць калючыя лапкі.

— Мой татка часта ходзіць сюды!—кажа Настачка.—Ён яшчэ зазлуецца. Ён казаў, што дзецям няможна хадзіць у гэты лясок. Баюся таткі...

— А я таткі твайго не баюся!—супакойвае Язэпка.

Дзеці раскідаюць лапкі ва ўсе бакі. Працуюць шчыра.

Ад сухіх лапак сыплюцца жоўтыя калючыя голкі, колюць цела праз вопратку, драпаюць твар, лезуць у валасы.

Лапкі бароняць захаваны ў гушчэчы скарб.

— Ой, колецца, кусае!—скардзяцца некаторыя.

— Няхай кусае!—супакойвае Язэпка.

Дзеці спацелі, расчырванеліся.

Таямніца і казачнасьць лесу адсунуліся кудысьці, туляцца па далёкіх кутках. А тут, дзе вясковыя дзеці шукаюць скарб, пануе праца, будзённая, звычайная.

Вясёлыя, гарачыя вочы пранізваюць наскрозь вялікую кучу яловых лапак і старога падгнілага гальля. Лапкі і лом ляжаць тут ужо некалькі год. Прэлы пах лезе ў нос, няпрыемна казлыча ноздры. Зусім ня цікава. Ніхто з дарослых тут, мабыць, ніколі ня бывае.

Дзеці топчуць пад ногі «сабачыя грыбы», якія растуць тут цэлымі сямейкамі—жоўтавата-бледныя, мізэрныя капялюшыкі на высокіх кволых тычках-сьцяблох.

З-пад гальля паказалася белая трава, нібы сівая шэрсьць невядомых жывёлін. Трава пляцецца па зямлі, прыціснутая, змучаная, як нявольнік у цямніцы.

— Ды няма тут ніякіх скарбаў. Маніш, Язэп!—пачынае сумнявацца адзін з зmoраных хлапчукоў.—Пойдзем адгэтуль!

— Яшчэ трошачкі пашукаем!—загадвае Язэпка і выцірае рукавом спацелы, чырвоны твар.

— Ня хочам! Ня хочам!

— Ну, яшчэ адзін разок, адзінюткі разочак...—моліцца-просіцца Язэпка.—Пасьля гэтага я скіну вароніна гняздо. Потым трусоў пакажу...

— Хіба што пакажаш!

Зноў закіпела праца.

— Ай!—крыкнула Настачка,—а вунь нешта белае блішчыць пад лапкамі.

— Ага! Што я казаў!—гарачыцца Язэпка.

Да дзяцей вяртаецца ранейшае імкненьне да шуканьня скарбаў.

З-пад яловых лапак выныраюць тры белыя, новыя драўляныя скрынкі, замацаваныя з усіх бакоў дротам і цьвікамі.

Дзіцячая вера ў байкі аб захаваных скарбах спраўдзілася.

Запанавала надзвычайная зацікаўленасьць паглядзець, што ляжыць у гэтых скрынках. Узмацнілася вера ў байкі, вярнулася і пачуцьцё страху.

У тых байках гаворыцца, што «нячыстая сіла» перашкаджае людзям знаходзіць скарбы, палохае іх...

Нават і Язэпка, самы адважны, струсіў.

Дзеці аглядаюцца ва ўсе бакі, ці ня ідзе на іх страхацьцё.

Ціха ў лесе...

Толькі час-ад-часу з старой калматай елкі шышка стукнецца аб зямлю.

Але гэта нястрашна. Так і яблыка падае з яблыні ў садзіку.

А во зашушукаліся бярозкі, задрыжэлі лісткамі, тоненькімі галінкамі.

«Ша-ша-ша... Няможна чапаць. Няможна»...

І гэта нястрашна. Так бярозка і на гумне, і каля хаты гаворыць пад ветрам.

Дзеці не баяцца і галасоў бярозак.

— Давай, адну скрынку адчынім!—камандуе Язэпка.

Хто пачаў ламаць дрот, а хто кійком тоненькія дошчачкі калупае.

Удалося адарваць са скрынкі адну дошчачку. Рагожа і папера лёгка зьнімаецца.

У скрынцы ляжыць многа невялічкіх папяровых скрыначак. Малыя скрыначкі—дзеці вялікай скрынкі.

Гэта вельмі цікава...

— Скарб пароўну будзем дзяліць!—абвяшчае Язэпка.—Пакуль што, кожны няхай возьме па аднэй скрыначцы!

Дзеці расчыняюць скрыначкі.

— А во грабенчыкі!

— А во панчохі!

— А во карункі!

— А во гузікі—бліскучыя, бліскучыя!

Дзеці ў няпрытомнай радасьці перакрыкваюць адны адных.

Пасьля першага імпэту радасьці яны пачынаюць з зайздрасьцю заглядаць у чужыя скрынкі.

— А я хачу грабенчыкі!

— Мне дай карункі. Я не хачу гузікаў!

— На табе панчохі, а мне дай гузікі.

Пачынаецца вялікая сумяціца.

Дзеці рвуць часткі «скарбу» адны ў адных.

Кожнаму з іх падабаецца якраз тое, што ў руках другога. А калі памяняюцца, дык пачынаюць падабацца зноў тыя самыя рэчы, якія раней былі ў іх-жа руках...

У вачох дзяцей, у рухах і ў голасе зьявілася нешта зусім новае, чаго ня было да гэтага часу.

Дзеці ў некалькі хвілін, пад уплывам «скарбу», робяцца як-бы сталымі людзьмі.

Калі ў маленькіх мужычкоў насьпявае вялікая бойка з прычыны дзяльбы «скарбу», Язэпка, правадыр «экспэдыцыі», пачынае адчуваць моральную адказнасьць за ўсе ўчынкі грамады. Ён па-сталаму мяркуе, як выйсьці з гэтага прыкрага становішча. Нарэшце, прыдумаў—думку сваю кажа ўголас:

— У нас ёсьць гузікі, грабеньчыкі, панчохі і карункі. Няхай кожны возьме патроху ўсяго. Давайце дзяліць гэта ўсё пароўну! Добра?

— Добра!—згаджаюцца дзеці.

— Добля!—чуваць і голас маленькай Мзей. Хоць яна мала разумее тонкасьць такой сур'ёзнай справы, але калі «вялікая» Настачка, якая «ведае ўсё на сьвеце», кажа «добра», дык Мзей таксама хоча быць «вялікай» і казаць «добля».

У гэты час дзеці забываюць, што страхі могуць яшчэ зьявіцца, каб не даваць забіраць скарбу. Яны заняты дзяльбою.

І вось...

У самую гарачку дзяльбы дзеці (ці мо' гэта ім здаецца) чуюць выцьцё невядомага зьвера.

Выцьцё раздаецца з блізкіх густых кустоў...

Дзеці палохаюцца.

Вочы ад страху выпучаны і блішчаць, нібы тыя гузікі са «скарбу». Скрыначкі выпадаюць з маленькіх загарэлых і замурзаных ручак.

Дзеці баяцца крануцца з месца.

І вось...

Чалавечы голас...

Голас бадай нечалавечы: нехта гудзіць, бурчыць, вые, войкае.

Словы чалавечыя:

— Кіньце вы ўсё гэта ды ўцякайце дахаты, а то я вас зьем... Ні слова дома не кажэце аб тым, што бачылі ў лесе, а то я вас

і дома зьем. Вылезу з-пад ложка—і зьем! Выскачу з-пад печы—і зьем. Выбегу з хлева—і зьем... В-в-у-у-у! Ціханька, бяз крыку і плачу ўцякайце! В-в-у-у-у!

Дзеці дрыжаць.

Прыслухоўваюцца да кожнага слова невядомай баечнай істоты.

Адкуль чуваць гэты голас?

— Не аглядайцеся!—строга кажа невядомы.

Дзеці сьціснуліся ў адзін камячок, нібы ў венік з тонкіх бярозавых галінак. Пусьціліся наўцекі з лесу—далі лататы.

Да разбуранага гальля і яловых лапак падскоквае чалавек.

Ён зьбянтэжаны, з хітрай усьмешкаю на твары, з аганькамі ў бліскучых вачох.

Рахмілька.

Ён аглядаецца ва ўсе бакі, прыслухоўваецца і хутка пачынае зьбіраць раскіданае дабро...

Запакоўвае ў драўляную скрынку і шпарка нясе ў іншае месца.

У працягу дваццаці хвілін забірае адгэтуль усе скрынкі. Разбураная куча яловых лапак і гальля зноў ляжыць па-ранейшаму...

Нічога тут ня здарылася...

Рахмілька, крадучыся, выходзіць з другога боку лесу. Абмінае сенажаць, поле. Вось ён на камяністым гасьцінцы. Бяжыць дахаты, бярэ свой кавалёўскі раменны хвартух і агародамі ідзе праз вёску ў кузьню Язэпа Крушынскага.

Рахмілька разьдзьмухвае агонь на горне.

Пані Ганна ў агародзе. Яна чуе звон малатка ў кузьні, ідзе ў хату і будзіць мужа:

— Ідзі, Язэп, нешта Рахмілька майструе. Трэба сярпы прывесьці да парадку. Жніво не за гарамі.

Язэп Крушынскі пабег у кузьню.

— Што здарылася, Рахмілька? Ты лепш паспаў-бы ўдзень. Сягоньня-ж ўсяночная будзе...

— То-то. Ліха здарылася. Нешта пацягнула мяне сягоньня туды...

— Ну, і што там бачыў?

— Дзеці там гулялі...

— А, каб іх ліха.—Там?!

— Якраз трапіў на тое, як яны дзялілі між сабою скрынкі.

— Ну?!

— Знайшлі, чэрці. Я перахітрыў іх. Завыў ваўком, зароў мядзьведзем.

— Яны цябе ня бачылі?

— Не. Я пад кустамі схаваўся. Напалохаў іх робленым галасам. Казаў, што я іх зьем, калі дзе скажуць, што бачылі ў лесе. Дзеці ўцяклі, і я перанёс скрынкі.

— Пашанцавала на гэты раз. Ніхто дзецям не паверыць.

— Яны пабаяцца каму і гаварыць, каб я іх ня зьеў.

Язэп Крушынскі засьмяяўся:

— Ідзі дахаты, нячыстая сіла. Там і мае дзеці былі? Ну, і дам! Ну, і дам!

— Былі. Вы іх лепш не чапайце. Не рабеце скандалу.

X

Вакол Курганішча многа курганоў.

Яны раскіданы і па сенажацях і па некаторых агародах, і ў лесе.

Курганішча—ад курганоў. На некаторых вырасьлі сталетнія хвоі. Іншыя ўзораны.

Часта сяляне знаходзілі тут старыя чарапкі з узорамі, пацеркі, нейкія абручыкі, каменныя стрэлы—«чортавы пальцы», каменныя, гладка адшліфаваныя, тапары і чалавечыя косьці. Каменныя тапары—добрая рэч у гаспадарцы—імі таўкуць соль.

Магілы старадаўняй, сівой мінуўшчыны ў Драздоў і Дзятлаў звычайнае зьявішча ў штодзенным жыцьці. Струхлелыя людзкія косьці, якія часам вычэсваюцца з рыхлай зямлі, нібы грэбенем, сялянскай сахою, ня робяць на аратага цяжкага ўражаньня. Араты, праўда, закопвае чэрап на мяжы, але зараз-жа аб ім забывае.

На курганох у непагодны час гралі вятры—старыя вандроўнікі. Яны сьпявалі на гэтым месцы і тысячу год таму назад.

Сярод старых людзей жывуць аб курганох цікавыя казкі і паданьні: а поўначы тут розныя страхі паказваюцца.

Паводле казкі аднаго старога дзеда, яго дзед, нябожчык, ехаў уночы каля гэтых курганоў. На іх сьвяціліся нейкія сінія

агоньчыкі. Раптам на адным з курганоў нешта замэкала. «Няйначай, авечка»,—падумаў ён. А дзед таго старога дзеда быў чалавек адважны. Ніякіх страхаў не баяўся. Ён спыніў каня і пашоў на той курган. Так і ёсьць: ляжыць баран, зьвязаны па нагах, і жаласьліва мэкае: «мэ-ээ!» А дзед таго старога дзеда быў чалавек гаспадарны. Зараз-жа абмацаў барана—тлусты; мо' поўпуда сала на ім. А воўна-ж, воўна! Ну, проста панская хутра! Тады дзед таго старога дзеда давай барана на воз класьці. Тузгаўся, тузгаўся, пацеў—і ткі ўскінуў на воз. Задыміў люльку і паехаў. Спачатку конь ірвануў, захроп і пабег з усяе сілы, як-бы цэлая ганьня ваўкоў за ім гналася. Але хутка конь запеніўся, замыліўся і ні з месца. Дзед таго дзеда, калі лясьне пугай—ня ідзе конь. Як трахне пугаўём—ні з месца. А ў дзеда ляжалі граблі на возе. Тады як возьме малаціць грабільнам па крыжы каня. Конь толькі азадкам круць-верць і хоць-бы што. Бяда! Баран такі цяжкі... Дзед таго дзеда дзівіцца, што такі баран, але радасьць яго бярэ: затое ні ў кога з суседзяй гэткага ня будзе... А ноч зрабілася цёмная—страх. Хоць вочы выкалі—нічога ня відаць. Дзед пагладзіў барана па мяккай шэрсьці. І дзівіцца: дзе правядзе рукою па сьпіне барана—там іскры сыплюцца. Мігацяць па шэрсьці агнёвымі палосачкамі, замільгаюць яркімі, дробненькімі, як шрот, чырвонымі вугольчыкамі—і зьнікнуць... Тады дзед таго дзеда трохі спалохаўся. Няпрыкметна для самога сябе рука яго зрабіла ў паветры крыжык над бараном. Тады баран як зарагоча чалавечым голасам: «о-го-го-го-го-о!», ажна рэха пасыпалася з усіх бакоў: «о-го-го-го-го-о!», і зьнік. Толькі дымок астаўся на возе. Серкай засьмярдзела. А конь як ірвануў, як пабег, як панёс, дык скуль толькі ў яго ногі! Тарахцелі калёсы па пнёх, па карчох, ледзь косьці не растрэсьліся ў дзеда. А ў дзеда валасы цьвярдзеюць, як дрот, растуць уверх, шапку падымаюць. Дзед вярнуўся дахаты ледзь жывы.

Шмат такіх казак ведаюць Дразды і Дзятлы аб курганох.

Абрасьлі курганы страхоцьцямі, нібы камяньні мохам.

Так было даўней.

Цяпер страхі зьніклі.

Год таму назад з гораду прыехалі людзі. Раскопвалі некаторыя курганы.

Дразды і Дзятлы сьмяяліся з гарадзкіх забаўнікаў: як малыя дзеці, тыя зьбіралі чарапкі, каменныя і мэталёвыя заіржавелыя цацкі. Усё гэта запакоўвалі ў скрынкі, нешта мералі, вылічалі і доўга запісвалі. Глянуць вакол—і пішуць, малююць.

Абегалі гарадзкія людзі ўсе курганы. Строга загадалі сялянам не раскопваць іх, не чапаць. А то штраф плаціць будуць, у турму пасадзяць...

Пляваліся Дразды і Дзятлы.

— Што мы канакрады якія?!—дзівіўся Галава.

— За што турма? Завошта штрафы плаціць?—гарачыўся Сухарукі.

Набралі гарадзкія людзі «цацак» з кургаоў і паехалі.

Усё зноў супакоілася.

Дразды і Дзятлы па-ранейшаму абыходзіліся з курганамі. Ніхто па турмах не сядзеў і штрафаў не плаціў.

— Гарадзкія жулікі выдумалі,—тлумачыў Галава.

— Хацелі нас напалохаць,—казаў Сухарукі.

А часам сухавеі кружыліся над курганамі.

Там, дзе курганы абрасталі сталетняй хваёвай чупрынаю, дрэвы выгіналіся ва ўсе бакі, трасьлі вецьцем, скрыпелі адно аб адно, нібы каналі, нібы маліліся. А вецер сьвістаў на розныя лады, гойсаў па вершалінах, ламаў іх, крышыў і адарванае лісьце перасыпаў у сваіх нявідочных далонях.

Лягчэй было разгульваць ветру па тых курганох, дзе дрэў ня было, дзе рыхлы пясок быў раскапаны лапатамі ці разораны сахою. Там цэлыя слупы пяску круціліся высока-высока, круціліся ўгару і зноў рассыпаліся. Вецер разьдзьмухваў пясок, пытляваў земляную цёмна-шэрую муку. З гэтай мукі дзеці ў спакойны час пяклі булачкі на полі, печачкі рабілі. Часамі, калі сонца мёдам фарбавала летні дзень, дзеці дзеля забавы самі закопваліся па пояс у пясок, насыпаны старадаўнымі пра-прадзедамі...

Зычэлі дзіцячыя галаскі.

А сівыя дзяды гаварылі, што сухавеі,—гэта не сухавеі, а «чортава вясельле».

«...каб апусьціць нож у сьвянцоную ваду, а потым кінуць яго ў гэты сухавей, дык на тым нажы відаць будзе кроў»...

Ніхто так і ня пробаваў тэтага фокусу з нажом, каб упэўніцца, што сапраўды гэта ня вецер, а «чортава вясельле».

Дразды і Дзятлы і так верылі...

Удзень людзі і сонца супакою не давалі старым курганом.

Увечары людзі адпачывалі па хатах, а сонца, акрываўленае, памірала. Тады курганы ў неба глядзелі, моўчкі выстаўлялі зоркам на паказ свае абскубаныя людзьмі сьпіны.

Зоркі глядзелі ўніз, нібы тысячы зрэнкаў, кідалі на курганы ледзь прыкметныя сіняватыя ніткі праменьняў і аплятаалі зямлю, як павуцінай, жоўта-сінім зьзяньнем.

Зоркі памятаюць той час, калі яшчэ тут курганоў ня было, калі палалі вялізныя агні, якія чырвонымі языкамі лізалі паветра, ператвараліся ў сіва-чорны дым. Патаемныя знакі пісаў па небе гэты дым, братаўся з воблакамі і расплываўся ва ўсе бакі і зьнікаў, як госьць, што ўжо ніколі назад ня вернецца.

Часам над курганамі кугатала сава. Засьмяецца дзіка-дзіка—па-вар'яцку, заплача жаласна-жаласна, па-дзіцячаму, і давай плысьці над курганамі на растапыраных крыльлях.

А калі месяц бываў поўны, круглы і ярка-жоўты, як дачырвана нагрэтая скаварада, тады пад яго бледным водблескам плаваў па курганох цень савы, соваўся ціха і хутка, нібы праводзіў па зямлі чорную паласу... Запісваліся на грудзёх зямлі галасы поўначы; гукі расьлі з задумёнай цішыні і тапіліся ў нямых і гучных абшарах. Ноч ня траціла ніводнага гуку. Шолах травы, піск дрымотнай птушкі, якая нешта радаснае ці смутнае бачыла ва сьне, хрып дрэва—усё гэта зычэла а поўначы, вызначалася ў хвалях цішыні і ўдаралася аб дрымотныя прасторы, нібы аб шаўковыя загарадкі.

Язэп Крушынскі даведаўся аб значэньні гэтых курганоў, аб іх пахаджэньні ад Івана Мацьвеевіча. Агроном апавядаў яму аб жыцьці старадаўных славянскіх плямёнаў, аб пышных хаўтурах і пахаваньні. Агроном тлумачыў Крушынскаму значэньне чарапкоў, пацерак, караляў, каменных тапароў і іншых «цацак», знойдзеных у курганох.

— Мой бацька,—гаварыў Язэп Крушынскі,—яшчэ і цяпер зёлкі зьбірае па курганох. Праўда, цяпер ён многа перайначыўся. Але памятаю, як яшчэ я быў малы, дык бацька выраб-ляў такія рэчы, што і цяпер дзіўлюся. Гэта бывала пасьля вялікадня. Мой бацька і яшчэ адзінаццаць чалавек хадзілі ў лес.

У гэты дзень раніцою, яшчэ да ўсходу сонца, тушылі агонь па ўсіх хатах. У лесе людзі зрубалі ясень, калолі яго на чатыры плашкі і доўга цёрлі плашкай аб плашку, пакуль не задыміцца дрэва. Тады прыкладалі губку і прыносілі агонь ў вёску. Бабы запальвалі ў печы ад гэтага агню. Так рабілася штогод.

— Гэта і ёсьць першабытны спосаб здабываньня агню. Калі ў вас, Язэп Сымонавіч, будзе паравы млын, тады зробіце электрычнасьць для Драздоў і Дзятлаў. Вось і будзе пераскок ад першабытнага вечнага агню да новага вечнага агню У вашай культурнай гаспадарцы электрычнасьць будзе новай прычынай для праслаўленьня вашай асобы ў газэтах. Яшчэ раз надрукуем ваш партрэт, Язэп Сымонавіч.

Яны сядзелі на ганку.

Над Курганішчам апусьцілася ноч. Сьвяцілі зоркі.

Іван Мацьвеевіч разьвіваў далей свае проекты:

— Як хораша будзе, калі ў Курганішчы засьвецяцца электрычныя лямпачкі.

— Хоць аб электрычнасьці гаворыце, Іван Мацьвеевіч, і ня верыце ў забабоны, аднак, пад сьвятлом зорак схадзеце цяпер на курган і прынясеце сюды чалавечы чэрап. Якраз бачыў сяголеньня. Ляжыць там зьверху ў пяску.

— Не, не пайду. Дзівацкая ў мяне натура. Удзень я ніякіх страхаў не баюся. Жартую з іх. А як толькі надыйдзе ноч, дык нешта такое з глыбіні душы лезе наверх. Прабуджаецца дух маіх прадзедаў, і я, чалавек з вышэйшай адукацыяй, раблюся пужлівым, як дзіцё або як вясковая, цёмная баба.

— А я пайду і прынясу чэрап,—пахваліўся Язэп Крушынскі.—Гэта каля самага лесу.

— А вось ня пойдзеце!

— Пайду!

— Ня пойдзеце!

— Пайду! Толькі вы не чакайце тут, а ідзеце, Іван Мацьвеевіч, у пакоі, бо я трохі забаўлюся там. Курган далёка адгэтуль.

— Добра!

Іван Мацьвеевіч пашоў у хату. Крушынскі хуткімі крокамі пусьціўся за гумно. Там стаяў Рахмілька.

— Я даўно чакаю,—шапнуў Рахмілька ўстрывожаным голасам.—Перанёс сюды...

Каля сьцяны ляжала шэсьць белых скрынак.

— Я ледзь адвязаўся ад агронома. Абяцаўся яму чалавечы чэрап прынесьці з курганоў. Гэта ўсё глупства, Рахмілька. Але небясьпечна тут ля сьцяны...

— Нічога. Зараз людзі забяруць.

— А людзі свае?

— Тыя самыя. Пэўныя. Тры Дразды і тры Дзятлы.

— На той раз удалося. Можа і на гэты ўдасца. Ты, Рахмілька, угаварыўся з імі?

— А як-жа. Трое павязуць сена, а трое дровы.

— Толькі каб ня ехалі разам. Няхай рассыпяцца па дарозе паміж іншых фурманак. Заўтра будзе вялікі кірмаш у Менску. На гасьцінцы павінна быць многа фурманак.

— Усё будзе добра, пане Крушынскі. Зараз людзі прыдуць. Ідзеце сабе па чэрап і трахнеце ім аб дурны чэрап агронома.

— Ды што ты, Рахмілька,—засьмяяўся Крушынскі,—ён разумны і добры чалавек. Ты будзеш ехаць на маім кані далёка ззаду, а пад Менскам наперад паедзеш. Каля Шмуйлы Замен-скага міліцыі няма. У Шмуйлы на дварэ схаваеш, у шпіхляры пад жэрдкамі. Потым пойдзеш на Пярэспу да Зэліка. Яму толькі скажаш, дзе ляжыць. Ён сам забярэ. Пагуляеш у Менску і паедзеш дамоў. А праз дзень-два я сам буду.

— Ідзеце на курган, пане Крушынскі, а то людзі сюды не падыйдуць. Яны-ж ня ведаюць чый тавар.

— Бывай здароў, Рахмілька! Будзь малайцом!

Разьвіталіся.

Крушынскі пашоў на поле.

Ён спыніўся на мяжы. Лёг. Глядзеў ў бок гумна.

Ціха было вакол. Пахла сьвежым сенам. Цьвіркалі конікі. Нібы пілавалі па нявідочных трухлявых дрэвах сотнямі піл. Аднак, гэты шум як-бы тапіўся ў цішыні ночы.

— Тавару на тры тысячы золатам. Калі ўсё пройдзе гладка, будзе на гэты раз дзьве тысячы заробку. Тры тысячы засталося з таго разу. У шчаціну ўлажыў пяць тысяч. Зэлік прапануе некалькі зьліткаў золата. Ад каратаў адмоўлюся. Ну іх да д'ябла! Вельмі далікатная для мяне рэч. Я ў гэтым сьляпы, бы крот.

Крушынскі спыніў вусную матэматыку. Наставіў вушы.

Тупат ног...

Да пуні падышло шэсьць чалавек.

... Ліха на іх. Як жарабцы тупаюць і ўсе разам...

Людзі ўсунулі скрынкі ў мяшкі, ускінулі на плечы і панесьлі па гародах у бок вёскі. Рассыпаліся хто куды. Кожны, відаць, меркаваў несьці на сваё гумно, да фурманкі.

Пакуль не пачуў, як вазы выехалі з варот, Крушынскі ня мог супакоіцца. Яго сэрца было падзелена на шэсьць кавалкаў. Кожны кавалак знаходзіўся цяпер на сялянскім возе разам са скрынкамі пад сенам і дрывамі...

— Ці патрапяць добра захаваць? Часам пагранічнікі пробуюць штыхамі...

З лесу падзьмуў сьвежы ветрык. Прыемны халадок песьціў гладкую, шліфаваную лысіну Крушынскага.

— Эт,—махнуў рукой,—чаго непакоюся? Ня ўдасца на гэты раз, прыдумаем нешта новае на другі. Удавалася-ж мне браць проценты з сваёй-жа контрабанды, якую нібы-то лавіў. Калі заарыштуюць коняй, адкуплю Драздом і Дзятлам новыя.

З лёгкім настроем Крушынскі падняўся з месца. Пашоў да кургана. Там удзень блішчэў у пяску адшліфаваны ветрам жоўты чалавечы чэрап.

... Трэба прынесьці Івану Мацьвеевічу падарунак...

Падышоў.

Зірнуў у бок лесу.

Чорным высокім тынам стаяў застыглы, нярухомы хвойнік. Нізка над вершалінамі была прышпілена да неба бліскучая вышыўка зорак.

Язэпу Крушынскаму здавалася, што на гэты раз хвойнік па-інакшаму глядзіць, што нехта туліцца паміж дрэў і цікуе за ім, за Крушынскім...

Шум вершалін сьцелецца па разрытым кургане ціхім, працяглым, нібы чалавечым, стогнам.

... Мала што Іван Мацьвеевіч баіцца. Я-ж тут праходзіў уночы дзесяткі разоў...

Разважаў:

... Глупства. Забабоны. Мы не агрономы, каб уночы баяцца...

Адзінокі дуб, які стаяў недалёка на мяжы, быў відаць на фоне цёмна-сіняга неба ўсімі галінамі. Выразы кожнага паадзі-

ночнага лістка прыкметны былі, нібы наклееныя папяровыя ўзоры чорным на сінім.

Павеяла сумам вякоў.

Жальба і смутак адзіноцтва панавалі ў ночным полі...

... І трэба-ж было прыдумаць мне такое глупства—чэрап, каб на хвіліну пакінуць аднаго Івана Мацьвеевіча. Сказаў-бы проста: «выбачайце, я зараз вярнуся...» Насі цяпер трухляціну дахаты...

Пачаў сябе ўгаварваць:

... Гэта-ж звычайная косьць. За гумном вунь колькі конскіх чарапоў бадзяецца. І коні—жывыя істоты.

Плюнуў, падышоў да таго месца, дзе ўдзень бачыў чэрап. Падняў з зямлі. Атрос пясок...

Чэрап глядзеў на яго пустымі ямінамі вачэй. Усьміхаўся нахабнай усьмешкай...

Гэтая ўсьмешка сьмерці таілася ў зямлі многа сот гадоў...

... Агідна...

Крушынскі прынёс трофэю дахаты.

Агроном ляжаў у ложку.

— Ну, што? Прынесьлі, Язэп Сымонавіч?

— Не...

— Ага! Я так і ведаў.

— Вось вам!

Крушынскі выняў чэрап з-пад палы і наставіў супроць твару Івана Мацьвеевіча.

Усьмешка чэрапа адразу кінулася ў вочы агроному.

— Фу... Агідная штука...—знэрваваным голасам сказаў ён,—і цікава глядзець і неяк прыкра. Вось гляджу на гэты чэрап і мне здаецца, як-бы роднага бацьку абакраў. Ну, і маладзец вы, Язэп Сымонавіч! Я-б нізашто ня прынёс, каб вы мне хоць тысячу рублёў далі!

— А я вось не баюся.

— Ведаеце, Язэп Сымонавіч, трэба будзе вам закапаць зноў гэты чэрап. Такімі ўчынкамі мы саміх сябе не шануем. Некалі і нашы чэрапы будуць так бадзяцца, як каменьне ў полі. Сьмерць ня любіць, каб выкрывалі яе інтымнасьць, каб не шанавалі яе саромлівасьць. Яна самая агідная штука на сьвеце. У мяне цяпер такое адчуваньне, нібы мне хтосьці плюнуў у твар. Як вы, Язэп Сымонавіч?

— Нібы нешта нясмачнае глынуў.

— За час імпэрыялістычнай і грамадзянскай вайны аголілася сьмерць. Сарвалі вопратку з гэтай старой, брыдкай жанчыны. Яна зрабілася няцікавай, будзённай, без поэтычнай чорнай мантыі на касьцяку.

Іван Мацьвеевіч спыніў філёзофію на гэту тэму і пачаў прыслухоўвацца.

— Нехта пад вакном шастае ці якое там ліха?

Голас яго быў спалоханы.

— Гэта рабіна. Галінамі ў шыбіны барабаніць,—вытлумачыў Крушынскі.

Агроном супакоіўся і давай разьвіваць далей сваю філёзофію:

— Нават у акопах, дзе людзі прывыклі да сьмерці, як да сваіх агідных вошай, і то баяліся яе. Баяліся ня звычайнага процэсу сьмерці, але ў салдат жыў містычны страх уяўленьня аб ёй. Гэты страх людзі носяць з сабою, як спадчыну тысячагодзьдзя. Гэты страх ідзе з глыбіні чалавечай фантазіі. Адзін знаёмы афіцэр расказаў мне на гэту тэму цікавую гісторыю. Гэта было ў 1915 годзе на расійска-нямецкім фронце. У нашых быў агентам адзін кітаец. Часта прабіраўся праз фронт на нямецкі бок, прыносіў адтуль вельмі каштоўныя весткі аб разьмяшчэньні іхнага войска. Нашыя атрады пасоўваліся наперад толькі дзякуючы гэтаму кітайцу. Так цягнулася некалькі дзён. Але вось неспадзявана перастала шанцаваць. Немцы пачалі біць нашых. І так трапна—як-бы ведалі, дзе знаходзіцца кожны наш узвод, кожны паадзіночны салдат. Падазравалі кітайца. Давай сачыць за ім. Так яно і вышла! Цапнулі яго аднаго разў якраз тады, калі ён сядзеў пад пнём і самым спакойным чынам здымаў плян разьмяшчэньня нашага войска. Праз некалькі гадзін яго павесілі і закапалі. Аб гэтым ведалі ўсе салдаты. Дык што вы скажаце, Язэп Сымонавіч, назаўтра салдаты заўважылі, што гэты самы кітаец, як ні ў чым ня бывала, разгульвае каля акопаў... Сярод салдат пачаўся перапалох. Валасы дыба падніміліся. Жартачкі—мярцьвяк разгульвае! Да каго-б кітаец ні пасунуўся, усе ў гвалт і наўцёкі. Даведаліся афіцэры. Такі-ж самы страх і на іх напаў. Але знайшоўся адзін адважнік. Ён з рэвольвэрам у руках пашоў на кітайца. Кітаец спалохаўся: «У чым справа? За што яго страляць?» Пасьля доўгіх гутарак і тлу-

мачэньняў выявілася, што гэта быў павешаны ня ён, а яго родны брат, які служыў такім-жа самым агентам у немцаў. Брат быў вельмі падобны да яго. Дык вось што часам бывае. Людзі, якія не баяліся куляў і шрапнэляў, спалохаліся здані павешанага няшчаснага кітайца...

— Цікавая гісторыя,—сказаў Язэп Крушынскі.—Чэрап вынесу ў сад і заўтра закапаю, а то вы спаць ня будзеце.

Па гасьцінцы ў Менск едзе шмат фурманак.

Сьпяшаюць на кірмаш. Тарахтаюць калёсы. Людзкі гоман. Хто крытыкуе каня свайго суседа. Хто сьцёбае ўласнага каня, б'е са смакам, з моцнай лаянкай. Некаторыя курэць. На вазох крычаць куры ў клетках, верашчаць парасяты.

Шмат вазоў з дрывамі, з сенам, з цабэркамі, з мяшкамі; у кублах і пасудзінах—масла, сыр і іншае вясковае дабро.

Бадай на кожным возе—баба. Гаспадар—пехатой.

Пры дарозе каля хвойніку дымяць вогнішчы. Коні распрэжаны, прывязаны да вазоў, перабіраюць сена мяккімі губамі. Каля вогнішча на разасланай тканіне сілкуюцца людзі.

Толькі што пачынае віднець. Над ляском шапаціць ранічны халодны ветрык, перабірае на вазох паадзіночныя калівы сена, трасе сівымі барадамі дзядоў. Нясе з дарогі на сьпелае жыта, на сьвежа-зялёныя аўсы пах кірмашовага гасьцінцу; сена, калёсная мазь і конскі пот зьмешаны ў адзін востры пах.

Пад ружовай паласою ўсходняга неба над завялым густым бульбянікам крычаць вароны. Цёмна-шэрымі плямамі яны кружацца над адзінокімі бярозамі, вызначаюцца на ружовым фоне паветра вострыя канцы іхных крыльляў і дзюбаў.

Рахмілька едзе на аднэй з лёгкіх калясак Язэпа Крушынскага.

Яго абоз з трох вазоў сена і трох вазоў дроў расьсеяны ў адзіночкі між іншымі вазамі сена і дроў.

Па яго камандзе Дразды і Дзятлы едуць ня разам, а ўперамешку з незнаёмымі людзьмі.

Рахмілька адчувае адказнасьць за дабро: стараецца мець перад вокам усе свае фурманкі. Спачатку пусьціць каня хуткім крокам, пакуль не абгоніць увесь «свой» абоз, каб пабачыць, мо' што здарылася нядобрае. А пасьля, як угледзіць самую першую

сваю фурманку з сенам, зноў аслабіць лейцы; конь ідзе марудна, павольна, і зноў такім чынам Рахмілька прапускае «свой» абоз да самай апошняй фурманкі з дрывамі.

Зноў пачынае шыбка ехаць...

Так Рахмілька плыве па гасьцінцы, вартуе дабро, трывожыцца і радуецца ў адзін і той самы час.

... Некалькі соцень і мне пападзецца. Каб толькі давезьці да Шмуйлы Заменскага.

Настрой увесь час напружаны.

... А можа на гэты раз не пашанцуе? Ліха яго ведае, усё можа здарыцца...

Холадна робіцца на сэрцы. Мары аб некалькіх сотнях вельмі вабяць. Яны адыходзяць, адсоўваюцца на некалькі вёрст.

Рахмілька нырцуе між сялянскіх вазоў, ня спускае з вачэй «свайго» абозу, пераміргваецца па чарзе з «сваімі» Драздамі і Дзятламі. Кожнаму асьцярожна кіўне, міргне і адвернецца: ён з імі не знаёмы.

... Не выпадае цяпер гаварыць з суседзямі. Ня трэба мець ніякай сувязі з гэтымі вазамі...

Рахмілька—добры дыплёмат. Адзін з першых у «рэспубліцы» Крушынскага.

Пасьвятлела.

Над гасьцінцам у шкляным бяздоньні неба вісяць дробненькія кропкі. Часам яны выглядаюць маленькімі мушкамі. А часам нічога ня відаць, толькі чуецца чысты і дробны звон. Гэта жаўранкі...

Шнуры жыта, аўса, канюшыны, бульбы разгортваюцца абапал гасьцінцу, разьбягаюцца далёка ў бакі да туманнага курадыму далячынь, да хутароў, да ледзь прыкметных узгоркаў, да цёмна-зялёных хмызьнякоў... Даўжэзнымі акварэлямі каляруюцца яны істужкамі, абрусамі і завостранымі клінамі па шырокіх грудзёх глебы-маткі.

Прыгледзься пільна да аднаго толькі каласка жыта. Колькі ў ім зграбнасьці, колькі пераліваў ліній і колераў!

Кінь вокам на адзін-адзінюткі васілёк, што стаіць элегантам на мурожнай мяжы—і ў цябе зьявіцца радасьць і супакой...

А вунь, нібы вартаўніца, пазірае ўдаль самотная дзічка-яблынька.

Яе кручкаватыя галіны таксама клічуць да сябе.

Сярод лугу, водаль ад дарогі—сажалка. Блішчыць яна аграмадным вокам зямлі, глядзіць уверх—у неба. Яе зрэнка адлюстроўвае ў сябе калматую хмарку, якая заблудзілася ў чыстым небе, як маленькае ягнё. Абапал сажалкі цямнеюць, нібы густыя вейкі, змрочныя вольхі. Яны нахіляюцца над сажалкай, заглядаюць у вакно падзямельля.

Кожны куток вабіць прытулам сонечнай, летняй гасьціннасьці.

Грукаюць-стукаюць калёсы. Па гасьцінцы пыл стаіць, курадыміць на поле.

Людзі заклапочаны. Трэба пасьпець упору прадаць тавар ды яшчэ за добрую цану: гэта значыць—дорага, а потым купіць тое-сёе для хаты таксама за добрую цану: гэта значыць—танна...

Людзкія галасы завэнджаны махорачным дымам; ядраныя лаянкі запаўняюць летнюю раніцу.

Рахмілька ўтаропіў вочы: глядзіць у даль дарогі, пазірае над конскімі вушамі пад дугою.

На дузе шмат намаляваных пеўнічкаў. Рахмілька налічыў іх штук дваццаць. Яны—як жывенькія. Во, здаецца, зараз кукарэкчуць тоненькімі галаскамі: паводле свайго росту...

А пад гэтымі пеўнічкамі разгортваецца даўжыня дарогі. Яна ўрэзалася між палямі і цягнецца далёка-далёка, як нейкі казачны вуж. Чым далей, яна робіцца вузейшай, пакуль ня ўткнецца ў неба тоненькім, як завостраны кіёк, шпілем... Там, дзе дарога ў далячыні вузейшая—і фурманкі драбнеюць, а пад канец дарогі здаецца, што гэта мухі поўзаюць па зямлі... Людзкі гоман таксама болей гучны на блізкіх вазох. А далей ён зьліваецца ў агульны гоман летняй раніцы і кірмашовай дарогі.

Усё гэта бачыць Рахмілька пад дваццацю пеўнічкамі маляванай дугі.

Усё жывое, чым далей, тым больш драбнее перад вокам Рахмількі.

Толькі мары яго, чым далей, тым болей вырастаюць і прымаюць болей жывыя, рэальныя формы.

Чым далей, тым большая адлегласьць дарогі праглынута.

Абозу Рахмількі пакуль што яшчэ ніхто не зачапіў...

... Небясьпечна сустракацца з коннымі вайсковымі разьездамі і з міліцыяй. Тыя часам заглядаюць у вазы, калі які воз здасца ім падазроным.

Вось гэтых вайсковых і міліцыянэраў Рахмілька і «пільнуе».

Якая карысьць з таго, што «пільнуе»—ён сам ня ведае. Карысьці, хутчэй усяго, ніякай няма. Але лягчэй на душы. Прынамсі, пастаянна ведае, у якім становішчы знаходзіцца ён і як справа з яго марамі.

... Вунь-вунь конны паказаўся. Рахмілька нацэліў на яго вочы. Каб вочы былі стрэльбай-дубальтоўкай, дык адразу выстралілі-б.

З кожнай хвілінай коньнік расьце на кругавідзе, вырастае ў грознага «сьвятога» Ягора на кані, з вострай пікаю супроць цмока-людаеда. Блішчыць піка на сонцы.

У Рахмількі сэрца тухкае мацней...

Коньнік ня спыняецца каля вазоў.

... Пашанцавала на гэты раз...

Коньнік пад'ехаў бліжэй.

Рахмілька зірнуў на яго. Адвярнуўся і злосна плюнуў.

... Ліха ведае што. Гэта-ж чалавек з касою на сенажаць едзе... Цьфу!

Рахмілька шкадуе, што гэта звычайны селянін, а не вайсковы, пагранічнік:

... Дармо спужаўся...

... Няхай-бы хоць страх быў выкарыстаны.

Сонца пачынае грэць. Здалёк выплылі з-пад залацістага туману бліскучыя купалы менскіх цэркваў і касьцёлаў, чорныя трубы фабрык.

Грукочуць калёсы па шашы. Трасе і ў лёгкім вазочку. Рахмілька не зварочвае ўвагі. Перад горадам яшчэ пільней глядзіць...

І на гэты раз без усялякай карысьці...

Разьезд наехаў ззаду...

Тры чырвонаармейцы...

Млосна Рахмільцы. Пахаладзеў увесь.

... Вось, каб на хвіліну зрабіцца пеўнікам на маляванай дузе...

... Каб і вазы з сенам, з дрывамі пеўнікамі парабіліся...

... Пакуль чырвонаармейцы адчэпяцца і паедуць сваёй дарогай...

— Гэй! стой! таварыш!

... Ніхто іх не чапае, чаго лезуць?..

Спыняе каня.

— Контрабанды няма?

— Шукайце!

Поркаліся ў возе, перакінулі сена.

— Чаму едзеш з пустым возам?

— Я—каваль. Па жалеза еду.

... Ня так страшан чорт, як яго малююць.

Чырвонаармейцы спынілі яшчэ некалькі вазоў і паехалі далей.

На гэты раз Рахмілька нават ня плюнуў. Ня то, што не спалохаўся, але небясьпечна і плюнуць, каб ніхто не падумаў, што спалохаўся...

... Хутка і Шмуйла Заменскі.

... Вунь яго вялізны заежджы дом з высокім тынам з тоўстых бярвеньняў. Каб акапаць ровам вакол тыну, дык выглядала-б старасьвецкай крэпасьцю.

Рахмілька абганяе фурманкі, адчыняе вароты на двор Шмуйлы.

Стары сядзіць на ганку ў ярмолцы, з акулярамі на носе. Доўгая да грудзей сівая барада. Халадайка да пят.

Біблійны патрыярх.

— Гут моргэн, рэб Шмуэл! *

— Гут ёр! **

— Купляеце дровы і сена?

— Чаму не? Колькі вазоў?

— Шэсьць.

— Адкуль?

— З Кургнішча.

— Ага...

Шмуйла паважна, гладзіць бараду, паказвае рукою на шпіхляр і ідзе ў хату па ключы.

Фурманкі накіраваліся на дзядзінец.

* — Дзень добры, пане Шмуйла!

** — Добры дзень!

XI

У прасторы летняга дня сонца наліло мядовы сок. Над паласамі аўсоў зіхацiць ледзь прыкметны для вока залацісты сонечны пылок. Па лясных хрыбтох, па чулых вяршалінах хмызьнякоў вандруе дзень; заглядае ва ўсе шчыліны, наводзіць глянц на адзінокія бярозкі. Яны дрыжаць сарамлівыя ў кужэльных сарочках і ня ведаюць, дзе схавацца ад аграмадных хвой, укутаных у бурыя дарожныя бурносы.

Вандруе дзень.

Ён сыпле-сее з нявідочных пазух у прыдарожны хмызьняк, нібы сейбіт зерня, гучна-сьпеўны дождж жаўранкаў і вераб'ёў.

У багне каля гразкай грэблі кіпіць жыцьцё. Сьвяткуюць сонечнае сьвята балотныя кветкі і траўкі. Між сакавітым аерам і густым трысьцём разьмясьціліся сямейкі белых вадзяных лілей. Яны ўтаропілі ў сонечнае полымя сьнежныя гладышыкі, углядаюцца ўгару да ахмяленьня, да сьляпоты. Кожная жылка на пілюстках сьвеціцца правіднай вузенькай, як валасок, сьцяжынкаю. На кожным лісточку—цэлы лес такіх жылак. Вока можа заблудзіцца ў іх...

А водаль на мяккіх травяністых купінках-булках туляцца густыя грамадкі сініх, жоўтавокіх незабудак. Іх вельмі многа абапал грэблі.

Матылькі і вялізныя мухі з празрыстымі крыльлямі мітусяцца ў сонечнай мяцеліцы, кружацца над расьлінамі ў ціхі віхор і ня могуць нарадавацца яркімі колерамі і сьветлым цяплом.

А водаль грэблі і далей адпачываюць на купінах тонкія ляшчыны, сумныя вольхі і чулыя асіны.

А за імі разгарнулася балота, цягнецца-цягнецца ўдаль роўным абшарам аж да рэчкі. Балота скрозь абрасло шчацінай высокай травы, цьвёрдай і вострай, як шкло.

Часам вятры насоўваюць на свае плечы шэра-мутныя сьвіткі хмурых воблакаў і пускаюцца брысьці па балоце. Тады дрыжыць цьвёрдая шчаціна травы, і зморшчыны праходзяць па бяльмістых рудаўках. Туляцца вятры да зямлі, шумяць і сьвішчуць і месца сабе не знаходзяць. Пішчаць жаласьліва балотныя птушкі. Уніз, бы камень, падае драпежны аграмадны каршун.

Каля грэблі трохі падсохла.

Шмат было крыку ўночы; вакольныя сяляне ехалі на рынак. Вазы з сенам рабілі круг на многа вёрст вакол.

Цыпрук Ярэмчык, які заўсёды любіць пагутарыць з людзьмі, на гэты раз ня выходзіў на дарогу. Ён прапусьціў цікавую аповесьць мінулай кірмашовай ночы, гутарлівай дарогі.

У пазаўчарашнюю ноч у яго начаваў «аграмон» з портфэлем.

Шкадуе Цыпрук, што не запытаўся ў таго вучонага чалавека, на ўсялякі выпадак, лякарства ад зубоў.

Нібы «аграмон» урачыў: раніцою, пасьля яго ад'езду, у старога селяніна разбалеліся зубы, да таго моцна, ажна кінуў працу на полі і пашоў у хату. Вельмі шкадаваў, што сына-рабфакаўца дома ня было, бо той паехаў на нейкую «скрусію» у Ленінград. А то пэўна ведае сын зёлкі ад зубоў: не дарма-ж вучыцца ў Менску.

Стары Цыпрук увайшоў у хату і завойкаў.

Ва ўсіх яго хваробах войканьне лічылася першай «хуткай мэдыцынскай дапамогай».

Але войканьне мала памагала. Яно толькі зьвярнула ўвагу ўсіх хатніх на хваробу старога гаспадара і дало магчымасьць яму самому як-бы кінуцца ў рукі гэтай хваробе, аддацца ёй і казаць: «рабі са мною, што хочаш».

Толькі лёгка сказаць, «рабі са мною, што хочаш», калі нехта піліць па сківіцах, сьвідруе мозаг, выбівае іскры з вачэй. Лёгка так казаць, калі зубы ў роце вырасьлі ў паркан, цесна ім там, ныюць. Вось здаецца, выбіў-бы іх, размалоў-бы на муку, каб толькі вызваліцца ад гэтай агіды.

— Во-о-ой, во-о-ой!—стогне стары Цыпрук.—А ніколі-ж яны, шэльмы, так заядла не балелі, ліха на іх!

Пробаваў паласкаць зубы самагонам: добрае лякарства, лепшага ня трэба.

— Трасца нейкая, ці што?

І гарэлка не памагае.

Тады баба ахутала яму твар цёплай хусткай.

Стары сеў на лаву, абапёрся вострымі локцямі аб стол, сьціснуў далонямі твар і гудзеў ціханька, працягла, нібы камар:

— В-в-в-вой... Во-во-о-о-о...

— Ліха яе бяры з работай!—прамармытаў Цыпрук праз цёплую хустку.—Паеду да хвэльчара, ці што?

— А праўда, згадзілася баба,—усяго пяць вёрст да Моркаўкі!

Стары Цыпрук сам запрог каня. Паехаў.

У дарозе зубы яшчэ мацней разгуляліся.

... Ня ведаў я дагэтуль, што ў мяне зубы ёсьць, ці што? А во маеш сабе пацеху на старасьць—зубы!

Цыпрук заплыўшымі ад болі вачыма злосна паглядаў на крыж каня. Прыехаў.

На шчасьце, у старога фэльчара ня было пацыентаў.

Стары, адзінокі фэльчар сядзеў пры стале супроць недапітай пляшкі гарэлкі. На канапе адпачывала гітара.

На высьлізнулае з-пад хусткі «дзень добры!» фэльчар падняўся, пільна зірнуў на Цыпрука і сказаў:

— А, зубы? Штука прывычная!

— Якая там прывычная?

Фэльчар пачаў разважаць спакойным тонам:

— Спачатку абмазгуем, як і што, а потым возьмемся за дзела. Ого—зубы! З болем яны вырэзваюцца ў дзіцяці, з болем іх прыходзіцца вырываць у сталага чалавека, каб на той сьвет пайсьці бяззубым. Быццам перад сьмерцю чалавек толькі што нарадзіўся.

— Навошта гэты боль?

— Як навошта?!—зьдзівіўся фэльчар.—А з чаго-б наш брат жыў? Падыходзь бліжэй, дружа!

Цыпрук пасунуўся да фэльчара.

— Ды скінь анучы з цэры! Абматаўся імі, як тая баба. Не падобен-жа ты, пане дабрадзею, да чалавека, а да нейкага ня тое ды ня сёе, ня тут кажучы. Ну, годзе стагнаць...

Цыпрук разматаў хустку. Бародка зьлямцавалася, падрабнела.

— А-а-а-у-вой-у-вой...

— Пакажы, пакажы, дружа! разяў ляпу!

— А-а-а! у-у-у!

Цыпрук матае галавой, расчыняе рот і паказвае закарэлым крывым пальцам у правы бок рота:

«Во-во-во»...

Фэльчар падводзіць селяніна бліжэй да вакна. Доўга ўглядаецца ў яго цёмны рот. Ківае галавою. Жмурыць маленькія вочы і як-бы сам з сабою гаворыць:

— Штука прывычная. Гнілы зуб—трэба вырваць.

— У—гум, у—гум.

Фэльчар дастае з шафы бутэлечку і пучок ваты. Наматвае кавалачак ваты на кончык запалкі, макае ў бутэлечку з лякарствам і затыкае гэтым хворы зуб Цыпрука.

— Цяпер адпачні трохі.

Цыпрук сеў на табурэт, а фэльчар заспацыраваў з кута ў кут, мармытаў пад нос і калечыў украінскую песьню:

Ї шумэ, і гудэ,
Дробен дождык ідэ,
А хто мэнэ молодэньку
Тай да дому довэдэ?

Праз колькі часу фэльчар пытаецца:

— Ну, што? Палягчэла?

— У—гум!

«Пашумеўшы і пагудзеўшы», фэльчар зноў пытаецца:

— Адпаў боль?

— Адпаў! Дай вам бог здароўя ці што? Цяпер і гаварыць магу. А то проста бяда. Як вострым шылам калола скіўцы, галаву. Пробваў самагонам лячыць.

— Ну, і як?—зацікавіўся фэльчар. Гарэлка часам памагае.

— Дзе там!

— Зараз вырвем—і гэты зуб ніколі балець ня будзе, бо яго самога ня будзе... За іншыя, суседзе, ня ручаюся... Калі не заразіліся ад хворага, тваё шчасьце. А то, ведаеш, часам нападзе на зубоў пошасьць, усёроўна як на курэй.

Фэльчар дастаў з шафы бліскучыя абцугі. Наліў вады ў шклянку, кінуў туды некалькі драбінак нейкай солі, ад чаго вада пачырванела, і падышоў да селяніна.

— Ты толькі глядзі, дружа, сядзі спакойна. Як буду рваць, ня круці галавою і не хапайся за мае рукі. Разумееш, пацярпі. Ну, як-бы не ў цябе рвуць зубы, а ў мяне...

— Ужо ці што?

— Разяў рот шырэй, яшчэ шырэй. Во так!

Фэльчар сам разявіўся: паказаў Цыпруку, як гэта трэба рабіць:

— А-а-а-а!

— А-а-а-а!

— Добра! Пачынаю! «І шумэ, і гу...» Толькі дружа, глядзі, дзяржыся рукамі за тубарэт—і ні з месца! Шутка прывычная...

Фэльчар яшчэ раз паглядзеў селяніну ў рот.

— Ну і зубы ў цябе—конскія, здаровыя. Ага! вось ён! Гад гэты... Зладзюга... Мы яму задамо дыхту!

Усунуў тонкія сталёвыя абцугі.

— Ківаецца шэльма, як стары жыд пры малітве. Мы яго... Цап! штука прыв...

— Ой, ой!

Цыпрук крыкнуў немым голасам і схваціўся рукамі за рукі фэльчара.

— Ой, ву-ой!

— Такога ўгавору ў нас ня было,—пакрыўдзіўся фэльчар.— Мудрыя церпяць. І пан Езус цярпеў... І вісеў на крыжы, як комуністы ў белагвардзейскім лягеры.

Фэльчар зноў прыняўся за работу.

Селянін пакрыўся потам. Цяжка сапеў.

— Вуай!—крыкнуў Цыпрук, як дзіцё, якое толькі што нарадзілася, і падскочыў на месцы.

— Ох, ты!—зазлаваўся фэльчар,—сам вінават, што зуб даўся папалам. А, здаецца, ня той, за які браўся... Штука прывычная... Паласьні рот гэтай чырвонай жыжай. Адсапніся...

Фэльчар падсунуў шклянку.

Цыпрук паласкаў рот і пачаў выць, скавытаць дзікім, немым голасам.

— Ву-а-ай... О-о-о-ой... Ая-ё-о-ой...

— Што сеяў, то і жні,—апраўдваўся фэльчар.—Казаў-жа табе: сядзі спакойна. Трэба было сядзець!

— Такімі абцугамі і скіўцы мог мне выкруціць, ня толькі здаровы зуб паламаць,—сыпаліся праз выцьцё словы Цыпрука.

— Дай сюды! Я цяпер ужо ведаю, дзе хворы зуб...

Цыпрук падняўся моўчкі.

Акуратна абматаў хусткай твар.

— Прышлю табе праз унука старыя граблі, дык будзеш зубы рваць у грабель.

Цыпрук выняў з кішэні дзьве грыўні і палажыў на стол.

Фэльчар мармытаў:

І шумэ, і гудэ...

Цыпрук стукнуў дзьвярыма і вышаў.

Сеў на воз. Ад вялікай злосьці на фэльчара зубны боль як-бы сьцішыўся.

Едучы дахаты, Цыпрук злаваўся ўжо не на фэльчара, а на сына, які часта гаварыў, што калі чалавек захварэе, дык трэба лячыцца ў доктара, а не ў шаптуна.

... Во як доктар памагае. Узяў-бы я гэтыя абцугі ды адкруціў-бы яму нос, гэткаму доктару!

Ад злосьці Цыпрук моцна сьцебануў каня. Конь з няпрывычкі падскочыў заднімі нагамі, наваструў вушы і пабег шпарчэй.

Слава Сымона Чарнюка, бацькі Язэпа Крушынскага, лунала па ўсёй ваколіцы.

Ён лячыў ад усіх хвароб зёлкамі і нашэптанай вадою.

Хворыя езьдзілі да яго за многа міль. Ня толькі звычайна хворыя, але вазілі да яго вар'ятаў, «пакручаных» падвеем. Езьдзілі бабы, у якіх ня было дзяцей, мужчыны з сакрэтнымі хваробамі. У селяніна ўкралі каня—ішоў да шаптуна, каб даведацца, хто ўкраў. Даведваліся ў яго, хто хату падпаліў. Прыходзілі па розныя сямейныя парады.

Цёпкаліся да яго па гразі і ў глухую восень, у вясеньнюю паводку на чоўнах перабіраліся. І ў зімовыя завеі, і ў летнюю гарачыню да яго зьяўляліся розныя людзі, і ня толькі простыя сяляне, але нават і шляхта, і з мястэчак. Адукаваныя дабрадзеі з гораду хоць рэдка, але таксама бывалі ў Чарнюка.

Вельмі ня любіў Сымон Чарнюк, калі гарадзкія нешта ў кніжках запісвалі пры ім. Аднаго разу такі гарадзкі хацеў яго сфотографаваць, дык шаптун ледзь фотографічнага апарату не зламаў.

— Хочаш мяне са сьвету зьвесьці!—злаваўся Сымон Чарнюк.— Праколеш потым шпілечкай маю картачку, і ў мяне грудзі забаляць, сэрца заные...

Заўсёды Сымон Чарнюк спачатку злосна прабіраў сваіх пацыентаў, сыпаў брыдкімі лаянкамі, а пасьля ўжо «лячыў» вадою.

Калі прыходзіў да яго чалавек, у якога ўкралі каня, ён, звычайна, распытваўся аб усіх суседзях, з якімі той сварыўся ў апошні час, даведваўся аб ваколіцы, аб кірмашовых мястэчках, аб усіх лясох і дарогах вакол, потым доўга думаў, меркаваў і часта правільна паказваў, дзе шукаць каня.

Пры гэтым шаптаў на ваду і даваў «пацыенту» піць.

Па судовых справах ён таксама даваў піць «лякарства» і ўважліва, па-адвакацку, знаёміўся з судовай справай. Сухотнікаў, раматусных і іншых хворых, апрача вады, лячыў яшчэ і зёлкамі. Людзей, «сапсутых нячыстай сілай», ён лаяў, часам нават і біў. Пры гэтым яго чорныя вочы страшна блішчэлі.

Сымон Чарнюк дзяліў усе хваробы на тры катэгорыі:

1) калецтва цела зьверху, 2) нутраныя і 3) калі чалавек сапсаваны «нячыстай сілай».

Першае лякарства—нашэптаная вада—ужывалася пры хваробах усіх катэгорый.

«Вада ачышчае чалавека»,—гаварыў часта Сымон Чарнюк.

Узьверхнія калецтвы цела лячыў травамі і «замаўляў кроў», каб «ачышчалася».

Усе нутраныя хваробы ён лячыў таксама зёлкамі.

— Нутраныя хваробы—ад чарвякоў, якія кішаць у чалавечым целе. Гэтыя чарвячкі—дробненькія. Іх не заўважыш. Яны грызуць чалавека—ён сохне, марнее і гіне. Тое самае бывае з капустай, са збожжам на полі, з дрэвамі, калі нападзе рабак.

Паводле Сымона Чарнюка, яго зёлкі і нашэптаная вада рабілі тое, што хворы выплёўваў пошасных чарвячкоў, выпаласкваў іх з цела. Тады чалавек здаравеў.

Дактары, па-ягонаму, кепска лечаць людзей, бо яны сваімі лякарствамі труцяць маленькіх чарвячкоў у чалавечым жываце. Спачатку чалавек як-бы ачуняе, але гэта толькі спачатку, бо атручаныя чарвячкі асядаюць у целе, ня вылазяць наверх. Ад розных хвароб іх набіраецца там цэлая куча, вось як магільнік ўсёроўна... Яны гніюць у чалавечым целе. І вось раптам, пасьля доктарскіх лячэньняў, чалавек памірае.

— Няхай апруцянее фэльчарская парада на ўсім сьвеце!—вылаяўся Цыпрук.

Ён пакінуў дома каня і пехатой пусьціўся ў дарогу да Сымона Чарнюка зубы лячыць. Пашоў пехатой па дзьвюх прычынах: каб каня не адрываць ад гаспадарчай працы, а таксама, каб пільней прыглядацца да таго-сяго, што на дарозе робіцца... Паглядзець, як ідзе праца ў людзей на полі, а часам з чалавекам, пры выпадку, пагаварыць.

Да Сымона Чарнюка (па-вандроўніцку: з торбай за плячыма і кіем у руках) Цыпрук прышоў пад вечар.

Дробны, рэдкі ельнічак пазалочаны заходнім сонцам. Маленькія вакенцы Сымонавай хаткі праменяцца ад сонца, і здалёк здаецца, што гэта знутры хаткі сьвеціцца агонь. Уся хатка—і трухлявыя, нізкія сьцены, і зарослы рознымі травамі дах—таксама афарбована ў празрысты бледна-ружовы колер заходу.

На дзядзінцы буяе махрастая крапіва і попельнага колеру палын. Каля самых сьцен прымасьціліся густыя кусты малінынку. Сьцены абвешаны жмутамі драўляных абручоў. Кучкамі навалены дубовыя клёпкі. Яны сохнуць і на даху. Каля дзьвярэй—недаробленыя асінавыя начоўкі.

Недалёка ад хаты, пры дрывотні, стаіць фурманка. Калматы сялянскі конік ня выпражаны, задумёны, апусьціў галаву над ахапкам сьвежага сена. Ружовыя колеры сонца адлюстроўваюцца ў яго застыглых, як-бы няжывых, вачох дзьвюма плямкамі. Між мяккімі губамі каня дрыжыць пучок сена. Конь забыўся глынуць, і жмуток выглядае сьмешнай казьлінай барадою, якая расьце, надзіва, між губ у роце.

З хаткі пачуліся крыкі. Нехта заходзіцца ў плачы і прарэзьлівым голасам пішчыць:

«Ратуйце, ратуйце... душыць... ой, душыць»...

Стары Цыпрук зьдзівіўся, трохі занепакоіўся. Праз цёмныя сенцы, скуль пахнула на яго сьвежым дрэвам, зьмешаным з вільгацю і многагадовай трухляцінай, ён дабраўся да сьцяны вобмацкам і па галасох знутры трапіў да дзьвярэй. Адчыніў.

На тапчане ляжыць маладая, гадоў васемнаццаці, дзяўчына.

Яна глядзіць перад сабою затуманенымі ад сьлёз вачыма і як-бы нічога ня бачыць. Зрэнкі, павялічаныя ад затаёнага спалаху, дрыжаць у бязьмернай чарнаце. Вейкі трасуцца хутка і лёгка, нібы крыльлі матылька. Прыпухлы ад плачу твар дзяўчыны бледны з шаравата-зялёнымі плямамі на шчоках і ілбу. З-пад белай хусткі выбіліся чорныя валасы. Рукі яна моцна прыціснула да грудзей.

Каля дзяўчыны на тапчане сядзіць кабета гадоў пад сорак пяць, поўная, паважная. Аднэй рукой абыймае тонкі стан дзяўчыны, а другой выцірае сьлёзы з сваіх вачэй.

Час-ад-часу дзяўчына дрыжыць усім целам і стогне:

«Мамка... мамка»...

А вось яна ўскочыла з тапчана:

— Ратуйце! Душыць! Паміраю! Ой, канец надыходзіць... зараз... зараз...

Яна кідаецца на грудзі маці, туліцца да яе і трапечацца ад страху.

Сымон Чарнюк строгімі вачыма зірнуў на яе і затупаў нагамі:

— Ціха, ты! Не памрэш! Гэта табе так здаецца. Ціха, а то...

Ён сьціснуў кулакі і як-бы намерыўся біць.

Дзяўчына пад яго крыкамі супакойваецца і, ня здымаючы з яго вачэй, зноў апускаецца на тапчан.

Сымон Чарнюк пытаецца ў сталай кабеты спакойным голасам:

— А даўно яна так?

— Некалькі месяцаў.

— Яна можа спалохалася?

— Здаецца, не. Мне, прынамсі, нічога не казала.

— У вашай сям'і, у сваякоў, няма хворых?

— У мяне старшая сястра так вырабляла. А як вышла замуж, дык ачуняла.

— Ага...—сказаў многазначна шаптун.

Наліў з вядра вады ў вялізную бутэльку. Доўга шэпча.

Дае напіцца хворай. Пры гэтым зноў робіцца злосным, настаўляе на хворую бліскучыя чорныя вочы і гаворыць строгім голасам:

— Будзеш здаровай! Будзеш здаровай! Будзеш здаровай!

Дзяўчына глядзіць на яго, як зачараваная.

— Калі не ачуняеш, біць буду!

Затрос над ёю кулаком.

Палез на печ, дастаў адтуль засушаны пучок зёлак і даў кабеце.

— Вось гэта напарыш у гаршку, увальлеш сюды вады з бутэлькі і будзеш паіць яе гэтай настойкай два разы ў дзень перад усходам і заходам сонца. Няхай вып'е кожны раз з поўшклянкі. Перад сном будзеш ёй naціраць грудзі і плечы халоднай вадою з сольлю.

За ўвесь гэты час на старога Цыпрука ён не зварочвае ніякай ўвагі, нават ні разу на яго ня зірнуў.

Цыпрук аглядае курную старасьвецкую хату.

Яна чорная ад дыму і пахне нейкай гаркатою, ня так, як усе сялянскія хаты. Хоць застаўлены рознымі мяшкамі, пасудзінамі і скрынямі, але аддае пусткай, няжылым будынкам.

Стары Цыпрук з сялянскай зацікаўленасьцю і мужыцкім гаспадарчым вокам паглядае на рэчы ў хаце. Скрыні, цабэркі, кублы, начоўкі—усе прыкрыты дошкамі або палатном. Відаць, усё гэта нечым запоўнена, напакавана, бо з пасудзін, прыкрытых палатном, нешта падымаецца ўверх, тырчыць коптарам, і берагі палатна ўсунуты ў пасудзіны. Вока старога Цыпрука заўважае, што нешта сыпучае і пругкае знаходзіцца ў пасудзінах.

Ён пробуе цягнуць носам, каб пазнаць паводле паху, што тут знаходзіцца. Але пахаў у хаце так многа, што цяжка з іх вызначыць нешта адно пэўнае: пах дыму, розных траў, яблык, грыбоў—усё зьмешана.

Цыпрук да таго захапляецца гэтым усім новым для яго, што нават забывае пра зубны боль.

Яго цікавіць:

... А што ў хаце так многа напакавана?

Кожны цабэрак, мяшок, кубел і скрыня, здаецца, таксама і на Цыпрука пазіраюць з нязменшай зацікаўленасьцю. Нібы гэта глядзяць на чалавека жывёліны, толькі такія дзівацкія, што ня можаш уцяміць, дзе ў іх вочы, нос, рот, ногі ці іншыя адзнакі жывых істот. Адно толькі пазнаеш: паасобны характар кожнай з гэтых істот. Некаторыя з іх надаюць вясёласьць, іншыя нібы кпяць, а то наводзяць сум, страх і розныя неадчэпныя настроі. Няжывыя рэчы ў хаце Сымона Чарнюка здаюцца Цыпруку жывымі, разумнымі. Яны ведаюць многа, многа і нешта такое, чаго стары ўцяміць ня можа.

Селянін адчувае, што знаходзіцца пад іхнай незразумелай уладай. Яны нешта да яго гавораць, гавораць тымі галасамі, тэй мовай, якую заўсёды чуе на пустой дарозе, дзе ён стаіць каля сваёй хаты цэлымі гадзінамі і чакае навін...

На ўсім хатнім начыньні павольна і ў надзвычайна прыгожым суме памірае сонца.

Самы малейшы ўздрыг сонечнай сьмерці адчуваецца ў ігры колераў на ўсім вакольным. Зморшчынкі на мяшкох запоўнены сьветаценямі. Варсінкі на грубай тканіне адліваюць золатам. Месцамі на сьценах сонечныя водбліскі падобны да кропелек крыві. На скрынях і кублох вызначаюцца слаі дрэва, паводле

чаго Цыпрук можа ў выабражэньні дамалёўваць як гэтыя дошкі і кавалкі дрэва, якія ператварыліся цяпер у новыя формы, у новае жыцьцё, зьмяшчаліся раней у жывым целе хвоі, асіны ці дуба. Цыпрук, паводле слаёў, дагадваецца—ці з камля ўзяты кавалак, ці з сярэдзіны, ці зьверху. Старым спрактыкаваным вокам ён можа вызначыць, паводле слаёў, якога веку было гэтае дрэва. Адчуваецца сувязь між першапачатковай і цяперашняй формай рэчаў, якія ў выабражэньні селяніна жывуць асабістым жыцьцём.

Памірае сонца.

Праз вокны прасейваюцца ў хату апошнія жаўтаватыя праменьні. Дробныя пылінкі ў асьвечаных кволым сонцам дарожках гойдаюцца цэлымі роямі, млеюць, заміраюць у паветры мільёнамі бліскучых крапінак.

Недалёка за сьцяною хрыпіць балотная птушка. Яе голас урываецца ў колеры сонечных адсьветаў гукавой ілюстрацыяй.

Колеры пачынаюць, бляднець, вянуць і губляцца ў шчылінах. Сымфонія фарбаў адыходзіць у далячыню на многа-многа міль, губляецца недзе ў прасторах, дзе, нявідочна для вока, жыве ранейшым жыцьцём.

Сонца сканала.

У рэдкім ельніку завандраваў поўзмрок.

У хаце пацямнела.

Ціха, бяз слоў і бяз спрэчак расплацілася кабета за лекі: выняла з-за пазухі кавалачак палатна, у якім заверчаны грошы, палажыла на стол. Вывела на двор супакоеную дзяўчыну.

Толькі цяпер Сымон Чарнюк зьвярнуў увагу на Цыпрука.

Толькі цяпер Цыпрук успомніў свае зубы: старому нялоўка. Зубы цяпер зусім не баляць... Ён пачаў прыслухоўвацца да іх, давай зьлёгку скрыгатаць імі, усунуў палец у рот—зубы як-бы ніколі не балелі...

Сымон Чарнюк на яго грозна зірнуў:

— Ну, чаго прышоў?

Ад вачэй Сымона, ад іх калючых праменьняў Цыпруку не па сабе.

— Зубы баляць...—мармыча ён і адварочваецца ад Сымонавых вачэй, нібы ад няпрыемнага дымнага агню.

— Маніш, падла, дылда старая!—хрыпіць ад злосьці Сымон.—Мяне не падвядзеш.

— Раніцой балелі...

— Ведаем гэткія казкі. Учора раса вочы ела.

— Дальбог балелі,—бароніцца Цыпрук.—Цяпер, ліха іх бяры, падвялі мяне, перасталі балець ці што?

— Добра, калі перасталі балець. Здаровых я не лячу...

— Палячы, братку, дык мо' трывалыя будуць...

— Трывалыя, трывалыя. Нашто табе трываласьць? Няхай полудзень на сенакосе будзе трывалым.

— Пашапчы мне на зубы...—не адстае Цыпрук.

— Вон з маёй хаты! Ведаю вашых. Прышоў нюхаць, што я раблю, як народ абманваю! Хто цябе прыслаў, качарэжка крывая?

— Ніхто не прысылаў...

— Ідзі да доктара. Многія прыходзяць ка мне, каб выведваць. Ідзі!

Сымон Чарнюк адчыніў дзьверы і паказаў на іх сухой чорнай рукою.

Цыпрук зьбянтэжаны, згорблены высунуўся за дзьверы.

— Ну і людзі бываюць на сьвеце!—дзівіцца Цыпрук.—Чорт іх няньчыць. Гэта-ж трэба адважыцца чалавека з хаты гнаць...

Цыпрук плюе, лаецца і ідзе ў вёску шукаць прытулку нанач.

— Вось і жыві цяпер на сьвеце... Вось і лячыся. Адзін д'ябал кіруе і фэльчарам, і шаптуном.

Нанач ён астаўся ў вёсцы «Дразды і Дзятлы» ў аднаго старога селяніна. Але і тут яму не шанцавала. Стары гаспадар вельмі моцна, ад усяго сэрца, прабіраў свайго сына.

Цыпрук у яго запытаўся:

— Што за сьвет настаў? Цяпер і старыя перайначыліся, ці што? Усе людзі такія злосныя, што хоць ты іх...

Тут ён спыніўся, бо ня ведаў, што з такімі «злоснымі людзьмі» рабіць.

— Так,—згадзіўся стары гаспадар,—настаў такі паганы сьвет, што хоць ты яго...

На гэтым і гаспадар спыніўся, бо і ён ня ведаў, што рабіць з такім «паганым сьветам».

Старыя трапілі адзін аднаму ў тахт гэтым няведаньнем, што рабіць з злоснымі людзьмі і паганым сьветам.

Старыя пільней зірнулі адзін на аднаго і пачулі блізкасьць...

Іх зьвязала ў гэты міг узаемная сымпатыя, нібы ў хлапчукоў-падлеткаў, якія апынуліся ў кампаніі дарослых людзей.

— Адна бяда, не бяда, але калі іх нападзе цэлая капа, дык ня ведаеш, дзе дзецца!—казаў стары гаспадар.—Зьнімі, дзядзька торбу з плеч!

— Бойся бога, пане гаспадар! Гэта-ж праўда, што адна бяда не бяда,—узрадаваўся Цыпрук: да яго чалавек па-чалавечаму загаварыў...

— А якая ў мяне бяда?—як-бы запытаўся стары гаспадар у Цыпрука,—такая, братку, бяда, што і людзям брыдка паказаць, як скулу на паганым месцы. Вось, прыкладам, сын у мяне. Марцінам завецца...

— І дзякаваць богу...—устаўляе слова Цыпрук.

— За усё мы павінны дзякаваць богу. Але сын мой во ўчора жаніўся...

— Гэта кепска, ці што?

— Жаніўся. Але ня так, як людзі жэняцца.

— А што? Бяз шлюбу?

— Горш таго. Вунь глянь: сядзяць, абняўшыся, на дварэ, каб іх ліха ды бяда абдымалі!

— Няможна так, пане гаспадару! Маладыя яны—няхай цешацца. Самая любасьць цяпер у іх. І мы былі маладымі, ці што?

— Але мы так ня дурэлі. Гэта-ж мой Марцінка за жонку сабе жыдоўку прыдбаў...

— Жыдоўку?!

Цыпрук выставіў на старога спачуваючыя вочы.

— Во то-та-ж. Кажу я сыну: гэта яшчэ поўбяды, але-ж яе, жыдоўку, хрысьціць трэба—тутэйшага каваля Лейбы дачку.

— Так, хрысьціць трэба. Згодзен...

— Ты дык згодзен, але яны, каб на іх тры пагібелі і адна трасца і то мала, нязгодны...

— Во гэта горш... Новы сьвет настаў, ці што?

— Гэты новы сьвет нанёс сюды сын шаптуна, Язэп Крушынскі.

— Ці ня той самы, да якога аграмон езьдзіць, ці што?

— Той самы. Ён то чалавек ня кепскі. Сыпле грошы направа і налева, але ліха яго з грашыма! Баламуціць народ. І ўсе тут за яго гарою стаяць. Разыкоўны ён чалавек, гэты Крушынскі,

разыкоўны, кажу я, і спрытны. Але да пары жбан ваду носіць. Каб ня ён, дык і Лейба каваль тут ня жыў-бы і яго дачка не закруціла-б мазгоў майму сыну.

— Усё гэта «каб ды каб», як капнуць цябе па галаве, дык і ня ведаеш, дзе дзецца, ці што.

— Разумны ты чалавек, як бачу.

XII

Трывожна праспалі гэту ноч Іван Мацьвеевіч і Крушынскі.

Агроному ўсю ноч сьніўся чалавечы чэрап, які прынёс Крушынскі з кургана. Чэрап рагатаў, яміны вачэй у ім сьвяціліся двума фосфорытнымі аганькамі. На цемяньніцы вырасталі валасы, зноў павылазілі. Агроном часта прасыпаўся, а як засьне—зноў у яго снох фігуруе чэрап у розных варыянтах: то на агародзе качаны капусты растуць; прыглядаецца ён, ажна гэта не капуста, а па градках натыканы чарапы. Кожны чэрап мае свой выгляд, сваю асаблівасьць жывой чалавечай галавы. А то бачыць ён у натуры «апотэоз вайны»—малюнак Верашчагіна: вялізная піраміда з чалавечых чарапоў. Каля чарапоў сядзіць «Леў Талстой», з якім ён удзень пазнаёміўся, і піша нешта на пажоўклым пэргаміне.

Усю ноч кідаўся ён з боку на бок, засыпаў, прачынаўся і ўвесь час адно і тое самае—сон пра чэрап.

Крушынскі сноў ніякіх ня сьніў. Яму проста ня спалася. Курыў папяросы ўсю ноч. У яго было такое адчуваньне, нібы ў таго купца, караблі якога знаходзяцца ў бурным моры. Ён рупіўся аб трох вазох сена і трох вазох дроў, якія павезьлі ў Менск на рынак Дразды і Дзятлы...

Ні Крушынскі, ні агроном не расказалі адзін аднаму аб кепска праведзенай ночы. Па-звычайнаму пасьнедалі. Іван Мацьвеевіч з большай стараннасьцю, чым заўсёды, расказваў сьмешныя анэкдоты. Крушынскі з большай пільнасьцю слухаў іх і так шчыра сьмяяўся, ажна жонка яго, пані Ганна, зьвярнула на гэта ўвагу:

— Ня сьмейся так, Язэп, бо мне нядобра ад твайго сьмеху.

Пасьля сьняданьня гаспадар і агроном вышлі на двор.

Пачаўся агляд гаспадаркі. Самым слабым месцам у культурнай гаспадарцы Курганішча быў сад. Калісьці добры сад, які займае некалькі дзесяцін зямлі, цяпер вельмі запушчаны.

Старыя яблыні і грушы ня маюць догляду і даюць мала пладоў. Месцамі пад дрэвамі навалена шмат ламачча. На пустых палянках у садзе пасьвяцца цяляты. Пасярод саду красуецца вельмі прыгожая сажалка. Правільны круг сажалкі абсаджаны малінънікам. Калісьці тут у вадзе вяліся карасі. Цяпер сажалка пакрыта зялёнай плеўкай, у якой плюхаюцца жабы.

Іван Мацьвеевіч строга ківаў галавою, запісваў нешта ў блёк-нот і паўтараў адно і тое самае:

— А-я-яй, Язэп Сымонавіч! А-я-яй!

— Усё няма калі гэтым займацца. Заняты ўвесь час полем, жывёлай і рознымі іншымі справамі.

— А-я-яй, Язэп Сымонавіч! Такое дабро прападае. Я вам прышлю садоўніка. Ён дорага ня возьме. Няхай прывядзе ў парадак сад. А то буду мець наганяй, як даведаюцца.

Іван Мацьвеевіч усё пісаў у кніжцы.

Крушынскі пачаў жартаўліва вырываць блёк-нот з рук агронома.

— Ня пішэце, Іван Мацьвеевіч, яшчэ год—і не пазнаеце гэтага саду.

— Памалу, блёк-нот парвяцё. Вы ўсё адкладваеце з году на год.

— Затое паглядзеце маё пчалярства. Пятнаццаць калод маю. Сам даглядаю іх. Вельмі пчол люблю.

— Дзякую за прыемнасьць. Пакусаюць мяне, як у мінулы раз. Яны ня вельмі гасьцінныя, вашыя пчолы. Колькі новых раёў сёлета?

— Не шанцуе мне з гэтым. Улятаюць маладыя раі. Ёсьць тут за пару вёрст адзін стары бортнік, дык хваліцца, што такую замову ведае. Як толькі шапне—усе раі на яго вульлі апускаюцца.

— А гэта што за новая будыніна ў канцы саду?

— Лазьню паставіў. Другім разам як прыедзеце, нагрэем для вас лазьню, Іван Мацьвеевіч. Вы толькі не запісвайце нічога дрэннага аба мне.

— Дзе там дрэннае напішаш, калі ў газэту даў аб вас такі добры артыкул. Ня буду-ж пісаць, Язэп Сымонавіч, супроць самога сябе.

За садам разгортвалася вялікае поле канюшыны.

— Вось гэта ў мяне сёлета добра ўрадзіла!—хваліўся Язэп Крушынскі, паказваючы на канюшыну.

— Так, але вунь авёс вельмі мізэрны,—крытычным тонам сказаў агроном.

— Калі тут поле такое камяністае, што ліха яго ведае. Вунь глядзеце, колькі каменьняў выбралі. Два чалавекі працавалі ў мяне над гэтым дабром некалькі месяцаў. Бачыце тры вялізныя крушні. Усе межы завалены каменьнямі. Ты іх выбіраеш, а яны зноў як-бы вырастаюць з зямлі. Плуг псуецца.

Іван Мацьвеевіч запісваў.

— А як караньплоды?

— Можна паглядзець. Сёлета ўрадзіла. Шмат гною даў.

— Не пайду: сонца пячэ. Галоўным чынам, хвалю вас, Язэп Сымонавіч, за жывёлагадоўлю. Учора агледзеў хлявы. Проста на нямецкі лад. Бачыў вашых кавалераў: бугая і жарабца—лёрды ангельскія. Толькі манокляў не хапае.

— Разьбілі-б манокле, Іван Мацьвеевіч. Жартачкі, з усёй ваколіцы прыводзяць кароў і кабыл. Бугай яшчэ малайцом, а жарабец як-бы засумаваў, страціў жвавасьць.

— Трэба асьцярожна. Праз меру не гадзіцца. Сапсуецца. Ага, я ня бачыў яшчэ, як у вас вядзецца запіс удою.

— Самая акуратная бухгальтэрыя, Іван Мацьвеевіч. Жонка запісвае кожны раз. Пакажу сягоньня.

Яны вышлі ў малады дубняк.

Дзе-ні-дзе высіліся рослыя дубкі, а месцамі стаялі густымі шэрагамі тонкія, бы пугаўі, дубочкі, нібы насаджаныя рукою чалавека. У самым цэнтры дубняку разгарнуліся ўшыр і ўвысь два волаты-дубы.

— Нічога сабе сямейка,—сказаў агранам і любаваўся на дубняк.—Вось два дубы роданачальнікі, а вакол іх гадуюцца дзеці, унукі, праўнукі і пра-праўнукі. Гэта самае поэтычнае з усёй вашай культурнай гаспадаркі, Язэп Сымонавіч!

— Мабыць, дзеля таго, што я дубняку зусім не гляджу. У мяне быў адзін знаёмы, дык ён заўсёды гаварыў: «ня трэба нічога рабіць, тады ўсё будзе добра».

— Яго філёзофію практыкуеце на запушчаным, адзічэлым садзе, Язэп Сымонавіч? Аднак, нічога не рабіць—не па вашай натуры.

— Вось дзеля гэтага, што многа раблю, ня маю часу дбаць аб садзе. Затое сельска-гаспадарчыя машыны ў мяне ў парадку.

— Так і ёсьць, але цяпер маю ахвоту пад цяньком пасядзець пад гэтымі дубамі,—лянівым і рахманым голасам сказаў Іван Мацьвеевіч.—А вось і курганы недалёка. Адгэтуль вы чэрап прынесьлі?

— Не. Тыя курганы на другім баку, пад самым лесам.

— Вось дзеля чаго вы ўчора так марудзілі. А чэрап мне ўсю ноч сьніўся.

— Я сягоньня раніцою закапаў яго ў садзе. Болей сьніцца ня будзе. Вы тут, Іван Мацьвеевіч, пасядзеце ў цяньку, а я пайду. Зараз вярнуся.

Крушынскі пашоў на хутар.

Над галавою Івана Мацьвеевіча зашапталіся старыя дубы—«бацькі» дубняку.

Дубняк высіцца над самай рэчкай. На гэтым месцы бераг стромкі і абрывісты. Жоўты пясок слаісты, з прымешкаю чырвонай гліны, ледзь ня роўнай сьцяной вісіць над вадою. Маленькія плотачкі цэлымі стадкамі мітусяцца ў чыстай вадзе, блішчаць серабром. Дно рэчкі залоціцца жоўтым пяском. Па другім беразе па сьцежцы вясковыя бабы нясуць мяшкі з травою. Дзяўчынка, гадоў дзесяці, загарэлая ад сонца, з закарузлымі худымі ножкамі валачэ за імі, нібы зброяноша, тры сярпы. Бабы сьмяюцца, жартуюць і гавораць аб учарашняй бітве Драздоў і Дзятлаў.

Іван Мацьвеевіч прытаіўся пад дубам, чамусьці ня хоча, каб вясковыя бабы яго тут заўважылі.

Калі бабы адышлі далёка, ён скінуў з сябе вопратку, адышоў у бок, дзе бераг ня быў такім крутым, і спусьціўся ў рэчку. Улез па пояс у ваду. Вада была яшчэ халодная.

Ён сьцяў зубы ад холаду, даў нырца, трохі паплыў і выскачыў на бераг. Успомніў, што ня мае чым выцірацца. Сеў на сваю бялізну пад сонца, каб сагрэцца.

— Холадна, Іван Мацьвеевіч?—запытаўся Крушынскі здалёк.—Зараз будзем грэцца.

Крушынскі нёс пару бутэлек віна, два кілішкі і белую сарвэтку з закускаю.

— Ну, і практычны вы чалавек, Язэп Сымонавіч! Гэта-ж трэба так умець наладзіць справы, каб усё было на месцы і ўпору... Хутчэй, дарагі, налейце віна, а то ўсё нутро трасе ад холаду.

Крушынскі наліў віна ў кілішак.

— Яшчэ!

Выпіў яшчэ кілішак.

— Яшчэ на закуску адзін!

Выпіў.

— Цяпер пацяплела!

Агроном хутка апрануўся.

Пад ценем дубоў яны разлажылі сарвэтку і ляглі адзін супроць аднаго, апіраючыся локцямі аб зямлю.

Віно хутка выпілі.

— Вось тут на беразе думаю млын будаваць, паравы. Гэта музыка будзе каштаваць каля пятнаццаці тысяч рублёў. Яшчэ не хапае палавіны.

Так развражаў як-бы сам з сабою Язэп Крушынскі, пазіраючы ў даль на сенажаць і поле.

— Няма добрага млына па ўсёй ваколіцы. Проста бяда. За пятнаццаць вёрст прыходзіцца езьдзіць.

— Так... Так...—лянівым голасам мармытаў Іван Мацьвеевіч.

— Мая культурная гаспадарка яшчэ больш праславіцца, калі тут будзе добры млын. Для сялян вялікая карысьць.

Язэп Крушынскі падрабязна гаворыць аб пляне будоўлі млына. Доўга разважае аб выгадах для вакольных вёсак і ня бачыць, што Іван Мацьвеевіч сьпіць ціха і смачна, падлажыўшы пульхлыя рукі пад правую шчаку, як дзіцё, якое яшчэ не пакаштавала смаку дабра і зла на грэшнай зямлі...

Стары Цыпрук зноў у дарозе. Торба за плячыма, кій у руках.

— Даўно не вандраваў. А вось, ні з таго, ні з сяго, прыходзіцца рабіць такі маршрут...

Зуб трохі ные, але ня так, як учора раніцою.

— І фэльчар не лячыў, і шаптун не шаптаў, а вось хаджу сабе, як бяздомны, па шырокім шляху. І ў хаце нават няма чым пахваліцца...

Стары памалу рухаецца наперад.

На дарозе мала людзей. Часам пройдзе стары вярсту-другую і жывой душы ня сустрэне. А калі-ні-калі між жытамі на лагчыне блісьне каса: селянін лужок косіць.

— Ня будзе чым у хаце пахваліцца...

Стары аглядаецца па бакох, прыслухоўваецца адным вухам, другім...

Ён уваходзіць у звычайны смакназіраньня.

Дарога сама па сабе яго дужа вабіць. Тыя вербачкі, бярозкі і ляскі, якія бачыў учора, сягоньня сустракаюць яго абапал дарогі, як добрыя сябры.

Цішыня дарогі, пасьля ўчарашняга кірмашовага грукату, урачыстая і глыбокадумная.

Селянін павольна ідзе наперад. Яго цікавіць таксама, што робіцца за яго плячыма, ззаду...

Раптам спыніўся.

Пачуў грукат калёс ззаду. Адвярнуўся. Праз воблака дыму заўважыў фурманку. Яна хутка параўнялася з ім. Спынілася.

З воза ветла ўсьміхаецца «аграмон», які пазаўчора ў яго начаваў. Побач з «аграмонам» сядзіць другі чалавек.

— Зараз наедзе мой фурман; вы, таварыш, з ім пад'едзеце,— кажа агроном да Цыпрука.

Іван Мацьвеевіч з Крушынскім паехалі далей, сьцелючы дарогу белаватым пылам.

— А настаўніцу я абавязкова цяпер з Менску прывязу! А то сапраўды дзеці распусьціліся. Цягаюцца ўсюды, па лесе капаюцца... Адно гора з гэтымі дзецьмі...—кажа Язэп Крушынскі, успамінаючы аб учарашнім «скарбе».

— Так... так... заўсёды мяне слухайцеся і ўсё добра будзе!

Насупроць іх здалёк паказаліся конныя.

Крушынскі пабляднеў.

— Пагранічнікі вечна ёрзаюць,—прагаварыў ён і няпрыкметна для Івана Мацьвеевіча выкінуў з каляскі мяккі пакунак.

... Калі «свае» пагранічнікі, тады самі прынясуць мне гэты пакунак,—падумаў Крушынскі,—а калі «чужыя»—чорт з імі!

Пагранічнікі пад'ехалі бліжэй.

Крушынскі хацеў сажмурыць ім адно вока ў знак сяброўства.

... Не... «чужыя», ліха на іх...

— Стойце, таварышы!—крыкнулі строга пагранічнікі.—Куды едзеце?

— У Менск.

— Што вязеце?

— Паглядзеце!

Голас крушынскага сьмелы і задзёрысты.

Пагранічнікі саскочылі з коняй і падышлі да фурманкі. Запыталіся дакумантаў. Падазрона зірнулі на вопратку агронома, на яго портфэль, пэратрасьлі чамадан, сена на фурманцы. закурылі ў Крушынскага, ветла разьвіталіся і селі на коняй.

Фурманка схавалася з вачэй старога Цыпрука, яе грукату ўжо ня чуваць, а пыл на дарозе яшчэ ня ўлёгся.

Стары селянін ідзе наперад па вузкай сьцежцы на мяжы і прывычным гаспадарчым вокам паглядае на ўсе бакі.

... Што за чорны камячок ляжыць на дарозе?

Зацікавіўся, падбег да «камячка». Разгарнуў пакунак прагавітымі рукамі.

Кавалак сукна...

Ад радасьці ўнутры горача робіцца.

... Вось і адплата за вандраваньне...

Сарваў з плеч сьвітку, абкруціў пакунак і рушыў шпаркім крокам.

Агляну ўся па бакох.

Захацелася, каб да яго прыходу дамоў дарога была пустая, мёртвая, забытая ўсім сьветам...

Дзе там! Цяпер як наўмысьля... Вунь новы пылок коціцца здалёк, насустрач...

Конныя едуць.

Селянін супакойвае самога сябе:

... Што мне да іх і што ім да мяне?..

Ідзе вельмі павольна: «каб чаго не падумалі»...

Не глядзіць па бакох, вохкае ад старасьці...

Параўняўся з «імі».

— Што, стары, цяжка?

— Старасьць—ня радасьць, дзеткі мае.

Сьмяюцца вайсковыя, дабрадушна, па-здаравецку рагочуць:

— Го-го-го!

Ад гэтага сьмеху старому лягчэй на душы.

— Шчасьлівай дарогі, дзеткі мае!

— Бывай здароў, дзядок!

— Якія добрыя хлопцы!

Цыпрук шчыра расчулены.

Конныя ад'яжджаюць на некалькі крокаў.

Стары дае ходу.

— Гэй, дзед! дзед!! З тваёй сьвіткі нешта чорнае цягнецца.

— Ой, дзеткі мае!

Селянін спалохаўся і зьняў сьвітку з плеч.

Выпаў чорны пакуначак.

Коньнікі пад'ехалі.

— Пакажы, дзядок, што ў цябе?

— Гэта я купіў, дзеткі мае, у аднаго чалавека на вопратку сыну... Жэніцца сын мой...

— Ня хітры, стары!—строга кажа адзін з іх,—гэта-ж контрабанда!

— А ліха яго ведае. Я-ж купіў у чалавека, дзесяць рублёў заплаціў, каб я так здароў быў!

— Не мані, дзед!

— Каб я дахаты не дайшоў, калі маню...

— Ну, ну, разгаварывай!

— Яй-жа-ж богу, дзеткі, не картрабанда...

— Кажы, у каго купіў?—грымнуў злосна адзін з вайсковых.

Рэдзенькая барадка старога траслася.

— Усю праўдачку скажу, дзеткі мае, ці што? Гэта я знайшоў тут на дарозе...

— Не мані, а то горш будзе!

— Яй-жа-ж богу!

— Бог табе з неба кінуў, мабыць! Эх ты! Ідзём з намі!

— Мне дахаты трэба, дзеткі мае, вазьмеце сабе гэты пакунак, ці што?

— Ідзём, стары, ты арыштованы!

— А людцы мае! Я-ж ня ўкраў... Знайшоў на дарозе. Я-ж ня ведаў...

— Ідзём, а то...

Стары апусьціў галаву і паплёўся за коннымі пагранічнікамі ў другі бок.

... Каб скрозь зямлю праваліліся такая дарога, ці што?

Зноў занылі зубы...

XIII

Бывала, ні з таго, ні з сяго, Язэпу Крушынскаму рабілася цяжка на душы, так цяжка, ажна ня ведаў, дзе дзецца ад нейкага застаёнага сполаху. Прыкрыя хвіліны перажываў ён тады. Нешта яго гнула да зямлі. Яму здавалася, што ён маленечкі, слабы, шукае месца, дзе схавацца—і не знаходзіць.

Такі настрой заўсёды зьяўляўся ў яго, калі ён прыяжджаў у Менск. Каля вялізнага дому дзядзькі-нябожчыка ён заўсёды знаходзіў прычыну гэтага настрою. Тады ён усьміхаўся сам сабе, і яму раптам рабілася прыемна, так прыемна, нібы ён у другі раз сьніў сон раньняга маленства.

Моцна ўрэзалася ў яго памяць першае ўражаньне ад дому дзядзькі. Ніякія іншыя дамы, большыя і прыгажэйшыя за гэты, куды ён увайшоў васьмігадовым хлопчыкам з сялянскай маленькай хаткі, на яго ўражаньня пасьля гэтага ўжо не рабілі.

Калісьці дом дзядзькі яго палохаў і вабіў, як мітычная істота.

У хаце бацькоў, на вёсцы, ён маленькім хлопчыкам наслухаўся шмат баек аб страхоцьцях, аб царэўнах і царэвічах у зачарованых замчышчах. Яго душа, напоеная гэтымі байкамі, нібы хмельным пітвом, была тады вельмі чулая да ўсяго вакольнага. Яму здавалася, што поле, лес, рэчка, каменьні напоўнены нявідочнымі істотамі, якіх яму трэба баяцца, бо яны варожа настроены супроць яго. Увесь сьвет быў супроць яго.

Дзядзькаў дом глынуў тады яго, маленькага, пужлівага і безабароннага, як адно з страхоцьцяў вясковых баек.

Цагляная аграмадзіна ў чатыры паверхі высілася насупроць гарадзкога парку. Вялізныя вокны, у якіх мог схавацца самы высокі чалавек, былі выразаны ў чатыры рады ў пярэднім фасадзе дому з боку вуліцы. Дзякуючы такім вокнам, дом выглядаў лёгкім, як-бы плаваючым у паветры і выгафтаваным у правільныя ўзоры. Над тротуарам віселі прыгожыя бальконы. Тры пад'езды з вуліцы, з адшліфаванымі каменнымі ганкамі, з маляванымі дзьвярыма на дзьве палавіны, напоўкруглыя ўверсе, з прыгожымі орнамантамі, нагадвалі ўваход у касьцёл (яшчэ як Язэп быў маленькім хлопчыкам, езьдзіў з маткай у касцёл). Нібы ў касьцёле, блішчэлі каляровыя шыбы стрэльчатых вокнаў у калідорах. Сонца прапускала праз каля-

ровае шкло на шэры камень усходаў яркія вясёлкі. Такія вясёлкі бачыў часам Язэпка ў летні дзень у вёсцы, пасьля дажджу, на небе ў выглядзе вялікай дугі над сасоньнікам.

А са сьцен і суфітаў у калідорах (ня толькі ў пакоях) на малога Язэпа паглядалі крылатыя голенькія хлопчыкі. Некаторыя з іх трубілі ў трубы або стралялі з лукаў у кветкі на сьценах.

Язэпку тады здавалася, што гэта ён бачыць істоты з тых казак, якія чуў ад старых дзядоў на вёсцы.

У першы раз, як бацька прывёў яго сюды маленькім хлопчыкам, ён моцна спалохаўся гэтага дому, заплакаў у калідоры і прасіў літасьці ў бацькі:

— Татачка, дамоў паедзем... татачка...

З цягам часу Язэпка звыкся з дзядзькавым домам, доўга вывучаў яго з сьвежай дзіцячай зацікаўленасьцю і ўражлівасьцю; вывучаў з такім імпэтам, нібы апынуўся раптам у незнаёмым царстве, напоўненым дзівоснымі людзьмі і жудаснапрыгожымі рэчамі.

Дом быў такі вялікі, што ў ім магла-б зьмясьціцца цэлая вёска...

У ўяўленьні Язэпкі вёска была тады самай вялікай адзінкай меры і ліку.

Шмат народу жыло тут, нават больш, чым хлопчык мог сабе ўявіць.

Да фарбаваных дзьвярэй у калідорах былі прыбіты мэталёвыя дошчачкі з надпісам гаспадара кватэры, з кнопкай ад званка, са скрыначкай для пошты. Усюды адно і тое самае. Надзвычайны парадак панаваў у калідорах. Веяла ад іх строгасьцю. Іхная прыгожасьць ня вабіла вясковага хлопчыка: на ўсіх пляцоўках калідораў, у кожным кутку аднолькава. Гэта надакучала яму. Ён любіў, каб на кожным кроку было штонебудзь іншае. Такі густ да хараства ў яго выгадаваўся яшчэ на вёсцы, дзе ён часам з старэйшымі хлопчыкамі-сябрамі гуляў у лесе; там самы маленькі кавалак зямлі, нават корч, мае іншы выгляд, не такі, як ранейшы.

Адно, што ён любіў тут,—гэта каменныя ўсходы з паліраванымі, гладкімі, як шкло, парэнчамі.

У той час, калі вялізны дом душыў яго турэмнай замкнёнасьцю, дзе, як хлопчыку здавалася, ня было патрэбнага для

яго, сына лесу і палёў, вольніцы, усходы давалі яму ілюзію замілаванага прастору.

Спачатку ён любіў бегаць па ўсходах зьнізу ўверх і зьверху ўніз. Бегаў так бесьперастанку многа разоў туды і назад і прыслухоўваўся да гулкіх водгаласаў сваіх уласных крокаў па каменьні. Ён знаходзіўся тады ў радасным ахмяленьні.

Ад шпаркага бегу гарачылася кроў, сэрца моцна тухкала. Яму здавалася, што ўсходы канца-краю ня маюць, як тая далячыня, за якою ён часта ганяўся на вёсцы.

Любіў ён глядзець з самай верхняй пляцоўкі ўніз—у чатырох-павярховую процьму. Яму было так прыемна, як тады, калі дома, бывала, узьбярэцца на высокую старую яблыню. Ён глядзеў уніз і думаў:

... Вось, каб цяпер кінуўся туды...

Ад такой думкі яму рабілася горача, кусьлівыя мурашкі бегалі па сьпіне, галава кружылася.

... Я не звалюся, бо трымаюся за парэнчы...

Парэнчы гладкія, сьлізкія. І Язэпка зрабіўся авіятарам: лётаў у паветры. Машына для гэтага была гатовая—парэнчы ўсходаў. Па іх ён сьлізгаўся зьверху ўніз—у жудасную процьму чатырох паверхаў. Ён налаўчыўся рабіць гэта з вялікім спрытам. Узьбярэцца на верхнюю пляцоўку калідору, да самай гары, узьвесіцца на парэнчы рукамі і нагамі і з імпэтам сьлізганецца... Яму здавалася, што ня ўніз едзе, а падымаецца ўверх з шалёнай хуткасьцю.

У той час гэта давала яму найвялікшую радасьць. Ён тады забываўся аб строгасьці дому, аб яго акуратным няспрыяльным характве і аб тым вялікім холадзе, што веяў з цёплых пакояў дзядзькі.

Не адзін раз стары дзядзька на яго сварыўся за сьлізганьне па парэнчах.

Але хлопчык ня слухаў яго, ня гледзячы на тое, што ва ўсім іншым быў вельмі паслухмяны. Гэты спорт яму надзвычайна спадабаўся.

Як трохі павучыўся ў школе, дык любіў чытаць надпісы на дошчачках, прыбітых да дзьвярэй кожнай кватэры. Мядзяныя дошчачкі, з выграviраванымі на іх літарамі, нагадвалі яму магільнік. На дошчачках часам была напісана і профэсія кватаранта: доктар, зубны лекар, адвакат, акушэрка і іншыя.

Гэтыя словы былі для Язэпкі незразумелымі, і ён стараўся паводле пара́ўнаньня з іншымі словамі ці гукамі слоў, падобнымі да іх, даваць ім свой зьмест, сваё тлумачэньне. Зубны лекар быў у яго ўяўленьні нейкім зубатым страшным дзядзькам. Адвакат—катам. Акушэрка—цёткай, якая курэй глядзіць («акуш»—асоцыяцыя са словам «акыш!»). Доктар—ён добра ведаў, што гэта за птушка, бо ня раз яго, хворага Язэпку, матка вазіла ў мястэчка да доктара. Прозьвішчы: Сасновіч, Бэргер, Стрэльчык, Макараў, Іваноўскі, Пракаповіч, Сарокін, Зэлікман, Арлоў і яшчэ некалькі з канчаткамі на «...іч» і «...скі» вельмі тады цікавілі малога Язэпку. Яшчэ ня ведаючы кожнага з жыльцоў дому па выгляду, ён стараўся паводле вычытанага на дошчачцы прозьвішча ўявіць сабе выгляд гэтых людзей. У гэтым выпадку ён меў зноў-жа сваю ўласную сыстэму: разьбіваў прозьвішчы на паасобныя гукі, уголас гаварыў іх і шукаў знаёмага сэнсу.

Сасновіч павінен быць абавязкова высокім (падобным да сасны).

Бэргер—яўрэй у халамідзе, зашмальцаваны, як той анучнік, які часам бываў у іхнай вёсцы («гэр-гэр»—яўрэйская гутарка).

Стрэльчык—чалавек нявысокага росту, са стрэльбай за плячыма (падобны да паляўнічага-пана, які часта бываў у вёсцы).

Макараў—дзядзька з рыжай бародкай, з прыплюснутым носам і маленькімі сінімі вочкамі, як іх сусед Макар.

Такім чынам, ён у кожным прозьвішчы адчуваў маленькі портрэт чалавека.

Тыя з жыльцоў, якія мелі прозьвішча з канчаткам на «...іч», павінны былі быць вусатыя, з голенымі барадамі, на «...скі»—барадатыя.

Часам гэта тэорыя яго бязьлітасна падводзіла. Напрыклад, Бэргера ён сабе ўяўляў зашмальцаваным старым яўрэем ды яшчэ зубатым (зубны лекар), які гаворыць так, што выходзіць: «гэр-гэр-гэр», а вышла зусім іначай. Прозьвішча Бэргер мела маладая дзяўчына, нізенькая, шчуплая, з тоненькім мілагучным галаскам. Яе трэба было зваць ня Бэргер, а Кветка, бо ад яе заўсёды пахла парфумэрыяй.

Па выгляду ён-бы многім даў зусім новыя прозьвішчы. Дзеля гэтага ён падазрона пачынаў глядзець на жыльцоў дому.

Яны як-бы ашуквалі яго або самі памыляліся, калі называлі сябе такімі непадыходзячымі прозьвішчамі.

«Няйначай, вышла памылка»,—думаў ён.

Доўгі час прайшоў, пакуль ён прывык спакойна глядзець на людзкія «памылкі».

Яго назіраньні над жыльцамі дому даходзілі да таго, што ведаў, хто ў якую пару выходзіць з кватэры і калі прыходзіць.

З усімі жыльцамі, такім чынам, наладзілася ў хлопчыка пэўная сувязь—у яго думках.

Часам і хто-колечы з жыльцоў зварочваў на яго ўвагу. Гэта бывала тады, калі ён коўзаўся па парэнчах усходаў з чацьвертага паверху ўніз. Кожны з жыльцоў па-свойму рэагаваў на яго адважны ўчынак. Жанчыны палохаліся, дзівіліся, літасьці прасілі, каб ён гэтага не рабіў. Некаторыя з мужчын, наадварот, хвалілі, называлі яго малайцом, а іншыя проста сьцягвалі з парэнчаў, дзёрлі за вушы з пагрозай: «дзядзьку раскажам».

На вялізным падворку дому, апрача хлявоў, стаяла яшчэ некалькі корпусаў для жыльцоў. У гэтых кватэрах не адчуваўся той парадак, як у цэнтральным корпусе з вуліцы. Ня было тэй зграбнасьці і малявідлаў у калідорах, дошчачак на дзьвярах. Былі толькі нумары кватэр. Тут жылі, галоўным чынам, рамесьнікі і рабочыя.

У той час, калі кватаранты вялікага дому збоку вуліцы былі чыста апрануты, часам у бліскучых чыноўніцкіх гузіках, мелі круглыя твары, і сытая супакоенасьць адлюстроўвалася ў іхных вачох,—людзі з падворку, у большасьці, былі завэцганыя, у старых вопратках, з заклапочанымі злоснымі вачыма.

Чамусьці Язэпку болей спадабаліся злосныя і вострыя вочы людзей з падворку, чым рахманыя і спакойныя кватарантаў галоўнага корпусу з вуліцы.

У выразах твару людзей з кватэр, дзе на дзьвярах былі прыбіты магільныя дошчачкі з прозьвішчамі, адчуваўся і магільны супакой, супакой сытасьці і забясьпечанасьці; ня было ў іх таго жыцьця і рухавасьці, як у людзей з падворку, што вечна клапаціліся аб штодзенным кавалку хлеба.

Язэпку цягнула да «жывых» людзей з падворку. Пробаваў там сябраваць з равесьнікамі-хлапчукамі. Але яны, часта пакрыўджаныя сваімі бацькамі, былі таксама злосныя і некалькі

разоў моцна адлупцавалі Язэпку. Ён рэдка заходзіў туды пасьля гэтага.

Сам дзядзька часта лаяў кватарантаў з падворку. Яны неакуратна плацілі за кватэры. Ён часам судзіўся з некаторымі. Прыходзілі гарадавікі і выкідвалі на вуліцу бэбахі гэтых «злосных, няпрыемных» людзей.

Кожны раз цяпер, калі Крушынскі прыяжджаў у Менск пасьля сьмерці дзядзькі і спыняўся ў гэтым доме ў аднаго з сваіх стрыечных братоў, ён успамінаў дзіцячыя гады, першыя ўражаньні ад гэтага дому і ўсіх былых яго кватарантаў.

Кожны раз, як толькі ўгледзіць фасад дзядзькавага дому з вуліцы, на яго нападаў сполах, як у дзіцячыя гады.

У 1921 годзе гаспадары дому—Алесь і Пётра Крушынскія—адчувалі сябе ня зусім добра: яны былі домаўласьнікамі.

Большасьць жыльцоў з галоўнага корпусу—былыя царскія чыноўнікі і гаспадары багатых магазынаў—кудысьці зьніклі. У кватэрах жылі зусім новыя людзі. Частка рабочых з двара і падвальных кватэр перабралася наверх. За кватэры або мала плацілі, або зусім нічога не плацілі.

Алесю і Пётру кепска жылося. Галоўнай іхнай апорай у той час былі тыя продукты, што прывозіў з Курганішча Крушынскі. Толькі тады між ім і стрыечнымі братамі моцна зьвязалася нітка крэўнасьці, слабая ў дзіцячыя гады.

Улетку Крушынскія—доктар і адвакат—выпраўлялі сваіх жанок і дзяцей на дачу ў Курганішча. А Язэп, калі прыяжджаў у Менск, заўсёды спыняўся ў сваіх стрыечных братоў.

— Домаўласьнікі вы, домаўласьнікі!—зьвярнуўся ён аднаго разу да сваіх аднафамільцаў.

У яго тоне чуваць былі кпіны моцнага чалавека над слабейшымі.

Стрыечныя браты напэўна пакрыўдзіліся-б, каб у іх ня было адчуваньня слабейшых людзей да моцнага.

— А што?—устрывожыліся яны,—вядома, домаўласьнікі!

— Надышоў час,—сказаў Крушынскі ўрачыстым настаўніцкім тонам,—і вам, домаўласьнікам, падумаць над тым, дзе вы жывеце і як жывеце. Зусім няма ў вашых галовах бацькаўскага спрыту, бацькаўскіх лічбаў. Грошы на дом ваш бацька зарабіў

у рэсторане ад сваіх «гасьцей»: заробак лёгкі. Кватэрная плата за дваццаць, прыблізна, гадоў вярнула яму гэты капітал яшчэ з коптарам. Вы самі мелі тут добрыя кватэры. Дык вось, не забывайце, што бацька ваш быў калісьці сам лёкаем у рэсторане. Яго эксплёатаваў гаспадар. Значыць (у Крушынскага вочы заблішчэлі), ён, ваш бацька і мой дзядзька, быў соцыялістым! Гэты дом? Ваш бацька яго збудаваў для дзяржавы. І вы, яго дзеці, аддаеце цяпер дом рэспублікі!

Доктар і адвакат выставілі на стрыечнага брата зьдзіўленыя вочы:

— Як-жа гэтак?! Гэты-ж дом—наш, бацькаўскі...

— Вы павінны аддаць яго ў комхоз, жыць спакойна ў сваіх кватэрах і плаціць па стаўцы кватэрную плату дзяржаве.

— За свой уласны дом?!

— І ня будзеце тады буржуямі, гэта значыць дворнікамі гэтага дому, і зробіцеся сябрамі профсаюзу, бо адзін з вас кепскі доктар, а другі—яшчэ горшы адвакат. А дом, бяз вашай на гэта згоды, не сягоньня-заўтра і так забяруць.

Крушынскі скончыў сваё тлумачэньне дзякаўскім басам на сьпеўны царкоўны лад.

Стрыечныя браты так і зрабілі. Запушчаны, даўно нерамантаваны дом аддалі ў комхоз, які пачаў зараз-жа наводзіць у ім свае парадкі, такія-сякія рамонты рабіць.

Алесь і Пётра Крушынскія адчувалі сябе спачатку як апушчаныя ў ваду. Ім здавалася, што яны самі сябе абрабавалі, дурнямі парабіліся. Аднак, яшчэ ня верылася, што гэты дом ужо ня іхны.

Па старой гаспадарчай прывычцы яны, хаваючыся адзін ад аднаго, самі сачылі за тым, каб рамонты рабіліся акуратна, не па-тандэтнаму. У іхных сэрцах яшчэ ледзь прыкметна гралі ціхія ўласьніцкія стрункі:

... А можа... можа дачакаемся іншых часоў?..

Часта браты Крушынскія, саромячыся адзін аднаго, хадзілі-спацыравалі па вялікім падворку «свайго» дому і заглядалі ва ўсе закуткі, у хлявы, у чужыя кватэры, ці ўсё ў парадку, ці ня трэба дзе рамантаваць. «Гаспадарчае» вока песьціла кожны куток, балела за кожную адломаную цаглінку. Рупная рука прыбівала цьвікамі адарваную дошку. Кожны стук малатком у цьвік будзіў пачуцьцё ўласнасьці. Часта яны, заклапочаныя, хадзілі

да загадчыка дамамі гэтага раёну і далікатна напаміналі, што трэба рамонты рабіць, што жыльцы—*рабочыя* скардзяцца... (Яны рабілі націск на слова «рабочыя»).

Сэрца балела, калі ў якой кватэры кавалак тынку адваліцца або дзьверы сапсуюцца.

... Ці гэтаму загадчыку за чужое душа баліць?—думаў кожны з іх.

Ажываў ва ўспамінах рупны бацька: як ён зьбіраў грошы, купіў гэты дом, вечна глядзеў, каб дом быў у парадку, каб кватаранты былі акуратныя...

... Каб бацька цяпер падняўся з магілы і пабачыў усё гэта, дык напэўна памёр-бы ў другі раз...

Часамі на братоў Крушынскіх, у сувязі з гэтым домам, нападаў шчыры смутак.

А дом глядзеў на іх з дакорам усімі вачыма-вокнамі.

... І свой—і ня свой.

Часта каму-колечы з братоў сьнілася, што прышла новая ўлада, дэмакратычная, у якой уласнасьць—сьвятая рэч, рэлігія.

Прачнецца—і пачынае злавацца на стрыечнага брата Язэпа за дзікую параду.

... Вось у іншых дамы пазаставаліся, і ніхто не чапае...

Патрохі ў братоў Крушынскіх сум па дому перайшоў у новую элегійную форму. Гэтае адчуваньне апранула поэтычную мантыю няясных лятуценьняў. Яны марылі аб доме, як старасьвецкая паненка аб рыцары на белым кані. Мары канчаліся кожны раз прыпеўкай:

... А можа... можа дачакаемся іншых часоў?

Але лёгіка стрыечнага брата, Язэпа, была моцная: вышла якраз па-ягонаму.

Пётра кінуў сваё дакторства, а Алесь—адвакацтва.

Першы зрабіўся пэдагогам, працаваў у тэхнікумах і ў унівэрсытэце, і пасьля таго, як напісаў дзіцячы лемантар, яго сталі называць профэсарам.

Другі дастаў службу ў мытніцы і ў вольны ад працы час пісаў лірычныя вершы. Яшчэ ў гімназіі альбомныя вершыкі пісаў аб каханьні і салоўцы.

У цяжкія гады—у эпоху пайкоў—яны ўмудраліся мець па некалькі служб і пайкоў. Яны тады налаўчаліся, апрача пайкоў, сталавацца ў дармовай сталоўцы для адказных працаўнікоў.

У братоў Крушынскіх пачалося зусім новае жыцьцё.

Вясной 1924 году нават у Крыме пажылі разам з жонкамі. Ехаць на дачу ў Курганішча лічылі цяпер ніжэй за свой гонар і стан.

Новае жыцьцё так вымуштравала іх, што ад ранейшых домаўласьніцкіх мар астаўся толькі лёгкі кадзільны дымок.

Часта яны крытыкавалі тых з сваіх колег, якія зусім бяз страху будавалі для сябе новыя домікі ў Менску. Гэтыя колегі імкнуліся да таго, ад чаго яны самаахвотна адмовіліся.

А калі часам гутарылі аб бацькаўскім доме, дык зусім у іншых колерах, у новым асьвятленьні. У выніку такіх гутарак выходзіла, што іх нябожчык-бацька ўсё жыцьцё працаваў выключна для рабочых, бо ў доме, які ён збудаваў, жывуць цяпер рабочыя...

— Ці-ж ён не соцыялісты?

Бацька Крушынскіх калісьці пачынаў сваю кар'еру з лёкайства ў рэсторане, а пасьля разбагацеў. Лёкайства бацькі грала яркую ролю ў жыцьці Алеся і Пятра, як сонца: то яно стаіць пасярод неба і пакрывае галовы сыноў златаблескам праменьняў, а то заходзіць за кругавід і пакідае ім цень вечара і вільгаць ночы.

Даўней у школе іхныя сябры, дзеці чыноўнікаў і багатых, часта называлі іх «лёкайчукамі», ня гледзячы на тое, што ў той час іх бацька меў ужо свой дом і свой рэсторан.

Алесь і Пётра вельмі цярпелі ад кпін сяброў і не маглі падараваць свайму бацьку праступак:

— Бацька быў лёкаем.

Гэта ляжала ганебнай плямай на маладым гонары сыноў. Многія гады «ганьба» ім супакою не давала, вісела над імі страшным знакам Каіна. Нават калі яны зрабіліся дарослымі людзьмі, часта чулі за плячыма слова «лёкайчукі».

Крушынскія не спадзяваліся, што надыйдзе час, калі гэта самае слова паслужыць ім перад тымі-ж людзьмі ня ганьбай, а хвальбою.

Так здарылася пасьля Кастрычніка.

Ранейшая ганьба—«дзеці лёкая»—зрабілася для іх пэўнай апорай.

А ў пераходныя часы, калі савецкая ўлада ў Менску чаргавалася то з нямецкай, то з польскай окупацыяй, адвакат і

доктар у дакумантах былі то дзецьмі багача-домаўласьніка, то лёкая-пролетара.

Ї першая, і другая бацькаўская годнасьць была імі выкарыстана як найлепшая спадчына.

Цяпер?

Яны—дзеці чыстакроўнага пролетара!

Аб гэтым красамоўна напісана ва ўсіх анкетах, якія ім толькі прыходзілася запаўняць: іх бацька—пролетар, дзед—безьзямельны селянін. Лінія іхнага роду цягнецца сымболічнай чырвонай істужкай ад рабочых і сялян.

Ганьба домаўласьнікаў-буржуяў, смак ад чаго яны адчувалі такі-ж самы прыкры пасьля рэволюцыі, як ад лёкайства бацькі да рэволюцыі, была цяпер змыта дашчэнту.

Дом належаў комхозу. Яны стараліся пры людзёх не гаварыць аб ім, як аб няпрыстойнай хваробе. Лёкайства бацькі радавала іх цяпер так моцна, як да рэволюцыі іх, пэўна, радаваў-бы княжацкі герб. Ці пры рабоце ва ўстановах, ці дома пры гутарцы з сябрамі Пётра і Алесь Крушынскія стараліся накіроўваць тэму гутаркі ў адзін бок: праўдзівым пролетарам зьяўляецца той, хто пролетарскага паходжаньня. Само сабою пры гэтым выплывала, што іхны бацька працаваў лёкаем у рэсторане.

Бацька-лёкай ператварыўся ў нейкага мітычнага пролетара, у рэволюцыянэра, які, здаецца (яны добра не памятаюць), разам з Леніным працаваў.

Позна ўвечары Крушынскі з агрономам прыехалі ў Менск. Заехалі да старшага Крушынскага, былога доктара і цяперашняга «пролетарскага песьняра», які піша вершы пад псэўдонімам Антон Цярэшка. Ён ужо другі тыдзень сьвяткуе свой двухгадовы літаратурны юбілей. Дзень-у-дзень у яго поўна гасьцей. Дзень-у-дзень ладзіцца ў яго кватэры ўрачыстае сьвяткаваньне двухгадовай мастацкай творчасьці. У працягу двух год ён выпусьціў два зборнікі поэзіі, па шаснаццаць балонак кожны, па восем радкоў на балонцы.

Надрукавана яго біографія з портрэтам. У біографіі шмат гаворыцца аб лёкайскай профэсіі бацькі і безьзямельлі дзеда; паказана нават, у якога пана яго прадзед адбываў прыгон.

Даведзена ў друку, што апошнім творам ён перарос Коласа і Купалу і падае вялікія надзеі расьці і расьці, і расьці.

Крушынскі з агрономам папалі якраз у самы вір выпіўкі.

Гасьцей было чалавек дзесяць. Ня гледзячы на позьні час ночы, зараз-жа гаспадыня, жонка поэты, паслала служанку па піва.

Жонка поэты—кругленькая, нібы гумалястыкавая лялька, жанчына гадоў пад трыццаць, пазнаёміла агронома з гасьцямі. Крушынскі быў з імі яшчэ раней знаёмы, бо ён іх часта бачыў тут, прыяжджаючы ў Менск па справах.

Апрача профэсара Аляксандра Крушынскага, былі тут яшчэ два такія-ж профэсары з жонкамі, літаратурны крытык і яшчэ пара асоб.

Хоць гэта быў ужо дзевяты дзень сьвяткаваньня юбілею, але сам пясьняр сказаў стрыечнаму брату Язэпу, цалуючыся з ім, што гатоў юбілейнічаць дзень-у-дзень хоць яшчэ тры гады—аж да пяцігадовага сьвята.

Калі адзін з гасьцей на гэта заўважыў, што пры такіх варунках да пяцігадовага юбілею Цярэшкі ня будзе новых збораў яго твораў, тады працаўнік выдавецтва, які тут сядзеў, супакоіў:

— Мы будзем перадрукоўваць творы Антона Цярэшкі яшчэ раз або два. Да новага юбілею выпусьцім поўны збор твораў песьняра.

Госьці пілі піва і гаварылі голасна, траха ня крычалі.

Гаспадыня пасадзіла Івана Мацьвеевіча побач з сабою і давай старанна частаваць пітвом і закускамі.

— Даганяйце ўсіх, шаноўны Іван Антонавіч, выбачайце, Іван Мацьвеевіч!—паўтарала яна пры гэтым кожны раз.— Выбачайце, заўсёды забываюся, як завуць людзей па бацьку.

— Дагонім!—з пэўнасьцю сказаў Іван Мацьвеевіч.

Наконт тытуляваньня па бацьку ён зараз-жа расказаў гаспадыні пікантны анэкдот. Яна сьмяялася і прыязна глядзела на яго.

Іван Мацьвеевіч шчыра «даганяў» гасьцей. А гаспадыня не адыходзіла ад яго, нібы першы раз у жыцьці сустрэла такога цікавага чалавека. Яна ўвесь час паўтарала:

— Даганяйце гасьцей, даганяйце!

— Чаму госьці вашыя так голасна гавораць?—запытаўся Іван Мацьвеевіч у гаспадыні.

— Адзін з нашых гасьцей трохі глухаваты. Гэта літаратурны крытык, Максім Кірковіч. Вунь той, што водзіць галавой у розныя бакі, нібы качка.

Гаспадыня так лоўка паказала вясёлымі вачыма на крытыка, што ніхто, апрача Івана Мацьвеевіча, гэта не заўважыў.

Іван Мацьвеевіч залюбаваўся чорнай стрыжкай і сінімі вачыма гаспадыні.

— Далікатныя ў вас госьці, пані гаспадыня,—сказаў ён у раздум'і, расьцягваючы кожнае слова, і відаць было, што стараецца нешта ўспомніць.—Ага! успомніў! Дазвольце мне, пані гаспадыня, быць недалікатным. Хачу вам расказаць няпрыстойны анэкдот пра глухога.

— Проша, проша! Люблю няпрыстойныя анэкдоты.

Іван Мацьвеевіч ціха расказваў.

Гаспадыня хіхікнула некалькі разоў, зірнула на яго, як на вельмі цікавую для сябе знаходку, і яшчэ шчыльней прысунулася.

На Язэпа Крушынскага гаспадыня вялікай увагі не зьвяртала: «свой чалавек, не пакрыўдзіцца».

Ён частаваўся сам, сьмела трымаўся, як у сваёй хаце. Ён быў трохі заклапочаны. Меў шмат спраў у горадзе. Заўтра цэлы дзень прыдзецца тупацца па вуліцах да розных людзей. Разам з заклапочанасьцю на яго твары прыкмячалася стомленасьць, дрымотнасьць.

Як старанна ні «даганяў гасьцей», а відаць было, што яму хочацца спаць. Налівае сабе піва ці віна, а вочы зьліпаюцца. Часта, замест відэльца, бярэ ў рукі нож, есьць закуску нажом або крышыць мяса на дробныя кавалкі, потым бярэ кожны кавалак пальцамі, натыкае на відэлец і кладзе ў рот.

Гаспадыня ціханька штурхае Івана Мацьвеевіча ў бок і паказвае сьмехатлівымі вачыма на Язэпа Крушынскага.

— Вось так заўсёды. З малых гадоў быў у горадзе, гадаваўся тут, а есьці па сягоньнешні дзень па-людзку не навучыўся.

— Мне скардзіўся, што цётка з маленства вучыла яго есьці. Гэта было для яго найвялікшай пакутай.

— Аднак, навука гэта яму не далася.

У часе такой інтымнай гутаркі літаратурны крытык гаварыў аб поэзіі Антона Цярэшкі.

Пры гэтым ёнківаў галавой направа, налева, выцягваў яе наперад, нібы пробаваў, ці яна моцна яшчэ трымаецца на шчуплых плячах. Ён гаварыў з ліслівай усьмешкай на бледных губах:

— Я, як філёзоф, павінен зрабіць заўвагу, што ў поэзіі Антона Цярэшкі ёсьць глыбокія філёзофскія думкі. Я, як марксыцкі крытык, зазначаю, што ў творчасьці нашага пролетарскага поэты надзвычайна вытрыманая ідэолёгія. Я, як культурны чытач, пераконваю вас, шаноўныя госьці, што мастацтва ў вершах славутнага таварыша Цярэшкі стаіць на вышыні сучаснасьці. Я, як...

Доўга гаварыў літаратурны крытык аб творчасьці Антона Цярэшкі, прыводзіў урыўкі з яго поэзіі. З кожным «я, як» голас у крытыка павышаўся, патос рос, вочы запальваліся большым агнём.

Антон Цярэшка ня даў яму дагаварыць, наліў у чаркі віна і выпіў з крытыкам на «брудэршафт».

Іван Мацьвеевіч уважліва прыслухоўваўся да прамовы крытыка і шапнуў на вуха гаспадыні:

— Мне вельмі прыемна, што так хваляць вашага мужа! Але-ж і крытык! Ён і філёзоф, і марксысты, і культурны чытач, і масавы. Ня дзіва, што ў яго так многа «я, як»!

— Ціха, Іван Адамавіч, выбачайце, Іван Мацьвеевіч! Хі-хі-хі! Я вам потым раскажу, раскажу пра ўсіх гасьцей. А пакуль што не жартуйце з крытыка. Во! ён на вас глядзіць. Хоць ня чуе, але па губах пазнае, што вы аб ім нядобрае гаворыце. Паглядзеце, як ён пачырванеў...

Крытык з яўнай варожасьцю пазіраў на агронома. Праз акуляры блішчэлі маленькія, хітрыя мышыныя вочкі. Як два шылы, яны калолі наскрозь Івана Мацьвеевіча. Агоньчыкі шчырай нянавісьці зіхацеліся ў гэтых вочках. Голены твар гарэў полымем. Губы былі да таго сьціснуты, што падбародак высунуўся наперад. Крытык так моцна вадзіў галавою ў бок агронома, ажна здавалася, што галава зараз сарвецца з тулава, кінецца на агронома і ўгрызецца зубамі ў яго круглыя, пульхлыя шчокі.

Прыкра зрабілася Івану Мацьвеевічу.

— Здаецца, я недзе бачыў гэтага чалавека...—падумаў ён.— Так. У адным з гарадоў Расіі бачыў яго. У цяперашняга марксыцкага крытыка былі тады бліскучыя чыноўніцкія гузікі з царскімі арламі. Ніяк не магу прыпомніць, кім ён тады быў.

Горача зрабілася Івану Мацьвеевічу.

Літаратурны крытык на яго глядзіць, утаропіўшы вочы і, здаецца, таксама стараецца нешта прыпомніць.

Няпрыемна было Івану Мацьвеевічу глядзець у такія пранізваючыя вочы крытыка. Але нейкая невядомая сіла накіроўвала яго вочы якраз на бліскучыя акуляры крытыка.

Хто збоку паглядзеў-бы на крытыка ў гэты час, дык напэўна заўважыў-бы палахлівасьць і неспакой і ў яго вачох.

Іван Мацьвеевіч пачаў вандраваць у думках у той пэрыод часу, які быў акрэсьлены ў яго адным толькі словам «т а д ы».

Успомніў!

— Прозьвішча крытыка—Кірковіч, мабыць, літаратурны псэўдонім. Яго праўдзівае прозьвішча—Алалоўнік. Алалоўнік жыў у тым-жа горадзе, дзе вучыўся ён сам. Быў інспэктарам гімназіі, дзе вучыліся выключна дваранскія сынкі. Ён быў чалавекам пэўным у палітычным сэнсе... І ня дзіва, што ня ўмее выгаварваць «г» па-беларуску і, замест «це», кажа «те».

Крытык падышоў да Івана Мацьвеевіча і лагодным тонам запытаўся:

— Выбачайце, вы не Антон Сяргеевіч Мятлоў?

Крытык наставіў правае вуха супроць рота Івана Мацьвеевіча.

— Я—Іван Мацьвеевіч Шапавалаў.

— Як? Як?

— Ша-па-ва-лаў!

— Ага! Выбачайце. Вочы вашыя такія знаёмыя мне. Але ў таго, у Мятлова, чорная бародка. Выбачайце.

Крытык гусінай манерай вярнуўся на сваё месца.

Іван Мацьвеевіч прыпомніў цяпер добра гэтае характарнае выцягваньне і ўцягваньне галавы.

...Той самы! Алалоўнік!..

У агронома мурашкі поўзалі па сьпіне. У роце суха зрабілася.

Каб заглушыць прыкрае адчуваньне ў нутры, ён запрапанаваў выпіць у чэсьць гаспадыні, якая нядаўна прыехала

з Крыму. (Яна пасьпела яму тут-жа пры стале паказаць свой паўдзённы загар на шыі і плячах глыбей тых месц, якія адзначаны вопраткай).

Госьці ажывіліся.

Агроном падняў тост і за Язэпа Крушынскага, культурная гаспадарка якога праславілася на ўсю рэспубліку.

У Крушынскага зышла дрымотнасьць з твару.

— Абавязкова,—сказаў ён,—заўтра куплю сто нумароў «Беларускай вёскі», дзе надрукавана аба мне!

Ён прывык гаварыць голасна, як чалавек, што знаходзіцца часта ў полі.

Па твары крытыка была разьліта прыемнасьць: яму добра чуваць былі словы Крушынскага.

— І аб вас у газэтах пішуць?—зьдзівіўся крытык.—Выбачайце, нічога з вашай творчасьці ня чытаў. Як вы падпісваецеся?

— Я ня пішу!—сказаў Крушынскі.

— Язэп Сымонавіч сахою па глебе піша,—вытлумачыў крытыку Іван Мацьвеевіч.

— Парою поэмы піша? Як? Як?—наставіў правае вуха крытык.—Я, як акуратны чытач беларускае літаратуры...

— Не!—крыкнуў яму Іван Мацьвеевіч на самае вуха,—ён піша сахою па глебе! Сельскай гаспадаркай займаецца! Культурную гаспадарку вядзе!

Агроном крычаў нібы ў трубку тэлефону.

— А... Выбачайце, разумею. Вы так вобразна выражаецеся, таварыш... тав...

— Шапавалаў!—крыкнуў Іван Мацьвеевіч так моцна, ажна гаспадыня спалохалася.

— Вы так вобразна выражаецеся, таварыш Шапавалаў, ажна я думаў, што поэмы піша. Ну і Крушынскія! Увесь род іх таленавіты! Я, як марксыцкі крытык, павінен зазначыць, што калі-б ніхто ня пісаў сахою па глебе, дык ніхто-б і ня пісаў вершаў пяром на паперы. Адна вытворчасьць немагчыма бяз другой. Я, як марксыст...

Крытык доўга гаварыў аб базе і надбудове.

І ў яго, і ў Івана Мацьвеевіча быў вельмі добры настрой: і адзін, і другі вельмі ўзрадаваліся, што незнаёмы.

Крытык глядзеў прыхільна на Івана Мацьвеевіча. А Іван Мацьвеевіч соладка яму ўсьміхаўся, каб пад маскай усьмешкі схавацЬ тое, што ўсплыло ў памяці...

Крытык увайшоў у надмерны экстаз. Вочкі яго, замасьленыя ад выпіўкі, кідалі вакол сябе праменчыкі, касіліся ў бакі і глядзелі на ўсё не праз шкелкі акуляр, а міма іх, як-бы хацелі вызваліцца з шкляной турмы.

— Я, як крытык, павінен зазначыць, што крытыка таксама вялікае мастацтва: рабіць з чорнага белае і з белага чорнае. Гэта, выбачайце, трэба ўмець!

Крытык горда азірнуўся вакол.

— Часам,—казаў ён далей,—я люблю паспрачацца сам з сабою аб поглядах на мастацтва. Я гавару і за, гавару і супраць. Крытыка—гэта ёсьць фэхтаваньне бліскучай шабляй. Блескі ад мігаценьня шаблі ў спрытных руках фэхтавальніка і ёсьць тое вышэйшае хараство, якое я разумею пад крытыкай, тое мастацтва...

Крытык махнуў рукой, як-бы хацеў стрымаць самога сябе.

— ... Але перш-на-перш пачнем з поглядаў на мастацтва. Якое мастацтва самае каштоўнае? Я, як марксыцкі крытык, цаню толькі тое мастацтва, якое асьвятляе ўсё вакольнае з пункту погляду клясавасьці. Мастацтва павінна служыць зброяй для замацаваньня і ўглыбленьня новага ладу жыцьця. Яно павінна стаяць на варце ўсіх заваёў рэволюцыі. Іншае мастацтва ніякай вартасьці для нас ня мае. Што вы ўсе, шаноўныя госьці, можаце сказаць супроць гэтага? Вядома, нічога!

Крытык ажывіўся. Стукнуў кулаком сабе ў грудзі і зноў пачаў:

— Выбачайце! Вы нічога ня можаце сказаць насупраць гэтага погляду на мастацтва? А я магу! Я, як аматар сапраўднага мастацтва, мушу запэўніць вас, што мастацтва, якое служыць зброяй для абароны і замацаваньня пэўных ідэй якой-бы ні было клясы ці групы грамадзтва, ёсьць не мастацтва, а агітацыя. Удала зробленая ці не—усёроўна—гэта толькі агітацыя! Сапраўднае мастацтва ёсьць такое, калі выяўнікі яго знаходзяцца па-за клясавасьцю—у творчасьці вырашаюць проблему агульнага чалавека. Калі яны, мастакі, бесстаронна малююць эпоху, калі перад імі няма вінаватых і невінаватых, няма прыгняіальнікаў і прыгнечаных, а ёсьць звычайнае змаганьне за

дабрабыт. Верх і права на баку моцы і сілы. А калі гэту ўсталяваную сілу пераможа іншая, новая сіла, тады старая сіла ўжо ня сіла. Яна застаецца вінаватай. Гэта ёсьць адвечны закон жыцьця. Адлюстроўваць гэты закон бясстаронна павінна мастацтва.

Крытык змоўк. Зірнуў на ўсіх асалавелымі вачыма.

— Што вы на гэта, таварышы, можаце сказаць? Папробуйце нешта супроць гаварыць! Ня можаце? А я магу!

Зноў зьнікла асалавеласьць, зьявілася яшчэ большая натхнёнасьць, чым раней. Ён павысіў голас да хрыпоты, як-бы гаварыў супроць заядлага ворага:

— Нахлусіў ты, аматар сапраўднага мастацтва! Што значыць пазаклясавасьць і проблема чалавека? Чаму агітацыя не мастацтва? І што значыць бесстароннасьць мастака да вакольных зьявішчаў жыцьця? Гэта-ж адны пустыя словы! Калі мы возьмем ранейшае, так званае, «чыстае мастацтва», дык няўжо-ж яно ня было прыналежнасьцю людзей дармаедаў, гультаёў, якія ў час адпачынку ад нястраўнасьці жывата марылі аб нейкім жыцьці «без руля и без ветрил», апявалі кунежных лятуценьнікаў і балбаталі аб таемнай музыцы сфэр. Якраз гэта і ёсьць творчасьць клясавая, клясы буржуазіі. Ім лезьлі ў галавы розныя дзівосныя фантазіі. А мы гэта ўсё называлі характвом, натхненьнем. Вось якраз такое «чыстае характво» і было агітацыяй супроць барацьбы. Гэта цягнула да ўпадніцтва. Пролетару прышчэплівалі хваробу апатыі і расхлябанасьці. Бесстароннасьці ў мастака ня можа быць, калі мастак жывая істота, а не кастрат. Калі ў мастака няма ў душы агню нянавісьці да варожай клясы, якая прыгнятала яго, яго бацькоў, дзядоў і прадзедаў—ён не мастак. Калі ён не прапускае сваю творчасьць праз прызму клясавай, пролетарскай эмоцыі, ён—не мастак, а нейкая істота без касьцей, нікудышнік. Бесстароннасьці ў маляваньні эпохі ня можа быць, бо гэтай бесстароннасьці няма ў жыцьці. Толькі сьмерць бесстаронна. Мастацтва—гэта тое, што плыве з глыбіні жыцьця і кліча на ўзьверх, агітуе за новыя палепшаныя формы бытаваньня. Вечнага застыглага, канонізаванага характва няма! Мастацтва пролетарскае бярэ цяпер верх, як бяруць верх тыя мільённыя масы працоўных па ўсім сьвеце над сваімі эксплёататарамі. Няхай жыве мастацтва працоўнай клясы!

Літаратурны крытык выпучыў вочы, выцер хустачкай успацелы лоб, узьняў чарку і давай азірацца вакол, як пераможца, што ўвесь сьвет заваяваў.

Госьці (апрача аднаго, які ўвесь час маўчаў і з агідай глядзеў на крытыка) бісавалі.

Крытык сядзеў самазадаволены. Наліў у чарку чырвонага віна, адным махам выпіў і зноў загаварыў:

— Вось якія вы?! Выбачайце! Вы памыляецеся! Я не магу маўчаць. Кепскія ў вас погляды на мастацтва! Дзіўлюся! Няўжо-ж вы забылі аб тым, што цяга да мастацтва была і ў пяршабытных людзей? Няўжо тое мастацтва было клясавае? Няўжо мастацтва не павінна быць так прыгожа, як сонечнае неба, як мора, як расьліны? Трэба памятаць, што таямніца хараства захована ў прыродзе, у яе дзіўных гротах, у яе вечна маладых і сьвежых вытоках. Ёсьць хараство адвечнае, якое жыве тысячагодзьдзямі; каляруюцца помнікі чалавечага генія. Яны вечныя якраз таму, што няма ў іх тэндэнцыйнасьці. А тое, што тэндэнцыйна, што навучае, ня жыве, ад гэтага і сьледу астаецца столькі, як ад леташняга сьнегу.

Тут крытык выпіў з кялішка суседа, адсапнуўся і зноў загаварыў:

— А я магу сказаць і супроць гэтага. Хто па-марксыцку мысьліць і адчувае, той высьмее такую думку. Вы кажаце, што тэндэнцыя не гадзіцца? Але, выбачайце, дзе яе няма гэтай тэндэнцыі? Тэндэнцыя знаходзіцца ва ўсіх формах жыцьця, якое зьяўляецца об'ектам для мастацтва. Я магу прывесьці многа цытат з Леніна, з Пляханава. Трэба памятаць...

Але тут літаратурны крытык меў важную прычыну спыніць сваё красамоўства.

Той з гасьцей, які ўвесь час маўчаў, кінуў раптам у крытыка бутэлькай ад піва, сказаўшы пры гэтым у бок крытыка брыдкую лаянку.

Крытык спрытна падхваціў бутэльку, спакойна паставіў пад стол і яшчэ спакайней сказаў:

— Выбачайце...

— Якое там «выбачайце»!—крыкнуў чалавек, што кінуў бутэлькай.—На якое ліха вы тут нагаварылі гэтулькі глупства? Я зразумеў, што ў вас, гора-крытык, існуюць два погляды. Вы пад розныя дудкі сьпяваеце! За свой рознастайны тавар вы

атрымлівалі, відаць, раней, царскімі дзесятухамі, а цяпер савецкімі чырвонцамі! Эх, вы... падхалім!

Госьць быў увесь бледны ад хваляваньня. Вочы ў яго блішчэлі шэрым мутным шклом, выпучыліся дзіка і строга.

— Выбачайце,—мармытаў спалоханы крытык,—я ня чую, што вы кажаце. Я трохі глухаваты...

Госьці падняліся з-за стала зьбянтэжаныя, занепакоеныя.

Гаспадыня заплакала.

— Як вам ня сорамна скандаліць, дзядзька Цімафейчык?—зьвярнулася яна да гасьця, які бутэлькай ад піва скрытыкаваў літаратурнага крытыка.

— Не цярплю я гэткіх падхалімаў і езуітаў! У-у-у!

Ён стукнуў кулаком аб стол так моцна, ажна пасуда зазьвінела на розныя галасы.

— І навошта ён прыходзіць да нас кожны дзень?—накінулася гаспадыня да мужа.

— Ціха, ціха,—супакойваў яе Антон Цярэшка,—маўчы!

Гаспадыня плакала гучна і шчыра, залівалася сьлязьмі і ўсхліпвала, як малое дзіцё.

— І так штодзень!—зьвярнулася яна са скаргай да Івана Maцьвеевіча.—Штодзень такія скандалы. Калі ўжо скончыцца гэты юбілей? Божанька мой!

XIV

Госьці хутка разьвіталіся з гаспадарамі. Разышліся. Самага п'янага, які наскандаліў з прычыны прамовы літаратурнага крытыка, гаспадар узяў пад руку і павёў на вуліцу, пасадзіў на рамізьніка і вярнуўся дамоў.

Гаспадыня з заплаканымі вачыма сама паслала ложкі Івану Мацьвеевічу і Крушынскаму. Пасьля гэтага яна ў спальні пераапранулася ў лёгкую белую вопратку, вышла і лёганька стукнула ў дзьверы пакою, дзе ляглі спаць госьці.

— Можна?

— Калі ласка!—адказаў Іван Мацьвеевіч на кволы голас гаспадыні.

— Хачу паглядзець, ці добра вам спаць.

Гаспадыня ціха адчыніла дзьверы і бокам усунулася ў пакой.

Іван Мацьвеевіч усьпёрся ў пасьцелі на правым локці.

Крушынскі ўжо спаў.

— Род Крушынскіх вечна сьпіць—і мой адразу заснуў!— сказала гаспадыня і прысела на крэсла каля ложка Івана Мацьвеевіча, нібы мэдычная сястра, якая зьбіраецца хвораму банкі паставіць.

— Ого!—запротэставаў на словы гаспадыні Іван Мацьвеевіч,—род Крушынскіх якраз ня сьпіць, а дзейнічае на розных франтох: адзін—культурнік па сельскай гаспадарцы, другі—поэта, трэці—профэсар! Усе працуюць на карысьць рэспублікі. І любуешся родам Крушынскіх, і налюбавацца ня можаш, і зайздрасьць бярэ.

Гаспадыні быў прыемны гэты комплімэнт. Яна бліжэй прысунула крэсла да ложка гасьця.

— Нічога супроць ня маеце, што я вам трохі, Іван Антоновіч, выбачайце, Іван Мацьвеевіч, ня дам паспаць? Так цяжка мне. Хочацца з новым чалавекам пагаварыць.

— Калі ласка! Я і спаць не хачу.

— Божачка мой, як усё гэта мне дадзела. Вы ня знаеце, як дадзела. Дзень-у-дзень выпіўкі. Яны-ж майму мужу працаваць не даюць. Вечна адно і тое самае. Чаму-ж гэта вы ў нас ня бываеце? Я вас першы раз бачу.

— Не даводзілася.

— Я ў горадзе бадай усіх знаю, а чаму з вамі незнаёма— проста дзіўлюся, Іван Антонавіч, выбачайце, Іван Мацьвеевіч.

— Бо я рэдка бываю ў Менску, пані гаспадыня.

Ён з боку зірнуў на гаспадыню. Трохі прыкра было, што яна блытае яго імя па бацьку, але ён ня меў часу калі і пакрыўдзіцца на гэту жанчыну. Любаваўся яе вузкімі маленькімі і пульхнымі ручкамі. Яна перабірала пальцамі, нібы разматвала заблытаныя ніткі. Яе твар быў спакойны. Вясёлыя вочы трохі стомлены. Агроном прыслухоўваўся да лёгкіх пераліваў яе голасу. У гэтых пералівах адчуваўся нясупынны кплівы сьмяшок. Кожнае слова купаецца ў стрыманым сьмеху. Пры кожным сказе агроному здаецца, што яна зараз пачне нястрымана рагатаць. Часта мяняліся колеры на руках гаспадыні—яны былі то бледныя, то ружовыя.

Ён ня мог адарваць вачэй ад яе рук. Нібы цэнтр жыцьця гэтай прыемнай жанчыны быў у яе руках. Яму здавалася, што гутарка гаспадыні чуваць не з яе губ, а з рук. Яе голас

нагадваў яму журчаньне ручая, якое вельмі добра дзейнічае на нэрвы, дае супакой.

Часта ў гутарцы гаспадыня яму задавала розныя запытаньні, але ён не пасьпяваў адказваць на іх, бо яна забывалася і гаварыла далей. Гаварыла—і сама прыслухоўвалася да свайго голасу.

— Вам добра ляжаць? Так. Бязумоўна, каб расказаць вам аб усім маім жыцьці, дык, ведаеце, можна некалькі кніг напісаць. Другім разам аб усім вам раскажу. Нічога не ўтаю. Вось мне здаецца, што вы—добры чалавек. Будзеце прыяжджаць да нас у госьці? Ой, як надакучылі мне гэтыя людзі, якія што вечар тут бываюць. Я вечна шукаю новых людзей, Іван Антонавіч, выбачайце, Іван Мацьвеевіч. У мяне такі голад на людзей! Божанька, які голад! Хоць, бадай, усіх болей-меней прыкметных людзей у горадзе знаю. Апрыкрылі яны мне! Вы ня сьпіце?

— Не! Не! Калі ласка!

— Дайце, я вас пазнаёмлю цяпер хоць з тымі, што былі сягоньня ў нас. Насупроць вас сядзеў адзін з абскубанай барадой, з лысынай. Вы памятаеце? Гэта профэсар. Да рэволюцыі ён быў настаўнікам у гімназіі, адбіраў у вучняў беларускую газэту «Нашу ніву», пагражаў, што за беларушчыну выкіне з гімназіі, а цяпер? Ого! Якія прамовы гаворыць! Праводзіць розныя агітацыі за савецкую ўладу, лічыць сябе «шчырым беларусам». Нядаўна я сама бачыла, як ён у царкве паклоны адбіваў, хоць на тыдзень раней выступаў на сходзе з антырэлігійнай прамовай. Вы ня сьпіце?

— Не! Не! Будзьце ласкавы!

— А другі, што пераміргваўся з жонкай майго швагра. Мо' памятаеце?—голены. Вочы глыбока пад лобам сядзяць. Ён увесь час аглядаецца падазрона па баках, нібы ўсіх зладзеямі лічыць.

— Ага! Ага!

— Ну, вось! Гэты таксама вучоны. Ён мае спэцыяльнасьць выслужвацца ў начальства. Робіць гэта вельмі проста, да сьмяхоты: даведваецца па календары, калі ў начальніка ці ў каго з яго сям'і імяніны, і абавязкова прыносіць торт. Кожнаму з аўторытэтных людзей нашага гораду торт прыносіць. Яго торты славяцца на ўвесь Менск. Вам сьмех? Ведаеце, памагае! Божачка мой, як памагае! Торты ў людзі яго вывелі. Прозьвішча гэтага тортмайстра Бычкавіцкі. Вы ня сьпіце?

— Што вы?! Пані гаспадыня, вельмі ўсё гэта цікава!

Іван Мацьвеевіч у захапленьні. Ён заварожаны, загіпнотызаваны яе бела-ружовымі ручкамі, якія здаюцца яму надзвычайным творам скульптуры. Пры кожным пальчыку маленькая ямінка. Даўгаватыя пазуры блішчаць пэрлямутрам. Пальчыкі гаспадыні наігрываюць на нявідочным інструманце нячутную мэлёдыю...

— Добры твор мастацтва,—думае ён.—Але толькі літаратурны крытык хіба разьбярэцца тут, ці пролетарскага, ці буржуазнага напрамку.

— Вы глядзіце на мае рукі? Мазалёў на іх ніколі ня было. Вы цікавіцеся, можа, маім жыцьцём? Гэта матэрыял для раманістага. А што вы скажаце на крытыка, Іван Ант..., выбачайце, Мацьвеевіч. Вечна блытаю. Даўно, ведаеце, сьвежага чалавека ня бачыла. Хочацца пагаварыць. А як храпе наш Крушынскі! Вось не пераношу, божачка мой! Чыстая дзярэўня. Ведаеце, чаму я сёлета не паехала на дачу ў Курганішча? Не магу там спаць па начох. Як пачнуць усе храпсьці, іграць насамі, дык у мяне ўсё нутро перавернецца. Аб чым гэта я хацела казаць?

— Вы нешта пра крытыка...

— Ага! Ён піша артыкулы па заказу. «Хваліць ці ганіць?»—пытаецца ён у заказчыка. Як прыкажуць, так і піша. Яго пяро—гэта тое самае, што торты Бычкавіцкага на імянінах. Пабрэша, пабрэша—і грошы бярэ. Ён да таго цынічны, гэты крытык, што пазычае грошы на проціанты, бярэ ў залог срыбныя і залатыя рэчы, вэлёсыпэды, фотографічныя апараты і рознага гатунку каштоўнасьці. У яго кватэры праўдзівы лёмбард. Ён таксама вядзе гешэфты з чорнай біржай. Любіць золата, як пушкінскі «Скупой рыцарь». Часам ён зазывае к сабе на кватэру маленькіх дзяцей з дзядзінцу, высыпае перад імі на стол кучу залатых монэт і дазваляе забаўляцца гэтымі цацкамі. Ён ад гэтага мае вялікую прыемнасьць. Вы ня сьпіце?

— Не...

Кожны палец гаспадыніных ручак здаецца яму асобнай жывой істотай. Яе голас адганяе дрымотнасьць.

— Многія з гэтых людзей варты таго, каб іх выкінуць на сьметнік, але ліха іх не бярэ. Вы запытаецеся, чаго яны сюды ходзяць? Многа гаварыць трэба. Гэта мы адложым на іншы

раз, Іван Мацьвеевіч (нарэшце запомніла, як вас па бацьку тытулавацць), а пакуль што пара спаць. Дай бог здароўя!

Гаспадыня ціханька, бокам высунулася з пакою.

Яе голас доўга зьвінеў у вушох Івана Мацьвеевіча. Перад вачыма мітусіліся прыгожыя рукі. Зусім не хацелася спаць.

Крушынскі вельмі моцна храпеў.

— У Курганішчы я ніколі не зварочваў на гэта ўвагі.

Такіх жанчын, як гэту, Іван Мацьвеевіч знаў многа ў сваім жыцьці.

Яны зьяўляюцца ў пэўным асяродку людзей жывымі летапісамі, назіраюць пільна за сваімі знаёмымі, як тыя каты, яны драпаюцца ў чужой душы і ведаюць болей аб сваіх суседзях, чым аб сабе. Часам такія жанчыны даюць аб людзях трапныя характарыстыкі. Сягоньня аднаму нагавораць пра яго блізкага сябра, а заўтра сябру аб ім тое самае раскажуць. У жанчын такога гатунку, як Івану Мацьвеевічу вядома, ёсьць нейкі спэцыяльны нюх выведваць усё аб чалавеку, каб пасьля з асалодай распаўсюджваць аб ім благую славу. Гэта кемкасьць даходзіць часам да нейкага вуснага мастацтва.

... Мне трэба асьцерагацца яе—уладарніцы прыгожых ручак. Кепска зрабіў, што паслухаў Крушынскага і застаўся тут. Яны кожнае лета бывалі ў Курганішчы, а я іх ня ведаю. Бачыць ня прыходзілася ў часы майго прыезду туды. Болей усяго мне трэба асьцерагацца кабет.

Электрычная лямпачка разьлівала па стале з-пад сіняга абажура роўнае мяккае сьвятло.

Недалёка ад лямпы стаяў карафінак з вадою, пустая шклянка. Гранёнае шкло ледзь прыкметна пераміргвалася блескамі з лямпай на сьветлым крузе стала і адкідвала празрыстыя няясныя цені на белым абрусе.

Ва ўсім пакоі панаваў сіняваты поўзмрок, у якім можна было ўлавіць чуць прыкметны водсьвет абажура. Белыя гардзіны на вокнах даходзілі да падлогі, нібы вышытыя з сьняжынак. Панавала пяшчотная прытульнасьць. Цішыню палохала рытмічнае здаровае храпеньне Крушынскага.

Агроному хацелася цяпер пачытаць штосьці лагоднае, спакойнае. Так ён заўсёды перад сном і дома рабіў, колькі перад

гэтым ні піў. Людзі, аб якіх расказвала толькі што гаспадыня, іхныя дзеі і характары хутка высьлізнуліся з яго думак і ўяўленьня. Ён шмат ведае такіх. Ён сам... Але ён іначай ня мог і ня можа... Ён—іншая справа.

— Штосьці такое пачытаць перад сном?

Ён успомніў пра «Альбом—красный сон мужика» старога чалавека, вельмі падобнага да Льва Талстога.

... Забаўны чалавек!

Барада патрыярха і парваныя мужыцкія юхтавыя боты стаялі цяпер перад вачыма агронома. Гэтыя рэчы мелі між сабою ў яго ўяўленьні моцную сувязь—сувязь контрастаў, былі блізкі адна да аднэй сваёй аддаленасьцю: барада мудраца і боты мужыка, якія пахлі хлявом. Голас, выгляд вачэй і філёзофія «Льва Талстога» не замацаваліся ў яго памяці. Засталося толькі агульнае ўражаньне.

— Трэба пачытаць яго пісаніну.

Ён ціха зьлез з ложка, дастаў з дарожнага чамадана «альбом» і давай паволі перагортваць.

Спыніўся на пісаніне пад назваю «*Спрытныя людзі*».

Гэтыя два словы былі напісаны буйнымі літарамі. Першая загалоўная была размалёвана чырвона-сінім алоўкам. Яна нагадвала загалоўныя літары ў старадаўных рукапісных евангельлях. Узоры расьлін, птушачкі, елачкі і розныя замыславатыя орнаманты абкружылі ўвесь загаловак і занялі палавіну старонкі вялікага формату «альбому».

Такі малюнак, зроблены прымітыўнай і цярплівою рукою, надаў настрой інтымнасьці, чуласьці. Зьявілася ў Івана Мацьвеевіча нейкая спагаднасьць да гэтага аматара мастацтва.

... Значыць, «Леў Талстой» мае нахіл ня толькі да пісьменьніцтва, але нават да рысаваньня.

Яго поўныя губы скlаліся ў лагодную ўсьмешку. Рахманыя вочы зацягнуліся павалокаю лятуценнасьці.

«Гэта было ў 1920 годзе ўвосень,—пачаў ён чытаць,—калі ў нашай ваколіцы была ўстаноўлена часова нэўтральная зона, тоісь, гранічная паласа між Беларусьсю і Польшчай».

На палёх старонкі было прыпісана драбнейшымі літарамі, чымся ў галоўным тэксьце, рукою «Льва Талстога».

«Па-моймy, зрабілі нядобра, памылку зрабілі, што растаўклі Расію на дробны мак розных рэспублік: Расія, Беларусь, Украіна і

многа іншых назваў, якіх нават і ня ведаю. Навошта такі падзел на новыя дзяржавы? Так. Венік ніхто не паломіць, а паадзіночныя пруцьці яго паломіць і малое дзіцё. Тады і веніка ня будзе, тоісь, савецкай уласьці. Нават з комуністычнага боку не павінна быць розных зямель і розьніцы між народамі. Павінен быць інтэрнацыянал. Так. Не разумею».

«Недалёка ад нэўтральнай зоны,—чытаў працяг тэксту Іван Мацьвеевіч,—стаіць хутар старавераў на ўзвышшы гары, як скула на жываце».

Іван Мацьвеевіч паморшчыўся ад такога нязграбнага параўнаньня.

... Няма эстэтызму.

«Як я памятаю, а мне ўжо стукнула шэсьцьдзесят год, там жывуць старaверы—рослыя рыжабародыя, здаровыя. Так. Іх галоўным заняткам было зладзейства. Кралі коняй. Кралі таксама дзяўчат сабе на жонак. І надумаюцца людзі жанок красьці! Тоісь, баба крадзеная смачней. Так. За тое, што кралі коняй, тоісь, баб, ніхто і ня скардзіўся. Баба з калёс—калёсам лягчэй. А вось наконта баб, тоісь, коняй, дык вечная бяда. Канакрадаў мучылі, насьмерць забівалі, тоісь, самасудам. Так. Набожныя гэтыя старaверы. Украдзь каня ці забі чалавека, а потым ня есьці скаромнага адну пятніцу—і грэху як ня было. Так гавораць старaверы, а ня я. Кралі яны коняй за дваццаць вёрст ад свайго хутару. Сваіх суседзяй не чапалі. Так. Нэўтральная зона нявідочным нажом перарэзала нашу зямлю на дзьве часткі—савецкую і панскую. У сэнсе палітычным, калі дазволіце так выразіцца, гэта былі дзьве дзяржавы, далёкія адна ад аднэй, як Амэрыка ад нашай Барысаўшчыны. Затое ў іншым сэнсе, тоісь, на тэрыторыі—адны і тыя самыя людзі жывуць па абодвых баках зоны. Я ня веру ні ў бога, ні ў чалавека. У бога ня веру, бо яго ня бачу. У чалавека ня веру, бо бачу яго. Так».

Іван Мацьвеевіч усьміхнуўся, кіўнуў у знак згоды галавою, глыбокадумна зірнуў на маляваны суфіт пакою і сказаў ціха, каб не разбудзіць Крушынскага:

— Пра-а-авільна!

Ён павольна перанёс свае рахманыя вочы зноў з суфіту на «альбом».

«Трэба было мець тысячу вачэй, каб глядзець, што робіцца на гэтай зоне. Так. Прыехаў на зону адзін чалавек. Нешта

пашаптаўся з стараверамі і паехаў назад. Гэта быў добры пачатак, каб людзям многа зла чыніць. Раптам стараверы пачалі езьдзіць на начлег на скошанае балота ў самую зону. Так. Толькі заўважылі людзі, што раніцою стараверы варочаюцца на іншых конях. Мужыцкае вока вострае да каня. Памяналі коняй з начлежнікамі таго боку, з-за граніцы. Маўчаць людзі. Рады, што іхных коняй не чапаюць. Розныя радасьці на сьвеце бываюць. Так. Часта зьяўляўся на стараверскі хутар той самы чалавек. Галоўны атаман шайкі. Пачаўся вялікі крадзеж коняй з абодвых бакоў. З Беларусі вывозілі ў Польшчу, адтуль— сюды. Плакалі людзі з польскай стараны і глядзелі на наш бок. Плакалі нашыя людзі і лыпалі вачыма ў той бок. Адны і тыя самыя людзі—адны і тыя самыя сьлёзы. Так. Толькі рэчка Сьлізанка падзяляла іх на два лягеры. Была гэта рэчка па прыкладу, тоісь, ракі Бабілёну—і як там далей у псальмах Давіда гаворыцца. Так. А ўсё той самы чалавек, аб якім я раней казаў. Ён быў, тоісь, ключыкам гэтага хітрага мэханізму, нібы ключык да загарка. Так. Я знаю таго чалавека. Ён цяпер шышка. У яго культурная гаспадарка. Яго імя я тут ня пішу. Гэта было-б з майго боку, прыкладам кажучы, вялікай адвагай. Гэта небясьпечна больш для мяне, чымся для яго. Як гэта кажуць: хлеб еж і праўду рэж! Рэж праўду на кавалачкі і кідай у сьметнік. Так. А гэты чалавек, які кіраваў канакрадзтвам, цяпер пазалочаны багацьцем і славай. Ён, прыкладам кажучы, як тая пазалочаная шклянка. Глянеш і падумаеш—залатая пасудзіна! Але вось крутануўся каля стала, скінуў яе на пол, і яна разьбілася на кавалачкі. Тоісь, шкло, а ня золата. Так».

Івану Мацьвеевічу нешта цюкнула пры гэтым. У яго зрокавай памяці «Леў Талстой» цяпер стаяў, як жывы. Успомніліся ўсе рыскі яго прарочага твару. Вочы «Льва Талстога» пранікалі яго наскрозь. Відаць было па ўсьмешцы, што ўсе думкі Івана Мацьвеевіча ведае.

... Няўжо Язэп Сымонавіч і канакрадамі кіраваў?—падумаў Іван Мацьвеевіч і глянуў на сьцяну. На шпалерах ён хацеў вычытаць адказ на сваё запытаньне. Храпеньне Крушынскага перабівала яго думкі, прыкра разіла слых. Ён пачаў чытаць новы артыкульчык пад назваю «Калі ты ня поп, адзявайся ў рызы».

«Аб папох у нас ёсьць шмат цікавых баек: то іх вымажуць дзёгцем, кінуць у кадушку з пер'ем, а пасьля на рынку чорта паказваюць за грошы; то да іх прырастае авечая скура з рагамі; то папа лупцуюць за тое, што да чужой жонкі палез. Так. З папа сьмяюцца ўсе. А ён ня лыс і з нас сьмяецца. Так. Было гэта ў 1922 годзе каля граніцы зімою. Пагранічнікі нейкім чынам даведаліся, што ўночы павінна быць правезена некалькі вазоў контрабанды. Так. Ня гледзячы на мяцеліцу, яны расставілі пасты па ўсіх ваколічных дарогах. А мяцеліца была такая, што жывой душы на дарозе ня відаць. Аднак і ў завеі фурманка паказалася, нават з ґразгулкамі. Так. «Стой!»—крыкнулі пагранічнікі—«хто едзе!» Фурманка спынілася. А на санках—бацюшка, духоўная, значыць, асоба. Гэты контрабандай займацца ня будзе. Так. «Куды едзеш, баця?»—запыталіся пагранічнікі. «У вёску еду, мужыка спавядаць. Паміpae ён. Такі звычай хрысьціянскі». Так. Поп сказаў гэта такім пакорлівым, елейным голасам, ажна добрыя людзі пашкадавалі бацюшку. Так. «Няўжо, бацюшка,—сказалі яны,—чалавек і бяз споведзі дарогі ня знойдзе на той сьвет?» «Закон такі ў нас, духоўнікаў. Нічога ня зробіш»,—вытлумачыў поп. Так. А адзін з пагранічнікаў бязбожным агітатарам быў. І вось ён тут уночы, на дарозе цэлую прамову сказаў перад папом на тэму: «Рэлігія—опіум для народу». Ён так бязбожна гаварыў, што зрабіў уплыў на папа. Бацюшка абяцаўся адмовіцца ад сану духоўнага. Так. Прызнаў ён сваё дармаедзтва, згадзіўся з тым, што вышэйшае духавенства абманвала яго, а ён дурманіў народ. Як кажа тая казка: «бабка за дзедку, дзедка за унучку, ўнучка за сучку». Так. А мароз трышчыць, што ў агітатара і папа словы замярзаюць на губах. Поп сказаў, што гатоў і цяпер не паехаць да паміраючага чалавека і хацеў накіраваць каня назад. На гэта агітатар не згадзіўся. Так. «Едзьце,—кажа,—бацюшка, цяпер да хворага. Вы-ж павінны ведаць псыхолёгію старых несьвядомых сялян. Перад сьмерцю яму куды лягчэй будзе, калі вы яго паспавядаеце. Толькі вы ўжо на гэты раз, таварыш, платы ня возьмеце ў беднай сям'і за адпушчэньне грахоў. Я добра ведаю сам гэтае жыцьцё, гэты быт, бо мой бацька быў папом». Так. А мароз трашчыць, хоць лысых лічы. Поп паехаў далей. А пагранічнікі чакалі контрабандыстых. У гэту-ж ноч іншыя

пагранічнікі на іншай дарозе таксама сустрэлі папа, які ехаў спавядаць хворага. Так. Сярод тых пагранічнікаў ня было чалавека з далікатнай псыхолёгіяй. Ім удалося сарваць у папа кудлы. Парык і воз з контрабандай застаўся ў пагранічнікаў, а пераадзеты ў папа контрабандысты ўцёк, адстрэльваючыся з браўнінга. Зусім не па-хрысьціянску зрабіў гэты хлоп, а ня поп. Так. Пад абстрэл антырэлігійнай агітацыі папаўся якраз той самы чалавек, які кіраваў раней канакрадамі. Так. Некаторыя кажуць, што гаспадар хутара Курганішча памагаў лавіць гэтага папа, а іншыя кажуць, што ён сам быў гэтым папом. Можа быць і адно, і другое».

Іван Мацьвеевіч быў у захапленьні ад пісаніны «Льва Талстога».

Перавярнуў у альбоме некалькі старонак з наклеенымі на іх «керанкамі».

Над гэтымі грашмі стаяў загаловак: «Багацьце, якое страціла вартасьць».

Была напісана кароткая гісторыя гэтых «керанак»:

«Леў Талстой» іх атрымаў за каня. Потым яму хацелася купіць цялё—прасілі столькі грошай, колькі ён атрымаў за каня.

«Аддам каня за цялё»?—пытаўся сам у сябе «Леў Талстой».—Не!

Грошы асталіся на рост.

Другім разам яму трэба было купіць пяць фунтаў солі—прасілі столькі грошай, колькі ён атрымаў за каня.

«Я яшчэ з глуздоў ня зьехаў, каб аддаць каня за пяць фунтаў солі»—пастанавіў «Леў Талстой»,—гэтыя грошы зноў вернуцца да сваёй вартасьці».

Ня купіў солі.

У трэці раз за пачак махоркі прасілі ў яго той капітал, які ён атрымаў за каня.

«Трэба быць апошнім дурнем»,—напісаў тады «Леў Талстой»,—каб аддаць каня за пачак махоркі».

Такім чынам, грошы за каня асталіся ў «альбоме» «*на памяць патомству*»,—як ён прыпісаў на белым полі старонкі, пад графою. «*Время посещения Земским Начальником Волостного Правления*».

Далей Іван Мацьвеевіч натрапіў на цікавы загаловак:

«Ня ўсё, што ні блішчыць, ня золата».

І ён зноў пачаў чытаць:

«Жыву ўжо шэсьцьдзесят год і такіх дзівосных штук ня бачыў. Так. У мяне белая, як сьнег, барада, і я ніколі не дадумаўся-б да такіх фантазій, якія здараюцца ў самым жыцьці. Хопіць мне тое, каб толькі запісваць людзкія падзеі. Так. Гарадзкія людзі кажуць, што я падобен да Льва Талстога. Я не саромлюся гэтага імені. Цяпер наконт блеску і золата».

Тут «Леў Талстой» падробна апісвае, як у чалавека шукалі контрабанды і нічога не знайшлі. Потым пачалі шукаць зьліткі золата, воз у кавалачкі расшчапілі—і таксама нічога не знайшлі. Дзе-ж тут яшчэ можа быць?—думалі пагранічнікі. Асталіся адны атосы, запэцканыя ў каланіцу. На жарт папробвалі разьбіваць атосы. Аказалася, што ўсе жалезныя часткі воза—залатыя.

Ва ўсіх артыкульчыках ці новэльках такога характару цэнтральнай фігурай быў адзін і той самы чалавек.

Храпеньне Крушынскага пачало моцна нэрваваць Івана Мацьвеевіча. Цяпер ён чытаў твор пад назваю: «*Людзкая слава—пыл і пясок*».

Тут былі пералічаны ўсе добрыя ўчынкі Язэпа Крушынскага, яго заслугі перад грамадзтвам.

Гэты твор па тону быў падобны да артыкулу агронома ў газэце «Беларуская вёска».

Івана Мацьвеевіча гэта ўзрадвала:

... І ты, «Леў Талстой», ведаеш—калі, што і як. Чалавека бачыш наскрозь,—ня горш за мяне. Розьніца між намі тая, што ты толькі назіраеш, а я дзейнічаю. Але тут высоўваецца пытаньне: хто большую карысьць прыносіць—пісьменьнік, або той чалавек, які зьяўляецца об'ектам пісьменьніцкага твору? Ва ўсякім выпадку, позыцыя пісьменьніка выгаднейшая. Апіша, абмалюе чалавека з ног да галавы, надрукуе, гонорар возьме, а натуршчыку свайму і капейкі ня дасьць.

Іван Мацьвеевіч доўга ўзіраўся ў шпалеры супроцьлеглай сьцяны, жмурыў вочы, і тады—дзіва дзіўныя—малюнкі на шпалерах мянялі свой выгляд.

З дрэўцаў і галінак выступалі фігуркі знаёмых людзей. Круціў сьмешна галавою літаратурны крытык, пад псэўдонімам Кірковіч з праўдзівым прозьвішчам Алалоўнік, мітусіўся про-

філь гаспадыні кватэры, а калі прыгледзеўся добра, дык гэта была яго жонка, агронома жонка—Аграфена Макараўна.

Ён хутка палажыў альбом у чамадан, выключыў электрычнасьць і лёг спаць з цьвёрдай думкай выехаць заўтра як раней з гораду ў свой раён.

... Трэба будзе схадзіць толькі ў адно месца—у Наркамзем.

Ён хутка заснуў.

І сьнілася яму, што паехаў да жонкі. Не пазнае яго Аграфена Макараўна. Як ні стараецца вытлумачыць, што ён—яе муж, Антон Сяргеевіч Мятлоў, а ня Іван Мацьвеевіч Шапавалаў,—нічога не памагае. Жонка яго знаць ня хоча. Яму так цяжка, так крыўдна, што пачынае плакаць.

XV

Язэп Крушынскі ўздрыгнуўся праз сон. Нехта лямантаваў над самай яго галавою. Яму здавалася, што цяпер зіма, піліпаўка, што ён знаходзіцца недзе ў глушы, блізка ад лесу і каля сялянскай хаты, занесенай гурбаю сьнегу, выюць ваўкі.

Працёр вочы, ускочыў з ложка і давай у поцемках прыслухоўвацца. Пераклікаліся ранічныя гудкі, крычалі на розныя галасы. Вушам яго, адвыклым ад гарадзкіх гудкоў, яны здаваліся выцьцём.

Душна было ў пакоі ад густога змроку. Ціханька, каб не прачнуўся Іван Мацьвеевіч, ён адчыніў акяніцы, потым ледзь чутна скрыпнуў вакном і зірнуў на вуліцу.

Ранічнае сонца заглядала ў вокны дамоў. На вуліцы, побач з сіняватымі вільготнымі ценямі, урэзваліся жаўтавата-празрыстыя палосы. Вокны палалі ў сонечным пажары. На лісьцях вулічных прысад блішчэла раса, мільгалі яркімі кроплямі, нібы тысячы сьветлячкоў. Воблакам каціўся па вуліцы пыл. Чулася моцнае шарханьне венікам па бруку. Па тротуары аддаваліся гулка крокі адзіночнага чалавека. Потым яны аддаляліся, цішэлі і танулі недзе далёка.

Насупраць вялікага дому Крушынскіх, па тым баку вуліцы, стаяла сіняя драўляная хатка. З-пад фарбы на сьценах, якая вісела шматкамі, выступала шараватае дрэва. Супроць брамы гэтага доміку, каля вузенькага тротуару з старых дошак, сядзела сагнутая худая жанчына сярэдніх гадоў і з сур'ёзным,

заклапочаным выглядам калупала нажом мізэрную траву між каменьняў бруку.

Сырэны змоўклі.

У пакой лез праз адчыненае вакно пах гораду. Усім целам Крушынскі адчуваў гэты клейкі, густы пах. Нібы пах пральні, аптэкі і дыму казлытаў ноздры. Ад няпрыемнасьці ён моршчыў губы, адварочваў нос. З спэцыфічным пахам гораду заўсёды ў яго ўяўленьні ўзбуджалася нешта чужое, далёкае, што яго вельмі мала цікавіла. Ён успомніў учарашнюю выпіўку, гутаркі гасьцей у стрыечнага брата. Заўсёды большасьць такіх гутарак на адцягненыя тэмы выклікала ў яго мазгох цяжар. Пад гуд спрэчак вучоных людзей яго галава зацягвалася цеснай драцянай сеткай. Ад такіх пераліваньняў з пустога ў парожняе ён уваходзіў у цяжкі настрой. Ён тады адчуваў, што паміж ім і гэтымі людзьмі стаіць непралазны тын. Яны гавораць на нейкай незразумелай мове. Хаця, калі ўважліва прыслухоўваецца, дык паасобныя словы і нават сказы, за выключэньнем навуковых тэрмінаў, як-бы і зразумелы. Пры такіх гутарках ён заўсёды вінавата ўсьміхаўся, адчуваў сябе расслабленым і маўчаў. Толькі калі-ні-каліківаў галавою ў знак згоды, гаварыў «угум», маскіруючы, такім чынам, сваю неінтэлігентнасьць.

Нават Іван Мацьвеевіч, яго прыяцель, з якім вёў заўсёды самыя сардэчныя гутаркі на зразумелай мове—і той пры ўдзеле ў вучоных бяседах робіцца Крушынскаму чужым, здрадніцкім. Ён заўважыў, што, наогул, Іван Мацьвеевіч мае вялікі спрыт у гутарцы. Яго мова дзеліцца на тры катэгорыі: іншая ў гутарцы з вучонымі людзьмі, не такая, калі ён бяседуе з ім, з Крушынскім, ці з яго сям'ёю ў Курганішчы, і зусім простая, калі гаворыць з сялянамі. Ён тады падбірае спэцыяльныя словы—простыя, зразумелыя, популярныя. І голас, і манеры мяняюцца тады ў агранома. Ён кожны раз стараецца быць роўным з сваім субяседнікам і, такім чынам, да адных падніімаецца, да другіх паніжаецца.

Крушынскі зайздросьціў такому спрыту, бо ў яго самога ёсьць адзін слоўнік для ўсіх людзей.

Ён хутка апрануўся і выскачыў на дзядзінец. Засыпаў каню аўса і вярнуўся ў кватэру. Паплюхаўся ў кухні пад кра-

нам халоднай вадою. Потым накінуў на плечы скураную жакетку і без сьняданьня спусьціўся па сходах.

У яго на сягоньня ў горадзе шмат спраў.

Ён папесьціў рукою гладкія, але замурзаныя парэнчы ўсходаў, на якіх калісьці так спрытна ўмеў зьяжджаць з чацьвертага паверху, і хутка вышаў на вуліцу. Не пашоў, а кінуўся ў вір вуліц і закавулкаў па ранічных пуставатых тротуарах. Яго крокі гулка адбіваліся і барабанным стукатам паведамлялі аб ім—аб Крушынскім. Перайшоўшы мост па Пролетарскай вуліцы, ён сунуўся налева па вузкай сьцежцы высокага абрыву над Сьвіслаччу. З правага боку сьцежкі—высокі драўляны паркан. Белыя корпусы другога савецкага шпіталю і высокія дрэвы падымаюцца над парканам. Крушынскі трохі спыніўся і пачаў любавацца відам гораду з высокага месца. Дахі дамоў, вокны блішчэлі на сонцы, шпілі касьцёлаў і цэркваў пераліваліся ў розныя колеры. Пярэстая панорама гораду раскінута, як каляровы бухарскі халат.

Рупнасьць дзелавога чалавека была ў Крушынскага трохі зьмешана з лятуценьнем романтыка, часам захапляўся хараством вакольнага.

Пастаяўшы трохі, ён раптам усхапіўся:

— Трэба сьпяшыць да Зэліка, а то будзе позна!

Ён кінуўся ў бок Пярэспы.

Дом Зэліка—вялікі, стары і нізкі. Здаецца, што разьехаўся ў бакі і зараз разваліцца. Ён мае падабенства да старасьвецкай карчмы: плоскі дах і шырокія вароты з боку тэй палавіны вялікай будыніны, якая калісьці служыла хлявом для сялянскіх і местачковых фурманак, якраз нагадвалі карчму на старадаўных беларускіх трактах. Сьцены зрыты чарвяточынамі, падобнымі да арабскіх літараў.

Крушынскі ветліва кіўнуў галавою да аднаго з вакон дому. Рыжая барада Зэліка здавалася праз шыбу патухаючым агнём.

Зэлік вышаў насустрач.

Яго нявысокая, прысадзістая фігура аддае здароўем і бадзёрасьцю. Гладка пастрыжаная галава блішчыць медзьдзю. Шэранькія вочкі колюць паветра дзьвюма вострымі шпілечкамі. Яго твар, ярка ружовы, абсыпаны плямінкамі-рабаценьнямі, зьліваецца адным колерам з барадою. У яго не прыкмячаецца

шыя. Галава прымацавана да карку. Аднак ён вёртка круціць ёю ва ўсе бакі. Яго шэрая жакетка расшпілена. Выступае камізэлька, з зашмальцаваным да бліскучасьці кантам. Срыбны ланцужок ад гадзіньніка блішчыць на шырокіх грудзёх.

Зэлік выцягнуў Крушынскаму насустрач руку з тоўстымі кароткімі пальцамі—таксама ружовую, у рабаценьні. Нібы не прывітацца хоча з гасьцём, а ляпнуць яго тоўстай рукою.

Ён моцна, смакуючы, сьціснуў руку Крушынскага і прагаварыў коратка, адрывіста, тоненькім галаском:

— Язэпка, гэта ты?

Галасок Зэліка не гармонаваў з яго прысадзістай магутнай фігурай. Такі чалавек павінен быў, здаецца, гаварыць тлустым, грудным басам. Выглядала, нібы за яго плячыма хаваецца худы чалавечак і гаворыць за Зэліка тоненькім галаском, а Зэлік толькі так сабе, для віду, расчыняе і зачыняе рот.

Зэлік доўга ўглядаецца ў Крушынскага, нібы бачыць яго ўпяршыню.

— Ты-ж хіба не асьлеп, Зэлік?

— Маё шчасьце, што не асьлеп. Хоць ты хацеў мяне асьляпіць.

— Я?!

— Ты!

Крушынскі выставіў на Зэліка зьдзіўленыя вочы.

— Ідзём у хату, Язэпка ты, пагаворым,—прапішчэў Зэлік лагодным галаском і палажыў на плячо Крушынскага правую руку так моцна, ажна той прысеў.

— Ня дуры, Зэлік!

— Пагаворым, Язэпка ты!

— Атрымаў шэсьць скрынак у Шмуйлы Заменскага?

— Вось аб гэтым і будзе гутарка, Язэпка ты!

Тон Зэліка Крушынскаму не спадабаўся. У гэтым «Язэпка ты» адчувалася лаянка.

Яны ўвайшлі ў хату.

Праз вялікі, брудны пакой, дзе кружыўся рыжы хлопчык, вельмі падобны да Зэліка, перайшлі ў другі, меншы. Там стаяў стол, засланы жоўтай цыратай, некалькі крэслаў, камода, шафа і пара ложкаў з горамі падушак. На сьцяне вісеў портрэт старога рабіна ў ярмолцы, увесь у мушыных сьлядзінках.

Зэлік і Крушынскі прыселі.

— Можа вып'еш, Язэпка ты, чарку гарэлкі?

— Не, не! Дай аб справе пагаварыць!

— Бойся бога, пагаворым. Пяць скрынак адправіў у Маскву ў вагоне з дошкамі, а шостая не хацела ехаць, заартачылася.

Пры гэтым Зэлік паківаў пальцамі на Крушынскага і так на яго зірнуў, нібы ён, пакрыўджаны чалавек, добра разумее ўсе хітрыкі Крушынскага.

— Язэпка ты! Язэпка ты!—гаварыў ён далей тоненькім галаском,—мы-ж з табою, не забывайся, рамяні аднэй скуры. Бойся бога!

Крушынскі сарваў са стала свой правы локаць, які прыліп да цыраты, зірнуў на портрэт рабіна і нэрвова запытаўся:

— Чаму, Зэлік, так гаворыш?

— Чаму? — перапытаўся Зэлік, — ай-я-яй, Язэпка ты! Шчасьцё толькі, што Зэлік ня любіць глупства рабіць. Зэлік не такі дурань, як некаторыя думаюць. Зэлік—малайчына!

Крушынскі ціскаў плячыма і нічога ўцяміць ня мог.

— Дык у чым-жа справа?

Ён утаропіў вочы ў Зэліка.

Зэлік хітра міргнуў вачыма і абняў Крушынскага ў другі раз.

— Няўжо, Язэпка ты, аклог цу дыр, аброх цу дыр, * сам ня ведаеш?

— Нічога ня ведаю.

— А што ў шостай скрыні ляжала? Які там быў тавар? Бяз утайкі скажы Зэліку. Бойся бога, Зэлік—свой чалавек.

— Такі самы тавар, як і ў тых пяці скрынках.

— Бім-бам-бом!—забомкаў Зэлік срыбным званком, заківаў галавою і зірнуў на Крушынскага так кпліва, як глядзяць на блазна.

— Што тут такое здарылася? — запытаўся Крушынскі зьбянтэжаным голасам.

Зэлік нічога не адказаў на запытаньне, нагнуўся пад ложак, выцягнуў адтуль скрыню, спакойна адчыніў і сказаў:

— Вось яна! Глядзі, Язэпка ты!

Крушынскі вытарашчыў вочы:

— Ня можа быць, Зэлік!

* Ліха на цябе.

— Можа быць, Язэпка!

Скрыня была напакована дошчачкамі, апілкамі і анучамі.

— Тут іншае ліха!—гарачыўся Крушынскі.—Я сам правяраў тавар!

— І я-ж правяраў! Зэлік такі чалавек, які верыць толькі ў тое, што бачыць вачыма Зэліка.

Зэлік моршчыў чырвоны лоб.

— Дам табе, Язэпка ты, грошы за пяць скрынак!

— За шэсьць!—паправіў памылку Крушынскі.

— Як сабе хочаш!

Зэлік выняў з-пад камізэлькі грошы і палажыў на стол.

Узнэрваваны Крушынскі пералічыў грошы, схаваў у кішэню і зьвярнуўся да Зэліка:

— Зэлік, чуеш? Ня думай, што так прапушчу! На гэты раз твой фокус ня пройдзе, як у той раз з сахарынам. Я сам правяраў!

Зэлік спачуваюча зірнуў на Крушынскага:

— Можа гэта Шмуйла Заменскі зрабіў? Ён—ня Зэлік. Я зараз пашлю свайго хлопца па Шмуйлу. Пойдзем да Бэрндрука. Шмуйла прыдзе туды.

Зэлік вышаў з пакою, сказаў некалькі слоў свайму пятнаццацігадоваму сыну. Той зараз-жа пабег.

Зэлік і Крушынскі вышлі на вуліцу, як самыя блізкія прыяцелі. Ніхто, глянуўшы на іх, ня мог-бы падумаць, што гэтыя людзі толькі што спрачаліся і зараз можа яшчэ мацней будуць лаяць адзін аднаго.

У Бэрндрука заежджы двор.

З вуліцы над брамай вісіць бляшаная шыльда, на якой намалявана залатымі літарамі на чорным фоне:

ЗАЕЖДЖЫ ДВОР БЭРНДРУКА.

Хаця ад гэтай шыльды над брамай вее прытулам, але вакол двара з вуліцы і ўнутры заўсёды рыначная, няпрытульная сумяціца. Каля заежджага двара на вуліцы заўсёды стаіць некалькі рамізьнікаў—«на ўсялякі выпадак». Фурманы сядзяць на перадкох калясак у нейкай дрымоце. Але як толькі хто з двара скрыпне форткай і выйдзе на тротуар, фурманы прабу-

джаюцца, рухава, спрытна адварочваюцца ў бок брамы з прапановай:

— Можа падвезьці?

— Куды трэба ехаць?

— Садзецеся ка мне!

У рынвчныя дні на двор і з двара скрыпяць крамніцкія і сялянскія фурманкі з блізкіх і далёкіх мястэчак і вёсак.

Пад вялікай паветкай на двару стаіць многа вазоў. Аглоблі тырчаць уверх, як старасьвецкая зброя. Коні прывязаны да вазоў, хрумсаюць авёс або ляніва жуюць сена. Сяляне круцяцца туды і сюды з торбачкамі ў руках, пояць коняй, мажуць калёсы: тут яны, наогул, больш рухавыя, чымся ў сябе дома. Завіруха заежджага двара і на іх робіць уплыў. Пах сена, конскага гною і каламазі казлыча насы. Да людзкога гоману дадаецца яшчэ капэля вераб'ёў, якія ёрзаюць у гнаі і з вялікім галасам апускаюцца на двор або падымаюцца ўверх.

Гармідар на двары служыць заслонай да таго, што робіцца ў двухпавярховым доме, які падзелены на «нумары». Дзесяць меншых «нумароў» у ніжнім паверсе і шэсьць большых—у верхнім.

У ніжнім паверсе «нумары» простыя—для сялян і местачковых крамнікаў. Тут уночы людзі сьпяць на бруднай падлозе, на скрынях і паках з таварамі. Сюды заходзяць гарадзкія кабеты з кошыкамі, купляюць яйкі, курэй, масла, сыр, гусі. Заходзяць скупшчыкі цялят, скур. Круцяцца жабракі і кішэньнікі. Стаіць такі вэрхал і тарарам, ажна глушыць вушы. Людзі гавораць усе разам, стараюцца перакрычаць адны адных, махаюць рукамі, бяруць адны адных за гузікі і, здаецца, у іх адна мэта—ахрыпнуць ад крыку.

Верхнія шэсьць «нумароў» спэцыяльна для «інтэлігентных гасьцей». Перад імі гаспадар заежджага двара, Бэрндрук, ходзіць, як кажуць, на задніх лапках. Вельмі зацікаўлена распытваецца аб здароўі, аб хатніх справах, гутарыць на палітычныя тэмы, пытаецца, ці ня трэба паставіць самавар, дый, наогул, адчувае сябе далікатным чалавекам сярод далікатных людзей. Па калідоры ходзіць ён ціха, асьцярожна, нібы стараецца не разбудзіць хворых. Высокі стройны Бэрндрук падобны да маладога доктара ў шпіталі, які толькі-што зьняў з плеч шпітальны халат.

У кожным «нумары» другога паверху стаяць чыста засланы ложак, стол, канапа, некалькі крэслаў і ўмывальнік. У гэтых «нумарох» пануе цішыня. Госьці гавораць шэптам і таемна глядзяць адзін на аднаго. Шум з двара і ніжняга паверху даходзіць сюды прыдушаным пчаліным гудам.

У верхнія «нумары» таксама прыходзіць многа народу—людзі «інтэлігентныя». Пры гэтым яны падазрона аглядаюцца вакол, гавораць ціха, прыкладаючы часам губы да самага вуха субяседніка, не дагаворваюць, міргаюць вачыма, строяць хітрыя портрэты, глыбока зазіраюць адны адным у вочы, спыняючы цяжкі алавяны погляд на «падазроных» і «няпэўных» госьцях.

Тут бываюць макляры, контрабандыстыя, людзі з чорнай біржы, «свае» міліцыянэры і іншыя «свае» людзі. Жабракі і абарванцы сюды не дапускаюцца.

Царыцаю гэтага паверху адна асоба—высокая брунэтка родам з мястэчка Радашкавічы. Яна ўвесь час тут жыве. «Яе» людзі працуюць на граніцы. Жыхары верхніх «нумароў» глядзяць на яе з вялікай пашанай, адносяцца як да генія контрабанднай справы. Яе жыцьцёпіс распаўсюджваецца тут шэптам з вуснаў у вусны.

Яна—дачка беднага шкляра, няпісьменная, простая дзяўчына. Спачатку сама езьдзіла на граніцу, нават пехатою хадзіла туды. Прыгожы выгляд шмат ёй памагаў, выручаў часта з бяды. Ёй так шанцавала, што ніколі не пападалася пагранічнікам у рукі, а калі часам і пападалася, дык вельмі спрытна выкручвалася. Тут, вядома, галоўную ролю грала яе хараство. Яна падкуплівала людзей ня золатам, а сабою. Цяпер яна сядзіць спакойна ў заежджым двары Бэрндрука. Працуюць на граніцы яе агенты. Хоць няпісьменная, а галава добра працуе. Напамяць робіць рахункі на дзесяткі тысяч рублёў розных валют і ніколі не памыляецца. Апранаецца з вялікім шыкам і хоча купіць сабе жаніха—доктара або інжынэра. Сам Бэрндрук шукае ёй жаніха. У яго на прымеце—некалькі. Але яна пакуль-што не дапускае да сябе жаніхоў: ёй трэба раней трохі «адшліфавацца». Брыльлянт таксама патрабуе шліфоўкі. Яна шліфуецца: штодня да яе прыходзіць адзін студэнт, у якога яна «бярэ ўрокі» па дыктоўцы, чытаньні і рахунках. Пасьля яго заходзіць хлопчык—чысьцільшчык ботаў, які чысьціць ёй

чаравікі. Часам, калі яна ня ў гуморы, праганяе студэнта і астаецца бяз «урока», а чысьцільшчыка стукне чаравікам у лоб.

Чысьцільшчык носіць на сваім закарузлым лобе сінякі ад яе чаравік. Ён хацеў-бы мець многа такіх сінякоў, бо за кожны яна плаціць па рублю. Таксама студэнт атрымаў за яе капрызы ў прэзэнт залаты портсыгар.

Часам, калі трэба каму з гасьцей другога паверху параіцца аб справе, дык ён зварочваецца да Соні (так завуць гэту дзяўчыну). Яна добра знаецца на футры, золаце, «каратах» і іншых таварах для заграніцы. Калі здараецца якая спрэчка між людзьмі, дык Соня разблытвае заблытаныя справы.

Зэлік завёў Крушынскага да Соні.

Хутка зьявіўся і Шмуйла Заменскі.

Язэп Крушынскі загубіўся ў хітрасплеценай гутарцы гэтых людзей.

Стары Шмуйла пры кожным слове кляўся сабою, сваімі дзецьмі, унукамі і адным праўнукам ад старшага ўнука старшай дачкі Рахілі, што фокус са скрынкай—не яго фокус.

Божкаўся і Зэлік. Ён гаварыў, што ня быў-бы Зэлікам, каб такую штуку зрабіў. «Гэта-ж было-б такое «фэ»,—сказаў Зэлік,—ад якога Зэліку толькі нос затыкаць трэба было».

Крушынскі з свайго боку запэўняў, што ён добра ведае спрыт Зэліка і ніколі-б не адважыўся падсоўваць яму пустую скрыню.

Тут маглі быць і іншыя прычыны нястачы тавару: можа селянін, які вёз гэту скрынку, украў тавар? Можа Рахмілька?

— Анучы, дошкі і апілкі—Менскае дабро. Гэта ў Менску зроблена,—стаяў на сваім Крушынскі.

Пасьля доўгіх і гарачых спрэчак Соня пастанавіла, каб шкоду за гэту скрыню цярпелі і Зэлік, і Крушынскі.

На гэта згадзіліся.

Згоду замацавалі сытным сьняданьнем з моцнай выпіўкай тут-жа, у «нумары» Соні.

Усе былі здаволены. Гаварылі аб адпраўцы тавару ў Маскву, пашкадавалі тых, якія «селі макам». Соня ведала ўсе артыкулы савецкага крымінальнага кодэксу, якія тычыліся спраў контрабанды.

Але Соні ня было часу доўга заседжвацца ў «нумары». Ёй трэба было ехаць да «свайго» юбэліра. Яна дастала чамадан-

чык, напакавала туды залатыя портсыгары, гадзіньнікі і шмат залатых зубоў, якія выглядалі, як пчаліныя соты, і іншыя рэчы.

Сонца ўжо моцна пякло, калі Язэп Крушынскі вышаў з заежджага двара.

На вуліцы быў шум, таўканіна. Ішлі бабы з кошыкамі, людзі з портфэлямі, вучні. У гэтым людзкім тлуме Крушынскі працаваў локцямі, прабіваўся праз жывую гушчыню нізкага рынку на Пляц Волі.

Стукат яго крокаў не аддаваўся ў яго вушох, як раніцою, а губляўся ў агульным стукаце пешаходаў па тротуарах і рамізьнікаў па бруку. На Пляцы Волі Крушынскі настроіўся на іншы лад. З яго твару прапала клапатлівасьць грашовага чалавека. Ён трохі нават наўмысьле апраставалосіўся, апусьціў уніз доўгія вусы, расхрыстаў скураную жакетку і прайшоў цераз Пляц Волі на Ленінскую вуліцу павольным крокам. Заглядаў у вітрыны магазынаў з прыдуркаватым (робленым) відам «божага чалавека».

На рагу Ленінскай і Інтэрнацыянальнай стаяў касавокі чалавек і прадаваў сьмешную дзіцячую цацку.

Крушынскі зьдзівіўся, што па тротуарах Ленінскае вуліцы кудахтаюць куры. Раптам закудахтаў і прадаўца цацак. Ён трымаў у аднэй руцэ пудэлачку, а другой рукой цягаў за нітку. Гукі гэтага інструманту напаміналі кудахтаньне курыцы.

Каля гэтага чалавека тоўпіўся народ. Людзі рагаталі, як малыя дзеці. А прадавец сьмешнай цацкі кудахтаў шчыра, сур'ёзна і працавіта. Відушчае вока яго глядзела з зазываючым блескам на «публіку», а другое, белае, сьляпое ўвесь час пазірала з выразам незацікаўленасьці і нірваны ў бок плошчы.

Крушынскі набыў цацку за дзесяць капеек і зайшоў у кнігарню, купіў некалькі кніжак па сельскай гаспадарцы, пашоў далей і павярнуў направа, уверх па Савецкай вуліцы.

На душы было лёгка і радасна ад сонца, якое сьвяціла цяпер у самы твар, ад кудахтаньня цацак-кур і на гэтай вуліцы, ад людзей у «талстоўках», ад жанчын у лёгкіх белых вопратках, ад аўтомобіляў, якія часам мільгалі туды і сюды. Усё гэта радавала Крушынскага сваёй пярэстасьцю і рухам.

Ён скінуў з кніжак упаковачную жоўтую паперу, насіў іх у правай руцэ, высунутай наперад, нібы трымае наган, настаўлены супроць ворага. У такой позе дайшоў да складу сельскагаспадарчых прылад, выбраў там дзесяць кос, заплаціў за іх і хутка па-дзелавому пакіраваўся назад. Ён успомніў, што яму яшчэ трэба зайсьці ў рэдакцыю газэты «Беларуская вёска».

Вывеску газэты знайшоў хутка на сьцяне з вуліцы і пачаў узьбірацца наверх па ўсходах, пытаючыся ў сустрэчных, дзе рэдакцыя газэты «Беларуская вёска».

— На апошнім паверсе! Першыя дзьверы направа!

На дзьвярах наклеена паперка:

БЕЛАРУСКАЯ ВЁСКА РЭДАКЦЫЯ

Крушынскі стукнуў ціханька ў дзьверы.

— Увайдзеце!—раздаўся знутры гучны мэталёвы крык.

Ён адчыніў дзьверы і ціханька ўвайшоў.

Пакой рэдактара малы. Два сталы, прысунутыя адзін да аднаго. На іх ляжаць кучы лістоў, газэт, розныя кніжкі, атрамантніцы, ручкі, алоўкі і іншыя прыналежнасьці канцылярскіх сталоў. На сьценах—плякаты, розныя друкаваныя табліцы, портрэт Леніна і конвэрты, адрасаваныя ў «Беларускую вёску», разрысаваныя ў розныя колеры і ўзоры. На нізкай кахлянай печцы навалена гара комплектаў розных газэт. Газэты, рукапісы і клішэ ляжаць і на падаконьніку адзінага ў пакоі вакна.

Рэдактар сядзіць нахілены над рукапісамі з алоўкам у руцэ. Відаць, вельмі заняты, бо, не падняўшы галавы, ня зірнуўшы на Крушынскага, крыкнуў:

— Сядайце! Я—зараз!

Крушынскі прысеў і ціханька, каб не рабіць шуму, палажыў на стол купленыя кніжкі і зьвязаны жмут кос.

Ён скоса зірнуў на рэдактара.

Рэдактар адзеты ў шэрую рубашку. Голеная галава блішчыць сіняватым водблескам. Чорная доўгая барада пакрывае грудзі. Ад чарнаты барады матавы твар рэдактара прымае шэрае адценьне. Рэдактар гмыкае, насьвіствае песеньку і робіць чырвоным алоўкам значкі на рукапісах.

За некалькі хвілін аж тры разы званіў тэлефон. Рэдактар некага моцна прабірае за неакуратнасьць, другому кажа, што згодзен з яго прапановай, а трэцяму крычыць: «бягу!»

Крушынскі з зацікаўленасьцю прыглядаецца да змучанага твару рэдактара.

— Калі з барадою можна яму даць сорак пяць гадоў, дык без барады ён выглядаў-бы ня больш за дваццаць пяць,—мяркуе ён у думках.

— Па якой справе, таварыш?—пытаецца голасна рэдактар.

Пры гэтым ён глядзіць на Крушынскага такімі яснымі вачыма, ажна Крушынскаму не па сабе робіцца. Здаецца, рэдактар бачыць яго наскрозь, усе думкі яго знае, дзеля гэтага так крычыць і злуецца.

— Я... я бачыце, таварыш рэдактар, я той самы Язэп Крушынскі, аб якім у вашай газэце надрукавана...

— А-а-а!

Рэдактар устае, моцна паціскае яму руку, і яго шэрыя вочы блішчаць ветласьцю і шчырай дабратою.

— А-а-а! Вельмі рад!—кажа рэдактар і гладзіць бараду.— Такія культурныя гаспадары нам дазарэзу патрэбны, чорт пабяры! А някультурны гаспадар—кацiся каўбасою!

У яго мэталёвым голасе чуюцца мяккія тоны. Ён пяшчотным вокам глядзіць на кніжкі і косы Крушынскага.

— Працуем патроху,—скромна кажа Крушынскі.—Вось хачу выпісаць для суседзяў дзесяць нумароў «Беларускай вёскі» і купіць некалькі экзэмпляраў таго нумару, дзе аба мне надрукавана.

— Справа добрая,—сьмяецца рэдактар.—Гэта можна зрабіць у канторы. Побач!

Рэдактар распытваецца ў Крушынскага аб справах ваколіцы, аб парадках на вёсцы. Потым просіць прабачэньня, што даўжэй ня можа з ім гутарыць, запрашае пісаць у «Вёску» і паказвае, дзе падпісацца на газэту.

Крушынскі заплаціў у канторы за дзесяць падпісак да канца году, даў адрасы пяцёх Драздоў і пяцёх Дзятлаў, дастаў некалькі экзэмпляраў «Беларускай вёскі» з сваім портрэтам і пашоў уніз на вуліцу. Наняў рамізьніка і паехаў на кватэру да стрыечнага брата.

...Розныя рэчы для хаты куплю пасьля абеду,—падумаў ён.

— Пані Мар'я,—зьвярнуўся Крушынскі да жонкі стрыечнага брата,—дзе Іван Мацьвеевіч?

— Іван Мацьвеевіч перадаў вам прывітаньне. Паехаў. Быў раней па нейкіх справах у Наркамземе. Ага! Ён мне нешта гаварыў пра настаўніцу. Вы шукаеце настаўніцу для дзяцей? Даўно пара. Мае дзеці ўжо ходзяць у дзіцячы сад.

— Вам добра, пані Мар'я, тут у горадзе. А вось мне, вясковаму чалавеку, бяда. Сам ніколі сьвету ня бачу і дзеці мае гадуюцца, як дзічкі ў полі.

— Бедненькі!—засьмяялася гаспадыня.—Памятайце, што вясковыя дзеці лепш гадуюцца за гарадзкіх. Яны здаравейшыя. Заўсёды на ўзлоньні прыроды. А цяпер, калі возьмеце да сябе настаўніцу, дык яна толькі імі аднымі займацца будзе. Ня то, што ў нас!

— Вы, пані Мар'я, усім трубіце, што мне лепш жывецца. Але кінем аб гэтым. У вас многа знаёмых. Можа, параіце мне дзяўчыну-настаўніцу?

— Бач ты яго! Канечна дзяўчыну! Але... ведаеце, сваячок, сапраўды ёсьць! Маю такую дзяўчыну, вельмі бедных бацькоў. Скромная, маладая і нават прыгожая. Толькі глядзеце (пані Мар'я строга кіўнула на яго пальцам), каб жонка ваша потым на мяне ня гневалася! Але, можа, раней паабедаем? Мой зараз са службы прыдзе.

— Не. Нядаўна ў горадзе еў. Пойдзем цяпер, калі блізка жыве.

— Блізютка. Зусім блізка. Я даўно знаю гэту сям'ю. Ёй вельмі трудна. Матка—сьляпая. Бацька—вар'ят. У іх дзьве дачкі. Быў у іх сын, дык недзе загінуў.

— З чаго-ж яны жывуць?

— Такое ў іх і жыцьцё. Ёсьць свая хатка, садок. Вось і жывуць. Старэйшая дачка якраз падыйдзе для вас. Калі яе возьмеце за настаўніцу, дык пакінеце некалькі рублёў бацьком на хлеб.

— Гэта можна! Я-ж не такі ўжо скупы.

— Дык мо' зараз пойдзем?

— Калі ваша ласка, пані Мар'я, дык я гатоў.

Яны пашлі. Пакіраваліся ў гарадзкі парк.

Крушынскі ўспомніў гутарку з сваёй жонкай і Іванам Мацьвеевічам аб настаўніцы. Тады былі толькі словы, а цяпер гэта

пераходзіць у рэальнасьць, у зьдзейсьненьне. Нейкая пяшчотнасьць зьявілася ў сэрцы. Дрэвы ў парку, правільныя прысады, сьпевы жаўранкаў нібы гаварылі яму, што вельмі добра жыць на сьвеце. Ён стараўся вызваліцца з-пад гульлівага настрою, які раптам ахапіў яго. Дзеля нейкай настаўніцы зусім не пасуе так радавацца яму—сямейнаму чалавеку, у якога так многа клапатлівых спраў. Успомніў худзенькую, паблеклую жонку і напусьціў на сябе посны, невінаваты выгляд.

— Што-ж вы так задумаліся, мой жвавенькі сваячок?

— Ат, нічога! Ведаеце, столькі клапот у мяне.

— Кіньце клапатаць!

— Калі галава завалена рознымі справамі па гаспадарцы.

У яго сэрцы тымчасам пачало цьвісьці нешта новае, вабнае: «жартачкі, маладая дзяўчына будзе ў Курганішчы...» Гэта няяснае і туманістае адчуваньне вельмі радавала яго.

— Сьвята... сьвята...—сьпявалі птушкі ў парку.

— Радасьць... радасьць...—шорхаў пясок пад нагамі.

Кожную маладую жанчыну, якая праходзіла па дарожцы, ён мерыў вачыма з галавы да ног, узіраўся ў таемнасьць яе вачэй і ўсё меркаваў:

...Ці не такая будзе настаўніца? Ці не падобная да гэтай?

— Заклапочаны сваячок, вочы сапсуеце!

— Кіньце жартаваць, пані Мар'я!

— Ма-а-ро-о-жанае!—пачуўся раптам крык над самым вухам.—Маро-о-о-жанае!

— Ой, спалохалася! Вам, дзядзька Язэп, сапраўды трэба хоць марожаным кроў сваю ахаладзіць. А то пачынаю гарэць і я ад аднэй блізкасьці да вас.

— Нічога. Не згарыцё. Я ўжо астыў. Мне сёлета стукнула сорак год.

— А забыліся, як яшчэ ў мінулым годзе мне мігдалёвыя вочы рабілі?

— Што-ж! Тады мне было ўсяго толькі трыццаць дзевяць. Ён крутнуў па-заліхвацку вусамі і зірнуў ёй у самыя вочы.

— А цяпер глядзіцё на мяне, як-бы вам усяго дзевятнаццаць? Ой мужу скажу!

— Нічога. Свае людзі. А скажэце, родненькая, тая дзяўчына высокая, ці нізкая?

— Самі пабачыце! Ну, ня лезьце! Дам па руках. Ой, дам!

Так, жартуючы, яны мінулі парк, пашлі направа і спыніліся на вуліцы з маленькімі хаткамі.

— Вось тут і будзе!

Пані Мар'я паказала на хатку з садком.

Яны ўзышлі на нізкі ганак. Пані Мар'я стукнула ў дзьверы. За дзьвярыма пачуліся няпэўныя крокі босага чалавека.

— Каго вам трэба?

Голас быў жаласьлівы, разьбіты.

— Гэта я, цёця Вярбіцкая! Адчынеце!

— Няўжо-ж вы, пані Мар'ечка?!

За дзьвярыма цёця Вярбіцкая доўга шорхалася рукою каля клямкі.

Адчыніліся дзьверы.

Высокая старая жанчына стаяла ў дзьвярах і глядзела мутнымі вачыма паўзьверх галоў Крушынскага і сваячніцы. На ёй была парваная вопратка.

— З вамі яшчэ тут нехта, пані Мар'ечка?

— Так. Мой сваяк.

— Заходзьце, прашу вас!

Жанчына асьцярожна павярнулася назад і пашла ў кватэру марудным крокам, трымаючыся аднэй рукой за сьцяну.

Крушынскі з паняй Мар'яй ішлі за ёю. Зайшлі ў першы пакой і спыніліся.

— Бронька! Бронька! сюды! Завядзі гасьцей у залю!— крыкнула жанчына хрыплым голасам.—Выбачайце мяне, пані Мар'ечка, не магу я за вамі ўхажваць. Вы-ж ведаеце, я асьлепла.

— Ня турбуйцеся, цёця Вярбіцкая.

Прыбегла дзяўчынка гадоў чатырнаццаці. У аднэй руцэ яна трымала нож, у другой—бульбу. Дзяўчынка засаромілася, пачырванела, палажыла на стол нож і бульбу, пакланілася гасьцём і павяла іх у другі пакой. Сама зараз-жа выбегла за дзьверы.

Яны асталіся адны ў пакоі. У адным куце стаяў на падлозе ў цабэрку вялікі фікус. У другім—засланы ложак. Сярэдзіну пакою займаў круглы вялікі стол і некалькі крэслаў. Этажэрка з кнігамі—у трэцім куце. Недалёка на жоўтым табурэце—умывальны таз, мыла і зубная шчотка. Старыя абарваныя шпалеры месцамі заклеены газэтамі. Дзе-ні-дзе на сьценах заха-

валіся квадраты шпалераў у сьвежым выглядзе. Гэтыя квадраты яшчэ больш адцянялі запушчанасьць пакою.

Раптам пачуліся з другога пакою крыкі і плач.

— Гэта шалёны Вярбіцкі, стары гаспадар,—шапнула пані Мар'я.

— Няпрыемна тут сядзець,—паморшчыўся Крушынскі,—а дзе-ж тая? настаўніца?

Ён спахмурнеў. Адпаў сьвяточны настрой.

— Пачакайце, зараз вернецца гаспадыня. Во яна ідзе!

Пачуліся крокі.

Пані Мар'я ўскочыла з месца, адчыніла дзьверы, за руку прывяла гаспадыню і пасадзіла да крэсла.

— Дзякую, пані Мар'ечка,—сказала яна ранейшым жаласьлівым голасам.—Вось да чаго дажыла. Госьця павінна за мною, гаспадыняю, ухажваць.

— Нічога, нічога, супакойцеся, цёця Вярбіцкая.

На сьляпой цяпер быў старамодны капот у доўгіх жоўтых палосах, на нагах,—сандалі. Яна прыбралася ў чэсьць гасьцей.

Крушынскі з зацікаўленасьцю глядзеў на сьляпую.

Хоць вочы сьляпыя, але ўвесь твар здаецца зрачым. Мускулы твару вельмі рухлівыя, чулыя і кожную хвіліну мяняюць выраз. Кожная зморшчка на лобе і шчоках сьляпой трапечацца, намацвае паветра вакол. Высунутая наперад завостраная барада таксама ходзіць туды і сюды, як на спружынах. На зямліста-шэрых шчоках многа выемак і пукатасьцяй. Тонкія ноздры дрыжаць, як лісткі. Сьляпая нюхам стараецца намацваць пакой, ці ўсё ў парадку.

— Што, пані Мар'ечка, скажаце? Не дарма-ж прышлі.

Пры гутарцы яна выстаўляе тры пажоўклыя клыкі. Рэдкія сівыя валасы дрыжаць над яе ілбом.

— Бачыце, цёця Вярбіцкая, майму сваяку, Язэпу Крушынскаму, патрэбна настаўніца для дзяцей. Вось мы з ім і зайшлі да вас. Думаю, што ваша Стэфка якраз падыйдзе.

— Дзякую, дзякую, пані Мар'ечка, што нас не забываеце. Бронька! Бронька!!

Яна крыкнула такім голасам, нібы яе зьбіраліся рэзаць. Шырока адчыненыя сьляпыя вочы глядзелі ў аблуплены суфіт.

Прыбегла Бронька зноў з нажом і бульбай у руках.

— Хутчэй, дачушка, зьбегай да Мансецкіх. Стэфка, пэўна, там сядзіць. Хуценька!

Цяпер у яе голасе чулася кволасьць і літасьцівасьць.

— Вось, як бачыце,—зьвярнулася яна да гасьцей, ня здымаючы вачэй з суфіту,—пусты пакой. Тры гады таму назад піяніна прадала, абразы са сьцен. Патрохі ўсю мэблю аддала на хлеб. Прадала-б і фікус, дык ахвотнікаў няма. Сын мой, Саўка, ведаеце, прапаў. Стэфка нядаўна школу скончыла. Ёй усяго семнаццаты год. Вось так і жывём. Нядаўна зноў новы кватарант зьявіўся. Вось у гэтым пакоі жыве. Доўга тут ня ўжываюцца яны. Уцякаюць. Год таму назад выцягнула з рота свае залатыя зубы—таксама на хлеб. Прышлося, як кажуць, зубы на паліцу пакласьці.

За сьцяною пачуліся крыкі.

Во. Чуеце? Зноў ён, вар'ят мой. Людзкую гутарку пачуў. Сюды хоча. Праз яго і кватаранты ўцякаюць. Вы ня бойцеся, ён спакойны. У шпіталь не бяруць. Франак! сюды ідзі! Без дазволу ня пойдзе. Баязьлівы.

Праз хвіліну ціханька, бокам усунуўся ў пакой стары, ускалмачаны чалавечак. Нізенькі, са стрыжанай бародкай. Ён палахліва азірнуўся на гасьцей і кіўнуў худым пальцам.

— Ша, Франак, маўчы!—сказаў ён сам сабе, усьміхнуўся і з шчырым дзівам наставіў на гасьцей чорныя прыпухлыя вочы. Ён прыпёрся да сьцяны і давай радасна мурлыкаць.

— Ціха, Франак!—крыкнула сьляпая.

Ён задрыжэў ад страху і змоўк. Смутак быў у яго вачох.

— Пані Мар'ечка. Тут у горадзе будзе Стэфка дзяцей вучыць?—запытала сьляпая.

— Не, цёця Вярбіцкая, на хутары. Трыццаць пяць вёрст адгэтуль. Ня бойцеся. Яна будзе ў добрых людзей.

— Ну, няхай, пані Мар'ечка,—махнула яна абедзьвюма рукамі,—можа, хоць дачка лепш зажыве.

Раптам сьляпая наставіла вушы ў бок вуліцы і давай прыслухоўвацца. Сонца сьвяціла ёй у мутна-белыя вочы.

— Стэфка ідзе!—сказала яна ўзрадаваным голасам.—Яе крокі! Крокі сваіх дзяцей заўсёды пазнаю. Няхай сотні людзей тупаюцца на тротуары. Стукат ног маіх дзяцей інакшы, чым у іншых.

Сьляпая нецярпліва нюхала паветра.

Скрыпнулі дзьверы, і ў пярэднім пакоі зазьвінеў вясёлы, малады сьмех.

— Сьмяшок зусім не падыходзіць да гэтай абстаноўкі,—падумаў Крушынскі і адчуў адразу няпрыязьнь да дзяўчыны, хоць яшчэ яе ня бачыў.

Увайшла Стэфка.

Яна ішла павольна, ледзь рухаючы нагамі, а здавалася, што танцуе. Ва ўсім яе лёгкім і зграбным целе адчуваўся захаваны імпэт да скокаў.

— Добры дзень, пані Мар'я!—сказала яна варкатлівым, грудным голасам.

Яна прывіталася з паняй Мар'яй і ўскінула вочы на Крушынскага.

— Знаёмцеся! Гэта стрыечны брат майго мужа. Таксама Крушынскі. Чорт насеяў Крушынскіх. Іх усюды поўна!

Пані Мар'я засьмяялася.

Стэфка з чуць прыкметнай усьмешкай у кутках тонкіх губ пакланілася Крушынскаму.

— Ведаеш, Стэфачка,—зьвярнулася да яе матка:—пан Крушынскі пытаецца, ці не паедзеш настаўніцай да яго маленькіх дзетак.

— Ня ведаю,—адказала Стэфка і скасіла на Крушынскага лагодныя вочы.

— Падумайце, Стэфка,—сказала пані Мар'я.—Будзеце жыць на хутары, трыццаць пяць вёрст адгэтуль. Дзядзька Крушынскі бывае тут вельмі часта. Калі захочаце, дык час-ад-часу да бацькоў у госьці будзеце прыяжджаць.

Стэфка маўчала.

Крушынскі няпрыкметна аглядаў яе. Сярэдняга росту, тоненькая. Чорная каса, чорныя броўкі і вочы, вельмі зграбныя. Тварам падобна і да бацькі, і да маткі. Але яны брыдкія, а яна—вельмі прыгожая.

— Што вы на гэта скажаце, таварышка Вярбіцкая?—зьвярнуўся ён да Стэфкі.

— Сама ня ведаю,—шапнула яна. Утупіла вочы ў падлогу і круціла нецярпліва тоненькімі высокімі абсацамі.

— Аб плаце гаварыць ня станем. Сыйдземся,—засьмяяўся Крушынскі.—Будзеце жыць, як у роднай сям'і. Трэба з дзецьмі

трохі гуляць, вучыць іх чытаць і пісаць. Нудна вам ня будзе ў нас, у Курганішчы.

— Калі трэба ехаць?—запыталася яна дзелавым тонам і зірнула на Крушынскага чорнымі, як атрамант, вачыма. Яе вейкі дрыжэлі.

— Заўтра раніцою. Мне трэба сягоньня рабіць розныя пакупкі для дому. Жонка дала цэлы запіс.

— Я згодна! Рыхтуюся ў дарогу!

— У яе надзвычайна белая шыйка...—падумаў Крушынскі.

XVI

Жонка Цыпрука Ярэмчыка пачала злавацца на мужа:

— Самы гарачы час працы, а няма старога! Завойкаў на зубы і прапаў! Каб ён запрапасьціўся, каб ён!.. Каб мае вочы яго болей ня бачылі! Каб ён навекі-вечныя не вярнуўся дахаты!

Першыя тры дні старая лаяла і кляла Цыпрука з шчырым абурэньнем, ад усяго сэрца. Яе лаянкі і кляцьба чуваць былі па ўсёй вёсцы—аддаваліся рэхамі ад гумна да гумна і плылі ўдаль дарогі, куды стары пехатою пасунуўся зубы лячыць з торбачкай за плячыма, з бярозавым кійком у руках.

— Уцёк ад работы стары абібок! Уцёк на ўзьвей-вецер, каб ад яго ўсе добрыя людзі паўцякалі!

Словы ліліся роўненька, адно за адным. Нібы Цыпручыха з кнігі чытала. Яе зычны голас чуваць быў на вярсту навокал.

Суседзі сьмяяліся з яе, жартавалі, казалі, што Цыпрук ад яе ўцёк, што прыдбаў сабе недзе іншую жонку, маладую.

Некаторыя пацяшалі яе:

— Чалавек ня голка—знойдзецца.

Але старая аж кіпела ад злосьці:

— Зубкі лячыць пашоў стары хрэн, каб яны ў яго павысыпаліся, як гарох з сухіх струкоў, дай божанька!

На чацьверты дзень яна ўсё-ж перастала лаяць мужа. Шчырае занепакоеньне пракралася ў душу:

— У яго-ж ні капейкі няма з сабою, а харчоў узяў усяго на два дні. Людцы міленькія, што магло з ім здарыцца?

Яна часта спыняла работу, выбягала на выган і чакала на дарозе. Пільна ўглядалася ў даль: мо' дзе пабачыць. У суседзяў пыталася, мо' чулі нешта аб ім і казаць ня хочуць.

Як угледзіць здалёк чалавека пехатою, або фурманку, ідзе насустрач:

— Можа гэта Цыпрук? Можа едзе з кім?

Часам у хаце, калі нехта з двара цокне жалезнай клямкай ад дзьвярэй, старая ўздрыгвала:

— Ці ня ён?

А Цыпрука няма ды няма.

Ужо і вясковыя пачалі непакоіцца аб сваім суседзе, ківалі галовамі, розныя рады радзілі і па-рознаму меркавалі.

— Ці не захварэў ён часам? Не маглі-ж забіць чалавека; у яго-ж капейкі ня было пры душы...

Ня гледзячы на вялікую працу ў хаце, у Цыпручыхі рукі апускаліся. Адно толькі лезла ў галаву:

— Дзе ён дзеўся? Што з ім сталася?

А ў хаце і на полі праца ня ішла так, як пры Цыпруку.

— Стары ўжо сам мала працаваў апошнія гады,—скардзілася суседзям Цыпручыха,—але яго гаспадарчае вока ўсюды дагледзіць, дапільнуе. Нібы дваццаць вачэй у чалавека. Скажа пару слоў—і лепш чым хто з маладых цэлы дзень працуе... «Маці!», бывала, крыкне на мяне, «Маці! трэба брацца за сенакос. Трэба тое і сёе рабіць».—І ўсё рабілася, усё ішло гладка. Вось як-бы хто на скрыпцы грае...

Цыпручыха пачала адчуваць, што не хапае ёй слова «маці». За сорак гадоў жыцьця з Цыпруком яна чула гэтае слова дзень-у-дзень мо' па сорак разоў: «маці» і «маці».

Спачатку слова «маці» чуваць было з моцных, маладых грудзей Цыпрука са сьпеўнымі, вясёлымі зыкамі. Яна не заўважыла, як за доўгія гады жыцьця голас у мужа мяняўся і ў апошні час быў падобны да хрыплага, разьбітага звону.

Слова «маці» напісала ў сэрцы старой доўгі, аднастайны, як дарога пры вёсцы, ход жыцьця. Яе вушы моцна прывыклі да гэтага слова.

Ня гледзячы на тое, што старая ўжо трохі не дачула, досыць было, каб Цыпрук ледзь шапнуў «маці»,—і яна зараз-жа адклікалася прывычным словам:

— Га?

На пяты дзень старая пачала лаяць сама сябе за тыя лаянкі, якія толькі-што сыпала на мужа.

— Нездармо яго няма. Бедненькі мой, гаротненькі, любенькі...

За невялічкай вёскай каля выгану быў самы высокі пункт ваколіцы. Сяляне называлі гэта месца «Гарадком». Ён быў акопаны чуць ня ў правільны круг і ахоплены глыбокім ровам. Дзе-ні-дзе ў рове стаяла вада, рос аер і чарот. Толькі з усходняга боку можна было ўзьлезьці на Гарадок. Тут роў выглядаў перасечаным вялізным пярсьцёнкам. Зямля тут была накідана ў выглядзе землянога мосту.

На Гарадку растуць таўшчэзныя дубы—мо' па дзьвесьці гадоў. Тут і шнуры аўса буяюць пад дубамі. Людзі, якія аруць Гарадок, кажуць, што зямля вельмі рыхлая, насыпаная і да грунту нельга дабрацца.

Цыпручыха ведае многа казак аб паходжаньні Гарадка.

Паводле аднае казкі, тут даўней жыў багаты князь, які вельмі людзей мучыў. Ваўкі напалі на яго і загрызьлі, а вецер-гураган зьнёс адгэтуль палацы. Паводле другой—тут калісь жыў цмок-людаед. Паводле трэцяй—быў кляштар.

Болей чатырох дзесяткаў год таму назад дзявочыя вясьнянкі Цыпручыхі плылі з Гарадка на ўсю ваколіцу.

Лоўка было сьпяваць на гэтым высокім месцы. Голас быў званчэйшы і ярчэйшы, чым унізе. Адгэтуль песьні гучна сыпаліся ўніз, на саламяныя стрэхі вёскі, каціліся ўшыр і ўдаль.

З узвышкі Гарадка Цыпручыха аглядала цяпер ваколіцу. Як дазорца, яна пазірала ва ўсе чатыры бакі ў розныя поры доўгага летняга дня. Яна мацала ваколіцу старымі вачыма, каб сустрэць у летняй жаўранкавай далячыні маленькую кропку...

... Можа адгэтуль скарэй угледжу яго...

... Няма ды няма...

Калісьці румяны і моцны Цыпрук падобен цяпер да абгрызанай качарэжкі, да карча, што астаўся ад паломанай навальніцай бярозы. Але старой кабеціне ён—цяперашні дзядок—куды мілей і даражэй за ранейшага...

Ад злосьці і лаянак Цыпручыха перайшла да шчырага смутку-тугі, да пяшчотных і жаласьлівых слоў. Нешта смактала грудзі, душыла ў горле, сьлёзы сьляпілі вочы. Па змаршчынках твару сьлёзы каціліся ўніз ручайкамі, лезьлі ў рот салонымі вільготнымі камарамі.

... Яго няма ды няма...

І тут, водаль ад хатніх клапот, ад дзяцей і ўнукаў, сама-самюткая, паглядала яна ва ўсе бакі. Вочы выглядзела.

З кнігі чытае?

Сумную казку ўнукам гавора?

Кажа замову ў бок балота і лесу?

«М'ейца-сына» на свой няпісьменьніцкі лад перакручвае?

Яна сама ня ведае. Мо' ўласных слоў ня чуе.

Так, бывае, аер пад ветрам шапоча над рэчкай, калі сьцяблы чароту будзяць адзін аднаго. Так, бывае, дзікая качка крыльлем лапоча, калі шолах няпэўны пачуе спаміж альхоўніку з берагу возера.

Цыпручыха заводзіць:

— На каго-ж ты мяне, згорбленую бабульку, пакідаеш?

— Завошта загневаўся ты на мяне?

— Ці-ж я цябе ня слухалася? Ці-ж я за табою не глядзела?

— А хто словам «маці» будзе мяне клікаць-зваць?

— Вецер буйны костачкі твае расьсеяў-разьвеяў па дарогах і дарожаньках...

Галошаньне плыло ўніз, у бакі, рэчкай разьлівалася.

Занепакоіліся і суседзі. Паведамілі ў сельсавет, што Цыпрук Ярэмчык прапаў. Заварушылася міліцыя. Міліцыянэр Цішка Каборда, вядомы па ўсёй ваколіцы вялікім спрытам выкрываць самагоншчыкаў, меў свой погляд на гэту справу:

— Недзе ў знаёмых п'янствуе таварыш Цыпрук Ярэмчык!

Каборда кпліва зірнуў на людзей, адмахнуўся ад іх рукою, нібы ад надакучлівых мух.

Сяляне пачалі налягаць:

— Ты, Каборда таварыш, павінен!

— Ты—прадстаўнік улады!

Тады міліцыянэр пачаў энэргічна выціраць вечна ўспацелы лоб, углыбіўся сам у сябе і давай спацыраваць па хаце ад стала да дзьвярэй і ад дзьвярэй да стала. Можна было падумаць, што ён для чагосьці мерае, колькі крокаў удоўжкі мае хата.

Раптам ён спыніўся сярод хаты, прыняў позу Шарлока-Холмса, абвёў сялян вострымі вачыма і рашуча сеў за стол. Выняў з замыцганага брэзэнтовага портфэля аловак, аркуш паперы і махнуў пальцам да Цыпручыхі.

Яна падышла да стала.

З вуснаў Каборды пасыпаліся на старую жмуты запытаньняў:

— Калі Цыпрук пашоў?

— Куды пашоў?

— З якою мэтаю?

— Ці меў пры сабе грошы?

— Колькі яму гадоў?

— Колькі членаў сям'і?

І гэтак далей, і гэтак далей, і гэтак далей.

Старая адказвала. Часта блыталася і выцірала рукавом сьлёзы з вачэй.

З каменным выразам на твары, з бесстароньняй строгасьцю да ўсяго, што робіцца вакол, Каборда чуць не стэнографічна запісваў яе адказы.

Адсопся, падазрона азірнуўся навокал і нейкім іншакшым, чым раней, голасам запытаўся:

— А ці няма ў таварыша Ярэмчыка ворагаў сярод суседзяй, у вакольных вёсках? Можа хто мае на яго якую злосьць?

— Хто-ж яго ведае,—лемантавала старая.—Здаецца, з людзьмі палюдзку жывем. Мы нікога не чапаем—і нас ніхто ня крыўдзіць.

Хтосьці з сялян падсунуў міліцыянэру махорку.

— Дзякуем! Мы свой тутун курым!

Выняў махорку з кішэні і скруціў папяроску.

— Аднак, прыпомні, бабуля!—не адставаў ён, прыкурваючы ў селяніна.—Можа твой з кім за сенакос пасварыўся, за пашу, ці мала за што? Можа пабіўся з кім, падвыпіўшы? Можа на каго данос падаў?

Старая задумалася.

Яна пачала перабіраць у памяці ўсіх суседзяй. Давай успамінаць ранейшыя гады, апошнія, нядаўнюю вясну. Яна старалася вылоўліваць з жыцьця Цыпрука такія ўчынкі, за якія людзі на яго злаваліся-б, за якія яны былі-б на яго так варожа настроены, што пры выпадку маглі і забіць.

Каборда глядзеў ёй у самы рот. Завастрыў ступлены аловак і наставіў яго на паперу.

Каборда цярпліва чакаў.

Цяжка было Цыпручысе.

У гэтыя хвіліны, калі адна толькі жаласьць жыла ў яе сэрцы да старога, калі толькі яго прыязныя ўчынкі да людзей выплывалі ў яе памяці,—яна павінна была зрабіцца над мужам строгім судзьдзёю. Ёй трэба цяпер шукаць такіх яго ўчынкаў, за якія хтосьці мог-бы памсьціцца на дарозе...

Старая глыбока задумалася. Глядзела на міліцыянэра і ня бачыла яго. Яе вусны шапталі:

— Каб чалавек хварэў у хаце, каб сканаў тут, як усе добрыя людзі канаюць, дык што-ж бы я гаварыла! А то і нямаведама як па ім хаўтуры ладзіць...

Каборда пачаў выходзіць з роўнавагі:

— Ты, бабуля, толкам гавары, адказвай на запытаньні! А то кажаш ліха ведае што!

— Ня знаю,—бянтэжылася старая,—мала ёсьць благіх людзей на сьвеце?

— Скажы, хто з суседзяй мае злосьць на твайго старога?— не адставаў міліцыянэр.

Ён скінуў шапку з успацелай галавы і выцер лоб рукавом.

Старая пачала пытацца ў міліцыянэра:

— А мо' Хведар з Качалёў? Бо анэгды Цыпрук забраў у хлеў яго каня з нашай канюшыны. Ці Мікіта Сьвістун? Нам прырэзалі кавалак яго зямлі.

Яна бачыла цяпер паратунак толькі ў тым, каб знайсьці чалавека, моцна пакрыўджанага Цыпруком.

Міліцыянэр запісваў.

Шастаньне алоўка па паперы надало старой бадзёрасьці і ўпэўненасьці ў тым, што ў Цыпрука многа злосьнікаў:

— Ды мала іх, гэтых благіх людзей? Мікола Качарэжка казаў, што сякерай майго засячэ за мяжу. Вечныя сваркі ў іх за кавалак мяжы на расьцяробе.

Міліцыянэр запісваў.

— Добра! Мы расьсьледуем!

Ён прабег вачыма сьпісаны аркуш паперы і палажыў у партфэль.

— Як-жа мне хаўтуры ладзіць па мужу, калі на'т ня ведаю, дзе костачкі яго падзеліся?—зноў запыталася старая ў міліцыянэра.

Ён пацiснуў плячыма, яшчэ шчырэй выцер пот на ілбу і надзеў шапку.

На сёмы дзень Цыпрук вярнуўся дахаты. Ён быў змучаны, памізарнелы і пастарэў за тыдзень на дзесяць год.

Старая ні то спалохалася, ні то ўзрадавалася. Нічога не сказала, успляснула далонямі.

— Тата прышоў! Дзед вярнуўся!—загаварылі хатнія.

— Маці... Ня злуйся, ці што?—прамармытаў стары.

Ён аглядаў хатніх і ўсе куткі хаты такімі вачыма, нібы ня быў тут дзесяць год.

Зьбегліся суседзі.

— Дзе быў, Цыпрук? Мы-ж і міліцыю на ногі падняслі.

— Я? я... з дарогі...—прашаптаў ён саромліва. Потым павага засьвяцілася ў яго вачох і ён дадаў:

— Я? я з Менску...

— З Менску?!

— А так...

— Ну, і вандраваў! Ну, і вандраваў!—ламала рукі жонка.— Гэта-ж трэба ведаць! У такі гарачы час працы!

Яна зложыла рукі на грудзёх, апусьціла галаву і з-пад лобу глядзела на мужа поўхвіліны. Да яе зараз-жа вярнулася ўся ранейшая на яго злосьць. Пасыпалася навальніца рознастайных лаянак...

— Маці... Ня злуй, ці што? Я зусім аслаб. Век памятаць буду гэту праклятую дарогу...

У яго голасе, стомленым і спакойным, чулася нешта такое паважнае, ажна жонка адразу сьціхла, і ўсе ў хаце пільней вушы наставілі.

Цыпрук зірнуў на жонку з нявыразнай мінай і цяжка было ўцяміць, хто перад кім вінаваты.

— Дай, маці, есьці, ці што? Я цэлы тыдзень галадаў...

Старая нічога не сказала, паставіла на стол міску крупніку, падсунула акраец хлеба і села на лаву.

Цыпрук шчыра прырваўся да яды, гучна сёрбаў, часта аглядаўся на дрыўляную лыжку, аблізваў яе, ківаў галавою і дзівіўся:

— Як жыву, маці, такога смачнага крупніку ня еў...

З кожнай новай лыжкай крупніку ён весялеў, і як-бы пачала варочацца назад яго ранейшая сіла.

— Раскажы, дзе ты швэндаўся?—зноў запыталася старая.

Цыпрук глядзеў на ўсіх з вясёлай усьмешкай і маўчаў.

У гэты час ён прыдумваў форму—як расказаць гісторыю свае падарожы.

— Я-ж вочы свае выплакала, ліха на цябе! Было каго шкадаваць! Раскажы-ж! Што ты, анямеў?

— Пачакай, маці, ці што? Я зараз...

Ён узяўся рукой за лоб, падняўся з месца і зноў сеў.

— Памятаеш, маці, як я войкаў?

— А як-жа, у цябе зубы балелі, каб іх...

— Вось з гэтага і пашло, і пашло, і пашло... Я пусьціўся да шаптуна. Там, на ліха, яны, зубы, балець ператалі,—і шаптун мяне прагнаў.

— Добра зрабіў!

— Пачакай, маці, ці што? Я пераначаваў у аднаго чалавека і пашоў дамоў. На дарозе мне пашанцавала—я знайшоў кавалак сукна.

— Дзе твая торба?—усхапілася старая.

— Вось, думаю, прынясу дахаты... Ажна тут накруціліся чырвонаармейцы—конныя. Лоўкія хлопцы такія, сьмяяліся, жартавалі, яй-права! Мы пагаварылі і я сабе пашоў далей. Не агледзеўся я—і сукна няма—згубіў знаходачку...

— Як?! Згубіў?—старая ўскочыла з месца.—Вось дурны! Гэта-ж у хаце прыгадзілася-б! Асталопіна ты!

— Маўчы, маці! Дай гаварыць, ці што? Чырвонаармейцы знайшлі сукно і мяне затрымалі. Хто ты?—пытаюцца, і дзе кортрабанду дастаў? Гэта, кажу, сукно, а не кортрабанда. Ну, яны мяне і арыштавалі. Патрымалі ў сваім кардоне, а потым пагналі ў Менск. Распыталі там, хто я, што—і выпусьцілі на волю. Казалі—суд будзе. Прыдзецца плаціць пяцьдзесят рублёў штрафу або на казённым хлебе пасядзець. Мяркую адну карову прадаць, ці што?

— Вось і знаходка!—Цыпручыха заламала рукі.—Тады адзін войкаў, а цяпер усе войкаць будзем.

— Няхай цяпер хоць куча золата ляжыць на дарозе,—апраўдваўся стары,—яй-права, маці, ня буду чапаць!

— Дурны, як бот!

— Да позьняй ночы Цыпрук мусіў пераказваць суседзям сваю прыгоду. З кожным разам ён апавядаў усё болей падрабязна. Першы кароткі конспэкт вырас за дзень у вялікую, цікавую аповесьць.

— Можа пакунак з сукном згубіў той аграном, або другі чалавек—з Курганішча?—пыталіся людзі.

— Дзе там! Вазок іхны такі шчыльны, што і шпілька з яго ня вылезе.

— Чаго добрага, наўмысьне выкінулі контрабанду, як убачылі чырвонаармейцаў?

— Што яны дурныя, ці што? Такое дабро будзе чалавек кідаць на дарогу!

У той-жа дзень вярнуўся з Менску і сын Цыпрука—рабфакавец Мікола. Ён ехаў чыгункай з Ленінграду аж да Менску.

Даведаўшыся аб такім сямейным няшчасьці, ён моцна злаваўся, прабіраў бацьку на чым сьвет стаіць.

— І трэба-ж было табе да шаптуна цягацца! Вось і нашаптаў!

— А праўда, сынку, кажаш!—ажна ўзрадаваўся Цыпрук, што вікавайца знайшоўся.—Гэта ён на мяне нашаптаў. Ён такі злосны...

— Як вам, тата, ня сорамна такое глупства казаць! Вось і ўлезьлі ў бяду! Цяпер будзе на нас вялікая ганьба, нібы мы контрабандай займаемся.

Сын Цыпрука вельмі хваляваўся.

— Жартачкі, такі паклёп узьвялі. Каля граніцы проста жыць нельга чэснаму грамадзяніну. Калі сам у балота не палезеш, дык людзі цябе пацягнуць.

— Хто тут займаецца контрабандай у нашай ваколіцы?—запытаўся ён у суседзяў.

— А паляруш іх ведае! Ці мала правозіцца контрабанды па ўсіх сабачых сьцежках нашай ваколіцы! Ці мала народу па турмах за гэта сядзіць!

— Добра! Я дасьледую справу майго бацькі. Знайду вінаватых! Труціць трэба гэтых агідных рабакоў!

Вочы ў яго гарэлі ад злосьці і крыўды.

XVII

Іх дзесяць—пяць Драздоў і пяць Дзятлаў. Палавіна нізкіх і бялявых. Палавіна высокіх і чарнявых. Яны ў адзін і той самы час адзначаны асаблівым знакам. Зьдзіўленьне і здаволенасьць зьмешваецца ў іх у адно пачуцьцё: высока ставіць

кожнага ў сваіх уласных вачох. Гэтыя дзьве пяцёркі таксама ў аднолькавай меры прыязьні і пашаны адносяцца да Крушынскага. Ён іх вызначыў з усяе грамады вёскі. У абедзьвюх пяцёрак аднолькавы настрой. Нібы ў іх адно і тое самае імя; нібы ў адзін дзень, у адным месцы ладзяць імяніны.

Крушынскі прывёз з Менску дзесяць новых кос. Аддаў сваім касцом—пяці Драздом і пяці Дзятлам. Ён ім гэта абяцаў надоечы на сенакосе. Назаўтра гэтыя-ж дзесяць чалавек (яны былі няпісьменныя) атрымалі яшчэ па два нумары газэты «Беларуская вёска».

Кожны з іх зьдзівіўся:

— Скуль?

— Хто?

— Чаму?

— Якім чынам?

У некаторых былі хлапчукі, якія вучыліся ў школе. Сынкі хоць па складох, але чыталі. Кожны з гэтых падпішчыкаў «Беларускае вёскі», які звычайна ўжываў газэты на цыгаркі, стараўся даведацца, што ў газэце напісана:

— Як-жа іначай? Гэта-ж мне прыслана! Нават адрас друкаваны...

Ужо праз колькі дзён пазьней яны даведаліся, што газэты выпісаў для іх таксама Крушынскі.

Суседзі глядзелі няпрыязна на гэты дзесятак:

— За што гэтым, а ня іншым?

— Ці ня ўсе роўныя суседзі?

Зайздрасьць суседзяй злучала ў адно дзесяць адзначаных вялікай увагай Крушынскага. Само сабою вышла, што яны некалькі разоў зьбіраліся разам у аднэй хаце, каб абгаварыць сваю справу. Непаразуменьняў між імі ня было, паколькі косы і газэты ў кожнага з іх аднолькавыя—ня горшыя і ня лепшыя. Косы ня раз выпрабоўвалі рознымі спосабамі:

— Як адна каса!

— Газэты?

— Тыя самыя навіны! Проста няма за што пасварыцца паміж сабою...

За гэта самае, яны часам нездаволена пазіралі адзін на аднаго... І дзесяць чалавек былі злучаны ў адно—у невялікі ко-

лектыў імя Крушынскага... Яго вылучэнцы. Іх непакоіла адно пытаньне:

— Дарма нічога не даецца.

— Трэба чым колечы адслужыць.

— Крушынскі падмазваецца пад нас.

У гэтых людзей зьявілася да Крушынскага падвойнае адчуваньне, супроцьлеглае. Прыязнае за тое, што праз меру добра да іх адносіцца. Няпрыязнае—за клопаты, якія маюць цяпер у сувязі з падарункамі.

— «За дзякуй не адбыць—трэба заплаціць».

Колектыў імя Крушынскага пастанавіў адпрацаваць у Курганішчы: бабы будуць па два дні жаць.

Хоць Крушынскі ўжо каля двух гадоў ад сакратарства ў сельсавеце адмовіўся (ня было часу гэтым займацца), але і цяпер быў тут першай і самай паважанай асобай. Ні разу выбары не адбываліся без яго кіраўніцтва. Заставаліся ў сельсавеце заўсёды тыя самыя людзі, якіх ён намеціў з самага пачатку, старшынёю—Дрозд, сакратаром—Дзяцел.

Пісьменнасьці яны навучыліся трохі ў войску, а пасьля, у бытнасьці Крушынскага сакратаром у сельсавеце, ён іх сам вучыў, падрыхтоўваў сабе «чырвоную зьмену». Кожны раз, у вольныя часы, у памяшканьні сельсавету Крушынскі займаўся з сваімі «вучнямі». Ён праходзіў з імі вучобу практычна з самага пачатку. Вучыў іх пісаць заявы, протоколы, даклады, а галоўнае, стараўся ўбіваць ім у галавы «матэматыку».

— Лічбы—гэта ўсё,—гаварыў ён часта сваім стараным вучням.—Калі лічбы ў галаве арудуюць спрытна, перасоўваюцца разумна з месца на месца, як салдаты на фронце пад наглядам добрага камандзіра, тады ўсё добра. Уся наша дзяржава жыве на лічбах. Калі добра ведаеш, што ў цябе ёсьць, тады цяміш, чаго ў цябе яшчэ не хапае. А калі ведаеш, чаго не хапае, дык будзь пэўны, гэты недахоп папоўніцца ў некалькі разоў. Усюды лічбы пануюць. Я сам, каб стаць чалавекам, практыкаваўся ў лічбах.

Вучні рабілі вялікія посьпехі.

І тады толькі Крушынскі кінуў сельсавет, калі ўпэўніўся, што «вучні» самі справяцца.

— Я перадаў сельсавет у добрыя рукі!—ганарыўся ён часта перад Драздамі і Дзятламі.

Ён быў пэўны, што іншых, каб і хацелі, ня выбралі-б, бо пісьменных бадай ня было.

І старшыня, і сакратар сельсавету былі «Крушынскімі», толькі ў меншым памеры. Розныя савецкія кампаніі, падаткі і іншае праводзіліся акуратна, упору. Сельсавет карыстаўся славай аднаго з лепшых у ваколіцы.

Кожны раз, калі трэба было праводзіць якую-небудзь новую кампанію, сельсаветчыкі радзіліся з Крушынскім. У яго быў у гэтых выпадках адзін мэтод: як найбольш шуму рабіць вакол кожнай новай справы, каб аб гэтым многа гаварылася, каб у газэтах пісалі.

... Створаная раз назаўсёды слава разыходзіцца і разростаецца ўсё больш і больш. Яна нялёгка спыняецца і, як разгарачаны конь, галёпам скача наперад.

Такую думку ў розных варыянтах і разгалінаваньнях убіваў Крушынскі ў мазгі сельсаветчыкаў цьвікамі сваёй лёгікі.

— Што будуць казаць пасьля—нас цяпер цікавіць не павінна. На тое рэволюцыя, каб зараз-жа гарачымі словамі захапіць грамаду ў свае рукі. Мы будзем старацца, каб наш сельсавет зрабіўся багатым, каб у нас ня было бедных. Гэтым мы прынясем самую большую карысьць рэспубліцы.

Так праводзіліся кожны раз рэволюцыйныя сьвяты, у такіх настроях працавала школа, зорганізаваўся коопэратыў. Усё рабілася пры гарачых прамовах Крушынскага пад лёзунгам:

«Мы павінны багацець».

Калі трэба было праводзіць антырэлігійную пропаганду, Крушынскі знайшоў свой уласны орыгінальны спосаб. Пачаў пропагандаваць само духавенства супроць рэлігіі.

Ён разважаў так:

— Адрэж галаву, тады ўсё цела апруцянее. Перавабім пастуха, тады і стада ён пагоніць у наш хлеў.

Гэта было ў мінулую зіму перад калядамі. Быў зімовы вечар. Падаў пухкі лапцяваты сьнег. Ён лунаў у паветры белымі матылькамі. Крушынскі надзеў кароткі кажушок. Вышаў на дзядзінец. Сам запрог каня ў санкі—і паехаў за пяць вёрст ад Курганішча ў вёску Глухаўку. Там жыў айцец Дзімітры.

Пад нагамі сыпчаты сьнег. Ня чуваць, як сані сунуцца па дарозе. Тупат конскіх капытоў глушыцца ў белай мякаці. Сьнег зьверху зараз-жа замятае сьляды.

Сьпераду і ззаду—новая бялёная зямля, па якой яшчэ ніхто ня езьдзіў, не хадзіў. Санкі з канём, з чалавекам вырасьлі на гэтым месцы з зямлі, нарадзіліся тут: белыя, у сьнежным пуху.

У Крушынскага на душы вялікі супакой. Ні сьцебануць каня, ні нават лейцы падцягнуць ня хочацца. Ён сядзіць на санках, трохі зажмурыўшы вочы і, каб хмызьнячкі і хвоі ня сунуліся насустрэч, як дзівосныя здані, падумаў-бы, што знаходзіцца на адным месцы... Хвілінамі і думкі ў яго супыняюцца. Тады ён ня ведае, куды і дзеля якой мэты едзе. Нават забываецца—адкуль ён, хто, і як завуць яго...

А сьнег нізіцца з бяздоньня неба лёгкімі пушынкамі. Хтосьці ўверсе скубе белых лебедзяў і пыліць уніз пер'е. Яно сыплецца, лезе ў вочы, у рот.

Крушынскі смакуе на губах і вачох ледзь прыкметную вільгаць сьнежных краплінак. Увесь аддаецца пяшчотам зімовага вечара. Ня рухае ні рукой, ні нагой, пазірае на мутнаватую бель перад сабою, глядзіць спаміж шчылінак ледзь не заплюснутых на сон вачэй. Адчувае на твары ў зморшчынах каля губ і вачэй застыглую ўсьмешку. Твар траціць звычайную напружанасьць—мякчэе.

У гэтыя хвіліны думак ніякіх няма. Толькі няясныя адчуваньні лезуць на ўзьверх, выклікаюць нібы спрасоньня, урыўкі думак і абразкоў. Спачатку абразкі мільгаюцца, зьліваюцца ў бялявы туман. Потым пераходзяць у слых, у шолахі. Лезуць у вушы здалёк ціхія гукі. Нехта над ім квола і пяшчотна сьпявае і стогне:

А-а, а-а, а-а-а...
А-а, а-а, а-а-а...

Гукі прымаюць афарбоўку рытмічнасьці, уваходзяць у цэльнасьць мілагучнай гамы.

— Гэта-ж калыхальная песьня:

А-а, а-а, а-а-а...
А-а, а-а, а-а-а...

Крушынскі ківаецца ў санках з боку на бок, як у калысцы...

— Вось і словы да гэтай песьні:

А-а, а-а, мой каток.
Ехаў коцік на таржок.

— Жонка так уночы сьпявае над калыскай маленькай дачушкі.

Ён усьміхаецца:

... Калісьці маці і мне гэта самае сьпявала...

З-пад вэлюму сьняжынак перад вачыма Крушынскага вырысоўваецца постаць кабеты. Ён бачыць яе ўсю, з галавы да ног. Яна—журботная, пакрыўджаная, стомленая, хворая, няпрыгожая. А вабіць да сябе, як надзвычайна прыгожая... Не. Ня ўсю постаць жанчыны бачыць ён перад сабою, толькі вочы яе.

Вочы набліжаюцца, робяцца вялікімі, зазіраюць у самае сэрца. Блакітныя вочы з гарачым блескам, ад якога робіцца цёпла, горача.

Толькі вочы бачыць ён—знаёмыя, родныя.

Вочы—гэта цэнтральныя кропкі, ад якіх разыходзяцца лёгкія, тонкія, як павуціньне, лініі—абрысы жанчыны. Яго родная маці. Памёрла шмат гадоў таму назад. Ён тады быў яшчэ малым хлапцом. Крушынскі ўздрыгвае. Нібы толькі-што ўсхапіўся ад сну. Працірае вочы. Азіраецца па бакох.

... Не заўважыў, як праехаў па замёрзлай рэчцы, як ўзьбіраўся на ўзгорак.

Мігацяцца агні вёскі Глухаўкі.

... Мабыць агоньчыкі здаваліся мне чалавечымі вачыма...

Пацягнуў лейцы, сьцебануў каня, сьцёр з вусоў і броваў прылепленым абледзянелы сьняжок, моцна тарганууся ў санях. Нібы толькі-што прымасьціўся на сядзеньні з гарохавіньня.

Цяпер ён зусім іншы чалавек.

... Сьняжынкі навеялі на мяне мяккацеласьць і рахманасьць... Зусім быў раскіс—і не да твару мне гэта!

Сівыя на белым соўгаюцца насупроць сялянскія хаткі.

— А вось і дом айца Дзімітрыя!

Дом стаіць водаль і розьніцца ад вясковых хат, нібы вол ад атары авечак.

Крушынскі зыходзіць з санак. Папоўскі дом стаіць перад ім, як намаляваны на паперы. Дом адгароджаны высокім частаколам, стаіць трохі водаль ад вёскі.

Дзьве старыя бярозы, як багамолкі, высяцца абапал брамы. Яны прывандравалі сюды здалёк, каб пакланіцца айцу Дзімітрыю ў ногі, каб пацалаваць беражок яго расы, каб паслухаць яго імшу ў царкве. Царква на ўзгорку на другім баку вуліцы насупраць папоўскага дому. Але строгі поп чамусьці крыкнуў на багамолак і яны спыніліся тут, спалоханыя. Так засталіся чакаць да «страшнага суду», да «сканчэньня сьвету».

Пад лёгкім кялімам сьнегу і дом, і царква выглядаюць напісанымі акварэльлю на цёмна-сінім фоне.

Крушынскі ў самога сябе пытаецца:

... Ці ўдасца мне перамагчы папа?

У гэткай пышнай дэкорацыі перад яго ўяўленьнем і пастаць папа красуецца ў зусім іншым асьвятленьні: у орэолі харства, моцы і ўпэўненасьці.

... Ліха яго ведае...

Ён адчыняе вароты, бярэ каня за аброць і павольна вядзе праз браму на дзядзінец.

З глыбіні двара пачуўся брэх сабакі.

Мэлянхолічны, расьцяглы брэх выклікае ў яго настрой да глыбокадумных разважаньняў, да ціхай пакоры перад усім на сьвеце.

... І трэба ведаць—гаўканьне папоўскай сабакі мне падабаецца.

Звон ланцуга (сабака навязаны) чуецца разам з стукатам дзьвярэй. На высокім ганку паказваецца фігура айца Дзімітрыя.

— Добры вечар, бацюшка!

— Вечар добры! пан Крушынскі?

— Той самы!

— Прашу, прашу! Будзьце ласкавы! Нечаканы госьць...

Крушынскі зачыняе вароты. Ідзе за айцом Дзімітрыем у памяшканьне.

Айцец Дзімітры—нявысокага росту, досыць шырокі ў плячах, але ня тоўсты. Рэдкія, рыжаватыя валасы растуць на твары паасобнымі кусткамі, злучанымі між сабою ў адну бараду лёгкім сьветлаватым пушком. Пад ніжняй губою зусім

няма валасоў: бялее чыстае, нібы выпаленае, лапікла. Гэта надае яму малажавы выгляд. Айцу Дзімітрыю гадоў пад сорак, а здаецца маладзейшым на гадоў дзесяць. Невялікія сьветлашэрыя вочы заўсёды ўсьміхаюцца. Нібы духоўнік вечна чымсьці ўзрадаваны і ня можа стрымаць свайго настрою. Твар гладкі, бяз ніводнай зморшчыны, але на лобе прарыта адна глыбокая баразна, якая ніколі ня выходзіць, і падобна да шраму. Чырвоныя тонкія губы і даўгаваты нос з чулымі рыжаватымі ноздрамі надаюць твару выраз сьмеласьці, упартасьці, зьменлівасьці, захаванага капрысу. Голас у айца Дзімітрыя мяккі, з ноткамі просьбы і прабачэньня. Але гэта бывае тады, калі ён знаходзіцца ў роўнавазе пачуцьцяў. Калі часам яго выводзяць з цярплівасьці, калі злуецца, калі бывае чым колечы ўзварушаны,—тады голас мяняецца: ад мэталёва-басавых пераліваў пераскоквае да альтавых выкрыкаў, да жаночага піску. У гэткія хвіліны здаецца, што айцец Дзімітры практыкуецца на розныя галасы, шукае свайго голасу, сваіх манераў—і не знаходзіць. Яны загублены ў пустэчах жыцьця і разьвеяны, нібы пыл пад ветрам.

Айцец Дзімітры быў да рэволюцыі настаўнікам у вясковай школе. Пасьля рэволюцыі, калі многія з выхаванцаў духоўнай сэмінарыі кідалі годнасьць духоўніка і пашлі зусім новымі шляхамі, цяперашні поп—былы настаўнік—«здаў экзамін на папа» (так і цяпер сяляне гавораць) і яго назначылі ў гэту парафію.

Чаму ён так зрабіў—і цяпер ніхто добра ня ведае. Адны кажуць, што рэволюцыя на яго зрабіла такое адмоўнае ўражаньне—яе жорсткасьць і бязьлітаснасьць накіравала яго да бога. Другія тлумачаць, што ён проста захацеў мець спакойнае жыцьцё духоўніка. Трэція гавораць, што ён быў у часы рэволюцыі белагвардзейскім афіцэрам, і, каб захаваць сваё мінулае, апрануў расу і запусьціў валасы.

Айцец Дзімітры і Крушынскі расьселіся пры стале. Пакой асьвятляе невялікая газавая лямпа. (Крушынскі ня зьняў кажушка).

— З чым бог нясе?—пытаецца айцец Дзімітры лагодным голасам з адценьнем просьбы ў тоне.

— Дзівіцеся, айцец, што каталік да праваслаўнага духоўніка прыблукаўся?—пытае ў сваю чаргу Крушынскі.

Вясёлыя вочы папа пранікліва глядзяць на яго, і поп з пакорай і сумам адказвае:

— Евангельле для ўсіх хрысьціян аднолькавае. Хрыстос адзін і той самы і для каталікоў, і для праваслаўных.

— Нудна зрабілася, бацюшка, і я вось прыехаў пагутарыць з вамі. Чалавека жывога няма ў ваколіцы.

— І добра зрабілі, і добра зрабілі, што прыехалі. Я вельмі рады!

Поп кідае падазроныя погляды ў бок гасьця.

— А дзе матушка?

— Яна сьпіць пасьля абеду. Прастудзілася нешта.

— І добра зрабіла!—ледзь ня кажа Крушынскі ў ранейшы тон папа, а замест гэтага гаворыць з пашкадаваньнем:

— О-о-о, бедная. Трэба малінай напаіць і ўсё пройдзе. Як рукой зьніме!

Крушынскі здаволены, што «матушка» ня прымае ўдзелу ў іхняй гутарцы. Дзяцей няма ў папа—няма лішніх сьведак.

— Ну і сьняжок. Ну і бела ўсюды. Аж воку люба!—пачынае Крушынскі з пагоды, ня ведаючы з чаго пачынаць.

— Ніякі бялільшчык так ня выбеліць, ніякі маляр не намалюе—дадае айцец Дзімітры.

Ён любіць устаўляць у гутарку слоўцы і пагаворкі з евангельля. Ужывае гэта нават залішне. Нібы хоча такім чынам моцна афарбавацца пад колер духоўніка, каб выглядала, што ён «пастырам божым» ледзь не ад нараджэньня.

Крушынскі аглядае пакой. Надзвычайна цёпла. Нават мухі круцяцца і гудзяць над сталом. Адна муха буйная, сіняга колеру, садзіцца айцу на ўсьпацелы нос. Айцец настарожваецца і застывае на месцы. Хітраватая ўсьмешка заяскравіла на твары і ён левай рукой шмаргануў па носе. Муха ўзьнялася над галавою айца і гарэзьліва апусьцілася на лоб.

— Так, бацюшка,—кажа Крушынскі, нібы вядзе працяг доўгай ранейшай гутаркі.—Хутка нараджэньне Хрыста па-каталіцкаму, а па-праваслаўнаму будзе на два тыдні пазьней. Чаму-ж гэта для праваслаўных Хрыстос нарадзіўся ў адзін час, а для каталікоў—у другі?

Крушынскі расшпільвае кажушок на ўсе гузікі.

— Каталікі памыляюцца!

— Хто там разьбярэ, дзе памылка, але ў сельсавеце лішняя праца: два разы рыхтаваць антырэлігійную пропаганду.

— А вы ім памагаеце, Язэп Сымонавіч, біць нас? Вы памагаеце антыхрыстам?—хвалюецца айцец Дзімітры.

Муха спаўзла з лобу на нос айца.

— Не... Я проста хачу з вамі, бацюшка, абмеркаваць гэту справу. Комунізм, мне здаецца, бацюшка, новай рэлігіяй, якая мае з хрысьціянствам шмат супольнага.

Крушынскі пачынае пацець.

У айца Дзімітрыя твар палае ад натхненьня.

— Хрыстос сказаў: «бо многія прыдуць пад імем маім, кажучы, што гэта я». Яшчэ ён сказаў: «Надыйдуць дні, у якія з таго, што вы тут бачыце, не застанецца каменя на камені: усё будзе зьнішчана». У другім месцы напісана: «Паўстане народ на народ і царства на царства».

Айцец Дзімітры нібы з кнігі чытае.

Муха павандравала па носе і апусьцілася на верхнюю пульхлую і чырвоную губу айца Дзімітрыя. Айцец паморшчыўся, але махнуў рукой (усёроўна ня зловіш).

— Так, шмат агульнага,—кажа Крушынскі.—Напрыклад, Хрыстос бараніў бедных. Тое самае і комуністыя робяць.

— Не да іх Хрыстос сказаў: «Я зраблю вас паляўнічымі над людзьмі»—комуністыя нашы ворагі.

Муха паскраблася лапкамі і нібы моцна задумвалася над словамі айца, седзячы на яго губе.

— Але Хрыстос сказаў таксама: «любі ворагаў сваіх»—гаворыць Крушынскі ў тон папа, хітра прыжмурыўшы правае вока.

— Адыйдзі ад мяне, сатана! Вашы комуністыя—фарысеі і кніжнікі! Чаго вам ад мяне трэба, Язэп Сымонавіч?

Вочы папа пры гэтым сьмяюцца. Ён роблена па-акторску сыпле евангелічныя сказы. Ён вывучыў евангельскі стыль на выпадак дыскусіі з вясковымі бязбожнікамі.

— Я хачу вам дабра і толькі дабра, бацюшка. Ведаеце, што духоўнікам з кожным годам робіцца цяжэй жыць. Перастаюць хадзіць у божыя дамы. Народ стаў зусім іншым.

— Рахіль плача аб дзяцях сваіх...—мармыча айцец Дзімітры жалабным тонам.

— Адзін плач тут не паможа, бацюшка, трэба нешта больш разумнае рабіць. І вам, бацюшка, жыць трэба. А як усё ў вас забяруць, дык з чаго жыць будзеце?

Крушынскі моцна пацее.

— Зірнеце на птушак нябесных: яны ня сеюць ня жнуць...

— Ну і капаюцца ў конскім гнаі, корму сабе шукаючы.

Крушынскі сьмяецца пры гэтых словах.

— Навошта вы мне ўсё гэта гаворыце, Язэп Сымонавіч? Я прасіў у вас рыбы, а вы даецё мне зьмяю. Чаго вы ад мяне дабіцца хочаце?

Муха ўсадзіла айцу вострае джала ў самую мякаць верхняй губы. Ён злосна ляснуў сабе рукою ў губы. Сьлёзы пакаціліся з вачэй.

Муха выскоквае цэленькая спаміж яго растапыраных пальцаў і ўпарта гудзіць над яго вухам.

— Я хачу толькі аднаго, каб і вам, і ўсёй вашай парафіі добра жылося... Гэта залежыць ад вас, бацюшка.

— Ад мяне?! Не ад бога, госпада нашага, а ад мяне?!

— Ад вас, бацюшка, вядома, і пры божай дапамозе. Ад вашай пакоры...

— І Хрыстос гаварыў аб пакоры. Калі паб'юць цябе ў адну шчаку, падстаў дру...

Муха моцна ўкусіла яго за вуха. Ён ляснуў рукою па вуху і... труп жывёлінкі пакаціўся і завіс у жоўтых хмызьнячкох яго барады.

— Айцец! Гэта-ж вы супроць сваіх сьвятых слоў зрабілі! Чаму-ж не падставілі пад укусы мухі другое вуха?

— Я... я... Моцна падла кусаецца...

— Нічога, айцец. Ваш учынак правільны. Другую шчаку падстаўляюць толькі тады, калі моцны б'ець... Перад моцным, айцец, дапамагае толькі пакора. Аб пакоры я прашу вас...

— Усякі просячы атрымае, а шукаючы знаходзіць...

— Калі так, дык вельмі добра будзе! Мы з вамі, бацюшка, добрую справу наладзім. Я казаў, што новая рэлігія надыходзіць. Зерні ва ўсіх рэлігіях адны і тыя самыя. Толькі каласы трохі інакш выглядаюць. Той самы гарох, але струкі інакшыя. Трэба ўмець лушчыць гэтыя новыя струкі, каб знаходзіць стары гарох. Для новай рэлігіі і новыя духоўнікі патрэбны. Старыя не гадзяцца. Вы нядаўна толькі духоўнікам зрабіліся.

Вы яшчэ не ўкаранелы поп. Рабецеся чырвоным папом! Розьніца толькі ў расах, а нутро тое самае.

Пот капае з твару Крушынскага на кажушок.

— Юда Іскарыёт!!

Ад хваляваньня айцец скубе рэдкую бародку, паднімаецца, ходзіць туды і сюды па пакоі, махае рукамі, ноздры ў яго разьдзьмухваюцца. Але ў вачох—ранейшая ўсьмешка...

Муха скацілася з барады на жывот айца, а з жывата—на падлогу.

Крушынскі спакойна за ім назірае.

Айцец Дзімітры зноў садзіцца. Пачынае просячым голасам:

— Калі распускаюцца кветкі, ведаеце самі, што лета—блізка. Кветкі вашых слоў, Язэп Сымонавіч, распушчаны. Але якая пагода будзе ад іх—ня ведаю. Свайго духоўнага сану ня кіну.

— І вельмі разумна зробіце. Яшчэ лепш зробіце, калі новыя ідэі будзеце праводзіць у казаньнях з царкоўнага амбону. Тыя самыя ідэі, аб якіх калісьці Хрыстос гаварыў...

Пот льлецца з твару Крушынскага маленькімі ручаінкамі. Ён выглядае, як заплаканы.

— Комуністыя ня вераюць у Хрыста...

— Я-ж вам, бацюшка, казаў аб гаросе і струкох: гарох—той самы. Нутро тое самае. Толькі струкі інакшыя.

— Вось так і Вэльзавуль Хрыста спакушаў!

— Я зусім не спакушаю, а жыцьцёвую практыку тлумачу. Камень на хлеб цяпер не пераробіце. Ваду ў віно не пераверненце, бацюшка. Вы застанецеся пры каменьнях і вадзе.

Евангелічнае параўнаньне робіць уражаньне на папа.

— Дык што-ж вы ад мяне хочаце?

— Пакоры, хрысьціянскай пакоры і пашаны да ўлады. Той моцны, бацюшка, хто не ламаецца, а толькі гнецца...

Крушынскі торгае плячыма. Сьпіна мокрая ад поту.

— Я шаную ўладу, бо кожная ўлада ад бога. Я пакорлівы, бо так у сьвятым пісьме загадана.

— Трэба яшчэ камень на хлеб перарабляць...

Айцец Дзімітры ўсьміхаецца ня толькі вачыма, а нават пад абскубанай рэдкай бародкай граюць зморшчынкі сьмеху.

Крушынскі расказвае, што ў сельсавеце сяляне дамагаліся, каб забраць пад школу дом бацюшкі, але ён адгаварваў.

Да позьняй ночы сядзіць Крушынскі ў айца. Яшчэ многімі тэкстамі з евангельля аздабляе поп сваю гутарку.

— Ой, як вы спацелі, Язэп Сымонавіч, зьнімеце кажушок!

— Не. Трэба ехаць.

Крушынскі выцірае пот рукавом.

Пасьля гэтага візыту поп у казаньнях часта ўспамінаў комунізм, прыводзіў прыклады з евангельля, з старых часоў хрысьціянства.

Скрыні з таварамі Крушынскага часта прывозіліся на сховы да папа.

Так Крушынскі кончыў з антырэлігійнай справай мінулай зімою.

Крушынскі завёў з айцом Дзімітрыем вялікую дружбу. Пра айца распаўсюджваліся чуткі, нібы ён хоча зусім адмовіцца ад духоўнага сану. Крушынскі стараўся рознымі спосабамі зьняпраўдзіць гэтыя чуткі. Ён, пэўна, не парадзіў-бы айцу Дзімітрыю гэта рабіць, бо ўсёроўна на парафію прыслалі-б іншага папа.

— Айцец Дзімітры ў сане папа вельмі добра працуе на карысьць рэволюцыі,—гаварыў часта ў сельсавеце Крушынскі.— Ён павольна і грунтоўна падрыхтоўвае парафіян да бязбожніцтва. Ён скіне з сябе расу толькі тады, калі новы поп, які будзе прысланы сюды рознымі Мэльхісэдэкамі, ужо ніякага ўплыву не патрапіць зрабіць на сялян.

На стале ў пакоі Крушынскага ляжыць скрутка газэты «Беларуская вёска»—таго нумару, дзе надрукаваны яго портрэт і артыкульчык аб культурнай гаспадарцы Курганішча. Усяго пяць штук. Апошнія з рэдакцыі забраў. У горадзе, у завірусе розных спраў і хваляваньняў, ён не зьвярнуў увагі на газэты, на хвальбу, якая аб ім надрукавана. Хаця на вечарыне ў яго стрыечнага брата аб артыкуле гаварылі спачуваюча і пахвальна. Тут—у ціхім Курганішчы зусім ня тое. Ён перачытвае артыкульчык аб сабе многа разоў, кожны раз па чарзе ў іншым нумары. Напамяць вывучае, як прыгожую песьню.

Літары, словы, радкі і кожны абзац паасобку мітусяцца ў яго зрокавай памяці намаляванымі маленькімі атрадамі войска, якое бароніць яго і разносіць аб ім славу далёка-далёка.

Ён так удала сфальсаваў газэты, што портрэт з тэкстам да яго знаходзіцца ў цэнтры. Усе пяць газэт раскладзены на стале па парадку, паасобку. Пяць яго ўласных портрэтаў пазіраюць сур'ёзна, праніклiва і паважна. Ён пачынае шанаваць самога сабе яшчэ болей, чым заўсёды.

... І портрэты, і хвальба аба мне расьсеяны па ўсім краі і па замежамі краю многа-многа тысяч...

... Шмат народу чытае, уяўляе мяне, як героя—героя працы і культуры. Я служу добрым прыкладам для іншых. Мне зайздросьцяць. Мною ганарацца.

Ён уяўляе сабе вялізны дождж газэт з яго портрэтам па ўсіх беларускіх вёсках, мястэчках і гарадох. Хто расчыняе газэту, бачыць яго—Крушынскага, чытае і думае аб ім...

... Чытаюць звычайныя людзі, але чытаюць і камісары.

Ён чуе шастаньне газэты ў тысячах рук, чуе мармытаньне людзкіх губ. Яны ўсе гавораць аб ім, запамінаюць прозьвішча:

«Крушынскі».

«Крушынскі».

«Крушынскі».

Пасьля расказваюць тым людзям, якія ня чыталі гэтага нумару «Беларускай вёскі».

Ён цяпер знаходзіцца ня толькі тут, у Курганішчы, але ў многіх мясцох—ва ўсіх тых хатах, дзе чытаюць «Беларускую вёску», красуецца яго духоўнае аблічча. Яго ведаюць усе, ведаюць з таго добрага боку, з якога ён стараецца паказвацца перад людзьмі. Яго бачаць. Так пільна і з пашанай глядзяць на яго, ажна нейк нялоўка яму—нялоўка і надзвычайна прыемна ад нялоўкасьці. Яму здаецца, што нават хатнія інакш на яго цяпер пазіраюць.

... Трэба цяпер адмовіцца ад усяго іншага і займацца выключна сельскай гаспадаркай. Тады аба мне ня толькі ў газэтах пісаць будуць, але нават кнігу надрукуюць.

... На тое-ж рэволюцыя! Цяпер многа аб кім пішуць кнігі.

Ён пачынае агітаваць самога сябе:

... Кінь, Язэпка ты (успомніў выраз Зэліка), свае гандлёвыя справы! Кінь! Глядзі, лепш будзе, калі адчэпішся ад гэтай смалы. Тады ўсе бакі твае будуць чыстыя. А то, Язэпка ты, выглядаеш, нібы ў цябе шаўковая вопратка на зрэбнай падкладцы. Кінь, гад, Язэпка ты! Кажу табе, кінь!

лае самога сябе. Пераходзіць ад настрою да настрою: і за і супроць сваіх цёмных, гандлёвых спраў. Нібы пераскоквае праз высокія парканы, брыдзе па невядомых палёх, перасечаных між сабою глыбокімі канавамі і ручаямі. У кожным з гэтых палёў іншы клімат. У адзін і той самы час на адным полі—зіма, на другім—лета; на адным—вясна, на другім—восень. Яму то холадна, то горача.

... Кіну! Раз назаўсёды буду займацца аднэй чыстай справай—культурнай сельскай гаспадаркай. Курганішча зробіцца цудоўным садам, куды будуць прыяжджаць дзівавацца з усіх краін Саюзу. Калі ўвесь аддамся гэтай справе, тады ня тое будзе, што цяпер. І ўсе страхі згінуць! Раз пакончу з гэтымі паганымі хованкамі!

Твар Крушынскага прымае выраз адвагі героя і нявіннасьці дзіцяці.

... Але... але многія (праўда, прыяцелі) ведаюць аб маіх сакрэтных учынках і ўсёроўна плямы ня змыеш... Айцец Дзімітры што скажа... Як ні круціся, ня змыеш.

... Пляма?!—гневаецца Крушынскі на самога сябе,—якая пляма? Дзе? Няўжо-ж, Язэпка ты, забыўся, што бяз грошай нічога ў цябе ня выйдзе? Няўжо-ж ня ведаеш, што нават памарксыцку экономіка—усё на сьвеце? Няўжо-ж я буду чакаць, пакуль мне хто дасьць дапамогі? Каб кінуў гандаль, дык быў-бы невялікім разумнікам і немалым дурнем.

Ён разважае далей:

... Калі набуду шмат грошай, тады мая гаспадарка стане на моцны грунт. Прыемнае заўсёды злучана з няпрыемным. І рэволюцыя, заваёвы яе зьвязаны з рознымі няпрыемнымі ўчынкамі. Я змагаюся за тое, каб добра ў сябе, на паказ іншым, паставіць справу. На гэта патрэбны сродкі. Ну і вось... Каб есьці смачнае пахучае сала, трэба калоць парсюка. Каб расло прыгожае збожжа, трэба гнаіць поле. Каб...

Гэтых «каб» набіраецца многа. Ён часта бывае ў айца Дзімітрыя, вядзе з ім гутаркі. Евангелічны стыль папа пераймае трохі і ён. Ня то, каб навучыўся евангельлю, але падабаецца манера папа сыпаць параўнаньнямі, у вобразнай гутарцы выказваць філёзофскія думкі.

У той самы дзень, калі Крушынскі прыехаў з Менску, ён забраў з сабою пачку газэт з сваім портрэтам і пашоў у сельсавет.

XVIII

У доме Крушынскага быў невялічкі пакойчык, перагароджаны ад спальні тонкімі дошкамі, з адным вакном у сад. Галяндзкая кахлёвая печка знаходзілася топкай у спальні Крушынскіх і адваротнай сьценкаю ў гэтым пакойчыку. Усе ў хаце называлі пакой алькерыкам.

Ніхто ў пакойчыку ня жыў. Тут стаяў вялікі куфар, напакаваны бялізнай; на падлозе—пілы, малаткі, швэйная машына пані Ганны. На сьцяне—дзьве паляўнічыя стрэльбы, ягташ, розная мужчынская і жаночая вопратка. У адным кутку—цэлы стос старых малявідлаў ранейшага ўладара Курганішча, пана Семашкевіча. Некалькі гадоў гэта месца служыла гардэробным пакоем і сховам розных гаспадарчых рэчаў, якія ня штодня ўжываюцца.

Часьцей за ўсіх у алькерык, які меў асобныя дзьверы з кухні, забягалі дзеці Крушынскага. Яны тут забаўляліся, ажыўлялі алькерык шчырым дзіцячым сьмехам і хаваліся пад вопраткай, што вісела на сьцяне, раскладвалі па падлозе старыя панскія малюнкі, або сядзелі ў кутку і ціха між сабою шушукаліся. Галоўным чынам яны тут забаўляліся на заход сонца, калі на дварэ гуляць ім ужо не дазвалялася.

Іх цягнула адгароджвацца ад «вялікіх», як ад нейкай варожай клясы людзей. «Вялікія», нават бацькі, былі для іх чужым народам, няспрыяючым і непажаданым у кампаніі.

Пад вечар, у сонечныя дні, праз адзінае вакно ў алькерык заўсёды зазірала сонца. Яно прарывалася праз галіны дрэў чырвоным золатам і аблівала сьцены, падлогу і столь кволымі, ружовымі адсьветамі. Хвілін дваццаць сонца гасьцявала ў алькерыку. У гэты час пакойчык жыў патаемнай, сваясаблівай радасьцю і лятуценьнем фарбаў. Малінавыя колеры ў розных адценьнях і пералівах запаўнялі ўсе куткі і шчылінкі. Усё цьвіло, гарэла—нават тварыкі дзяцей. Потым павольна, марудна ўсе рэчы ў алькерыку пачыналі гаснуць, бляднець. Сонечныя водсьветы звужаліся і пераходзілі ў адну яркую пурпуравага блеску паласу.

Дзеці станавіліся ў сонечную мяжу алькерыку, абложаную абапал шэрым змрокам. Сонечная палоска была ў дзяцей маленькай цудадзейнай краінай, дзе яны хаваліся ад розных стра-

хаў, у якія шчыра верылі. Страхі яны сваімі вачыма бачылі ў лесе, калі знайшлі скарб...

Залатая сонечная краінка апранала дзяцей у лёгкі мядовага колеру шоўк. Надавала іхным тварам урачысты выгляд. Яны былі тады загрымаваны ў казачных хохлікаў, асьветленых палаючымі паходнямі.

Дзеці самім сабе здаваліся іншымі істотамі. Зморанымя за дзень бегатнёю па дзядзінцы і полі, яны заўсёды адчувалі сябе ў алькерыку стомленымі; прыемная зморанасьць разьлівалася па жылах смачным дрымотным пітвом, матчынай пяшчотай.

— Настачка, прытулі мяне...—Шаптала тады Мзей ледзь чутным галаском.

Мзей клала Настачцы галоўку на калені і зараз-жа задрэмвала. Настачка жмурыла вочкі ва ўсе шэра-змрочныя куткі алькерыку. Адусюль глядзелі на яе сьмешныя фізыяноміі вясковых дзяцей, з якімі днём забаўлялася. Бліскалі вачыма. Высоўвалі языкі. Хутка яны зьнікалі. Цені пакрывалі лёгкай коўдрай іх твары.

Настачка не баіцца: яна ў сонцы, у цудадзейнай паласе— ружовай, цеплаватай, дрыжучай, у якой пылінкі мітусяцца, нібы срыбныя камарыкі. Настачка мажа і баялася-б надыходзячых змрокаў, калі сонечная паласа пачынала шарэць і стушоўвацца, калі «залатая краінка» гойдалася ў змроках і тварык Мзей бляднеў ад таго, што сонца з яго зыходзіла. Заўсёды ў гэты час нехта абвязваў Настачку тоненькай вяровачкай, абкручваў рукі, ногі. Нехта ткаў па яе твары лёганькую павуціну, куды болей тонкую за тую, што Настачка бачыла часам на вакне. Настачка хацела вызваляцца з гэтай сеткі, але не магла: рукі і ногі былі моцна зьвязаны. Хацела крычаць, таксама не магла: рот быў моцна склееены павуцінай. Тады яна пачынала тузгацца, рвацца і... ляцела, плыла ўгару з Мзей на руках. Яна ўжо не ў алькерыку, а на дзядзінцы. Унізе тата і мама, усе равесьнікі—дзеці вясковыя. Крычаць, просяць, моляць:

— Настачка, не ўлятай ад нас...

— Настачка, апусьціся на зямлю...

Яна—вышэй і вышэй...

Ноч.

Зоркі перасыпаюцца па небе залатым гарохам.

Настачка ляціць да зорак...

Зоркі блішчаць, мігацяць, завуць...

Цёмная сінь выгінаецца, шалясьціць, як шаўковая спадніца.

А зьнізу раздаюцца галасы:

— Настачка, вярніся...

З кожным разам слабей:

— Настачка...

— Наст...

— На-а...

— Н...

— ...

Так чуваць у высокім небе з нізкай зямлі.

Настачку агортвае жаль па сваіх. Ажна плакаць хочацца.

Пасьля гэтага Настачка забываецца. Ніколі яна не ляцела ў паветры, ніколі зьнізу ня крычалі. Ніколі гэта не здаралася.

Сьвятлюкі дзень. Настачка з дзецьмі ў лесе. Туліць Мзей да сябе, а тая шэпча:

— Настачка, баюся...

— Баюся...

— Баюся...

У алькерыку змрок. Даўно зьнікла «залатая краінка» заходняга сонца, скрозь зямлю праваліласся. Даўно ў алькерыку дыміцца змрок. Ледзь прыкметны водсьвет лезе злодзеем праз вакно. А змрок такі, што, каб дзеці ня спалі, дык баяліся-б, анямелі-б ад страху на месцы, не адважыліся-б нават выйсьці з пакою. Яны сядзелі-б, прытуленыя адно ад аднаго, і крычалі-б:

— Мама!

— Ма-ма!

— Ма-ма-а-а!!!

Усё галасьней і галасьней. У гэтым крыку знайшлі-б паратунак. Лягчэй стала-б. Страх быў-бы нават і цікавы. Пасьля сьмяяліся-б... Але Настачка і Мзей сьпяць... Іх зусім на сьвеце няма, ніколі ня было. Бо нават сны спыняюцца, ня ткуцца ў маленькіх галоўках каляровай істужкай.

— Дзе-ж гэта дзеці прапалі,—пытаецца пані Ганна ў хатніх.

Яна добра ведае дзе, але па прывычцы пытаецца. Ёй прыемна лішні раз успомніць аб іх.

— Пэўна ў алькерыку сьпяць,—адказвае хто колечы з хатніх.

Пані Ганна ідзе ў алькерык. Цёмна. Знаходзіць іх заўсёды ў адным месцы—у куточку ля сьцяны супроць вакна. Чаму заўсёды тут—маці ня ведае. Яна не дагадваецца, што якраз тут была гадзіна таму назад «залатая краінка». Тут дзеці знаходзілі сабе прытулак.

Дыханьне іх ледзь чутна. Маці ня будзіць малых. Па чарзе (раней меншую, а потым большую) выносіць іх з алькерыку, разьдзяе, кладзе ў ложак... Пры гэтым дзеці прачынаюцца. Меншая заўсёды трохі (для парадку) плача. Старшая мармыча нязьвязныя словы.

Кожны раз маці іх трохі прабірае, што ляглі спаць без вячэры. Гэта такі злаўчынак, аб якім нельга маўчаць...

«Злачынцы» глядзяць на матку заспанымі вочкамі, задзіўленымі тварамі, жмурацца на лямпу. Нібы першы раз зьявіліся на няпрыемны, бязьлітасны сьвет, дзе прыдумалі на зьдзек добрым людзям нейкую вячэру. Дзеці просяць-моляць маму:

— Ня трэба вячэраць...

— Спаць...

— Спаць...

— Спа...

Назаўтра аб усім забываюць. Ня ведаюць, якім чынам папалі ў ложак, разьдзетыя, прыкрытыя, у цяпле... Гэта само сабою робіцца. Дзіўная штука маленькі чалавек: вось ён гуляе, а раптам няма яго. Глядзіш раніцою—апынуўся ў ложку, разьдзеты. Сонца так блішчыць праз вакно, ажна вочы жмурыш. Нельга глядзець, а глядзець хочацца... А на падваконьніку белы кот грэецца... Лапкамі твар выцірае і соладка мурлычыць...

— Калі ў другі раз пойдзеце ў алькерык спаць, заб'ю, насьмерць прыб'ю!

Так крычыць маці кожны раз раніцою. Яна моцна злуецца на Настачку і Мзей. Такімі крыкамі яна ім напамінае, што трэба і сягоньня туды пайсьці. Бо, калі няможна, значыць, там вельмі добра...

Ї гэтае незразумелае слова «алькерык» набывае вялікі сэнс у дзіцячых галоўках. Ї пад вечар, калі вясковыя дзеці разьбягаюцца па хатах, калі Настачка і Мзей застаюцца адзінокімі—іх вабіць ціхі прытул алькерыку. Їх заве «залатая краінка»...

Цяпер у алькерыку жыве настаўніца. Пакойчык мае зусім іншы выгляд. Ложак, стол, пара крэслаў. На вакне вазоны. Ад ранейшага нічога не засталося. Усё забралі. Мылі падлогу. Выціралі сьцены. Цяпер тут нават іншы пах. Прывабнасьць «залатой краінкі» скончылася. Дзецям забаронена сюды бегаць.

Пані Ганна вельмі рада гэтаму, бо дзеці пачалі вячэраць: першая карысьць ад настаўніцы. Другая карысьць—ад пакою: ён знаходзіцца побач са спальняй і, такім чынам, настаўніца будзе заўсёды пад контролем гаспадыні.

Усё ідзе паводле раней намечанай програмы: выбралі яшчэ трох дзяўчатак з вясковых дзяцей (хлопчыкаў пані Ганна забараніла), якім пашылі лепшую вопратку—і настаўніца пачала займацца з пяцёркай.

Лейцы выхаваньня перададзены выключна ў яе рукі. Крушынскія ня маюць на гэта часу. Месцам для заняткаў—«салён», дзядзінец і поле.

Настаўніца, Стэфка, у вёсцы ніколі ня жыла. У першыя дні нават баялася адна пайсьці гуляць далей гумна. У гэтым выпадку яе выхаванкі, пяцёрка дзяўчатак, зрабіліся яе выхавальніцамі. Яны паказваюць «цёці» (так дзеці называюць настаўніцу) усе цікавыя куткі на полі, водзяць да рэчкі, у лес. З ёю не баяцца бываць і там, дзе раней знайшлі «скарб». У часе такіх гулянак дзеці шчабечуць:

— А гэта канюшына!

— А гэта авёс!

— А гэта віка!

— А гэта гарох!

— А гэта жыта!

— А гэта што? Прылады для гімнастыкі?—пытаецца «цёця».

— Не-э-э! Гэта азярод...

«Цёця» ніколі вёскі ня бачыла ў натуры. Кожны новы куток для яе—цікавая вынаходка. Яна знаёміцца з вакольнай прыродай, нібы з жывымі істотамі, з падругамі. Часам сама пытаецца ў дзяцей аб тым, аб сім.

— Што гэта за ўзгоркі вунь там?

— А гэта курганы.

— Што такое курганы?

— Узгоркі...

Дзеці палюбілі «цёцю», адчувалі ў ёй добрую сяброўку, якая з часам, калі падвучыцца, будзе вельмі карыснай у гульнях. Калі яны больш асвоіліся з настаўніцай, дык часам рабілі ёй заўвагі:

— Цёця нічога ня ведае...

«Цёця» чырванела і сапраўды ня ведала, што на гэта адказваць.

Пасьля такіх заўваг яна перастала задаваць дзецям запытаньні такога роду, дзе магло выказвацца яе няведаньне. Пачала прыдумваць спосабы навучаньня і выхаваньня дзяцей, дзе сама магла быць ня ў ролі вучаніцы, а настаўніцы.

— Трэба будзе, апрача гульняў, вучыць чытаць і пісаць старэйшых дзяўчатак.

Уся ўвага Стэфкі была зьвернута на Настачку.

— Што ты, Настачка, умееш?—запыталася яна раз у дзяўчынкі.

Настачка з задзіўленьнем зірнула на «цёцю».

— Усё ўмею...

— А што? Чытаць можа ўмееш?

— Не... Я ўмею езьдзіць на кані. Часта татка садзіць мяне конна. Умею бульбу скрабаць, арфу круціць у таку, пацеркі з рабін на ніткі нанізваць. Усё ўмею: танцаваць, рыбу лавіць з хлопчыкамі, скарбаў шукаць. Усё ўмею!

Шчырая ўпэўненасьць чулася ў голасе Настачкі.

— Настачка і сьпяваць умее!—дадала Мзей.

— Вось гэта добра! Вельмі добра!

Настаўніца ўзрадавалася. Са сьпеваў трэба было і пачаць.

— Засьпявай што колечы!

Настачка запяяла:

> Нашу вёску Курганішча
> Можна горадам назваць.
> Сорак хат і дзесяць вуліц—
> Недзе з мілым пастаяць.

Настачка, як дарослая вясковая дзяўчына, зацягвала дрындушку. Рабіла пры гэтым розныя выкрутасы. Сьпявала гульлівым галаском. Паднімала плечыкі, махала ручкамі, быццам во-во пусьціцца скакаць, быццам ёй акомпануе гармонік.

— Засьпявай яшчэ!

Харашо цібе, каліна—
На цібе шырокай ліст.
Харашо цібе, падружка,—
Цібе любіць камуніст!

Другую дрындушку Настачка сьпявала наманер першай: працягла, на той самы мотыў. Галасок ад піскліўасьці пераходзіў да грубаватага сопрано. Відаць, што падраблялася пад дарослых дзяўчат.

— Што яшчэ сьпяваеш?

Мае глазкі, як каляскі,
Толькі не катаюцца.
Я—дзяўчына нехароша,
А за мной ганяюцца-а-а!

* * *

Сталі вутачкі купацца,
Пух па возеры пускаць.
Сталі дзеўкі задавацца,
Юбкі шоўкам вышываць.

Першы раз у жыцьці чула Стэфка такія песьні, ня гледзячы на тое, што сама ведала шмат «романсаў». Яна любіць сьпяваць. У яе ня кепскі голас. Песьні Настачкі ёй падабаліся сваёй жвавасьцю, гульлівасьцю; таксама цікавае было выкананьне: як Настачка падраблялася пад «вялікую дзеўку». Яна, Стэфка, сама з прыемнасьцю гатова навучыцца так сьпяваць. Нават зайздросьціць дзяўчынцы. Але адчувае, што для дзяцей такія сьпевы не падыходзяць.

Яна ўжо некалькі дзён шукала патрэбнага тону, як гаварыць з дзецьмі. Толькі нялёгка ўдавалася яго знайсьці. Цяжка было знаходзіць тое, чаго да гэтага часу ніколі ня шукала і ня ведала, як яно павінна выглядаць. Якім тонам ня пробвала гаварыць з дзецьмі—усё ня выходзіла: то вельмі па-панібрацку, а то праз меру строга. У першым выпадку дзеці не адчувалі ў ёй аўторытэту, у апошнім—глядзелі на яе, як на чужую.

Яна перабірала ў памяці тон сваіх настаўнікаў і настаўніц. Часам, будучы аднэй, нават пробвала практыкавацца ўслых, пакуль не знайшла патрэбнага тону і выгляду твару пры гэтым. Самае лепшае—гэта тон шчырасьці, тон старэйшага таварыша да маладзейшага.

Такім чынам, першыя крокі самастойнага жыцьця прымушвалі Стэфку задумвацца, назіраць над людзьмі і падзеямі. Да гэтага часу яна ніколі сур'ёзна гэтай справай не займалася.

— Такія песьні, Настачка, сьпяваць табе ня трэба!

«Цёця» пагладзіла дзяўчынку па галоўцы і глыбока зірнула ёй у вочы.

— Чаму? У нас усе сьпяваюць.

— Так сьпяваюць вялікія, а для маленькіх, як ты, ёсьць зусім іншыя песьні.

Тут Стэфка зацікавілася даведацца, што Настачка яшчэ ўмее сьпяваць. Магчыма, што ў яе «рэпэртуары» ёсьць і для дзяцей добрыя песьні. Большую частку ўвагі яна накіравала на Настачку. Хаця і дзяўчынкі з вёскі былі такога самага ўзросту і ня менш сталыя. Стэфка наогул дзівілася надзвычайнай сталасьці і самастойнасьці вясковых дзяцей у параўнаньні з гарадзкімі. Яна часта бачыла ў горадзе, як такіх дзяўчатак маткі трымаюць на каленях і кормяць. Яна зноў папрасіла Настачку:

— Засьпявай цяпер новую песьню, але не такую, як ранейшыя. Не такую... Ну...

Яна шукала слова, якім можна было зразумела ахарактарызаваць дрындушку.

— ... Не такую вясёлую.

Настачка доўга думала.

— Ага...

Настачка ўсьміхнулася, як акторка на сцэне, і прыняла зусім новую позу. Нават выгляд вачэй зьмяніўся. У іх патух дзіцячы агоньчык сьмеху. Яна лёгка кашлянула і скоса зірнула па баках. Адна дзяўчынка высунула ў гэты час чырвоны вільготны язычок. Настачка ўскалыхнула плечыкамі і хіхікнула. Засьмяялася ўся пяцёрка.

«Цёця» маўчала. На яе твары ня было ні прыемнасьці, ні нездаволенасьці. Яна маўчала і назірала.

Настачка падняла на яе вочы. Засаромілася, пачырванела, змоўкла і апусьціла галоўку.

«Цёця» пагладзіла яе па валасох.

Настачка зноў прыняла позу. Вочы яе завалакліся туманам суму. Ручкамі то бралася за вопратку, то папраўляла валасы. Відаць было, што яна ня ведае, дзе падзець рукі.

Нарэшце, апусьціла іх уніз. Яны віселі па абодвых бакох: тоненькія, загарэлыя. Нават пальчыкі выцягнуліся, як няжывыя. Яна зацягнула новую песьню:

Капайце, капайце магілу
У вішнёвым саду.
Схавайце, схавайце міне маладу
Ї ўзнавайце каго я верна люблю-у-у...

Песьня была жаласьлівая, сумная да сьлёз, падобная мэлёдыяй да хаўтурных вясковых галошаньняў. Прыкра стала «цёці», да таго не па сабе, ажна яна нэрвова замахала рукамі і сказала:

— Досыць, Настачка... Змоўкні...

Дзяўчынка спыніла песьню і з дзівам зірнула на «цёцю».

— Я вас, дзеці, навучу прыгажэйшыя песьні сьпяваць!

— Навучэце! Навучэце!

— Вось будзе добра!

Дзеці ў вялікім захапленьні білі ў ладошкі, выдавалі крыкі

— Ї ў розныя гульні гуляць будзем!—дадала «цёця».

Дзеці ў вялікім захапленьні білі ў ладошкі, выдавалі крыкі бяз слоў.

Такім чынам, павольна і асьцярожна, каб ня страціць аўторытэту ў дзяцей, Стэфка ў іх саміх вучылася, што рабіць і як вучыць іх.

Трэба было запоўніць кожны раз працоўны дзень з дзецьмі, якія ніводнай хвіліны не маглі быць бяз руху. Кожны дзень пяць пар вясёлых вочак глядзела на «цёцю» з зацікаўленасьцю, з запытаньнем:

— Што мы будзем сягоньня рабіць?

Гульні, песьні, маляваньне, пачаткі чытаньня з старэйшымі.

Стэфка была спачатку вельмі захоплена новай працай. Ня мела часу прыглядацца да дарослых людзей у Курганішчы. Ёй здавалася, што самая лепшая для яе кампанія—гэта дзеці. З дарослымі яна і ня ведала аб чым гаварыць.

У хмурныя дні яна займалася з малымі ў «салёне», у пагодныя—на полі. Тады да іх далучалася грамада іншых дзяцей, хлопчыкі і дзяўчаткі, з якімі пяцёрка гуляла да прыезду настаўніцы. Цяпер яны былі разлучаны.

«Цёця» на жывых прыкладах паказвала сваім выхаванкам на тое, чаго няможна. Узорам усяго адмоўнага і нядобрага была вольная грамада вясковых дзяцей.

— Вось такіх брыдкіх слоў, як *яны* гавораць, вам гаварыць няможна!

— Няможна так, як *яны*, капацца ў пяску і пялёхкацца ў рэчцы!

— Глядзеце, якія *яны* брудныя. Вам няможна быць такімі!

— Во, як *яны* б'юцца! Вам гэта забараняецца.

— Няможна так бегаць бяз толку, як *яны!*

Кожны раз пры сустрэчы з грамадою вясковых дзяцей «цёця» паказвала ўсё новыя і новыя «няможна». Для выбранай пяцёркі іншыя дзеці служылі жывой лябораторыяй усялякіх «няможна».

Часам «цёця» наўмысьля старалася пры гульнях у полі прыбліжацца да грамады самапасных дзяцей, каб паказваць сваім выхаванкам што колечы новае, чаго «няможна». Жывая кніга пэдагогікі захапляла яе. З гэтай крыніцы яна чэрпала настаўніцкія веды. Ёй здавалася, што чым больш «няможна» яна пакажа сваёй групцы, тым лепш. Але мэтод Стэфкі выклікаў зусім непажаданыя вынікі: дзеці падзяліліся на два лягеры. У гэтых лягерах спачатку вытварылася лёгкая ўзаемная няпрыязьнь, якая павольна перайшла ў варожасьць. Дайшло да таго, што нельга было ўжо блізка падпускаць гэту «вольную» грамаду дзяцей да пяцёркі. Тыя біліся. Кідалі на выбраных дзяўчатак пяском, а часам і каменчыкамі. Пяцёрка, з свайго боку, пранікнутая сьвядомасьцю аб тым, што «няможна», вельмі добра памятала некалькі дзесяткаў такіх «няможна». Кожнае такое «не» выклікала ў уяўленьні іх вельмі прывабную карцінку. Зажадалася рабіць якраз усё забароненае, да такіх «злаўчынкаў» цягнула...

І вось патрохі пяцёрка пачынала ўжываць гэтае «няможна» якраз адваротна таму, чаму вучыла маладая настаўніца. Мала таго, Стэфка сваімі стараньнямі паказваць ім як найбольш «няможна» дала ім вельмі багаты каталёг цікавых учынкаў, аб існаваньні якіх пяцёрка раней і ня ведала, бо толькі цяпер яны выпукляліся перад дзецьмі, дзякуючы падкрэсьліваньню настаўніцы.

Паміж Стэфкай і дзецьмі пачалося змаганьне, часамі досыць вострае і няпрыемнае. Прыходзілася прасіць бацькоў на дапамогу. Дапамога была адна:

— Біць!

Білі дзяцей бацькі, запрапанавалі рабіць тое самае і настаўніцы. Далі ёй на гэта права.

І скончылася ідылія паміж Стэфкай і ее выхаванкамі—тая ідылія, якая захапляла настаўніцу пры першым знаёмстве з дзецьмі.

Бацькі дзяцей гэтага не заўважылі. Яны лічылі ўсё гэта звычайным і нормальным: дзеці ня слухаюцца, а іх лупцуюць. Аднак, Стэфка адчувала сябе кепска. Ня ведала, што рабіць.

На шчасьце лякарства было знойдзена яшчэ да надыходу хваробы: яна адвярнула сваю ўвагу ад дзяцей, і настрой яе паправіўся.

Чыстае паветра і добрыя харчы, аб якіх Стэфка дома, у Менску, і ня сьніла, зрабілі тое, што яна пачала адчуваць сябе так, як ніколі да гэтага часу. Тут, у Курганішчы, яна як-бы ў першы раз заўважыла сябе, прыкмеціла, што існуе...

Твар пачаў акругляцца. Калі раней ружовасьць на шчоках была не пастаянная, а выкліканая шыбкім ходам або танцамі (яна любіла танцаваць), то цяпер ня зыходзіла з твару. Схаваліся косьці, якія дужкамі тырчэлі над грудзьмі. Гладкімі сталі шыя і плечы. Сінія жылкі на руках дзесьці зьніклі. Пальцы зрабіліся пульхнымі і белымі.

Толькі цяпер Стэфка зьвярнула ўвагу на дарослых у доме Крушынскага. Усе ў Курганішчы звалі яе «паненкай», адносіліся з павагай і абыходліва.

Калі на яе глядзелі мужчыны, яна адчувала ў іх вачох ласку. Але часта блішчэлі ў мужчынскіх вачох такія агоньчыкі, ад якіх Стэфцы жудасна рабілася. І ў гэтай жудасьці была захаваная прыемнасьць...

Зусім ня тое было ў кабечых вачох. Калі кабеты сустракаліся з ёю, Стэфка ў іх вачох бачыла няпрыемную халоднасьць. Яна заўсёды апускала пры гэтым вочы, як вінаватая. У вачох кабет блішчэла зайздрасьць да яе маладосьці і хараства.

Калі Стэфка пачала зварочваць увагу на сябе, справа выхаваньня дзяцей адышла на бок і мала яе непакоіла.

Болей усіх гарачымі вачыма глядзеў на яе сам гаспадар Курганішча. Стэфка заўважыла, што ён інакш на яе глядзіць пры людзёх і ня так, калі нікога няма. Пры людзёх вочы ў яго халодныя, звычайныя, часам і ня гляне на яе; а калі адзін—зусім іншае. Тады ў яго такія вочы, як у той час, калі яны ехалі з Менску. Усю дарогу карміў яе чакалядкамі. Чакалядкі так урэзаліся ў яе памяць, што кожны раз яна адчувае іх смак, як толькі Крушынскі на яе зірне.

Каб яна нявідзімкай апынулася ў Курганішчы на некалькі месяцаў раней і прыглядалася-б да тутэйшых парадкаў, вывучала-б хатні быт, выведала-б усе драбніцы жыцьця і суадносін сям'і Крушынскіх між сабою,—дык цяпер заўважыла-б тут вялікія зьмены. А яна думала, што так, як пры ёй, было заўсёды.

Зьмены былі. Спрактыкаванае вока магло-б гэта заўважыць. З хатніх рэчаў, з мэблі, часьцей, чым раней, сьціраўся пыл («каб гарадзкая паненка не скрытыкавала»). Людзі таксама стараліся вайсковы пыл з сябе сьцерці: інакш трымаліся, інакш гаварылі, пановаму адносіліся да працы ў хаце.

Жонка Крушынскага, пані Ганна, пачала нават лепш адзявацца ў буднія дні, каб хоць гэтым мець перавагу над настаўніцай. Яна саромілася ў прысутнасьці настаўніцы крычаць на хатніх працаўніц. Пры ядзе, калі вакол стала бывала ўся сям'я, гаспадыня сядзела моўчкі, або гаварыла шэптам, адрывістымі сказамі. Нібы на кагосьці злавалася.

Часта, няпрыкметна для іншых, гаспадыня паднімала падазроныя вочы то на мужа, то на маладую настаўніцу. Яна шукала між імі хоць тоненькую нітку інтымнасьці, сакрэту, прыязьні. Расшыфроўвала кожную ўсьмешку. У словах настаўніцы шукала захаванага, іншага зьместу. Напружнасьць адчувалася нават у яе рухах, гестах, хадзьбе. Яна ўвесь час знаходзілася на варце. Калі нікога ня бывала ў пакоі, яна варожымі вачыма калола дзьверы алькерыку, дзе жыла настаўніца. Нічога пры гэтым ня думала, толькі адчувала сябе так, нібы стаіць голымі пятамі на гарачых вугольлях.

Настаўніца любіла сьпяваць. Калі часам з яе пакою чуліся сьпевы, пані Ганна пільна прыслухоўвалася, лавіла малейшыя пералівы мэлёдыі. Моршчылася ад няпрыемнага адчуваньня.

Песьня трывожыла, упівалася ў яе вострай п'яўкай. Гаспадыня ўваходзіла ў роспач, калі настаўніца сьпявала «романсы».

Сьцяўшы зубы, пані Ганна старалася знаходзіць тое, чаго ўвесь час, пасьля прыезду настаўніцы, шукала. Яна хацела ўпэўніцца, што паміж мужам і настаўніцай існуюць блізкія адносіны. Каб магла ў гэтым упэўніцца, дык аж палягчэла-б на сэрцы, адпала-б вастрата сумненьня.

... Я ведала-б тады, што рабіць.

З гэтай мэтай яна часта перад мужам хваліла настаўніцу:

— Старанна з дзецьмі займаецца. Прыгожая, разумная, далікатная, хораша сьпявае.

Паводле яе пахвальбы выходзіла, што лепшай за Стэфку на сьвеце няма. Крушынскі моршчыўся. Вочы яго глядзелі абыякава, і ён часта бурчэў у адказ:

— Хвалі—перахваліш.

— Ня лезь у вочы рознымі глупствамі.

— Часу няма слухаць.

— Многа такіх ёсьць.

Пані Ганна зьбірала заўвагі мужа, запамятавала інтонацыю яго голасу і выраз твару. Пасьля, у адзіноце, старалася ў гэтым звычайным пяску слоў знаходзіць залатыя макавінкі: захаванае пачуцьцё мужа да настаўніцы.

... Нічога не знаходжу. Нічога...

Пані Ганна хрусьцела пальцамі ад непакою.

... Ён тоіцца, хаваецца. Наўмысьне так гаворыць. Ён любіць Стэфку...

Пры такіх думках гаспадыня радавалася, што знайшла захаваны ключ ад захаваных пачуцьцяў мужа.

... А можа я так сабе падазраю? Я-ж нічога пэўнага не заўважала... Няўжо яму палезе ў галаву рознае глупства? Ён-жа вечна заняты, працуе па гаспадарцы, або кудысь ходзіць з Рахмількай. Ат! Дурная я дый толькі...

Такому вываду яна вельмі рада. Чула адносіцца да мужа. Глядзіць на яго некалькі часу добрымі вачыма і лае сама сябе за дурны розум...

Але варта ёй заўважыць, што Язэп болей старанна, чым звычайна, мыецца раніцой, надзяе новы пiджак, альбо блішчыць весела вачыма, як зноў упадае ў туманісты круг сумненьня і падазронасьці.

Крушынскаму і ня трэба хавацца ад жонкі. Стэфка яму зусім не падабаецца. Ён часта (у адсутнасьці жонкі) прыглядаецца да яе:

... Дзяўчанё, тоненькая, малая. Зусім не ў маім гусьце. Вось, каб рослая, поўная, круглая...

Яго расчуляе толькі яе гладкая, белая шыйка з кволенькімі завіткамі валаскоў, як у дзіцяці...

... У хаце ўсё-ж весялей цяпер: маладое, жывенькае, рухавенькае...

Крушынскі і не спадзяецца, што будзе захоплены маладою дзяўчынаю.

... Ці не старэць пачынаю? У мяне да Стэфкі проста бацькаўскія пачуцьці. Трэба будзе даць ёй шэрсьць на сукенку. А жонцы сказаць, што яна гэта ў Менску купіла. Не выпадае перад жонкай... Падумае чорт ведае што...

Ён зусім упэўнены:

... Так... бацькаўскія пачуцьці. Карміў яе цукеркамі ў дарозе, як малое дзіцянё. Яна шчабятала ўсю дарогу. Я нават туліў яе да сябе, як сваю Настачку...

Гэта яму прыемна: адносіцца як бацька да маладзенькай дзяўчыны. Але па сэрцы разьліваецца сум.

... Значыць, я ўжо старэю, расту ўніз... У мяне бадай такая, як Стэфка, дачка магла быць, каб раней на некалькі год жаніўся.

Раптам злосна круціць галавою:

... Дурныя думкі лезуць у галаву. Я і не стары. Глупства ўсё гэта! Давайце мне іншую дзяўчыну, у маім гусьце—і то доўга валаводзіцца няма калі. Шмат працы ў мяне.

Між волі пры гэтых думках у памяць Крушынскага ўсплывае песьня менская, дарэволюцыйная, кафэшантанная:

Дайте мне за руб с полтиной
Женщину с огнем, женщину с огнем!

Ён пачынае мармытаць гэту песьню. Яна надае гульлівасьць, бадзёрасьць. Апошнія словы «женщину с огнём!» паўтарае многа разоў. Пераходзіць паволі ад высокага голасу да ледзь прыкметнага шэпту. Нібы кажа замову, робіць сабе амаладжэньне праз «женщину с огнем».

— Якое там «старэю»!

Кравец Мотка пашыў шлюбны гарнітур для парабка Крушынскага—Рыгора.

— Фрэнч і «філігэй» (галіфэ) пашыты як для монарха.

Так Мотка кажа аб сваёй рабоце.

Кравец Мотка вядомы «монархісты» у ваколіцы. Ён і ня ведае значэньня слова «монарх». Але паводле Моткі, чалавек, які носіць імя «монарх»—самы разумны, самы добры, самы элегантны.

Мотка трафнога ня есьць. Звычайна, калі ён працуе ў сялян па вёсках, дык там і корміцца: есьць печаную бульбу з малаком. Калі гаспадар жартам у яго запытае «ці смачна?» Мотка адказвае: «Вельмі смачна—і монарх еў-бы!» Усю вопратку, якую ён шые, «монарх мог-бы насіць». Калі хто Мотцы падабаецца, ён гаворыць: «разумны, як монарх», «прыгожы, як монарх», «добры, як монарх». У суботу Мотка не працуе: «у шабэс і монарх не працуе!»

Крушынскі, пачуўшы такія выразы краўца, назваў яго «монархістым», напалохаў:

— Цябе, Мотка, за гэта могуць арыштаваць, як контррэволюцыянэра...

— Могуць. Калі бог захоча, дык і венік выстраліць, але за што?

— За монарха...

— Я-ж не монарх!

— Але ты монархісты! гэта яшчэ горш...

— А што такое «монарх»?—пытаецца Мотка трохі спалоханы.

— Монарх—гэта цар!

— Ну?!—дзівіцца Мотка.—Няўжо той, хто пагромы рабіў?

— Так, так. Вось сам бачыш, якую контррэволюцыю разводзіш!

Мотка шчыра конфузіцца, непакоіцца.

Але без «монарха» Мотка абыходзіцца ня можа... Кожны раз ад яго гутаркі аддае «монархізмам».

Жаніх Рыгор, «монарх» у галіфэ, вельмі здаволены. Фрэнч бяз кішэняў яго трохі непакоіць, але-ж Мотка сам казаў, што кішэні—гарадзкое балаўство. што ад іх толькі вопратка рвецца. Затое-ж «філігэй» здаецца Рыгору ідэалам хараства. Дзьве вялізныя торбы вышэй калень, а ніжэй тоненька, аж

лыткі выпукляюцца. Ён часта бачыў такія штаны ў вайсковых. Зайздросьціў ім. Цяпер больш радуецца свайму элеганцкаму касьцюму, чым жаніцьбе.

Вясельле было наладжана ў нядзелю ў Курганішчы. Сам Крушынскі заняўся гэтай справай. Усё рабілася па яго камандзе.

— У нядзелю вясельле гуляць, дык не прападае працоўны дзень. Потым к жніву будзе яшчэ адна жнейка. Само вясельле таксама што-небудзь ды значыць, бо яно «чырвонае»—без царкоўнага шлюбу.

Крушынскі на колькі дзён раней гаварыў аб гэтым з айцом Дзімітрыем. Прасіў айца, каб ня ўмешваўся ў гэту справу. Нават даў яму некалькі рублёў «за шлюб», каб матэрыяльна не пацярпеў ад чырвонага вясельля.

Пасьля славы за культурную гаспадарку, пасьля таго, як пры вялікай грамадзе ў сельсавеце чыталі голасна аб ім артыкул, надрукаваны ў «Беларускай вёсцы», і людзі паднялі Крушынскага на «ура», называючы «гордасьцю сельсавету»,— «чырвонае вясельле» парабка было далейшым трыумфальным ходам «рэволюцыйнай» дзейнасьці і «культурнай» працы Крушынскага.

— Я ледзь угаварыў цёмнага вясковага чалавека жаніцца па-новаму,—хваліўся Крушынскі.—Хлопец упіраўся, артачыўся

Многа Драздоў і Дзятлаў на Рыгоравым вясельлі. Прасторны дзядзінец у Курганішчы бітком набіты людзьмі. Сталы расстаўлены на дварэ. На іх шмат самагону. З суседняй вёскі запрасілі гарманістага. Пад сонцам на гладкім дзядзінцы рыхтуюцца да танцаў.

— Я не шкадую пакояў,—тлумачыць Крушынскі,—але на дварэ вальней, прастарней.

Ніколі да гэтага часу Курганішча ня бачыла такой гульні. Разам з вясковымі было ўсё «начальства» сельсавету. Гаварыліся рэволюцыйныя прамовы аб новым быце, аб новым жыцьці, аб героічным учынку «таварыша жаніха» і «таварышкі нявесты», якія ўвайшлі ва ўзаемную сувязь праз «чырвоную браму рэволюцыі» без дапамогі папа і царквы.

«Таварыш поп» таксама быў запрошаны на чырвонае вясельле, але ён адмовіўся, казаў, што галава баліць. Доўга ўгаварваў яго Крушынскі:

— Гэтым, айцец Дзімітры, дапаможаце рэволюцыі, павялічыце яе перамогі і славу.

— Ну, калі так, дык прышлеце мне што колечы чырвонавясельнага сюды...

Крушынскі паслаў пару бутэлек віна.

А вясковыя кабеты—Дразьдзіхі і Дзятліхі—сьпяваюць на «чырвоным вясельлі» вясельныя песьні на стары лад. У песьнях «таварыш жаніх» і «таварышка нявеста» робяцца «каралём» і «каралевай», «месяцам» і «сонцам», «селязьнем» і «качкай», «пеўнікам» і «куркай», «дубам» і «калінай».

Гарманісты—вельмі важная пэрсона на вясельлі. Да яго прыслухоўваюцца ўсе хлопцы і дзяўчаты. Нават сталейшыя мужчыны і кабеты ловяць адным вухам гукі гармоніка.

Гармонік—то распускаецца, як вахляр, то сьціскаецца ў адно, а то абамлелы, разгінаецца поўкругам. Па клявішах скачуць пальцы гарманістага, перабіраюць адны тоны, другія, вяртаюцца назад, жонглююць, дрыжаць, мітусяцца. Вальсы, маршу, цяжкаватыя і сур'ёзныя, даюць месца болей лёгкім і гульлівым у польках і вальсах.

Гарманісты як-бы ніякага ўдзелу ў гульні ня прымае, хоць ад яго залежыць уся гульня. Яму толькі час-ад-часу падносяць чарку гарэлкі. Ён адным махам з сур'ёзным выглядам выпівае, не закусвае, адкідае аднэй рукой сваю чорную чупрыну, якая лезе ў вочы, і зноў пачынае іграць. Ён не зьвяртае ўвагі на тое, што робіцца вакол. Апускае галаву ўніз, напалову схіляецца над гармонікам, нібы прыслухоўваецца да сваёй ігры, або зусім апусьціць галаву, схавае твар за шырокімі мяхамі гармоніка і грае... Грае пакуль-што так сабе: рэпэтыруецца: прабуе свае сілы. Ніхто яшчэ не танцуе.

Пробуюць госьці танцаваць па мяккім, пакрытым стоптанай травою, зялёным дзядзінцы і нічога ня выходзіць: ня чуваць такту, выступкваньня абсацамі. Прападае ўвесь форс танцораў.

Без «адбіваньня такту» нагамі і гарманістаму цяжка іграць. Ён пацее, зьбіваецца з ладу, тупае нагамі і адчувае сябе кепска. Выступкваньне нагамі аб цьвёрдую падлогу на вечарынках звычайна дапамагае яго музыцы, як пісцу добры атрамант.

Хлопцы дадумаліся:

— Памост з дошак зробім! Пад паветкай ляжаць новыя дошкі!

Закіпела «будаўнічая» праца: панацягвалі дошак, накацілі сюды некалькі бярвеньняў і на роўным месцы дзядзінцу палажылі памост.

Вось тут і пачаліся праўдзівыя танцы—з прыскокамі, з выгінаньнямі, з прыстукамі і іншымі фокусамі. Памост, нібы зроблены для сцэны ў аматарскім тэатры. Ён новы, белы, як сьнег, і гулкі, як барабан.

Аб жаніху і нявесьце забылі; забылі старыя, забылі і маладыя. Старыя займаюцца выпіўкай, маладыя—танцамі. Старыя сядзяць пры сталох. З аднаго боку—Дразды на чале з Сухарукім. З другога боку—Дзятлы пад камандаю свайго роданачальніка Галавы. Блішчаць на сонцы лысіны, кудлаціцца пад пальцамі валасы, гучыць, пераліваецца гутарка—вясёлая, бадзёрая. Сягоньня Дразды з Дзятламі ня сварацца, або хочуць не сварыцца. Сухарукі стрымлівае сваіх, Галава—сваіх. У Курганішчы не дазваляецца ўзбуджаць і паказваць пляменную, узаемную варожасьць: Крушынскага шануюць. Іхная няпрыязьнь прымае сягоньня зусім іншыя формы: прыстойныя, рыцарскія:

— Хто каго перап'е—ці Дразды Дзятлаў, ці Дзятлы Драздоў?

Такі міжпляменны паядынак наладжваецца сам сабою, бяз лішніх слоў, без аніякіх слоў. Кожная племя толькі думае:

— Хто каго перап'е?

І сэкунданты тут не патрэбны. Хто раней зваліцца з ног ад выпіўкі—той лічыцца пераможаным. Хто астаецца пры стале—таму пашана.

Але і ў гэтым ёсьць блытаніна. Некаторыя тлумачаць якраз надварот: хто раней зваліцца пад стол ад самагону—таму гонар.

Зьвіняць чаркі, пераліваюцца на сонцы ў розныя колеры. Булькае гарэлка з чаркі ў горла і налівае ў жылы Драздоў і Дзятлаў агонь і бадзёрасьць. Яны цалуюцца, абымаюцца. Некаторыя плачуць ад вялікай чуласьці. Іншыя рагочуць.

— І за што мы вечна сварымся між сабою?—пытаюць Дразды ў Дзятлаў.

— Праўда, завошта?—у адказ пытаюцца Дзятлы ў Драздоў.

— Вы—Дзятлы ў гэтым вінаваты!
— Вы—Дразды!
— Дзятлы!
— Дразды!
— Дзятлюгі!
— Дразьдзюгі!

Яны нічога ня маюць супроць таго, каб кулакамі вытлумачыць—хто вінаваты ў вечных плямённых непаразуменьнях. Толькі ў гэты час (час вышэйшага імпэту) абодва плямёны пераможаны, ці абодва перамагаюць: рукі ў іх слабеюць, вочы асалавелыя. Людзі адчуваюць сябе вельмі стомленымі. Сонца двоіцца і троіцца ў іх вачох. Нават чарка ў руках двоіцца і троіцца.

Дразды і Дзятлы ў перамешку без разбору соўгаюцца пад стол.

Яны сьняць дзіўныя сны згоды і супакою.

Сухарукі і Галава застаюцца пры стале. Сахарукі ніколі гарэлкі ня п'е, колькі-б не сядзеў пры выпіўцы. Галаву ніколі гарэлка не бярэ, колькі-б ня піў.

У гэты час маладыя танцуюць на памосьце з новых дошак. Многа пар кружыцца ў польцы. Пот льлецца ў іх з твараў.

Пакончыўшы з сваімі плямёнамі, Галава і Сухарукі глядзяць на танцораў. Глядзяць доўга, смакуюць. Галава міргае да Сухарукага, Сухарукі—да Галавы.

— Чаму-ж бы і нам не паскакаць?
— Я гатоў!

Правадыры Драздоў і Дзятлаў паднімаюцца з месца і накіроўваюцца парачкай (адзін нізкі, другі высокі) да белай дашчанай сцэны. Узьбіраюцца на памост. Маладыя танцоры з рогатам (хлопцы) і хіхатам (дзяўчаты) разьбягаюцца.

Гарманісты іграе цяпер толькі для Галавы і Сухарукага. Спэцыяльна для іх смаліць «казачка».

Танцуюць Галава і Сухарукі. Кароткі выступае супроць доўгага. Доўгі дае адпор. То дробна перабіраюць нагамі, то робяць плаўныя поўкругі. Упрысядкі скачуць адзін супроць аднаго. Адзін абыходзіць другога бокам і вядзе далей свой танец вакол яго, сьмешна прыцмоквае губамі. Галава пляскае ў далоні і паднімаецца на цыпачках да Сухарукага. Сухарукі

трымае здаровую руку над сваёй галавою, нібы кіруе цэлай арміяй.

Здалёк стаяць Крушынскія з настаўніцай. Сьмяюцца разам з усімі.

— Чаму вы, Стэфка, не танцуеце?—зьвярнуўся Крушынскі да настаўніцы.

— Я? Гэтых танцаў ня люблю. А танцаваць умею!

— Ідзеце, патанцуйце!—просіць Стэфку і пані Ганна. Яна пры гэтым крытычна аглядае настаўніцу з галавы да ног.

Стэфка чуе няпрыязьнь у голасе гаспадыні, неспагаднасьць да сябе. З такой неспагаднасьцю пані Ганна сустрэла яе з першага дня прыезду. Яна-б у той-жа дзень паехала назад у Менск, каб не адчувала да сябе ветласьць з боку гаспадара. З кожным днём расла ў Стэфкі злосьць да гаспадыні.

... Вось наўмысьне пайду танцаваць «казачка»!

Хуткімі крокамі Стэфка ідзе да памосту. Ніхто нават не заўважае. Толькі тады агледзеліся, як пачала танцаваць.

Галава і Сухарукі спынілі свой танец. Саскочылі з канфузам з памосту і разам з усімі з дзівам давай глядзець на танец «паненкі».

Спачатку яна перабірае нагамі дробненька, нібы гарох рассыпае па белых дошках. Потым павольна пачынае плысьці па памосьце. Робіць шырокія кругі. Пры гэтым здаецца, што ногі яе зусім не кранаюцца падлогі, а яна проста ў паветры носіцца. Белая кароткая спадніца паднімае яе, нібы скрыдлы матылька. Тэмп танцу робіцца шыбчэйшым з кожным новым кругам. Нават прымітыўная музыка апрыгожваецца, дзякуючы мастацкаму танцу. Здаецца, што кругі, якія робіць танцорка, мігацяцца ў вачох і застаюцца намаляванымі над белым памостам. З вачэй Стэфкі ня выходзіць блеск і стомная, вясёлая ўсьмешка. Твар з кожным разам усё болей ружавее. Шчокі гараць. Тонкія губкі во-во зашэпчуць вабнае слова, паклічуць усіх на танец.

Ці танцорка на ўсіх глядзіць з прызывам-клічам?

Ці толькі на Крушынскага паглядае?

А можа на нікога не глядзіць. А Крушынскаму толькі здаецца, што глядзіць на яго і нават падміргвае?

— Ну і скакуха!—чуе Крушынскі за плячыма зайздросны шэпт жонкі.

— Віхор носіць яе!—кажа шчыра зьдзіўлены Сухарукі.

— Чэрці ў яе нагах сядзяць!—цмокае губамі Галава.

Усе маўчаць. Усе лезуць бліжэй да памосту. Вяскоўцы ў нямым захапленьні абкружаюць памост. Жывы вянец людзкіх вачэй сочыць за танцам Стэфкі, за кожным яе рухам, за ўзорамі, якія яна тчэ на белых дошках. Ня ведаюць, на што болей зварочваць увагу—ці на фокусы ног, ці на рукі, якімі яна робіць плаўныя, зграбныя рухі і гесты, ці на выраз твару і вачэй.

Так людзі дзіваваліся-б на сямікаляровую вясёлку, якая апусьцілася-б на белыя дошкі памосту і пачала-б тут перамiргвацца з людзьмі.

Крушынскі ловіць вачыма ўсё, мерыць кожную частку яе цела сваёй уласнай меркай. Глядзіць як на скарб ім адным знойдзены, які яму аднаму належыць.

... І якая яна прыгожая... якая дзіўная, надзвычайная...

Думкі ў Крушынскага мігацяць, як іскры. Адна думка затапляе блескам другую. У сэрцы расьцё надзвычайны сум— палючы, радасны, невядомы. І тое, што па дарозе з Менску частаваў Стэфку цукеркамі, расчульвае яго, павышае ў сваіх уласным вачох. Ён ганарыцца гэтым. Яму прыемна, што некалькі сот вачэй глядзіць цяпер на «яго» Стэфку з захапленьнем. Яе слава — яго слава. Сэрца гарыць, не знаходзіць месца. У памяць лезе песьня, ледзь ня зрываецца з яго губ:

Дайте мне за руб с полтиной
Женщину с сгнем!
Женщину с ог...
Женщину с...
Женщ..

— Чаго ў цябе так вочы асалавелі? Чаго мармычаш?— злосна шэпча яму ў вуха пані Ганна і худымі халоднымі пальцамі сьціскае яго руку.

— Кінь, дай глядзець!

Твар гарманістага пакрыўся потам. Спачатку яму прыемна іграць пад тэмп скокаў «паненкі», але з кожным разам яму робіцца цяжэй. Пальцы хадуном ходзяць, круцяцца, выкручваюцца. Гармонік млее на яго каленях. Апошні крык гармоніка хрыпла булькае басавым водгульлем, выдае слабы стогн

і расьцягнутыя мяхі гармоніка нямеюць, прызнаюць сваю слабасьць.

Ї Стэфка спыняе танец на самым цікавым месцы. Правай рукой папраўляе растропаныя валасы і з пашкадаваньнем глядзіць у бок гарманістага.

— Не магу болей! Змарыўся!

Голас гарманістага саромлівы, вінаваты. Па яго твары льлецца пот.

— Эх, ты! Музыка!—крычыць з дакорам Галава.

— Іграй! Іграй! Ліха матары тваёй!—лаецца Сухарукі.

XIX

Знаходка.

Такую мянушку далі суседзі старому Цыпруку за знаходку контрабанды на дарозе. У хаце цэлы садом. Трэба прадаць карову на штраф. Цыпручыха часта мерылася кулакамі на мужа. Некалькі дзён яе крыкі, лаянкі і плач чуваць былі па ўсёй вёсцы.

Рабфакавец Мікола, малодшы сын Цыпрука, хадзіў пануры і маўклівы. Ён толькі раз зьвярнуўся з дакорам да бацькі:

— Мала таго, што трэба прадаць карову на штраф, дык цяпер паганае імя контрабандыстага будзе пляміць нашу хату. Гэта можа і мне нашкодзіць.

Стары маўчаў, апусьціў галаву.

Першы раз у жыцьці ён перад сям'ёю такі вінаваты.

... Ї за што? Я-ж нікому кепскага не рабіў... Няўжо-ж я павінен быў такое дабро пакінуць на дарозе, ці што?

Наконт плямы і ганьбы для хаты, аб чым яму гаварыў сын, ён ня думае: гэта для яго абстрактная развага, якая розуму і сэрцу мала гаворыць. Ён толькі карову шкадуе.

Сам пехатой павёў у Менск.

Карове дзесяць гадоў, выгадавалася ад Падласай. Такія-ж белыя латачкі ў яе на чорным ілбу, як у яе маці. Такія-ж мутнаватыя, задумёныя, сумныя вочы. Ён добра памятае, як Падласая І вельмі непакоілася вясной, рыкала. Ён тады завёў яе да Антонавага бугая.

Слаўны быў бугай! Прыгожы, з буйнымі рагамі, рослы, і нейкая царская веліч была ў яго постаці. Усіх кароў ваколіцы злучалі з ім.

Антон фанабэрыўся. Яго кожны раз гарэлкай паілі за такі гонар. Ĭ Цыпрук тады бутэльку самагону за пазухай нёс. З Антонам пілі. Як на хрэсьбінах гулялі.

Падласая Ĭ ацялілася на Каляды. Жонка апоўначы прынесла ў хату маленькую цялушачку, мокранькую, кволенькую, дрыжачую ад холаду. Жонка грэла цялушку каля печы, як малое дзіцё...

Ĭ памятае Цыпрук:

У зімовыя месяцы, у лютыя маразы цялушка гадавалася ў хаце. Зрабілі ёй загародку ў кутку. А ўвясну, калі сонца добра прыгрэла, калі выган зазелянеўся, цялушку выпусьцілі на волю. Яна нюхала паветра, жмурыла вочы на сонца, мэкнула пару разоў і спалохалася. На адным месцы стаяла, нібы ўрасла нагамі ў вільготныя дзёрны выгану. Першы раз сонца пабачыла...

Так стаяла некалькі хвілін.

Потым няпрытомная радасьць заблішчэла ў яе выпучаных вялікіх вачох: закруціла хвастом, прыгнулася мордай да зямлі і пару разоў лізанула языком маладую траўку. Замэкала ў другі раз няпрытомна і трывожна, скокнула на месцы, як спружына, усімі чатырма нагамі. У паветры дугу зрабіла. Кружылася на адным месцы, як скакуха на вечарынцы. Пусьцілася па выгане бягом, нібы воўк за ёй гоніцца; пабрыквала, выраблява розныя круць-верці—і ня ведала, дзе дзецца ад шчырай радасьці.

Цыпрук памятае. Ён глядзеў тады на цялушу і цешыўся ад усяго сэрца...

Вырасла Падласая II—у матку ўдалася, цюцелька ў цюцельку. А як Падласую I трэба было зарэзаць, калі нагу выкруціла на балоце, ён знайшоў уцеху ў тым, што Падласая II была ўжо рослая. Ён і дачушку Падласай I завёў да Антона, у якога-тады быў другі бугай (таксама добрага заводу). Ĭ ў гэты раз з гарэлкай: пустых рук ня любіць Цыпрук—«не шанцуе».

Такі пераход ад Падласай I да Падласай II відавочна тлумачыў Цыпруку строгі і акуратны ход жыцьця. Як-бы нехта нявідочны паказваў яму добрай, літасьцівай рукою на генеолё-

гію Падласых. І той нявідочны гаварыў нячутна вушам, але чутна ўсяму нутру Цыпрука:

— Вось табе ўцеха ў жыцьці. У гэтым і адвечнасьць на зямлі: Падласая II зьяўляецца працягам Падласай I, як і твае дзеці будуць працягам твайго ўласнага існаваньня. Ты бесьсьмяротны і ўсе жывыя істоты не прападаюць у хвалях сусьвету.

Не такімі словамі гаварыў Цыпруку гэтыя думкі той «нявідочны», але сэнс такі быў.

Падласая II даравала Цыпруку на кожныя каляды «сынка».

Так Цыпрук называў бычкоў Падласай II.

Вельмі чуліла Цыпрука, што Падласая II кожны раз целіцца ў сьвятыя дні «ражства». У гэтым ён бачыў «божы знак», глядзеў на Падласую II набожнымі вачыма. Але вельмі шкадаваў, што ў яго не застанецца ад Падласай II насьледніцы—Падласай III. Праўда, ад бычкоў, калі яны вырастаюць у бугаі, таксама ідзе працяг роду, толькі тут генеолёгія такая заблытаная, што Цыпрук відавочна ня можа мець у сваім хлеве сымболю вечнага быцьця. Працяг роду павінен быць ад маткі. Магчыма і ў гэтым была для Цыпрука дзеля чагосьці новая адзнака ад «нявідочнага».

Ён часта прыглядаўся да Падласай II, вывучаў добра яе норавы: яна была спакойная, не пераборлівая ў ядзе, ня ішла ў шкоду і, наогул, мела шмат добрых якасьцяй у сваёй натуры, якія можна было параўнаць да вельмі добрага чалавека, якіх Цыпрук у жыцьці мала бачыў.

І што болей за ўсё яго дзівіла—гэта вочы каровы: рахманыя, добрыя і такія разумныя, ажна часам, калі яна доўга пазірала на Цыпрука, якому здавалася, што во' зараз загаворыць... Часам, у халодную зіму, калі пад вясну з кормам прыходзілася кепска, і скаціна галадала,—у вачох Падласай II блішчэлі слёзы...

Цыпрук гэта многа разоў бачыў.

А, бывала, Цыпрук ідзе ўвосень за гумно, дзе Падласая II пасьвіцца, дык яна ціха рыкне да яго. Гэта Цыпрука вельмі цешыла і разьлівала па яго старых грудзёх цеплату...

Калі вёў Падласую II на продаж у Менск, ня мог у вочы ёй глядзець: вялікі злаўчынак. Толькі адзін раз у вочы ёй зірнуў.

Яны былі, як заўсёды, рахманыя і спакойныя. Але яму здавалася, што не такія. Ён бачыў у іх тое, што хацеў бачыць,—адлюстраваньне свайго ўласнага настрою.

Яму здавалася, што яе вочы падобны да вачэй «таго» («не раўнуючы»—падумаў пры гэтым Цыпрук), да вачэй «таго», які вісіць на крыжы, на «сьвятым абразе». Да Падласай II яшчэ большая жаласьлівасьць была. «Той» («не раўнуючы»—падумаў Цыпрук у другі раз)—папяровы, а «гэта»—жывая...

На Траецкай гары, у вялікім людзкім тлуму падыходзілі да яго гандляры («драпежныя, паганыя»). Мацалі Падласую II, аглядалі яе з усіх бакоў, кпілі з яе і зьдзекаваліся. З іх гутарак Цыпрук вынёс уражаньне, што...

... даплаці ім і падзякуй, тады яны забяруць карову.

Але Цыпрук разумее хітрыкі—ого!

Прадаў за сорак рублёў. Называў сябе здраднікам, паганцам.

Доўга правяраў грошы, глядзеў на іх супроць сонца, шукаў вадзяністых знакаў, паказваў міліцыянэру—ці не фальшывыя. Потым глыбока за пазуху запхнуў. Нават для малых унукаў абаранкаў ня купіў.

А заўсёды яны поркаюцца па яго кішэнях і ў торбачцы, калі здалёк прыходзіць ці прыяжджае. Вочкі іхныя блішчаць:

— Дзядок, гасьцінца...

— Дзядок...

— Буйку...

— Абаянкі...

— Цукелькі...

На гэты раз сэрца дзеда акамянела, як у разбойніка...

— Эх...

«Эх» ён кажа ўголас. Потым гаворыць у сэрцы—бяз голасу:

... Шасьціць Падласенькая за пазухай. Чатыры паперкі: паперка за кожную нагу. Чорту лысаму! Яшчэ прыдзецца наскрэбці пяць рублёў. (Пяць рублёў у старой захована)... Вось табе і пяцьдзесят! Вось табе і знаходка!

— Эх...

Па дарозе дахаты часта мацае грошы. Ведае, што за пазухай ляжаць. Але больш пэўна, калі намацаеш. Той, хто знаходзіць, можа і згубіць...

— Эх...

Па старой прывычцы глядзіць удаль дарогі, зіркае па боках. Мутна ўсюды. А, здаецца, сонца блішчыць. Няўжо бельмы на вачох вырасьлі?

Ён адчувае вільгаць на зморшчаным твары...

— Эх...

Выцірае сьлёзы.

Ясна вакол. Сьветла. Бярозка махае дзесяткамі рук, вітае яго.

А вунь бабы жыта жнуць. Мігацяць белыя хусткі, рознакаляровая вопратка. Калі-ні-калі блісьне серп на сонцы, так блісьне, нібы хто прыснуў з конаўкі чыстаю крынічнаю вадою. Хлапец зносіць снапы ў адно месца, ставіць мэндлікі. Вось сжаты шнур. Іржышча роўненькай шчацінай тырчыць, нібы падстрыжаная галава асілка.

— Ціў, ціў, ціў, ціў!—зьвініць жаўранак над зжатым полем.

Ня бачыць Цыпрук жаўранка ў празрыстым шкле паветра, але па голасу пазнае—стары знаёмы...

— Памажы, божа!—крычыць Цыпрук бабам-жнейкам.

— Сам памажы!—жартуюць бабы.

Сьмяюцца. Граюць сярпамі, іскрамі зрэнкаў і белымі зубамі.

— Эх...

Нават жнейкі яго не разьвесялілі.

... Вось табе і знаходка! Усе на вёсцы, як глянуць на мяне, так і кажуць, так і шэпчуць: «знаходка! знаходка! знаходка!»

Няўжо-ж каменьне на дарозе разумее яго мармытаньне? Спачувае Цыпруку?

— Знаходка... знаходка...

Такі час.

Жнуць жыта і ў Курганішчы. Жнеяк на полі каля рэчкі многа. Сакочуць, як куры, шчабечуць, як птушкі.

І чаго ім так весела? Напрацаваліся за дзень, а ім хоць-бы што—сьмяюцца, жартуюць. Яны да-чырвана накалілі на сонцы рукі (галовы пакрыты хусткамі). І куды не пранікае сонца? Падсмажвае ўсё цела чалавечае, як на гарачым вугольлі: у дзяўчат-жнеяк ногі таксама сьпечаны сонцам: цёмнабурыя, поўныя, пругкія і набітыя знутры нечым цьвёрдым і круглым. А ступні—чорныя, патрэсканыя ад гразі і ветру, ад хлеўнага гною.

Сонца заходняе топіцца ў шызых валокнах хмар, бляднее. Гоняць з поля стада. Наперадзе бягуць сьвіньні—крычаць.

... Заўтра дождж будзе, ці што?

Ластаўкі кружацца над вадою, апускаюцца, беленькія камізэлькі ледзь не дакранаюцца да сіняй прохладзі вады; пішуць сталёвымі адшліфаванымі крыльлямі па вадзе; пішчаць, літасьці просяць, трывожацца.

... Заўтра дождж будзе, ці што?

Так варожыць на пагоду стары Цыпрук. Ён апынуўся ў Курганішчы. Не пашоў дамоў, а іншай дарогай сюды прышоў. Пацягнула... Яму трэба пагаварыць з Крушынскім аб вельмі важнай справе.

Не знайшоў гаспадара ў хаце. Пашоў на поле. І тут яго няма. Жабы пад нагамі скачуць.

... Заўтра дождж будзе, ці што?

Ён трывожыцца:

... Цяпер патрэбна пагода.

Цыпрук пашоў начаваць да старога селяніна, дзе быў у мінулы раз.

Неба было хмурае, калі раніцой Цыпрук стаяў на дварэ ў Курганішчы.

Прысеў на ганку. Ледзь дачакаўся гаспадара. Зусім ветла, нават з усьмешкаю, сказаў Крушынскаму «дзень добры»!

— Маеце да мяне справу?—запытаўся Крушынскі і зусім у другі бок глядзеў.

Цыпрук пацерабіў бародку і апусьціў галаву, як вінаваты. Яго голас быў трохі прыдушаны, шапатлівы і хрыплы:

— Памятаеце, як вы анэгды перагналі мяне на дарозе? Вы ехалі тады з аграмонам, што ў мяне начаваў, ці што?

Крушынскі зірнуў на яго схаладзелымі вачыма.

— Памятаю.

— Я знайшоў ваш пакунак—сукно... У вас выпала з воза...

Крушынскі таргануў левай нагою.

— Што? Які пакунак?!

— Ну, кортрабанда, ці што?

— Ніякіх пакункаў ня ведаю і ня губляў!

— Як не? Адразу знайшоў пасьля вас. Вы шыбка паехалі. Крычаў, хацеў дагнаць і ня мог,—схлусіў Цыпрук.

Крушынскі ціскаў плячыма, круціў двума пальцамі правы вус і дзівіўся.

— Апамятайся, стары! Што ты?!

Ён палажыў Цыпруку руку на плячо і зацікаўлена запытаўся:

— Што ты зрабіў, дзядзька, з гэтым пакункам?

— Я то нічога не зрабіў, зрабілі чырвонаармейцы. Арыштавалі мяне.

Цыпрук усё расказаў.

— Мой сын Мікола—рабфакавец, кажа, што гэта ваша кортрабанда, што на вас напіша.

— На мяне?! Што ты, дзядзька! Апамятайся! Мала людзей езьдзіць па дарозе. Гэта-ж сьмех. Вельмі шкода мне цябе, дзядзька, што карову прадаў на штраф, але прычым тут я?

Крушынскі гладзіў плячо старога і ўсё гаварыў:

— Шкода, шкода.

Цыпрук усхліпваў:

— Праўда, я і Міколе, сыну свайму, сказаў, што ня ваша віна. Хто будзе губляць такое дабро? Сьмех адзін, ці што?

— Зайдзі, дзядзька, пасьнедаць! А я бягу, часу няма.

Крушынскі пашоў у кузьню, скуль чуваць быў звон малатка.

... Ї чаго я валокся блізкі сьвет нямаведама куды?—пытаўся сам у сябе стары Цыпрук.

Ён ішоў з Курганішча дамоў. На дарозе нікога ня было. Толькі водаль па сьцежцы дыбаў чалавек.

... Нічога ня будзе з гэтага. Дарма прычапіўся да гаспадара Курганішча. Прыстаў, як бярозавы ліст да...

Кінуў вачыма на дарогу. Зьдзівіўся.

... Нячыстая сіла арудуе?

... Зноў д'ябал круціць?

... Ці не шаптунова работа?

Такія запытаньні задаваў сабе Цыпрук і, як укопаны, спыніўся.

Перад ім каля самых ног ляжала невялічкая белая хустачка, зьвязаная ў вузялок...

... Зноў знаходка, ці што?

У Цыпрука задрыжэлі рукі. Ён азірнуўся па бакох.

... Нікагусенькі няма... Тай чалавек пашоў полем, у бок...

... Не! Пайду...

Цыпрук зірнуў на маладую бярозку, што стаяла застыглая на мяжы, перажагнаўся, плюнуў і, адышоўшы на тры крокі ад знаходкі, адвярнуўся тварам да белай хустачкі.

Рашуча падышоў, нагнуўся і падняў...

У хустачцы шуршаць паперкі.

Разьвязаў.

Вочы ў яго шкляныя—ад спалоху:

Пяць чырвонцаў па дзесяць рублёў...

... Божа літасьцівы! Няўжо гэта праўдзівыя грошы?!

Сунуў за пазуху, да «тых», што Падласая II на памятку пакінула, палажыў хустачку на тое самае месца і пашоў.

... Каб ведаў, што знайду грошы, дык Падласая дома асталася-б.

Ішоў хутка. Не аглядаўся. Адчуў вільгаць поту пад кашуляй каля пояса. Сэрца малаціла ў грудзёх, выстуквала:

— Знаходка!

— Знаходка!

— Знаходка!

На мяжы стаяла бярозка, шчупленькая, з тоненькімі галінкамі, з кволымі лісткамі. Каб яна мела вушы жывой істоты, дык прыслухоўвалася-б да мяккага лапцёвага тупату Цыпруковых ног і пачула-б у яго кроках захаваную трывогу. Каб мела вочы, дык з цікавасьцю глядзела-б, як постаць Цыпрука драбнее-малее на дарозе, расьце ўніз і вось хаваецца за гліністым, рудым касагорам. Схавалася.

Няма тут Цыпрука. Нібы не шліфаваў ён на гэтым месцы гасьцінцу стоптанымі лапцямі.

Жывыя вушы і вочы ў Рахмількі: ён чуе і бачыць.

Твар яго бяз голасу сьмяяўся, калі вярнуўся з поля на дарогу.

— Ну і дзівак Крушынскі! Сапраўды дзівак! Гэта-ж трэба кідаць пяцьдзесят рублёў на дарогу, каб селянін потым не брахаў, што ён, Крушынскі, контрабандай займаецца!

Рахмілька спыніўся каля бярозкі і зьдзівіўся:

— Вось чорт стары! Не падняў...

Белая хустачка ляжыць на тым самым месцы, нібы камок сьнегу.

— А, здаецца, доўга тупаўся тут стары шэльма. Здалёк бачыў...

Рахмілька падышоў да хустачкі, апусьціў на яе руку асьцярожна, павольна, нібы ў глыб вады, і падняў парожнюю хустачку.

Гучны і шчыры рогат Рахмількі калыхаўся ў паветры над дарогай рознагалосымі выбухамі.

А знаходцы грошай Цыпрук расказаў толькі жонцы. Яны абое трымалі гэты сакрэт за зубамі, нават дзецям не расказвалі. Заплацілі пяцьдзесят рублёў штрафу і купілі другую карову.

Дзівіліся суседзі:

— Адкуль у Цыпрука грошы?

— Мо' сапраўды контрабандай займаецца?

Цыпрук маўчаў.

У яго быў такі настрой, нібы зусім забыўся аб контрабандзе і штрафу. Ён быў рады, што ў яго цяпер маладая кароўка—рабенькая, жвавенькая, на кароткіх нагах, вялікае вымя. Забыў Цыпрук і пра Падласую II. Даўно-б розныя крыўды Цыпрукова сэрца, як іржа, пераелі, каб стары не забываўся...

Толькі яго малодшы сын, рабфакавец Мікола, не забыў аб штрафе за контрабанду. Працаваў у полі хмурны і маўклівы. Яго шэрыя вочы закопваліся глыбей у падлоб'е, часта сыпалі вострымі голкамі злосьці, зарасьнікі броваў насоўваліся на іх грозна. Шырокі скуласты твар рэдка ўсьміхаўся, і выглядала, нібы на свой ранейшы вясёлы твар Мікола насунуў маску.

Пару разоў пробаваў гаварыць бацьку аб сораме, аб пляме, якая асталася ад знаходкі сукна і штрафу за контрабанду. Стары не разумеў яго.

— Гэта можа мне нашкодзіць. Скажуць: бацька контрабандысты, прагоняць з унівэрсытэту.

— Глупства гаворыш, ці што? Ніякай кортрабанды тут ня было. Ты-ж, сынок, хіба верыш мне...

У вольны ад працы час Міколе хацелася чытаць. (Хата-чытальня была ў суседняй вёсцы за восем вёрст). Браў кнігі выпадкова ў выпадковых людзей. Часта заходзіў да старога матроса Сьцяпана Солаха. Той быў матросам дзесяць год, ад 1906 да 1916 году. Потым яго збракавалі, і ён вярнуўся ў вёску на гаспадарку. Адзнакі матроса і «былой славы» засталіся ў Сьцяпана Солаха і па сягоньнешні дзень як у выглядзе і гутарцы, таксама і ў хаце наогул. У яго была яшчэ да гэтага часу матроская вопратка. Насіў штаны навыпуск, шырокія, з клёшам. А на нагах—лапці. Жыў бедна.

Ён часта расказваў Міколе аб вакольсьветных плаваньнях на караблі, аб розных землях і народах. Паказваў паштоўкі з малюнкамі розных краёў зямлі: ілюстрацыі да сваіх апавяданьняў. Паказваў прыгожыя медзяныя скрынкі і шкатулкі, якія прывёз

з сабою з карабля, і банкаўскую кніжку на шэсьць тысяч рублёў. Грошы сабраў за час службы, але яны прапалі ў банку.

У Сьцяпана Солаха была адна кніга—«Война и мир» Льва Талстога. Рабфакавец кожны раз пазычаў у былога матроса гэту кнігу і перачытваў яе. Князі і графы, княгіні і графіні, далікатныя, прыгожыя, разумныя, стаялі перад ім, як жывыя. Як чытаў першы раз гэту кнігу, дык той час, тыя людзі здаваліся яму вельмі прывабнымі. Але з кожным разам «Война и мир» адчыняла перад ім новыя далягляды, будзіла новыя думкі. І—ці хацеў гэта аўтар кнігі, ці не—на гэты раз князі і графы таго часу пачалі выклікаць у пачуцьцях рабфакаўца агіду. Ён бачыў тут нешта чужое, далёкае.

Хадзіў ён да Сьцяпана Солаха яшчэ дзеля таго, што два чалавекі яго там цікавілі—дзед і сын матроса.

Дзеду—Мірону Солаху, стукнула ўжо за дзевяцьдзесят гадоў. Дзед вечна, і зімою і летам, сядзеў на печы. Ён быў маленькі, згорблены. Валасы на барадзе калісьці (як памятае Мікола) былі белыя, цяпер жоўта-зялёныя і выглядаюць як сухі мох.

Дзед калісьці быў бортнікам. Меў каля пяці дзесяткаў калод пчол. Ён любіў лазіць на дрэвы.

— Я-б і цяпер лазіў,—ня раз гаварыў ён шамкаючы губамі,— але палякі зьнішчылі ўсе калоды. Мёд я прадаваў, а з воску сам сьвечкі рабіў і раздаваў па цэрквах за дваццаць або трыццаць вёрст. Пехатой у Менск хадзіў са сьвечкамі. Усе папы мяне ведалі. Заўсёды пехатой смаліў, каня шкадаваў, каня,—паўтараў дзед гэта слова.

Мікола ўжо ведаў, што далей будзе гаварыць дзед. Стары бортнік кожны раз паўтараў адно і тое самае:

— Надта каня любіў, каня. Ён быў гняды, разумны, як чалавек. Ды што я кажу?—Разумнейшы і лепшы за нашых дурняў!

У патухлых вачох дзеда блішчэлі агоньчыкі.

— Б'ала, пушчу Гнядога на пашу на цэлы дзень. Няхай сабе ў шкоду ідзе! Зямля была мая. Усе тутэйшыя Солахі—мае ўнукі і праўнукі. Цяпер у іх малыя палоскі зямлі—вечна дзеляцца і зямля драбнее. Гняды сам пасьвіўся. Выйду, б'ала, на двор і сьвісну тры разы...

Дзед складваў сухія зморшчаныя губы ў трубку.

... Сьвісну тры разы.—Як заіржэ Гняды, як пусьціцца бягом дадому, стане каля мяне і пачне, як сабака, рукі мне лізаць. Разумны быў конь! А потым... эт!

Стары бортнік махаў пажоўклымі кручкамі пальцаў правай рукі.

— Дванаццаць гадоў жыў у мяне Гняды. Я на сваіх плячах насіў дровы з лесу, зімой на саначках вазіў, а Гнядога шкадаваў. А потым палякі яго падстрэлілі. Не даваўся ім у рукі, як забраць у абоз хацелі. Нікому Гняды (апрача мяне) у рукі не даваўся—волю любіў. Сам яго закапаў на гумне. Эт!

Стары ківаў сухой галавою. Вочы ў яго патухалі і глядзелі на сьцяну ў нейкую аднаму яму відочную далеч.

Стары бортнік і сын яго—матрос царскай службы—жылі сваім мінулым. Зато ўнук, Саўка, жыў будучыняй.

Саўку семнаццаць гадоў. Ён высокі, як жэрдка, тоненькі, з доўгімі рукамі, румяны, бы яблыка, і сарамямлівы, як дзяўчына. Сёлета скончыў сямігодку ў блізкім мястэчку. Саўка рыхтуецца быць пісьменьнікам. Ужо гады два як займаецца пісанінай. Прыносіць чытаць Міколе-рабфакаўцу. Анэгды паскардзіўся, што бацька са злосьці (Саўка не павёў каня на начлег) парваў усе яго творы—працу за два гады. Праўда, яго творы яшчэ нідзе ня друкуюцца, але шкода...

Мікола, як мог, пацяшаў яго: ён яшчэ малады, многа новага напіша. Але Саўка быў смутны. Яго ўвесь час мучылі два пытаньні:

— Аб чым і як пісаць.

Мікола, які быў у яго крытыкам, «дазваляў» яму пісаць аб усім, што бачыць і чуе.

— Можна даваць пекныя малюнкі нашай прыроды. Вось «Гарадок» апісаў-бы. Таксама варта апісаць дзеда Мірона, бо такія людзі выводзяцца. Можна апісваць усё!

Але, галоўным чынам, Саўка мучыўся над пытаньнем, «як пісаць?»

— Вершам, апавяданьнямі, або проста ў форме артыкулаў?

Кожная з гэтых трох літаратурных форм цягне да сябе, мае перавагу над іншымі формамі.

Вершы вабяць рыфмамі, напеўнасьцю—той напеўнасьцю, якую Саўка чуе на кожным кроку: хлопцы і дзяўчаты частушкі

сьпяваюць, гармонік грае. Усюды, дзе толькі ёсьць радасьць або сум, там галоўнаю госьцяй—песьня. Нават вада пад млынавым калясом сьпявае, выдае тахт.

Апавяданьне, аднак, лепш тым, што ня трэба галаву ламаць над рыфмамі, над якімі часта прыходзіцца Саўку пацець. Часам рыфма як закруціць яго, як замуціць, як пацягне на сваім павадку ў вір, дык усе думкі, усе настроі паімчацца зусім у новы бок. А ў апавяданьні ён можа тое самае сказаць, толькі бяз крутні, можа разгарнуць думку і малюнак велічынёю ў жытняе поле, у лес...

Артыкул мае таксама свае добрыя бакі ў той час, калі, пішучы апавяданьне, прыходзіцца нешта выдумваць і хлусіць, у артыкуле даеш толькі голую праўду, як яна ёсьць. Ці не даражэй і за вершы, і за прозу гэта «голая праўда»?

Пры такіх думках сьветла-шэрыя дзіцячыя яшчэ вочы Саўкі робяцца больш задумёнымі. Ён бянтэжыцца. Быццам тры дзяўчыны завуць яго да сябе, адна да аднэй непадобная, але ўсе яны красуні. Якую любіць? Быццам Саўка піць хоча, а перад ім тры крыніцы з чысьцюткай і смачнай вадою. З якой піць?

Піша ён і вершы, і апавяданьні, і артыкулы. Разрываецца на часткі. Пасылае ва ўсе рэдакцыі. Нідзе пакуль-што ня друкуюць...

Ён часам у роспач упадае. Тады яго дух падтрымлівае Мікола. Любіць Мікола гэту сям'ю. Часта сьвідруе Міколу контрабандная знаходка бацькі: пляма, якая цяпер на ім ляжыць і можа нашкодзіць. Але пойдзе да Солахаў і забывае.

У гэтай сям'і ён бачыць сымболь трох пакаленьняў: мінулае, сучаснае і будучыню. Ён з цікавасьцю глядзіць на гэты твор (не літаратурны) самога жыцьця.

Сымболь розных пакаленьняў Мікола бачыць ня толькі тут у сям'і Солахаў, але ўсюды. Нават на рабфаку ў Менску. Паміж старымі настаўнікамі і студэнтамі часта пачынаюцца спрэчкі на лекцыях. Галоўным чынам пры выкладаньні гісторыі. Пры ім-жа выставілі аднаго настаўніка. Той тлумачыў розныя гістарычныя падзеі ня так, як трэба. Настаўнік ідэалізаваў расійскую інтэлігенцыю, «царя освободителя» і г. д.

Сустракаўся Мікола і з студэнтам Ленінградзкага унівэрсытэту, які прыехаў сюды зьбіраць народную творчасьць і вывучаць быт вёскі.

Ня вельмі цягнула Міколу да гэтага чалавека, апранутага ў шэры элеганцкі гарнітур, за лішнюю, прыкрую далікатнасьць. Ня любіў яго за гладкі, выпешчаны твар, за прыжмураныя вочы, у якіх заўважвалася пагарда да ўсяго вакольнага. З нейкай цынічнай пахвальбою студэнт расказваў Міколе аб тым, як цяжка было яму паступіць у унівэрсытэт за бацькавыя грашкі (за якія грашкі і хто яго бацька—не расказваў), але памог адзін выдатны профэсар унівэрсытэту—яго родны дзядзька.

Аднаго разу Мікола з студэнтам сядзелі на гумне. Гутарылі аб новым быце.

Студэнт даказваў, што забабоны ў народзе, якія гадаваліся тысячагодзьдзямі, яшчэ моцна жывуць у псыхіцы сялян і будуць жыць.

Мікола горача спрачаўся, гаварыў адваротнае.

— А дзікія забойствы ўсюды?—пытаўся студэнт.—За той час, что я тут жыву (а жыву я тут усяго два тыдні) аж тры забойствы былі! На вечарынцы аднаго дзяцюка зарэзалі. За тры вярсты адгэтуль сын роднага бацьку прыстукнуў. І за пяць вёрст на хутары Зялёны Бор хлопец сваю каханку ў студні ўтапіў.

— Гэта пераходны час!—тлумачыў Мікола.—Культуры ў нас яшчэ мала. А тое, што вясковыя хлопцы, як галодныя, да навукі рвуцца, гэта, па-вашаму, нічога? Бадай кожная вёска мае свайго поэту, селькора. Мы, моладзь сялянская, ірвемся цяпер да навукі, да культуры, носячы ў душы тысячагадовую смагу... Сяляне вырываюцца цяпер з турмы цемры і забабонаў... Пры лучыне кніжкі чытаюць...

— Ваша захапленьне падобна да захапленьня Саўкі пісанінай. Яго яшчэ ня друкуюць. А вашы мары аб лепшым жыцьці, пакуль-што яшчэ марамі застаюцца.

— Гэта ня мары, а сапраўднасьць. Трэба толькі змагацца, каб больш сялянскіх дзяцей у школе вучылася.

— З кім змагацца будзеце? Ваша змаганьне будзе падобна да змаганьня паміж вершам і прозай у Саўкі.

— Ён і вам расказвае аб сваёй творчасьці?—накіраваў Мікола гутарку ў новы бок.

— А як-жа! Сяготньня чытаў мне свае новыя рукапісы. Старыя яго творы бацька парваў.

Мікола і студэнт сядзелі на камні за токам, на некалькі хвілін спынілі спрэчкі.

Мікола расчуліўся ад сваіх уласных слоў. Студэнт курыў папяроску і задумёна пазіраў на шызы дымок, які струменіўся ледзь прыкметнымі тоненькімі істужкамі.

Быў заход сонца.

Дзесьці іграла труба пастуха. Выдавала гукі, нібы рог паляўнічага. Чырвона-крывавы дыск сонца стаяў нізка над зямлёй, відавочна апускаўся. Мікола заўважыў, як у студэнта ружавелі вушы, запаленыя сонцам. Тры высокія і тонкія дубочкі стаялі сярод поля, як дазорцы. Стромкія, роўныя, з кучмамі зялёных лістоў вызначаліся на смугласінім небе. З поля чуваць была жніўная сумная песьня.

— Баюся, што песьня возьме верх над прозаю ў творчасьці Саўкі!—сказаў студэнт ні то жартам, ні то сур'ёзна.—Сотні гадоў нашых сялян падтрымлівала песьня. Песьняю Беларусь была адваявана.

Мікола гучна зарагатаў:

— А Кастрычнік? А чырвонаармейцы? А партызаны?

— Іх усіх будзіла песьня.

— А ці ня будзіла іх да змаганьня кепскае жыцьцё? зьдзекі над імі багатых людзей? Ці не аб панскіх зьдзеках гэтыя песьні і складаліся?

Студэнт маўчаў.

Мікола на яго падазрона зірнуў. Вушы ўжо ня былі празрыстыя і ружовыя. Сонца зайшло.

Тры дубочкі пацямнелі. Трышчэлі конікі. Пахла мёдам і скошанай травою. На блізкіх шнурох зелянелі аўсы.

Гаспадыня Цяцера,
Ці гатова вячэра?

Так сьпявалі жнейкі, ідучы з поля.

Зноў думкі Міколы накіраваліся да конфузу бацькі—да знаходкі контрабанды.

— Даўно ня бачыў такіх прыгожых пэйзажаў!—перабіў яго трывожныя думкі студэнт.—Шкада, што хутка трэба ехаць адгэтуль. Глядзеце, як неба цямнее, лес робіцца задумёным і пагрозным... Вунь «Гарадок» зусім ужо чорным ценем пакрыты. Быццам на яго цёмную дзяругу накінулі. Эх... Люблю старасьветчыну!

На блізкім полі засьвяціўся агоньчык. Агнёвыя язычкі скакалі, выцягваліся, прымалі розныя формы. У паветры зьвінела песьня:

Мядзьведзь кару дзярэць-у-у-у...
А дзяўчына дамоў ідзець-у-у-у...

Агоньчык скакаў па іржаньні. Неба цямнела, а полымя ярчэла. Здавалася, што сама зямля выдае гукі песьні. Здавалася, што там, дзе блішчыць маленькае вогнішча, зусім іншы сьвет— цікавы, вабны.

— Няйначай, на нашым полі!—усхапіўся Мікола.—Ідзем глянем.

Яны шыбкім крокам пусьціліся да агню.

Вогнішча апусьцілася нізка. На выгарэлым іржышчы ляжала кучка шызага попелу. Над агоньчыкам кружыліся матылькі.

Старая маці Міколы ўсё падкладала стружкі на агонь.

— Маці, што робіш тутака?!—зьдзівіўся Мікола.

Старая не адказала яму. Яна трасла сухім, старчым кулаком у бок вёскі і злосна гаварыла:

— Я ёй дам! Гэтай поскудзі, гэтай паганьніцы! Я ёй...

— Каму гэта?

— Гэта яе работа! Яе—ведзьмы праклятай! Я ёй...

— Чыя работа? Што яна зрабіла?—устрывожыўся Мікола.

— Гэта-ж Мар'яна! Ведзьма тая! Пэўна яна залом на жыце заламала!

Мікола зарагатаў.

— Сьмейся, сьмейся, сынок!—пакрыўдзілася старая.

Зацікавіўся студэнт:

— Дык што-ж вы, цётка, робіце?

— Як што раблю? Адрабляю залом!

— Так і трэба,—спагадна сказаў студэнт.—І добра робіце! Чым-ж вы адрабляеце, цётка?

— Няўжо ня ведаеш?! Патрэбны стружкі ад труны і гняздо квактухі.

Студэнт выняў з кішэні блёк-нот, аловак, адвярнуўся ад старой і давай упоцёмках, наўгад запісваць.

— Дык гэта Мар'яна, кажаце?

— А як-жа, саколік,—яна!

Мар'яну студэнт ведаў. Гэта была маладая, прыгожая ўдава. Суседкі разносілі аб ёй благую славу ведзьмы-шаптухі. Хаця вясковыя не карысталіся яе шэптамі.

Міколе было сорамна перад студэнтам, што яго маці такая цёмная.

— І Мар'яна, і ты, маці,—аднаго поля ягадкі!— казаў злосна Мікола.

— Я, па-твойму, сынок, таксама ведзьма?—ускіпела на яго маці.

— І ты, і яна—дурныя бабы!

— Ідзем!—пазваў яго студэнт.

Яны пашлі далей полем.

— А гэта Мар'яна—бабец!—аблізваючыся, сказаў студэнт.—Я ад яе многа замоў запісаў.

— Шаптухі трымаюць, здаецца, у вялікім сакрэце свае замовы.

— Я ўмею падступіцца і да шаптух.

— Як гэта вы робіце?

— Я абменьваюся замовамі: навучаю іх мне вядомыя замовы і запісваю іхныя.

— Дык вы-ж узмацняеце веру ў забабоны!

— А вы хацелі, каб я з іх сьмяяўся. Тады ніводнай замовы не ўдалося-б мне запісаць.

— Цемру сееце сярод людзей!

— Інакш я ня буду мець матэрыялаў да залікаў у унівэрсытэце! А яны, вясковыя, усёроўна цёмныя! Ад маіх замоў цямнейшымі ня стануць.

— Гэта ня добра! Можа апрача цемры яшчэ што засеялі на Мар'янавай глебе? Суседкі гаварылі, што вы з Мар'янай у любошчы граеце.

Студэнт гульліва хіхікнуў.

— Глядзеце, каб нашы сяляне вас не пабілі за вядзьмарства. Добры з вас вядзьмар, новага фасону! Шкада, што ў вас дзядзька профэсар! Вельмі кепска, што такім, як вы, даюць месца ў унівэрсытэце. На вашым месцы лепш сын бедняка вучыўся-б.

Назаўтра студэнт-этнограф выехаў з вёскі. Нават не разьвітаўся з Міколай.

— Відаць, я здорава яго напалохаў!—падумаў Мікола.—Аб такім факце трэба будзе ў газэту напісаць!

Яму не ўпяршыню было супрацоўнічаць у газэтах. Першую школу літаратуры праходзіў у насьценнай газэце.

Дзень удаўся дажджлівы. Дробны, густы дождж барабаніў у шыбы. Якраз быў вольны час. У хаце пісаць нельга было і Мікола пашоў у стары ток.

Ток быў запушчаны. Дах прасьвечваўся, набрак гліняны памост. Калі Мікола праходзіў па гліне, дык ногі гразьлі і сьляды ад іх заставаліся на памосьце. Пахла трухляцінаю і вільгацю. Пад дахам было шмат павуціньня. Ток яшчэ быў пусты. Жыта было ў азяродзе. На сьцяне на калкох віселі граблі, вілы і цапы. У кутку стаяла пара кублаў, адзін парожны, а другі з леташнім сухім гарохам. Каля сьцяны пад цэлым кавалкам даху стаяла «машынізацыя» іхнай гаспадаркі—старая арфа. Мікола прымасьціўся да арфы і пачаў пісаць корэспондэнцыю ў газэту аб новым знахары. Кожны раз, калі яму прыходзілася пісаць для газэты аб недахопах у савецкім будаўніцтве, ён успамінаў словы свайго начальства:

— Ня трэба сьмецьця з хаты выносіць. Усё можна наладзіць сямейным парадкам. Кожны раз Міколе агідна рабілася ад гэтых слоў. Ён напісаў вельмі вострую корэспондэнцыю. Думаў— у якую газэту пасылаць.

— Трэба было папрасіць Саўку што-колечы на гэту тэму напісаць!—пажартаваў у думках Мікола.—Але шкада хлапца, бо пачнецца ў яго творчасьці зноў блытаніна паміж вершам, апавяданьнем і артыкулам.

Як расьпісаўся, дык яшчэ захацелася пісаць.

— Аб чым-жа?

Успомніў знаходку бацькі і штраф.

— Ёсьць! Толькі не для газэты, а заява ў пагранатрад.

Мікола напісаў:

«Як усім вядома, у пагранічнай паласе арудуе контрабанда. Каго трэба, таго ня зловяць. Часам пападаюцца зусім невінаватыя людзі. Нядаўна аштрафавалі і майго бацьку, Цыпрука Ярэмчыка, на пяцьдзесят рублёў за контрабанду. Каб зьняць паганае кляймо з нашай сям'і, паведамляю, што яму, бацьку майму, Цыпруку Ярэмчыку, гэта контрабанда (кавалак сукна) была падкінута на дарозе Язэпам Крушынскім з хутару Курганішча.

Я гэта магу сказаць напэўна, бо ва ўсёй ваколіцы ведаюць, што ён гэтым займаецца. Я шмат дзе распытваўся—усе тое самае гавораць аб ім. Хаця яго цяжка злавіць. Калі бацька мой, Цыпрук Ярэмчык, ішоў па дарозе, то яго дагнаў і перагнаў на фурманцы Язэп Крушынскі з Курганішча. Ён ехаў з нейкім аграномам. Відаць, як пабачылі здалёк чырвонаармейцаў, дык выкінулі контрабанду з воза. А мой бацька, Цыпрук Ярэмчык, падняў гэта з дурасьці сваёй. Можа быць, што і я сам, яго сын, Мікола Ярэмчык, хоць і рабфакавец, таксама падняў-бы з зямлі такое дабро. Няўжо-ж мяне маглі-б за гэта судзіць і штрафаваць? Мой грамадзянскі доўг паведаміць вас аб гэтым факце і прасіць зрабіць вобыск у Курганішчы. Там, пэўна, шмат чаго забароненага можна знайсьці».

Мікола падпісаўся пад заявай і быў вельмі здаволены.

Гудзеў дождж. Тонкая, мутная пража цягнулася з хмар і наўскос ударалася аб зямлю.

XX

На прыбярэжжы ракі распоўсься-распластаўся жоўты пясок—пругкі, падатлівы, як пытлёўка. Малыя дзеці тут часта забаўляюцца: печачкі робяць, булкі пякуць.

Пясок асьляпіў каля дзесяціны зямлі, ніводнай траўкі няма.

Нярэдка на гэтай маленькай «Сахары» людзі раніцою знаходзяць воўчыя сьляды. Тады вяскоўцы заводзяць гутаркі аб аблавах, аб паляваньні. Злуюцца і ядранымі слоўцамі лаюцца тыя з гаспадароў, каго воўчыя сьляды моцна торгаюць за сэрца—у каго са стада воўк авечку павалок. Ці будзе аблава ці не, а пакуль што хлопчыку-пастуху даюць з сабою ў поле старасьвецкую, паіржавелую стрэльбу—абарону ад драпежніка. Хлопчык рады, пухкае-страляе ў чыстым полі: дымок расплываецца, смурод ад пораху казлыча ноздры, сьлязіць вочы.—Адгалоскі разыходзяцца, расплываюцца гукавымі хвалямі ў паветры і даносяцца да сяліб, да вушэй гаспадароў.

Радуюцца сяляне, што пастух ня дрэмле, стада вартуе. А ў той-жа час шкадуюць: многа набояў і пістонаў псуе «падшывалец».

— Гэта-ж грошы каштуе...

Правандруе, прагойсае вецер па пяску і замяце воўчыя сьляды. Як-бы іх тут ніколі ня было. Пасьпеў за нейкі час селянін забыць пра авечку, не дае болей пастуху стрэльбы ў поле. І не памятаюць прасторы, што тут яшчэ колькі дзён таму назад водгаласкі-рэхі каціліся і палохалі неба.

А такая забава зусім не для дарослага чалавека: пасьля купаньня голым спацыраваць у гарачым ад сонца залацістым пяску.

Дарослы чалавек любуецца на адбіткі ўласных ног. Пясок гладкі і пяшчотны, як падушка. Чалавек ляжаў-грэўся раней у гэтым пяску, раскідаў рукамі, нібы плысьці зьбіраўся, прыкладваўся тварам, як да прыску. Пясок, нібы п'яўка, высмактаў рэчную вільгаць з цела.

Ён стомлена падняўся на ногі, быццам не сваё ўласнае цела падымае, а цягне ўверх з гультаяватым крэктам і стогнам нейкі цяжар на сьпіне; абцёр, абтрос пясок з грудзей, рук і з усяго цела, прыплюснуў вочы на сонца, нібы кот, зьнізіў іх на зямлю, наставіў правую далонь над вачыма, як брыль, і давай шукаць па шліфаваным золаце пяску воўчых сьлядоў.

— Вось яны!

Абрадваўся знаходцы.

Пярэднія лапы глыбока адклеймаваны. Каб цяпер улілі туды вадкі разьведзены гіпс, дык воўчыя лапы вышлі-б жывюткімі.

Чалавек усьміхаецца.

Доўга, з вялікай зацікаўленасьцю, глядзіць на воўчыя сьляды—і вось пачынае практыкавацца ў новым мастацтве: ён робіць спробы ўласнымі сьлядамі. Спачатку згібае і разгібае пальцы ног, робіць імі розныя выкрутасы як пальцамі рук.

Ён успамінае, што калі быў яшчэ хлапчуком, бачыў на Траецкай гары ў Менску ў балаганчыку чалавека зусім бяз рук. Той трымаў аловак правай нагою і пісаў, пальцамі ног уцягваў нітку ў голку. Усё гэта рабілася пад музыку губной гармошкі. Каб любавацца на гэты фокус, ён тады заплаціў пяць капеек.

Ён ставіць цяпер уласнымі нагамі сьляды побач з воўчымі:

— Няхай і чалавечыя тут будуць!

Прайшоўшы так некалькі крокаў, чалавек спыніўся на месцы і давай прыглядацца да ўласных сьлядоў. Углыбленьні наўмысьне прыгнутых пальцаў паказваюць форму нагі не чалавека, а нейкага

невядомага драпежнага зьвера побач з вядомымі воўчымі сьлядамі.

Чалавек застыў на месцы. Пачуў за плячыма мяккае шорханьне крокаў і стрыманы гарлавы сьмяшок, нібы не сьмяецца хтосьці за плячыма, а душыцца косткаю, стараецца выплюнуць яе.

Чалавек адвярнуўся.

У сонечнай празрыстасьці летняй раніцы мітусілася чорная фігура.

— Дзень добры, Язэп Сымонавіч!

— Добрага дня, айцец Дзімітры!

— Як Адам біблійны ў раі, голы, пад сонцам.

Айцец Дзімітры мераў голае цела Крушынскага прыплюснутымі вачыма.

— Толькі Эвы няма. Вось, айцец, зноў воўчыя сьляды.

— Але-ж побач і чалавечыя. Кожнае жывое стварэньне, Язэп Сымонавіч, сьляды свае пакідае на зямлі. А жыцьцё— гэта той самы пясок, на якім відаць сьляды. Ёсьць сьляды, па якіх трэба хадзіць, а ёсьць сьляды грэшныя і шкодныя для чалавека. А некаторыя замятаюць свае сьляды, каб іх ня відаць было.

— Напрыклад, я і вы, айцец Дзімітры.

Айцец Дзімітры грозна зірнуў на Крушынскага.

— А ёсьць сьляды божыя, па якіх мы ня ходзім і ня бачым іх, хоць і шукаем. А вось воўчыя сьляды мы бачым і ходзім па іх...

Поп пакорліва зьвесіў галаву і ўтаропіўся на ўласныя ногі.

— Куды, айцец Дзімітры, ідзе цяпер па воўчых сьлядох?

— Іду да аднэй Эвы.

— Можа ка мне—к Адаму—яе прытарабаніце?

— Грэшныя думкі лезуць у грэшную галаву, Язэп Сымонавіч, д'ябальскія словы кажаце. А-я-яй!

Жаўтаваты палец духоўніка калупаў паветра чорным ад гразі ногцем.

— Эт, глупства,—адказаў Крушынскі,—можна ўсё рабіць, толькі каб самому сабе не нашкодзіць.

Ён засьмяяўся. Ад шчырага сьмеху дрыжэлі грудзі, моршчыўся і хвалямі хадзіў валасаты жывот.

Айцец Дзімітры захаваў свой сьмех, які падрыхтаваў Крушынскаму ў адказ, і напусьціў на сябе смутак:

— Не захочаце, Язэп Сымонавіч, такой Эвы і ня пойдзе яна да вас. Яна памірае—старая Міроніха з хутару. Іду спавядаць. Бывайце здаровы!

— Цьфу!—плюнуў Крушынскі ад усяго сэрца. Пясок расьцёр босай нагою.

Айцец Дзімітры пашоў роўнай вымуштраванай хадою вайсковага і разам з гэтым крокі яго былі ціхія, кашачыя. Ён пашоў паўз бераг ракі, чорны ў сонечным зьзяньні воўчай сьцяжынкай па душу старой Міроніхі.

У грудзёх Крушынскага засмактала. Нейкі чарвячок у сэрцы капаўся. Надакучлівыя думкі, як камары, таўкліся ў мазгох— думкі аб сьмерці.

Кожны раз, як толькі Крушынскі бачыў перад сабою роспач сьмерці, дык адразу знаходзіў шчыт-абарону: радасьць, што ён жыве.

... Гэта іншыя паміраюць. Я ніколі не памру.

Крушынскі пачаў апранацца. Яшчэ раз зірнуў на сьляды сваіх босых ног у пяску, чамусьці растаптаў іх і пашоў на поле. Весела там было—штук пятнаццаць жнеек шорхалі сярпамі. Калі-ні-калі перакідваліся жартамі, сьмяяліся.

... Даўгі выплачваюць. Тут і косы, і газэты, і пуды збожжа вясною, і асьміны бульбы. На сьвеце ні адна краплінка не прападае дарам...

Па зжатым полі, па калючым іржышчы валюхалі спакойна вароны. Як гаспадыні, яны нахілялі галовы то ў адзін бок, то ў другі, порkaліся дзюбамі ў зямлі, клявалі і асьмялелі пры людзях, быццам куры.

Крушынскі любаваўся на жытнія снапы. Яны ляжалі на іржышчы, нібы заснуўшыя дзеці; залацілася калосьсе; гаспадар нагінаўся над імі, пробаваў зерня зубамі, вокам мераў вялікае нязжатае поле, сьлізгнуўся зрэнкамі па сьпінах сагнутых жнеяк, тапіў зрок у сярповым срыбным імгненьні і па-дзіцячаму ўсьміхаўся. У гэты час яго шырокія, бураватыя далоні то рассоўвалі ад сябе пальцы ў розныя бакі, нібы хацелі загрэбсьці ўвесь сьвет, то сьціскаліся ў кулакі, быццам усё жывое за нейкі нявыплачаны доўг схавана ў яго руках.

За яго плячыма ціха краліся дзьве старыя кабеты. Крушынскі павярнуўся да іх тварам, але не пасьпеў адскочыць: яны абкруцілі яго жытнімі перавясламі.

Зарагаталі жнейкі. Крыкнулі хорам на розныя галасы:

— Выкуп!

— Выкуп!

— Выкуп!

Крушынскі выняў бумажнік, адвярнуўся ад баб (у яго вечная прывычка адварочвацца ад людзей, калі трымае ў руках грошы), пачаў поркацца ў бумажніку, шукаць дробнага серабра на выкуп з «палону».

Ноч—не такая, як усе.

Туман клубіцца па лагчынах, куродымам уецца над рэчкаю, зацягвае зямлю сьляпым бяльмом. Пяць крокаў вакол—нічагуткі ня відаць. Затое ёсьць прытул пад кожным кустом. Нібы гэта ня чыстае поле, або лес, а хата—невялікая вясковая, прытульная хата з цяплом ад бярозавага паліва. І старому дзеду ня было-б холадна.

Калі-ні-калі пераклікаюцца ночныя птушкі:

— Ціў-ціў-ці-і-іў!—так жаласна...

Рахмілька ня едзе звычайнай дарагой. Ён аб'яжджае лесам і глухім полем, мінае гасьцінец, нібы зачумленую паласу. Тлуста, не шкадуючы, намазаў калёсы. Чуваць толькі мяккі тупат конскіх ног, нібы кулаком па падушцы. У апасьлівых мясцох, блізкіх ад чырвонаармейскіх пастоў, зыходзіць з воза, бярэ каня пад аброць і вядзе памаленьку-памаленьку—нічога ня чуваць. Калі зачэпіцца за куст або дрэва, яго абсыпае з лісьцяў ціхі дождж краплінак.

Прыемна язда па «сабачых дарожках» (як кажуць сяляне), дзе ніколі жывой душы няма. Ён ведае ваколіцу, як свае пяць пальцаў правай рукі, з зачыненымі вачыма трапіць куды толькі захоча. На кожным кроку ён абатканы цёплымі валокнамі вільготнага туману.

Ноч—не такая, як усе.

Яшчэ днём прыбег хлапчук да Крушынскага, прынёс пісульку ад спульнікаў «з таго боку»—з блізкага мястэчка. У гэту ноч на граніцы будуць дарагія тавары—падэшва, мэдыкамэнты і шоўк.

Хлапчук сядзіць на возе. Некалькі чалавек, кожны сваёй сьцежкай, пехатою ідуць на граніцу.

Ї здаецца Рахмільку, што ноч—не такая, як усе: туман, таямніца і харобрасьць.

...Чым ня гэткая адвага, як на фронце на першай лініі агню? Толькі там карысьці няма, а тут, калі ўдасца, у цябе будуць поўныя кішэні золата...

У лесе, блізкім ад граніцы, людзі чакаюць Рахмільку. Яны асьцярожна здымаюць з воза шчаціну. На пустым возе застаецца хлопец. Людзі нясуць пакі з шчацінаю. Скачуць па балоце з купіны на купіну, часам па пояс у багно ўсунуцца.

На Рахмільку нападае страх—такі вялікі, ажна сэрца сьціскаецца ў грудзёх. Сполах паўзе ў яго нутро нявідочным сямігаловым зьмеем, студзіць кроў, разьліваецца па жылах ільдзяной дурнап'янай настойкай. Шапка расьце на галаве. Так заўсёды, калі ён тут бывае. Кожны раз клянецца самому сабе, што болей ня будзе езьдзіць на граніцу, што гэта апошні раз. Сьведкам у яго—бог... Але «сьведка» маўчыць і, заўсёды пасьля ўдачнага «паходу», Рахміька забываецца і аб страху, і аб «сьведку». «Сьведку» ён ня бачыць, а страх надыходзіць заўсёды толькі на гэтым месцы—на балоце, недалёка ад рэчкі, а потым лезе ў шчыліну, нібы цень зайца. Сягоньня страх крадзецца да яго з-пад кожнага куста, змрочнай вольхі, ці дробнай скрыўленай бярозкі. Корч здаецца яму чалавекам. Лісьцяны шолах—падазроным шэптам.

— Ціха... чаго так сапеш?—кажа Рахмілька суседу.

— Асьцярожна...—шэпча другому.

Густы туман сьцелецца па рудаўках. Дзесьці з-пад карчоў выдае адрывістыя гукі бухала. З таго берагу рэчкі, з заграніцы чуваць крыкі пеўняў і стрыманыя брэхі сабак.

Рахмілька спыняе людзей і пачынае пільна прыслухоўвацца. Брэшуць у пераменку два сабакі: адзін грубым працяглым басам з рознымі пералівамі, якія пераходзяць у жудаснае выцьцё, другі—з няпэўным хрыплым піскам. Як сьціхне адзін, пачынае другі. Па чарзе глушаць ноч няпрыемным гаўканьнем.

— Эт, глупства!

Ідуць далей.

...У апошні раз... Няхай сам Крушынскі папробуе...

Вось і рэчка. Шырокае плёса. З «таго» боку—высокая сьцяна тонкай лазы. Перайшлі ў брод. Іх чакаюць на «тым» баку за лазьняком.

— Прэндзэй, панове псякрэв... Прэндзэй!—прыганяе польскі жаўнер.—Зараз другая зьмена прыдзе!

І ў слове «прэндзэй», і ў лаянцы жаўнера Рахмілька адчувае спагаднасьць і спачуваньне. Знаёмыя гандляры з «таго» боку гавораць голасна, зусім не баяцца... Правяраюць тавар, запісваюць, даюць адны адным пісаныя рахункі.

Брэх сабак на польскім баку аддае вясковым прытулам.

Рахмілька і ня думаў баяцца. Ён гэта жартаваў сам з сабою... Людзі, якія прынесьлі шчаціну і цяпер узвальваюць на плечы лубянкі з заграмічным таварам, апускаюць за пазухі бутэлькі «пілсудчыны».

Рахмілька нешта совае ў рукі жаўнеру.

Прыглушаны ў руках звон: мова залатых «імпэрыялаў» з двухгаловым арлом і галавою Мікалая.

— Прэндзэй! Прэндзэй!

Зноў дарога назад.

Той самы туман—той самы страх. Рахмілька прыпамінае цяпер выгляд жаўнера: чорныя вочы, чорныя, падстрыжаныя вусікі і бліскучы брылік шапкі. Вельмі прыемна Рахмільку робленая злосьць жаўнера, яго свойская лаянка.

... А нашы?.. Яны і ня злуюцца, а страх бярэ...

... Толькі да фурманкі дабрацца...

Фурманка ўяўляецца цяпер Рахмільку месцам паратунку. Там, у лесе, ляжыць на драбінах сьвежае сянцо. Можна расьцягнуцца на сене, прытаіцца і ляжаць. Ён знае такія дарогі, дзе сам д'ябал яго ня знойдзе. У выпадку небясьпекі, можна пры фурманцы пабыць. А пасьля тавар схаваць, а фурманку з хлапчуком адправіць. Фурманка якраз з недалёкага адзінокага хутару, дзе шчаціна ляжала. Хлопец паедзе туды сам.

Парадзеў туман.

На цёмна-сінім небе блішчаць зоркі. Вызначаюцца ярчэй абрысы кустоў і дрэўцаў на балотным абшары. Туман прыціснуўся ніжэй да зямлі, пабялеў, як малако. Туліцца да яго Рахмілька, як дзіцё да маткі, прыгінаецца, і сябры з яго сьмяюцца.

— У апашні раз я тут,—шэпча ён.—Бог сьведка, у апошні раз... Няхай сам Крушынскі...

Рахмілька ў зрокавай памяці бачыць усю дарогу дадому— да таго месца, дзе ўжо ніякая небясьпека яму не пагражае.

... Яшчэ сто крокаў і мінем балота. Пасьля вялізнай вываратні пакіруем налева. Некалькі вёрст лесам бяз сьцежкі пойдзем. А там полем. Хлопец з фурманкай паедзе дахаты. І ўсё...

— Стой!—грымнуў з боку лесу голас чырвонаармейца.

— Сто-о-о-ой! А то страляць буду!

Людзі паскідалі з плеч лубянкі ў балота, прыгіналіся да зямлі і пачалі ціха і асьцярожна адсоўвацца ў розныя бакі. Прыходзілася брысьці па пояс у балотнай жыжы.

У Рахмількі сэрца ўскаланулася ад нязвычайнага страху. Сьцюжа пранізала яго да самых касьцей.

— Браткі! мяне пачакайце!

Ён кінуўся, няпрытомны, назад убок граніцы.

Раздаўся стрэл.

Пошчакі разьляглíся ў лесе. Нібы нехта вялізны ходзіць там і вецьце ламае. Нешта моцна стукнула ў сьпіну Рахмількі, быццам хто кулаком грукнуў. Але зараз-жа палягчэла. Рахмілька забыўся, дзе ён і што з ім. Прапаў страх. Туман ірвануўся ўверх, панёсься ўгару—у неба з надзвычайнай шпаркасьцю, пакінуў на свамім месцы непраглядны густы змрок.

Туман яшчэ дыміўся над рэчкай, але неба было ўжо ранічнае, сьветлае. Каля лесу ляжаў цень—маленькая спадчына ночы. Трава імжэла вільгацю расы. Самотная песьня жаўранка зьвінела жаласьлівай просьбаю на ўсход сонца. Перад тым, як падняцца над шапатлівай сьцяною лесу, сонца акрывавіла шырокую паласу неба. Зашастала крыльлямі дзікая качка. Яна ціха плыла ў бяздоньні паветра, колеру віна, за ёю—другая, трэцяя, і хутка цэлае стада лятуноў вісела над рэчкаю, над лесам. А вось утонула ў вышыні стада качак—ніколі іх там ня было.

Усход сонца афарбаваў вакно ў спальні Крушынскага. Макаў цьвет гойдаўся на сьцяне. Аб гладкае шкло вакна біўся тоненькімі, як папяросная папера, скрыдлачкамі сіні матылёк. Ледзь чутны былі яго датыканьні да празрыстай шыбы. Крушынскі ўжо ня спаў. Яму здавалася, што гэта нечыя пальцы асьцярожна дакранаюцца да шкла: яго нехта заве,

Ён асьцярожна, каб не разбудзіць жонку, сеў на ложку.

Паводле ўгавору, Рахмілька павінен быў зараз прыйсьці, каб паведаміць аб выніках гэтай ночы, расказаць, як удалася справа.

— Чаму Рахмількі яшчэ няма? Ён павінен быў прыйсьці сюды ўжо гадзіну таму назад.

Крушынскаму неадчэпна лез у галаву вясёлы твар Рахмількі, яго зычны голас, інтонацыя. Часам Рахмілька гаварыў сьмешна. Гэта было тады, калі стараўся хутка гаварыць. У такіх выпадках ён сам замест «з» гаварыў «ж», замест «с»—«ш», замест «ц»—«ч» і наадварот. Напрыклад, «шагоньня пойджам на шаназач» замест «сягоньня пойдзем на сенажаць».

Крушынскі ўспомніў гэты сказ, пачаў мармытаць Рахмільчыны словы. Яму ніяк не ўдавалася выгаварваць так, як Рахмілька. Потым яго думкі пераскочылі на тыя пяцьдзесят рублёў, што выкінуў на дарогу для селяніна, каб той не брахаў аб контрабандзе. Рахмілька яго за гэта прабіраў, але ён, Крушынскі, ведае што робіць; засееш капейку—і вырасьце рубель. Трэба толькі ўмець сеяць.

Ён падлічваў напамяць, колькі яму каштавалі косы, газэты, выпіўкі і розныя падарункі суседзям. Падвёў агульны падрахунак. Потым давай лічыць тое, што на жніве бабы адрабля̀лі, сенакос і іншыя такія адробкі. Вышла, што яго выдаткі вярнуліся назад удвойчы, утройчы....

Ён усьміхнуўся. Каб усьмешка ня была захавана пад вусамі, дык выглядала-б усьмешкай бога—дабрадушнай, выбачлівай і спакойнай. Так прынамсі маляваў-бы госпада-бога той маляр, у ўяўленьні якога бог—ня грозны мсьцівец за грахі людзкія, а разумны, хітраваты і не заўсёды кепскі.

За тонкай сьцяной спальні чуваць былі шолахі і ціхае мармытаньне. Там спала ў алькерыку настаўніца Стэфка.

Крушынскі, у кожную ноч, тоячыся ад жонкі, прыслухоўваўся да таго, што робіцца ў алькерыку. Гэта з тых часоў, калі Стэфка танцавала, на вясельлі. Спачатку ён стараўся рознымі спосабамі ўгаварваць самога сябе, што ня трэба яму цікавіцца гэтай дзяўчынай. Па-першае, пачуцьцё да яе адарве яго ад працы. Аднак, гэта «па-першае» было зараз-жа адкінута—ён з яшчэ большым імпэтам імкнуўся зарабляць грошы,

бо яны яшчэ больш патрэбны ў сувязі з гэтай дзяўчынай. Па-другое—у яго жонка і дзеці. І «па-другое» было скасавана: «Няўжо-ж, калі ў мяне ёсьць сям'я, я не павінен мець тэй асалоды, якую сям'я даць ня можа? Гэта сям'і не зашкодзіць і, галоўнае, каб ніхто ня ведаў». Па-трэцяе, па-чацьвертае і г. д. Чаго-чаго ён ня прыдумваў супроць гэтага! Розныя сьмешныя довады лезьлі ў галаву: «яна» звычайная дзяўчонка, якіх ён тысячамі бачыў і не зварачаў на іх увагі; «яна» дачка такіх няпрыемных бацькоў: сьляпой маткі і вар'ята бацькі, у іх нейкія жудасныя рысы твару, а «яна» да іх падобна; «яна», калі будзе старой, дык стане такой брыдкай, ажна агідна будзе; «яна», калі памрэ, дык згніе, паветра будзе такое, што прыдзецца нос затыкаць. Кахаць трэба тое, што надзвычайна, вечна, а іначай—ня варта.

Але ўсе яго довады супроць Стэфкі разьбіваліся, нібы хвалі аб каменьне. У той час, калі да іншых дзяўчат ён адносіўся проста і сьмела, калі «браў» іх незадумваючыся, Стэфка зрабіла на яго нейкае новае ўражаньне. Ён сароміўся яе, губляўся. Яму было цэлы дзень прыемна пасьля таго, калі пагаворыць з ёю некалькі слоў, калі «яна» яму ўсьміхнецца.

Па начох ён кожны раз чуе згукі і шолахі ў алькерыку. Наўмысьля кладзецца рана ў ложку, каб прыслухоўвацца, як Стэфка распранаецца. Заўсёды пры гэтым яна ціха сьпявае, напявае бяз слоў незнаёмыя Крушынскаму мэлёдыі. І тым самым, што мэлёдыі незнаёмы, яны робяцца яшчэ вабней, водзяць яго за руку ў нейкія невядомыя і вельмі прыгожыя мясьціны. Кожны раз перад сном ён мерыцца вухам да асьцярожнага стукату маленькіх завостраных абсацаў яе «лодачак». Пры гэтым, калі Стэфка праходзіць недалёка ад вакна, ледзь скрыпне падлога. «Яна», відаць, глядзіць у вакно і думае. «Аб чым яна думае?..» А вось скінула цацкі-«лодачкі». Мякка ступае па падлозе босымі нагамі. Яе ножкі, нібы гумалястыкавыя, шчыльна прыстаюць да падлогі, лашчаць падлогу гладкай скурай пятак і пальцаў. Крушынскі пачынае пільней прыслухоўвацца: нібы ўзмахі крыльляў—яна зьнімае лёгкую летнюю вопратку. «Якое ў яе, мабыць, прыгожае, маладое цела...» Абрысы яе цела яму знаёмы з тых часоў, калі яна танцавала. Вось яна лягла на ложак. Ляжыць у пуху, як птушка ў гнязьдзе. «Жонка палажыла на яе ложак пуховую пярыну».

Заўсёды доўга прыслухоўваецца. Ня сьпіць. Стэфка сьпіць ціха, зусім не храпе. Гэта толькі ён і ўся яго сям'я храпе ўночы.

Ён засыпае позна.

Пані Ганна прачынаецца часта. Даўно муж яе не ласкаў, а вось, сплючы, абымае яе, песьціць, лашчыць, цалуе, так палка і горача, ажна ёй чамусьці няпрыемна ад гэтага.

... Ці ня думае ён, што я—чужая? Ці ня сьніць Стэфку?

Пані Ганна доўга ня сьпіць, непакоіцца.

... Можа ён спрасоньня гаварыць пачне? Можа пачую захаваныя сакрэты яго думак?

Так кожны дзень.

У гэту раніцу Крушынскі даўно ня сьпіць. Сядзіць на ложку. Сіні матылёк прыліп крыльлем да вільготнага вакна.

... Чаму яшчэ Рахмількі няма?

Раптам пачуў крокі ля вакна. Ускочыў, узрадаваўся:

... Нарэшце дачакаўся...

Нечая рука падсунулася да шыбы і пачала барабаніць. Зазьвінела шкло.

... Ах, які ён неасьцярожны—гэты Рахмілька! Зусім не выпадае шуму рабіць...

Ён пляснуўся цёплым носам аб халоднае шкло вакна, каб прабраць Рахмільку за такую неасьцярогу.

Каля вакна на двары стаялі два чырвонаармейцы. Адзін кіўнуў яму рукою, каб вышаў да іх.

У Крушынскага такое адчуваньне, нібы яго ашпарылі варам. Ён пачаў хутка апранацца. Жонка моцна спала, не прачнулася нават тады, калі рыпнулі дзьверы.

Крушынскі вышаў на ганак.

— І халодная-ж раніца сягоньня.

Дрыжэў...

— Зусім няхаладна. Гэта вы ад сну, таварыш Крушынскі. Выбачайце, што мы вас разбудзілі.

Тон чырвонаармейца быў лагодны. Крушынскі супакоіўся. Дрыжыкі скончыліся.

— У чым справа?

— Трэба запрэгчы каня і ехаць на граніцу. Контрабандыстага застрэлілі. Мы крычалі «Стой!», а ён уцякаў. Ну, і бухнулі... Чаго-ж ён, дурань, уцякаў? Эх і забілі чалавека...

... Рахмільку забілі... і давай прыглядацца да простага сялянскага твару чырвонаармейца. Шчырае пашкадаваньне сьвяцілася ў яго шэрых вачох. Вопратка запэцкана ў гразі па пояс.

— Дзе вы так выкупаліся, таварышы?

— На балоце. Ледзь не ўтапіліся ў поцемках. Там некалькі чалавек было. Уцяклі. Толькі адзін ляжаць астаўся. Мы яго выцягнулі на сухое месца.

Да Крушынскага вярнулася ранейшая спакойнасьць. Запрагаючы каня, ён прыдумваў плян, як самому выйсьці сухім з гэтай гісторыі.

Сонца ўсплыло яркае і цёплае. Пад лесам з кожнай хвілінай драбнеў і радзеў цень. Ехалі па роснай траве. Усю дарогу Крушынскі горача лаяў контрабандыстых.

— І ёсьць-жа такія людзі! Пэўна, калісьці хаваўся, каб не папасьці на фронт, а вось тут пагібель знайшоў: на фронце золата. Эх шэльма! Ды чорт яго бяры! Сабаку—сабачая сьмерць! Вось жыў-бы спакойна, працаваў-бы, дык не! багатыром хоча стаць, сукін сын!

Крушынскі ўваходзіў у азарт:

— І я, і конь—цэлы дзень мы на полі працавалі. А вось цягайся цяпер! Дзеля гэтай праклятай контрабанды і спакойнаму чалавеку супакою няма.

Чырвонаармейцы на яго спачуваючага глядзелі, згаджаліся з яго словамі.

— Па-мойму, улада вельмі мякка абыходзіцца з імі, з контрабандыстымі,—развеажаў далей Крушынскі пад акомпанімэнт калёс,—папаўся такі ў рукі—і прыкончыць яго! Іншага паратунку няма ад гэтай драпежнай саранчы. Расстралялі-б у нас некалькі такіх адважнікаў і граніца ачысьцілася-б.

— Мы на гэта права ня маем.

Крушынскі наступаў яшчэ больш строга:

— Як гэта права ня маеце?! Цяпер улада ў нашых руках— у рабочых і сялян!

— Вельмі вы строгі, таварыш Крушынскі,—адказаў адзін з чырвонаармейцаў і шырока з апэтытам зяўнуў.

Зусім горача стала як даехалі да таго месца, дзе ляжаў забіты. Пахла хвояй. Чырвоныя мурашкі паўзьлі па сухім моху, па пнёх.

Крушынскі толькі адным вокам зірнуў на забітага.

Ён...

Калючая, драцяная шчотка праходзіла па ўсім целе Крушынскага. Да скрыгату сьціснуў зубы, каб ня ляскалі адзін аб адзін і адвярнуўся ўбок, зірнуў на расшчэпленую, каравую хвою. Хваля страху мінула. Ён спакойна прывітаўся з чырвонаармейцам, які стаяў тут, чакаючы фурманкі.

— Гэта-ж ён... Рахмілька!..—сказаў Крушынскі з робленым зьдзіўленьнем. Зьдзіўленьне яго здавалася шчырым.—І хто-б мог падумаць? Каваль, спакойны хлопец, можна сказаць—рабочы. Працаваў гэтулькі часу ў мяне ў кузьні, а вось па начох контрабандай займаўся!

Абурэньне і злосьць кіпелі ў яго голасе, сыпалі іскрамі з вачэй.

З вершаліны хвоі паглядала на яго вавёрка. Крушынскі падняў з зямлі шышку, кінуў у зьвярка і сьвіснуў.

Ён трохі супакоіўся, зірнуў на рэчку, заўважыў на балоце сьляды некалькіх пар лапцей, якія разыходзіліся ў розныя бакі. У топкіх мясцох сьляды заплывалі тлустай каляровай вадою. На больш цьвёрдым грунце пляцёнкі лапцей вызначаліся вельмі добра, як-бы выціснутыя пячаткаю на мяккім мэтале. Крушынскаму ўспомніліся воўчыя сьляды ў пяску побач з яго ўласнымі, неадчэпна лезьлі ў галаву словы айца Дзімітрыя: «ёсьць сьляды, па якіх трэба хадзіць, а ёсьць сьляды грэшныя і шкодныя для чалавека». Сухі корч вываратня, які адкідваў ад сябе цень, напомніў Крушынскаму постаць айца Дзімітрыя ў чорнай вопратцы насупроць сонца.

— Дайце, таварышы, добра пашукаем па балоце па гэтых сьлядох. Тут пэўна контрабанда ляжыць.

У яго голасе чулася надзвычайная рупатлівасьць.

— Ды там лубянкі ляжаць у балоце!

Зараз вынесем.

— Я сам! Я сам!—хваляваўся Крушынскі.

З захапленьнем і зацікаўленасьцю ён выносіў на сухое месца адну за аднэй лубянкі, запэцканыя ў гразі, клаў недалёка ад Рахмількі. Забіты ляжаў на правым баку са скорчанымі нагамі ў ботах з доўгімі халявамі. Над пасінелым тварам з выпучанымі ў застыглым страху вачыма гудзелі авадні. З боку сьпіны куля прабіла невялікую дзірку, якая на левай часьці грудзей была шмат большая і вопратка сьпераду была заліта крывёю.

Крушынскі выняў з кішэні белую насавую хустачку і закрыў твар Рахмількі.

Труп забітага палажылі на воз. Побач паставілі лубянкі з контрабандаю. Як кранулі каня, дык у возе нешта задзынкала, зазьвінела. Спынілі фурманку. «Залатыя гузікі»—у дзесяць рублёў кожны—сыпаліся з воза ў траву. Монэты былі клейкія, запэцканыя крывёю... На грудзёх у Рахмількі быў прастрэлены мяшочак з золатам і монэты рассыпаліся пад вопраткай...

Крушынскі выцірае ўспацелы лоб.

... Вось табе і мая праца...—падумаў ён.—Гэта-ж прададзеная шчаціна крывёю абліваецца...

— Ліха яго матары! Зусім не заўважыў, што ў яго золата,— сказаў чырвонаармеец, які вартаваў тут забітага, пакуль прыехала фурманка.—Трэба паглядзець тое месца, дзе ён ляжаў, можа і там насыпана золата. О, чорт!

У чырвонаармейца быў спалоханы від. Ідучы назад на балота, ён прыціснуў правую руку да шынэлі на тым месцы, дзе знаходзіцца кішэня ад штаноў... Ён палез у балота, доўга круціўся каля дрэўцаў і карчоў.

— Ёсьць!—крыкнуў ён здалёк.—Знайшоў, ліха яго матары! Во!

Ён нёс у шапцы кучу залатых монэт. Густы чуб чорных, як вугаль, валасоў спусьціўся на лоб, лез у вочы. Валасы накінуты на вочы, каб ніхто з таварышоў не пабачыў, што таіцца ў зрэнках.

— Во, ліха яго матары, прынёс!

Чырвонаармеец палажыў на воз шапку.

— А чаму гузікі чыстыя?—строга запыталіся яго таварышы.

— Я... я іх выцёр. Няўжо-ж шапку буду пэцкаць?

Яго вочы хаваліся пад чорным чубам валасоў.

— Глядзі, Панашчук!..

— Можаце мяне абыскаць, таварышы! Во, ліха вашай матары!

Ён пачаў выварочваць свае кішэні. З іх сыпалася махорка.

— Добра! У кардоне пагаворым аб гэтым!

Чырвонаармейцы злосна глядзелі на Панашчука.

Перад кардонам сабралася многа народу. У той-жа дзень уся ваколіца ведала, што Рахмілька забіты. Многія пакідалі працу і прыходзілі глядзець. Кардон знаходзіцца ў доме былога паліцэйскага вурадніка, які з усёй сям'ю ўцёк у Польшчу яшчэ ў 1918 годзе пры немцах. Хоць дом яго ў самым мястэчку, але выглядае абасобленым хутарам. Стаіць глыбока ў двары за высокім частаколам, які цягнецца ўдоўжкі на палавіну вуліцы. Некалькі дзесяцін займае вураднiцкі сад, абсаджаны з боку вуліцы густымі ліпамі.

Рахмілька ляжыць на дзядзінцы. Абапал стаяць лубянкі з контрабандаю, а золата так і засталося ў чырвонаармейскай шапцы.

Начальнік кардону—высокі худы чырвонаармеец, успацелы ад гарачыні, настаўляе на Рахмільку фотаапарат.

— Аддайце мне шапку, таварыш начальнік!—просіць той самы чырвонаармеец Панашчук, які на балоце ўсыпаў золата Рахмількі ў сваю ўласную шапку.

— Потым аддам!

Чорная чупрына Панашчука блішчыць на сонцы, лезе птушыным крылом на вочы, на твар. Усёй загрубелай бурай пецярнёю ён заграбае чупрыну і адкідвае назад, вызваляючы з-пад валасоў шырокі лоб, які да палавіны буры, загарэлы ад сонца, а вышэй таго месца, дзе заўсёды прыкрыта шапкай, мігціцца белая паласа. Каля ног круцяцца куры, капаюцца ў пяску.

— Акыш! Ліха вашай матары!

Чырвонаармеец правай нагою разганяе кур.

Крушынскі ў задуменьні круціць вусы і пазірае то на апарат, то на Рахмільку.

... Палавіну майго багацьця фотографуе гад гэты, ды што майго багацьця! Гэта-ж народнае! Для Драздоў і Дзятлаў дабрабыт рыхтаваў. Мне добра жылося-б—было-б ня кепска і ім.

Крушынскі ўсьміхаецца. Яму прыемна хоць тое, што і ў сваіх уласных думках ён апраўданы: «не яго дабро, а народнае».

Завостраны сіні нос Рахмількі ў неба глядзіць. Вочы такія, што жудасна на іх зірнуць.

Крушынскі ўспамінае гучны сьмех і вясёлыя жарты Рахмількі. Яму шкода гэтага маладога дзяцюка, так балюча

шкода, ажна нешта ў сэрцы шчаміць. Ён глядзіць на грамаду людзей, што стаіць водаль на дзядзінцы.

... Здаецца, з нашых тут няма. Вёрст пятнаццаць будзе сюды ад Драздоў і Дзятлаў. І бацькі Рахмількі яшчэ ня ведаюць. З тэй пяцёркі ніхто ня скажа, нават сваім...

Падыходзяць да трупу бабы. Ківаюць галовамі, шапочуць:

— Бедненькі...

— Такі малады...

— А-ей, колькі золата...

— Глядзеце, вунь кроў...

Пачала падсоўвацца бліжэй уся грамада.

— Ідзеце адгэтуль!—крыкнуў начальнік.

— Пачакайце, таварыш,—шапнуў яму на вуха Крушынскі.— Трэба гэты момант выкарыстаць.

— А што?

— Я хачу сказаць цёмнай масе некалькі слоў.

— Аб чым?

— Аб чым-жа? Агітнуць трэба супроць контрабанды.

— Няўжо яшчэ малая агітацыя супроць контрабанды забітыя контрабандысты!

— Так то яно так, але вось бачыце, таварыш начальнік, несьвядомая грамада шкадуе забітага. Варта некалькі слоў сказаць, растлумачыць...

— Сыпце!

Заўсёды, калі Крушынскаму прыходзілася гаварыць перад грамадою, нават у «сваім» сельсавеце, ён ня ведаў, што рабіць з рукамі.

Ён для іх тады месца не знаходзіў. Пры гутарцы рукі ў яго або віселі, або рабілі рухі зусім недапасаваныя да слоў. Рукі як-бы выступалі супроць слоў, аднеквалі іх і ілюстравалі яго захаваныя думкі.

Ён глянуў на грамаду людзей. Пабачыў перад сабою шмат твараў: сялянскіх, местачковых, старых, маладых, дзіцячых. Некаторыя стаялі, іншыя сядзелі на бярвеньнях. Людзкія твары мітусіліся перад яго вачыма, надавалі яму натхненьня.

— Таварышы,—пачаў ён хрыплаватым голасам і давай шукаць месца для рук,—таварышы!

Спыніліся шэпты. У цішыне прамоўца пачаў адчуваць сонечную сьпякоту і голад. Ён сягоньня яшчэ нічога ня еў.

Певень, які дыбаў сьпераду вялікай сям'і курэй разбойніцкай хадою, раптам ускочыў на плот, зірнуў на людзей, выцягнуў шыю і закрычаў перад усім народам грозна і строга:

— Ку-ка-ра-кг-г-гу-у!

— К-г-г-гу-у-у!—раздаўся водгалас пеўня з яго ўласнага горла.

У грамадзе нехта хіхікнуў.

Чырвонаармеец з самым сур'ёзным выглядам падскочыў да плоту і сагнаў пеўня, які перашкодзіў прамоўцу.

Крушынскі быў рады спынцы: ён у гэты час набраўся сьвежых думак. Падняў угару задумёныя вочы.

— Таварышы!—пачаў ён больш цьвёрдым голасам і забыўся, што ў яго ёсьць рукі. Пад сьпевы пеўня ён паверыў у тое, што будзе гаварыць—і словы ў яго зьвінелі шчырасьцю і рукі ў тахт словам рабілі гесты якраз на ўзмацненьне ўражаньня ад слоў.—Таварышы! Мы бачым вось відавочна да чаго даводзіць контрабанда, таварышы! Вось малады чалавек, быў добрым кавалём, мог быць карысным працаўніком для рабочых і сялян, а што ён рабіў? Што ён рабіў, таварышы?

Крушынскі абвёў вачыма грамаду з шчырым запытаньнем.

— А вось што ён рабіў—акрываваў савецкае золата, дабро рабочых і сялян, сваёй уласнай крывёю. Ганебнай справай займаўся—контрабандаю. У той, час калі мы, таварышы, змагаліся за рэволюцыю, у той час, калі мы крывавілі рукі мазалямі (ён паказвае на свае рукі), каб падняць нашую зруйнаваную гаспадарку, калі мы ў голадзе і холадзе, у сьпякоце і пад дажджом, гнуліся над сахою,—вось гэты чалавек шукаў сабе лёгкага хлеба! Зірнеце вы на гэтага ганебнага злачынца! Зірнеце!!

Крушынскі крыкнуў гнеўным голасам.

Вочы ў яго блішчэлі. Твар быў у чырвоных плямах. Ва ўсёй позе яго відаць была цьвёрдасьць і злосьць разгневанага «правадыра».

Грамада—спалоханая, зьбянтэжаная; усе, як адзін чалавек, нейк між волі пaглядзелі на труп Рахількі.

Прамоўца, упэўніўся, што ўсе зірнулі на труп паводле яго, Крушынскага, загаду, і пачаў далей:

— Вось бачыце, таварышы, якую адплату дастаў гэты контрабандысты. Вось такі лёс сустрэне ўсіх, хто толькі будзе

займацца контрабандай, хто будзе ў агульнай нашай беднаце старацца вялікае багацьце нажываць! Гэтае багацьце, гэтае золата, таварышы, украдзена ад нас! (ён стукнуў сабе кулаком у грудзі і вытарашчыў вочы, поўныя болі і пашкадаваньня, на грамаду). Гэтае багацьце ад нас украдзенае—народнае дабро! Мы працуем-гаруем, а чорт нейкі хоча нашу кроў і пот выкарыстоўваць!

Ён адсапнуўся. Палажыў адну руку ў кішэні штаноў, а другою пачаў махаць у паветры, нібы клічучы да сябе і неба, і зямлю, і ўсіх жывых істот на дапамогу:

— Таварышы! (ён захлёбваўся ўласнымі словамі). Таварышы! Вельмі добра, калі чалавек свайго жыцьця не шкадуе, калі не баіцца вось, як гэты чалавек, праліваць сваю ўласную кроў. Вельмі добра! Але гэта правільна тады, калі ён пралівае сваю кроў у змаганьні з сусьветнай акулай імпэрыялізму, калі ён стаіць на рабочым фронце супроць капіталу!

Прамоўца пачаў хадзіць, тупацца туды і сюды па траве, нібы адбівае нагамі вайсковы марш. Цяпер яму ўжо ня есьці хацелася, а піць. Ён глытаў сваю ўласную сьліну, якая пеніласяна губах, і выціраў рот рукою.

— Мы павінны, таварышы, багацець. Калі зробімся багатымі, дык уся наша пролетарская дзяржава багатай будзе. Толькі не такім чынам, як гэты злачынец! Мы павінны весьці па-культурнаму сваю гаспадарку, тады ў нас усё будзе добра! Есьць, праўда, у нас культурныя гаспадаркі, яны ў пашане ў рабочых і сялян. Ім дзяржава памагае. Аб такіх слаўных людзях нават у газэтах пішуць, портрэты іхныя друкуюць побач з портрэтам таварыша Леніна! Але такіх людзей, таварышы, пакуль што ў нас нямнога.

У Крушынскага пры гэтых словах загарэўся твар. Ён адчуваў сябе так, нібы яго аблілі бэнзынай і прыткнуліся запаленай сярнічкай.

— Толькі ня думайце, таварышы, што мы, гэта значыць, наша ўлада і яе прадстаўнікі, такія жорсткія,—што-небудзь, дык адразу страляць... Не! і гэты чалавек ня быў-бы застрэлены, каб не ўцякаў. Яму крычалі «стой!», а ён наўцёкі.

Хоць пры гэтым простым тлумачэньні ў Крушынскага тон быў ужо не ранейшы ўрачысты, аднак, ён думаў яшчэ гава-

рыць і доўга гаварыць, але на няшчасьце той самы певень зноў ускочыў на плот, зноў выцягнуў шыю і крыкнуў:

— Ку-ка-рэ-к-г-г-г-у-у!—Кг-г-г-ў-ў...

Зноў падбег той самы чырвонаармеец, кінуў у пэўня шапкай. Але ў прамоўцы прапала натхненьне і патухла вогнішча красамоўства. Зморany і ўспацелы ён зьвярнуўся з просьбай да начальніка пагранатраду:

— Ї гэтак далей, таварыш начальнік! Ваша чарга казаць прамову!

XXI

— Бог даў і бог забраў,—пацяшаў Крушынскага айцец Дзімітры.—Вы кажаце, што каля чатырох тысяч рублёў вашых прапала? У бога нязьлічоныя багацьці, калі толькі ён захоча! А што-ж было-б, каб, не ў благі час кажучы, з вамі здарылася так, як з Рахмількам? Гэта таксама знак божы! Ня трэба наракаць. Трэба радавацца, што вышла так, а ня горш. Вучэцеся ад біблійнага Іёва. У яго бог адняў і дзяцей, і багацьце, абсыпаў яго цела нейкай страшнай каростай, аднак, няшчасны не падаваўся. Скроб цела сваё чарпаком, быў бядзёрым, а потым зноў разбагацеў, бо вытрываў экзамін у бога...

Пры гэтых словах айцец Дзімітры глядзеў на Крушынскага рахманымі вачыма і гладзіў яго пяшчотна па правай руцэ.

— Я не бядую аб тым, што прапала—адказаў Крушынскі,—але аб тым, што яшчэ можа прапасьці. З кожным месяцам гандаль на граніцы пагаршаецца! Шмат людзей сядзіць пад арыштам. Арыштавалі нават знамянітую Соню. Страх напаў на ўсіх. З Менску многа паважаных людзей выслалі чорт ведае куды, на самую поўнач Расіі, дзе бадай круглы год сьнег і маразы.

— Перачакайце гэту буру, не займайцеся пакуль-што гандлем, Язэп Сымонавіч. У часы вялікай завірухі і траўка гнецца да зямлі. Дуб крышыцца і ломіцца ў трэскі, а траўка застаецца цалюткая. У гэтым і моц яе, што яна гнуткая траўка.

Айцец Дзімітры гаварыў кволым, лагодным галаском, упрашаў як бацька роднага сына.

Такая гутарка адбылася між айцом Дзімітрыем і Крушынскім якраз на тым самым месцы каля рэчкі на пяску, дзе на некалькі дзён раней поп гаварыў аб сьлядох, грэшных і шкодных для чалавека.

Крушынскі ў сумнай задумёнасьці паглядаў перад сабою ўбок Курганішча, слухаў адным вухам пацяшальную гутарку папа, а другім—лавіў гукі ваколіцы.

Па зжатым жытнім полі гудзелі конікі, скакалі над іржышчам. Іх было так многа, што здавалася, нібы гэта буйныя зерні самі сабою перасыпаюцца з месца на месца. Пасьля касьбы і жніва абшар ваколіцы як-бы папрастарнеў. Калі раней у гэтай нізіне каля рэчкі толькі коміны Курганішча і вёскі відаць былі, дык цяпер выступалі дахі, гумны з азяродамі. Дзені-дзе на полі высоўваліся курганы. Стаяла цяплынь раньняй восені і па яркай зяленіве лёну прабягаў ледзь прыкметны ветрык—ціхі і лагодны, як гутарка айца Дзімітрыя. Толькі па сямейцы дубоў на курганох ветрык гуляў болей сьмела, кратаў тонкія галіны, шалясьцеў лісьцем і намякаў на магчымасьць надыходу грозных, дажджлівых і ветраных васеньніх дзён—няпрытульных і сьцюдзёных.

Але пакуль-што блішчэла яркае сонца.

Крушынскі плюшчыў вочы ў бок Курганішча. Адтуль ішоў сьпешнымі крокамі чалавек. Спачатку відаць была толькі маленькая кропка. Праз пару хвілін чалавек усёй постацю вырысаваўся на даляглядзе. Сьмешна махаў рукамі, сьпяшаўся і рухі яго вызначаліся на фоне прастору так ярка і выпукла, што Крушынскі адчуў у ім трывогу пасланца з няпрыемнай весткай.

Крушынскі ў гэты момант чуў толькі хрыплы гуд папоўскага голасу, словы не даходзілі да яго вушэй.

— Гэта-ж Рыгор, маладажон, няйначай, ка мне бяжыць. Нешта ў хаце здарылася!—спыніў ён казаньне айца Дзімітрыя пра біблійнага Іёва.

Рыгор падбег успацелы.

— Скарэй, гаспадар, дахаты ідзеце, бо да нас прыехалі пагранічнікі. Вобыск робяць. На гумне шукаюць. Каля хаты варта стаіць.

— Якраз Іеўскія пасланцы!—спалохаўся айцец Дзімітры.— Бягу і я дадому. Трэба схаваць тое ды сёе.

— Ня бойцеся, да бацюшкі ня пойдуць,—супакойваў яго Крушынскі,—а ў мяне нічога ня знойдуць.

Крушынскі сьпешна пашоў у Курганішча з Рыгорам. Айцец Дзімітры пацягнуўся дахаты іншай дарогай.

Хоць і горача зрабілася Крушынскаму ад гэтай весткі, але ён сам сябе супакойваў:

— У хаце і на дварэ нічога ня знойдуць. На шчасьце і гарэлка ўся вышла. Кавалкі шэрсьці і іншая дробязь з заграніцы, нават гатовая вопратка, усё схавана ў айца Дзімітрыя. Што ў хаце могуць знайсьці? Ага... ледзь не забыў... Дзьве тысячы золатам закапаны ў таку, а вось у куфры ляжаць доляры—тры тысячы пяцьсот... (у яго калені задрыжэлі). Ці дагадаецца жонка дастаць іх адтуль і палажыць дзе колечы ў іншае месца? Ня так шкада грошай, але запытаюцца, адкуль іх у мяне так многа? (сэрца пахаладзела і ў вушох зьвінела). Пэўна данос... Чыя-ж гэта работа? Старога каваля, бацькі Рахількі? Ня можа быць! Тады-ж яго самога могуць арыштаваць, ня гледзячы на тое, што сына забілі. Няўжо той чалавек, які знайшоў мой кавалак сукна на дарозе? Ці-ж тыя пяцьдзесят рублёў, што Рахілька падкінуў яму, незьмякчылі яго крыўды? (ён ад злосьці патрос кулаком у паветры). Суседзі падказалі. Здаецца, апрача дабра ад мяне ніхто з іх нічога іншага ня мае... (у яго твар скрывіўся, шэрым стаў ад нечаканай праўды). Ды як падкажуць, калі самі ўдзел прымаюць?

Пры такіх меркаваньнях ён дайшоў да Курганішча.

На дварэ былі прывязаныя да плоту ад гумна двое асядланых коняй. Каля ганку стаяла пустая фурманка. Конь раскелзаны, з распушчанай падпругай нагібаўся над сьвежым сенам. Ён ляніва перабіраў пахучае сена мяккімі губамі, скоса пазіраў на бакі і пры кожным шолаху на дварэ падымаў галаву ад купкі сена і вастрыў вушамі.

На ганку пры дзьвярах чырвонаармеец са стрэльбаю ў руках. Крушынскі зірнуў на яго дрымотны, застыглы твар. Калі Крушынскі ступіў на ганак, чырвонаармеец зірнуў кудысь над яго галавою халоднымі шэрымі вачыма і сказаў глухім голасам:

— Няможна! так прыказана! марш!

— Я-ж сам гаспадар...—пробаваў тлумачыць Крушынскі няўпэўненым голасам і давай лезьці да дзьвярэй.

Доляры надавалі яму сьмеласьці.

— Ухадзі!—крыкнуў чырвонаармеец і вочы ў яго бліснулі злосьцю.— Ато!

Чырвонаармеец узяў стрэльбу на перавес і намерыўся штыхом.

Крушынскі саскочыў з ганку і павярнуў да чорнага ходу з боку кухні. І там стаяў чырвонаармеец.

— Відаць, што яны не жартуюць са мною!—пажартаваў сам з сабою Крушынскі. Зірнуў на асядланых коняй з варожасьцю, плюнуў і пашоў на гумно.

... А можа гэта бандыты, пераапранутыя ў чырвонаармейцаў? Яны тады-б забілі мяне на месцы, або адразу ў хату пусьцілі, каб задушыць там.

На дварэ ніводнага чалавека. Як-бы павыміралі ўсе людзі. Толькі куры капаліся на скотным дварэ каля хлявоў, а на пагорачку грэўся стары кот. Пучок сонечных праменьняў абсыпаў рэдкія, калючыя вусы ката мэталёвым блескам.

— Пойдзем на гумно, яны там шукаюць!—услужліва шапнуў Рыгор.

— А чаму ваўначоска не працуе? Тут-жа сягоньня многа народу было!

— Як толькі чырвонаармейцы зьявіліся сюды з вобыскам, дык загадалі выбрацца адгэтуль усім чужым.

Ніколі ў Курганішчы ня было так ціха, як цяпер. Дзядзінец, на якім заўсёды мітусяцца заклапочаныя людзі, дзе чуваць галас і крык дзяцей, быў цяпер пусты і нямы. Адны толькі конікі скакалі па дробнай траве. На Крушынскага цішыня зрабіла больш цяжкае ўражаньне, чым вобыск. Нібы Курганішча разам з сваім гаспадаром задумалася цяпер над усімі ўчынкамі, якія тут адбываліся; нібы нейкі казачны чараўнік напусьціў сон на гэты шумлівы хутар.

... Гэта-ж некаторыя пагранічнікі мае знаёмыя. Яны-ж ведаюць, што ў мяне культурная гаспадарка...

У будынінах са збожжам, дзе пагранічнікі шукалі контрабанды, стаяў садом. Усе работнікі і работніцы Курганішча перакідвалі з месца на месца тарпы жыта паводле загаду пагранічнікаў. Яны шукалі пад снапамі, між снапамі, а калі які сноп быў таўсьцейшы, дык разьвязвалі яго. Шукалі з упэўненасьцю, уважліва перайшлі пасьля да вялізнай пуні з сенам,

адтуль—да хлявоў і да ўсіх іншых будынкаў. Закапанае ў зямлі золата не знайшлі. Успацелыя, змучаныя пашлі ў хату.

Тут трохі закалацілася сэрца гаспадара:

... Ці жонка забрала доляры з куфра?

Ён глыбока зірнуў у вочы пані Ганны.

... Усё ў парадку!—адказалі яе вочы.

На сэрцы палягчэла.

Якраз з куфра і пачалося шуканьне ў хаце. Павыкідалі адтуль усё. Нічога не знайшлі. У салёне нават пад падлогай глядзелі, шукалі ўнутры старога піяніна, у печцы, пад портрэтамі і абразамі на сьценах. На ложках пад падушкамі і матрацамі. Падазрона мацалі падушкі, адзін матрац распаролі нажом.

Спалоханыя дзеці маўчалі, туліліся да цёці Стэфкі ў яе пакоі.

— А хто ў гэтым пакоі?—запытаўся старшы ў гаспадара.

— Тут настаўніца жыве.

— Мы і туды пойдзем!

Пані Ганна пабялела як палатно.

Крушынскі дагадаўся:

... Жонка ў гэтым пакоі, у алькерыку схавала доляры...

Як падышлі да вялікага люстэрка каля сьцяны, пані Ганна сьціснула руку Крушынскага.

— Ай!—крыкнула яна і схапілася за галаву.

... Пад люстэркам доляры...—мільганула ў яго галаве маланкай трывожная думка.

Нічога не знайшлі і тут.

Стэфка песьціла дзяцей, гладзіла па галоўках, супакойвала маленькую Мзей, якая плакала ў яе на руках.

— Гэта-ж дзядзі, цукеркі дадуць,—угаварвала настаўніца дзяцей.

— Цукелькі?—зацікавілася Мзей і перастала плакаць.

Высокі чарнявы «дзядзя»—пагранічнік, гладзіў яе па галоўцы. Малая скоса, як зьвярок, зірнула на яго.

«Дзядзя» сапраўды выняў з кішэні жмут цукерак і пачаў частаваць дзяцей. Ён пры гэтым шчыра ўсьміхаўся. Дзеці асьмялелі.

Мзей зьлезла з калень Стэфкі, падала «дзядзі» руку і сказала «дзень доблей»,—як маці навучыла яе рабіць заўсёды, калі прыяжджалі госьці.

«Дяздзя» зусім расчуліўся. Зірнуў на ўсіх такімі вачыма, што Крушынскаму лёгка на душы зрабілася.

Але ўчынак Мзей на гэты раз не спадабаўся пані Ганьне. Мзей затрымлівала такім чынам чырвонаармейцаў у небясьпечным пакоі, дзе цяпер ляжаць доляры, якія, відаць, Стэфка схавала ў іншае месца.

— Дачушка, дай дзядзі спакою, ён часу ня мае.

— Ты-ж, мамка, сама навуціла мяне дзядзям люцку * даваць,—з дзівам у вачох сказала Мзей.

Пані Ганна нічога не сказала на гэта. Яна толькі падумала свой адказ:

— Няпрошаным гасьцям рукі падаваць ня трэба.

На яе думку адказаў са сьмехам сам «дзядзя»:

— Праўда, я няпрошаны госьць. Можа сягоньня ваша дачка не павінна была і вітацца са мною.

Мзей зноў умяшалася ў гутарку:

— Дзядзя доблей, цукелькі даў. Мы, дзядзя, скальб ** знасьлі ў лесе...

— Ціха ты, дурная, не лапачы глупства!—закрычаў Крушынскі. Ад страху мурашкі заёрзалі па яго сьпіне.

— Што яна сказала?—зацікавіўся «дзядзя».—Я нічога не зразумеў.

— Ат! дурное і малое!—«вытлумачыла» пані Ганна.

Крушынскі злосна круціў вусы і маўчаў.

— Няможна гаварыць, дурненькая!—пацягнула яе за спаднічку старшая сястра, Настачка.

— Дзядзя, нямозна гаваіць аб скальбу, а то цольт *** зьесьць!—сказала Мзей і заплакала.

— Нашто малых дзяцей чортам палохаць?—запытаўся «дзядзя».

— Ат, наслухаліся розных баек ад вясковых і блявузгаюць,—сказала пані Ганна.—Вось дзеля гэтага і настаўніцу нанялі. Тут і вясковыя дзеці разам з нашымі вучацца.

— Гэта добра! Вельмі добра!—пахваліў «дзядзя».

* Ручку.
** Скарб.
*** Чорт.

— Зусім добры чалавек!—падумаў Крушынскі і адпала ў яго злосьць за вобыск. Усе чырвонаармейцы здаваліся яму цяпер ветлымі, уважлівымі, і тое, што ўсюды раскінуты хатнія рэчы, вопраткі, было яму прыемна. «Раней магла быць падазронасьць на яго, што контрабандай займаецца, а цяпер і гэтага ня будзе—пасьля вобыску»...

— А вы адкуль?—запытаўся «дзядзя» ў Стэфкі.

— З Менску,—шапнула яна ціхім голасам.

У яе вачох быў сполах і сорам.

— Дзяцей вучыце?

— Але!

— Колькі-ж вам гаспадар плаціць?

— Мы не таргаваліся.

«Дзядзя» ў адзін міг агляну Стэфку з ног да галавы. Яна моцна пачырванела.

Уся суровасьць «дзядзі» прапала.

— Выбачайце, што мы вас занепакоілі,—сказаў ён мяккім голасам.

— У якіх пакоях мы яшчэ ня шукалі?—запытаўся «дзядзя» ў чырвонаармейцаў.

— А вось, таварыш, у тым бакавым пакоі!—адказаў Крушынскі.—Пойдзем туды.

Старшы пры вобыску адразу зьвярнуў увагу на выразку з газэты «Беларуская вёска» з портрэтам гаспадара.

— Гэта вы?—зьвярнуўся ён да Крушынскага.

— Гэта я сам!—горда і ўпэўнена адказаў гаспадар.

Старшы чытаў уголас газэтны артыкульчык і ківаў галавою. Пры кожным новым сказе ён адварочваўся ад сьцяны да Крушынскага з запытаньнямі:

— Дык вы прымалі ўдзел у партызанскім руху пры польскай окупацыі?

— Вы рэволюцыянэр з 1905 году?

— Ранены?

— Вы грамадзкі дзеяч?

— У вас культурная гаспадарка?

Кожнае з гэтых запытаньняў сьцябала Крушынскага па галаве шаўковай пугай. Сьцёбаньне было прыемнае, нібы ласкі матчынай рукі.

З кожным запытаньнем твар вайскоўца мяняўся, з яго зыходзіла строгасьць, пахмурнасьць, акамянеласьць і шчырыя зморшчыны сьмеху праменілі твар; вочы зрабіліся добрымі; свойскасьць адчувалася ў яго руках.

З кожным запытаньнем у яго мяняўся голас ад ранейшых, пры вобыску, сталёвых нотак да сямейнай мяккасьці, да братэрскасьці. Вайсковец цяпер глядзеў на Крушынскага такімі вачыма, гаварыў такім голасам, нібы знае яго многа гадоў, нібы яны старыя сябры.

Крушынскі ў гэты час з удзячнасьцю ўспамінаў агронома, які напісаў гэты артыкул, успомніў «Беларускую вёску», чорнабародага рэдактара, і ўвесь сьвет зрабіўся яму прыемным і добрым. Ён выняў з шуфлядкі стала другі талісман—пахвальны ліст з сельска-гаспадарчай выстаўкі за бугая. Да гэтага ліста быў прышпілены фотаздымак бугая. На картачцы бугай быў падобны да зубра.

Пасьля такіх яўных доказаў рэволюцыйнасьці Крушынскага, вайсковец падаў яму руку, падаў шчыра, моцна паціснуўшы руку гаспадара, і сказаў сваё прозьвішча:

— Лявончык.

— І рукавітаньне, і прозьвішча былі Крушынскаму на гэты раз прыямнейшымі за ўсё на сьвеце: ён вышаў з вады сухім.

Вобыск спыніўся.

— Прабачайце мяне, тав. Крушынскі, што так вышла з вобыскам...

— Калі ласка, калі ласка. Я вельмі рады. Добра ўсё тое, што добра канчаецца.

— А для даносчыка будзе кепска ўсё тое, што кепска канчаецца,—гарачыўся вайсковец.—Можна будзе яго пакараць за брахню.

— Ня варта—аднекваўся Крушынскі.—Мы ўсе павінны рэвізаваць адзін аднаго. Калі на рэволюцыянэра, на бальшавіка зьяўляецца падазронасьць у тым, што ён нечым кепскім займаецца, дык трэба вельмі строга адносіцца да яго, трэба яго правяраць. Я ад душы дзякую таму чалавеку, які на мяне даносіў. Прынамсі, цяпер мы вось пазнаёміліся. Увесь час гэтага стараннага вобыску я гардзіўся вамі—абаронцам нашай граніцы. Шчыра выконваеце свае абавязкі. Вам мой падзякуй за

цяжкую працу лоўлі контрабанды ня толькі ад мяне, але ад усяго нашага сельсавету.

Крушынскі пацiснуў руку вайскоўца.

— А цяпер, таварышы, будзем абедаць. Вы, пэўна, прагаладаліся.

Ніколі ў Крушынскага ня быў такі посны абед, як на гэты раз. Ня было гарэлкі, ня было смачных закусак. Абед быў «рэволюцыйны», «ідэолёгічна вытрыманы».

Стэфка выратавала на гэты раз.

Гэта яна схавала доляры. Зараз-жа, як толькі паехалі пагранічнікі, аддала пачку грошай Крушынскаму.

Як ні дапытваўся Крушынскі ў настаўніцы, дзе яна схавала грошы, яна не сказала. Толькі перад тым, як аддаць грошы, запёрлася ў алькерыку і гаспадар чуў шорханьне яе вопратак. Каб дастаць грошы, ёй прышлося распрануцца.

Стэфка была героем дня, ціхім героем з ціхаю славаю, аб якой ніхто не павінен быў ведаць, аб якой нават самі Крушынскія прымушаны былі маўчаць.

— Вось і карысьць ад настаўніцы!—сказаў Крушынскі пані Ганьне.—Мы павінны яе на руках насіць. Яна так многа грошай выратавала нам і зьняла падазронасьць з мяне, бо каб знайшлі грошы, дык упэўніліся-б, што я контрабандай займаюся.

Неспадзявана нахлынула на Курганішча хваля няпрыемнасьцяй, неспакою і страху, раптоўна надышла і радасьць. Пасьля вобыску, які так удала скончыўся, Крушынскі перастаў шкадаваць вялікую грашовую страту, якую меў у сувязі з забойствам Рахмількі.

... На стрыжаным баране новая шэрсьць нарасьце!—думаў ён і думкі свае выказваў айцу Дзімітрыю.

Цяпер і пані Ганна зусім іншымі вачыма глядзела на настаўніцу. На некаторы час у пані Ганны прапала зайздрасьць да маладосьці і прыгожасьці Стэфкі.

— Такая настаўніца нам і патрэбна,—сказаў Крушынскі жонцы.—Пагранічнікі глядзелі на яе, як кот на сала.

Пані Ганна паддавалася. Толькі з аднэй справай мірыцца не магла: настаўніца ня вучыла дзяцей богу маліцца, гаварыла ім

часта, што бога няма. На гэтым грунце адбываліся няпрыемныя стычкі між настаўніцай і гаспадыняй.

Стэфка ў гэтым выпадку кіравалася інструкцыямі гаспадара.

— Рыхтуйце дзяцей маіх у комсамол,—прасіў ён Стэфку.

— Да комсамолу ім яшчэ прыдзецца чакаць многа гадоў. Яны-ж малыя.

— Вось і добра, што малыя. З маленства і трэба іх падрыхтоўваць. Ніякіх жончыных багоў вы ім у галовы ня ўбівайце.

А ў гэты самы час пані Ганна яшчэ з большай гарачнасьцю бараніла багоў. Кожную раніцу і перад сном яна чытала малітвы з сваімі дзецьмі.

Вайна за бога і супроць бога вялася паміж гаспадыняй і настаўніцай дзень-у-дзень. Гэты «крыжовы паход» адбываўся ціха. Пад пагрозаю Крушынскага пані Ганна перастала гаварыць аб гэтым з настаўніцай. Пасьля вобыску, калі настаўніца, магчыма, не разумеючы значэньня свайго ўчынку (схаваньне доляраў ад пагранічнікаў), вярнула Крушынскім доляры, гаспадыня баялася ўгнявіць яе.

Уся энэргія абедзьвюх жанчын была накіравана выключна на дзяцей.

У дзень дзеці знаходзяцца пад наглядам Стэфкі. Да антырэлігійнай барацьбы яна была «падрыхтавана» яшчэ ў Менску. Яна бачыла ў рэлігійныя сьвяточныя дні па вуліцах гораду комсамольскія карнавалы. Поп, рабін, ксёндз, буржуй, бог, чорт і іншыя фігуры былі вельмі сьмешны і карыкатурны ў гэтых карнавалах. Пераапранутыя, загрымаваныя комсамольцы жывым паказам бога і яго прыслужнікаў рабілі на маладую Стэфку моцнае ўражаньне, пераконвалі яе ў шкоднасьці веры і забабонаў больш, чым газэтныя артыкулы ў часы антырэлігійных кампаній. Ды газэт яна ніколі ня чытала («нудныя»). Яна паверыла ў неіснаваньне бога, як у зграбнасьць новамодных жаночых вопратак. Такога характару веды аб рэлігіі яна перадавала і дзецям. Яна часта зварочвалася да малых:

— Бачылі папа айца Дзімітрыя?

— Бачылі!—адказвалі дзеці на розныя галасы.

— А ксяндза бачылі?

— Бачылі!

— Адзін кудлаты, другі голены. Страшныя нейкія, у чорных халамідах. Праўда?

— Праўда!

— Аб чым яны гавораць—поп і ксёндз?

— Яны кажуць, што трэба богу маліцца.

— Ня трэба богу маліцца, бога няма!—«тлумачыць» Стэфка.

— Яшчэ лепш, калі яго няма,—радуюцца дзеці.—Мы і ня хочам маліцца. Тата казаў, што трэба слухацца цёці...

Пані Ганна бярэ дзяцей пад сваю ўладу з вечара да раньня. Яна мае такое ўяўленьне аб існаваньні бога, як Стэфка аб неіснаваньні яго... У яе вера ў бога таксама неабходная мода, праўда, старая, але пані Ганна моцна трымаецца ўсяго старога і нічога новага не прызнае. Яна бароніць бога, як толькі можа: «Каб ня было бога, дык няўжо-ж гэтулькі касьцёлаў было-б на ўсім сьвеце? Няўжо-ж сьвет увесь звар'яцеў?!»—думае яна. Яна ўпэўнена, што ёсьць бог, а то, навошта былі-б напісаны сьвятыя кнігі? Хто мог-бы прыдумаць сьвятыя абразы, на якіх матка божа, пан Езус і ўсе апосталы, як жывенькія намаляваны... А хто дае хлеб усім людзям, калі ня бог? Ледзь не ад матчынага малака пані Ганна прывыкла да малітваў. А пры малітвах у пышных абставінах, у залітым блеску касьцёлу, пры раскошы тэатральных набажэнстваў, яна гатова вочы бліжняга выдрапаць у гонар і славу пана бога...

Дачуркі пані Ганны, Настачка і Мзей, увечары перад сном шапочуць незразумелыя словы малітвы пад нявыразнае суфлёрства маці:

— Ва імя айца, сына і духу сьвянтэга. Аман!—кажа маці.

— М'ейца, сына і дмуху тэго. Гам!—паўтараюць за ёю дзеці.

Незразумелае бармытаньне робіць на дзяцей такое моцнае ўражаньне, як замова шаптуна на цёмную старую бабулю. Дзеці палохаюцца і ад шчырага страху туляцца да маткі.

— Ня бойцеся,—пацяшае іх маці,—божанька добранькі. Ён вас абароніць ад рознай злыбеды. Толькі маліцеся яму.

Пры гэтым яна дае дзецям бліскучы абразок і загадвае цалаваць «божаньку».

Дзеці жывуць падвойным жыцьцём.

Удзень, пад яркім блескам сонца—у хаце ці на полі,—калі яны не адчуваюць ніякіх страхаў пад абаронай цёці Стэфкі, яны шчыра вераць, што вера ў бога—глупства, што няма бога.

Уночы, калі яны сьняць часам страшныя сны аб чэрцях, ваўкох, калі выпадкова пачутая казка старых сялян інсцэнізуецца ў каляровай карціне сну, дзеці шчыра вераць, што ёсьць бог. Яны ахвотна шэпчуць малітвы і, пакуль не засыпаюць, маці павінна сядзець на іхным ложку.

Кажны раз удзень дзеці прызнаюцца Стэфцы:

— А мы ўночы маліліся. Болей ня будзем. Мамцы скажам, што бога няма.

Уночы яны гавораць з тэй-жа самай упэўненасьцю пані Ганьне:

— Мамка, мы заўтра папросім цёцю, каб яна з намі таксама малілася...

Пасьля сьмерці Рахмількі яго бацька, стары каваль Лейба, выбраўся з вёскі ў блізкае мястэчка. Хоць ён добра ведаў, што Рахмілька загінуў дзеля Крушынскага, але прымушаны быў маўчаць, бо іначай яго, Лейбу, маглі-б арыштаваць, як удзельніка. Ён у мястэчку зрабіўся яшчэ больш набожным, чым раней. Тры разы ў дзень хадзіў у сынагогу богу маліцца, казаць «кадэш» * за душу сына і адчуваў сябе грэшным перад богам і людзьмі. Рахмілька загінуў, «зарабляючы сабе на хлеб». Але можа гэта была божая кара за Мэру? Няхай-бы лепш дачка Мэра памёрла, чым мець «гоя» за мужа...

Стары Лейба згорбіўся за гэты час, моцна пасівеў, яго вочы памутнелі. У іх зьявілася пастаянная палахлівасьць, зьбянтэжанасьць і сорам. Яму было сорамна перад усімі, што яго родная дачка за «гоем» замужам. У яго ня выходзіў з памяці дзень выезду з вёскі. Тры вазы з бэбахамі тарахталі па дарозе. Ён ішоў тады сумны за апошнім возам. Яго нехта нагнаў, нехта схваціў дрыжучымі пальцамі за кавальскую, яшчэ моцную, руку. Ён адчуваў на сваёй цьвёрдай, загартаванай працай, руцэ мяккія, гарачыя пальцы. Ён пазнаў гэту руку... Пробаваў вырываць сваю, але ня мог: другая чужая рука, такая-ж мяккая і цёплая, у гэты час моцна абхапіла яго шыю.

— Татэ...—пачуў ён шэпт Мэры,—татэ...

* Кадэш—спэцыяльная малітва за душу нябожчыка.

— Ухадзі ад мяне, паганая, чужая...

— Татынке...

— Авэк! *—крыкнуў ён і вырваўся.

— Выбачай мяне, татынке, я не магла іначай... Люблю Марціна. Усе людзі цяпер роўныя.

Яна плакала, ішла побач з ім, усхліпвала і гаварыла:

— Шкада мне цябе, татынке, што ты так блізка да сэрца гэта прымаеш, але ў мяне свая дарога ў жыцьці. Я не магла іначай.

Ён у той час стараўся не глядзець на яе, бо каб зірнуў, дык пэўна сэрца разарвалася-б...

— За твае грахі бог Рахмільку пакараў.

— Калі бог твой такі мсьцівы, дык ведаць яго не хачу,— адказала Мэра і перастала плакаць.

— Авэк, чужая ты мне, а не дачка! Чужая ты і богу нашаму. Твае дзеці, нібы-то мае ўнукі, «пархатым жыдам» назавуць мяне. Над маімі братамі пагромы рабіць будуць...

— Татынке, гэта ня будзе. Я-ж ім дам выхаваньне. Пры Савецкай уладзе няма пагромаў. Мой Марцін такі добры чалавек.

— Авэк!—Будзь проклята навекі-вечныя...

Пры гэтых словах бацькі вочы Мэры высахлі ад сьлёз, твар пабялеў, губы сьціснуліся і выпрастаўся яе стан.

— Чужы ты мне, а ня тата! Не хачу такога жорсткага тату!

Ні Мэра, ні ён не заўважылі як у гэтую хвіліну маці абхапіла Мэру... Маці тады затрымалася было ў вёсцы. Толькі цяпер ён дагадаўся, што старая пашла пабачыць перад выездам родную дачку і вось тут знайшла яе пры ім, пры бацьку...

Маці з Мэрай доўга цалаваліся і плакалі. За гэта самае ён з жонкаю праз усю дарогу да мястэчка не гаварыў.

Часта Лейба да рабіна ходзіць, раіцца, што яму рабіць. Стары каваль даўно ведае рабіна. Памятае яго маладым з жаўтаватай бародкай, з бліскучымі вачыма невядомага колеру, маленькага, сухога, з жылістымі рукамі. Ён сам састарэўся разам з рабінам. Да рэволюцыі рабін, апрача пасады духоўніка, якая мала яму давала прыбытку ў невялікім мястэчку, меў яшчэ іншыя

* Авэк—ухадзі.

заробкі: яго жонка прадавала дрожджы, сьвечкі на шабас і мела скураны гандаль.

— Мне самому мала трэба!—гаварыў заўсёды рабін.—Досыць таго, што кагал дае. Рабініха скардзіцца, што мала на сям'ю. Ну, няхай займаецца гандлем. Я тут ні прычым. Гэта ўсё—рабініха!

Лейба так і зразумеў:

— Рабін мае справу з богам. Рабініха—з людзьмі.

У кожную суботу, калі ў мястэчку панавала цішыня адпачынку, калі на ганках скакалі козы і пасярод вуліцы гулялі гуртамі местачковыя дзяўчаты паасобку і хлопцы паасобку, тады старэйшыя зьбіраліся ў сынагозе паслухаць казаньне рабіна.

Болей усяго рабін у казаньнях напіраў на тое, што трэба шчыра богу маліцца, сьвяткаваць шабас. Паводле рабінскага рэгляманту, маліцца трэба чуць ня цэлымі днямі, а глядзець за сям'ёю—галоўны абавязак жонкі! Яна за гэта ў раі будзе сядзець на падножжы крэсла «цадыка» *—мужа.

Чухалі бароды старыя яўрэі: добра крамнікам, бо іх жонкі могуць сядзець у крамах, а мужы—маліцца, сьвятую тору вучыць, каб гэтым запэўніць сабе цёплы куток у раі. А што-ж павінны рабіць шаўцы, краўцы, кавалі і тыя, што езьдзяць па вёсках гандляваць? Жонкі ня могуць іх замяняць. Выходзіць, што такія людзі павінны пакутваць і на гэтым, і на тым сьвеце...

Болей усіх у гэтым выпадку непакоіўся каваль Лейба. Ён бянтэжыўся, калі з галёркі сынагогі, дзе сядзелі кабеты, раздаваўся, у акомпанімэнт рабінскаму казаньню, жаночы плач. Пры такіх казаньнях заўсёды здавалася, што сьвет канчаецца, што божая кара зьнішчыць за грахі ўсё мястэчка... Але, на шчасьце, кожны раз, як толькі міне шабас, рабінскае казаньне забывалася да другога шабасу...

Цяпер стары Лейба ходзіць да старога рабіна на парады: што яму, старому Лейбе, рабіць...

— Нічога тут рабіць ня зможаце,—пацяшае яго рабін.— Гэта боская кара на вас за грахі. Гэта «Магэйфэ» ** ў сэрцах дзяцей нашых. Яны з «гоямі» братацца пачалі. Паглядзеце, рэб Лэйбэ, уся моладзь нашага мястэчка ахоплена пажарышчам

* Цадык—праведнік.

** Магэйфэ—эпідэмія, чума.

бязбожжа і шмад *. Няма хаты, дзе ня было-б «мэс» **, бо бязбожнік усёроўна, што мерцьвяк. Няма сям'і, дзе сын або дачка не пажаніліся-б з «гоямі». Гэты час напамінае мне бабілёнскае выгнаньне, калі ў працягу некалькіх дзесяткаў гадоў яўрэі пазабывалі, што яны яўрэі. Яны браталіся з бабілёнцамі. Бальшавікі—тыя самыя бабілёнцы... Пры цары кожны з нас памятаў, што ён яўрэй. Цяпер нажаль, многія аб гэтым забываюць... Дух «апікурсэс» *** запаланіў моладзь.

Ад рабіна стары Лейба выходзіць кожны раз з цяжкасьцю на душы. Бальшавікоў ён называе бабілёнцамі. На суседзяй, у якіх дзеці таксама пажаніліся з «гоямі», ён глядзіць, як на крэўных. Яму гэта служыць палёгкаю... Аднак, нейкі болеч вечна шчэміць яго сэрца нават пры рабоце ў кузьні.

У мястэчку ёсьць ужо многія, якія ня слухаюцца старога рабіна... Зьбяднелыя крамнікі і беспрацоўныя гандляры пачалі гаварыць аб зямляробстве. Яны расказваюць навіны адзін аднаму, што нібы яўрэям зямлю даюць.

— Памірае мястэчка,—скардзіцца рабін.—Коопэрацыя зьядае яго, як ва сьне цара Фараона худыя каровы зьелі сытых.

Мэра, дачка каваля, адчувае, што самы блізкі ёй чалавек— Марцін, муж яе. Ад бацькоў Марцін аддзяліўся зараз-жа пасьля вясельля. Ён цяпер будуе новую хату. Хоць Марцін не дазваляе, але Мэра памагае яму ў рабоце. Рознымі спосабамі стараецца забыць, што яна «жыдоўка». Не гаворыць з бацькамі Марціна і рэдка сустракаецца з імі: яны называюць яе «жыдоўкай». Да збудаваньня хаты Марцін з жонкай перабраліся жыць у апусьцелую хату яе бацькоў. Мэра палюбіла Марціна цяпер яшчэ болей чым раней: ён—уся яе апора. Сьветлавалосы і сінявокі Марцін ёй падабаецца яшчэ дзеля таго, што выглядам не падобны да яе крэўных, да яе самой—чорнавалосай і чорнавокай. Яна сьвяткуе цяпер дзень адпачынку ня ў суботу, а ў нядзелю. Яе вабіць усё новае і чужое, непадобнае да яе ранейшага жыцьця. Узрадавалася яна таксама, што

* Шмад—калі яўрэй кідае сваю рэлігію.

** Мэс—нябожчык.

*** Апікурсэс—бязбожніцтва.

бацькі выехалі з вёскі: «неяк лягчэй»... Ня будзе бачыць цяпер таго вечнага суму ў бацькавых вачох пры сустрэчы з ім. Ня будзе матка плакаць над ёю, як над нябожчыцай. Ды, наогул, вёска стала для Мэры вальней пасьля выезду бацькоў. Раней Мэра бадай з хаты ня выходзіла, каб не сустракацца з бацькамі, якія глядзелі на яе, як на злачыньніцу. Аднак, абразок разьвітаньня з сваімі, пракляцьце бацькі зрабілі на яе моцнае ўражаньне. Выгляд бацькі, плач маткі ня выходзяць з яе памяці. Часьцей за ўсё яна ўспамінае аб гэтым уночы і хавае ад мужа свае сьлёзы, свой жаль... Яна стараецца ўгаварваць сябе, што перад бацькамі невінавата, што кожны чалавек мае волю жыць так, як яму падабаецца. Якое права маюць бацькі над ёю? Ніякага выхаваньня яны ёй не далі. Яна ледзь умее чытаць і пісаць па-яўрэйску. На хлеб яна зарабляла ўласнаю працаю—шыцьцём з пятнаццаці-гадовага ўзросту. Праўда, бацькі яе выгадавалі, але-ж і іх выгадавалі іхныя бацькі... Чаму-ж гэта яна павінна цяпер рабіць тое, што ім прыемна?

Мэра пры гутарцы з мужам або з суседзямі гаворыць павольна, расьцягла, бо яна думае па-яўрэйску, а гутарыць пабеларуску. Часам, калі чыста слова ня выгаварыць, чырванее, саромеецца. Яна стараецца і думаць не па-свойму, але спачатку ёй гэта не ўдаецца. Горш за ўсё з лічбамі; калі ёй часам прыходзіцца лічыць, дык прымушана шаптаць: «эйнэ, цвэй, драй, фір» і г. д. Тады яна не памыляецца і яе «матэматыка» беспамылковая, стройная і жывая. А як толькі пробуе гаварыць: «раз, два, тры, чатыры», дык да дзесяці ідзе гладка, а пасьля пачынае блытацца, бо гэтыя словы зьяўляюцца для яе чужымі гукамі без усялякага сэнсу...

Мэра доўга змагаецца сама з сабою, з сваёю падвойнасьцю: думаць на аднэй мове, а гаварыць на другой. Змаганьне вельмі цяжкае—трэба выпіхаць, вырываць з карэньнем назаўсёды сваё захаванае, прытоенае «я», якое яно ад маленства носіць у сабе; трэба вытруіць усё ранейшае, выпаліць агнём.

Яе муж, Марцін, ад яе гэтага не вымагае. Яму якраз прыемна адчуваньне, што жонка не такая, як усе вясковыя жанчыны. «Чужое», якое вабіць Мэру ў Марціне, падабаецца Марціну і ў Мэры...

Дзеля гэтага ў іх адносінах заўсёды адчуваецца празьмерная далікатнасьць, уважлівасьць і абыходлівасьць.

Бывае, Марцін, лічачы грошы пры Мэры, каб зрабіць ёй прыемнасьць, гаворыць: «эйн, цвэй, драй».

— Ты з мяне жартуеш?!—крыўдзіцца Мэра.

— Не. Я хачу па-твойму гаварыць навучыцца...

Мэра з балючай падазронасьцю паглядае тады на мужа.

Мэра сябе перамагае: пачынае хутка і вольна гаварыць па-беларуску. Словы яе як-бы адшліфоўваюцца ў роце, апранаюцца ў яскравую напеўнасьць, як у вясковых суседак і высьлізгіваюцца, выскокваюць на вольны сьвет яскравыя, ядраныя, як сьпелыя сьлівы. Думаць на роднай мове яна перастае. Часам толькі паадзіночныя яўрэйскія словы лезуць у галаву, але яны растаюць у «мужыцкай» гутарцы, як сьняжынкі ў вадзе. Яна прыслухоўваецца да акцэнтацыі слоў пры гутарцы з суседкамі і, як акторка, стараецца падрабляцца пад іх. Вуха яе надзвычайна абвастрылася, улаўлівае самыя малейшыя нюансы вымовы, сьпеўнасьці і расьцягласьці гукаў. І нібы музыка, які наладжвае скрыпку, яна кожны раз перад тым, як пачаць гутарку, падрыхтоўвае сябе... Напружваецца ўсім целам, губы і барада пры гутарцы болей чым у іншых кабет рухаюцца. Здаецца, глухі чалавек толькі паводле рухаў яе губ мог-бы адчуваць яе словы. Нават гестамі рук і выразам вачэй яна падрабляе суседак. Выходзіць так, нібы яна не гаворыць, а дэклямуе, падкрэсьлівае асаблівасьці вымовы вясковых і стараецца такім чынам стаць такою, «як усе»... Яе ідэал—да таго зьмяніцца, каб ніхто ня мог і падумаць, што яна калісьці «жыдоўкай» была... Толькі адзін «каінаў знак» ёсьць у яе—тыповыя яўрэйскія вочы (з выразам своеасаблівага суму) і чорныя валасы. Хаця на вёсцы бадай палова сялян мае чорныя вочы і валасы, але на тых ніхто-б не гаварыў, што яны яўрэі: у выразе вачэй, ва ўсёй постаці відаць зусім іншае. Ня тое ў яе, у Мэры...

Колькі гадоў таму назад, калі палякі прышлі, калі яны зьдзекаваліся над яе бацькам, адрэзваючы яму бараду, яна пабегла да суседа-каталіка. Жаўнеры яе адразу пазналі. «Хоць жыдовэчка, але сьлічна паненэчка»,—гаварылі яны.—«Жыдув ня церпім, а жыдовечэк—о-го-го!..»

Ня любіць Мэра, калі яе называюць «Мэрай».

— Марыляй мяне завеце!—просіць яна.

У слове «Мэра» яна адчувае да сябе ганьбу, насьміханьне. І да розных насьміханьняў, з прычыны яе яўрэйскага паходжаньня, яна вельмі чулая. Вельмі часта западазрае насьміханьне над сабою, як над «жыдоўкаю», нават там, дзе гэтага зусім няма...

— Мэра крыўляцца пачала,—гавораць часта суседкі, пасьля гутаркі з ёю, калі заўважаюць яе «акторскае» падрабленьне пад сялянак.

Марціну гэта таксама ня зусім падабаецца: Мэра з кожным днём траціць тую розьніцу да іншых вясковых кабет, якая вабіць яго, вельмі падабаецца яму...

Выходзіць так, што не яна, Мэра, робіцца падобнай да ўсіх вясковых кабет, але, з прычыны яе стараньняў у гэтым падабенстве, яна згушчае фарбы да шаржаваньня і нібы вясковыя кабеты трохі да яе падобны...

Ад вечнага празьмернага вырасходваньня энэргіі на такую рэч, каб зрабіцца гэткай, як усе вясковыя, нэрвы ў яе заўсёды напружаны. Яна раздражлівая, траціць часта контроль над сабою, над сваімі ўчынкамі. Даходзіць да таго, што нават мужу забараняе называць сябе Мэрай.

— Каб я болей ад цябе гэта ня чула,—кажа яна гнеўна.— Заві мяне Марыляй! Чуеш? Я сама жыдоў ня люблю!..

— Калі так,—гіронізуе над ёю Марцін,—дык скажы гэта майму бацьку. Ён вельмі абрадуецца, прыгорне цябе, як родную дачку...

— Адыйдзі ад мяне разам з сваім бацькам. Калі жыды табе падабаюцца, дык ідзі да майго бацькі, будзеш у яго сынам...

— Досыць, Мэр... Марыля, глупства гаварыць! Усе людзі роўныя. Няма цяпер ні жыдоў, ні мужыкоў. Ты, мабыць, такія выбрыкі робіш таму, што пачала салонае есьці... Усе цяжарныя бабы злосныя.

А Мэра, з прычыны змаганьня з самой сабою, сапраўды, чуць не антысэміткай зрабілася. «І чаму я нарадзілася жыдоўкай?»—часта думае яна.

За апошні час Мэра стала яшчэ прыгажэйшаю, чым раней. Пастаянная напружнасьць, настарожанасьць надаюць яе вачом нейкі новы выраз. Твар трохі схудаў і нэрвовая ружовасьць гарыць на яе шчоках. Новыя гесты, сялянская вопратка, каляро-

вая ў яркіх кветках, якую яна носіць замест ранейшай чорнай або белай вопраткі, стрыжаныя чорныя валасы надаюць ёй шмат орыгінальнасьці і сваясаблівай прывабнасьці. Яна хоча гэтым усім зрабіцца падобнай да іншых тутэйшых кабет, не вызначацца. Выходзіць наадварот...

Такой сустрэў яе аднаго разу Язэп Крушынскі ў лесе, дзе ён выбіраў пні на новы сьвіран.

Мэра ішла па сьцежцы ўстрывожаная, гаварыла сама з сабою на... яўрэйскай мове і не заўважыла Крушынскага.

— Мэра!—клікнуў ён.

Яна ўздрыгнулася ад неспадзеўкі і запытала па-яўрэйску:

— Вос? *

— Што ты, Мэра, адна ходзіш па лесе?

Мэра спынілася.

— Уцякаю, пане Крушынскі.

— Куды? Ад каго?

— Куды—сама ня знаю. Ад мужа ўцякаю. Не магу тут жыць. Стары, бацька яго, назваў мяне «жыдоўкай». Яны між сабою доўга сварыліся і Марцін свайго роднага бацьку пабіў.

— Ат! Глупства! Мала што бывае ў сям'і. Не зварочвай увагі, Мэра. Усё наладзіцца.

Квапнымі вачыма Крушынскі аглядае яе прыгожую постаць. Яе новая манера гаварыць яму вельмі падабаецца.

Яны селі на старым вываратні—бярозе. Вакол расьцілаецца мяккі мох. Хоць сонца няма, але дзень удаўся цёплы, лагодны. Пахне вільгацю і грыбамі. Блізка ад іх дзяцел длубае асіну. Мэра моршчыцца ад няпрыемнасьці. Яна ўспамінае стук малатка ў кузьні, роднага брата Рахмільку... Агортвае такі вялікі жаль, ажна яна пачынае голасна плакаць. Крушынскі пробуе яе пацяшаць. Нічога не памагае. Яшчэ мацней плача. Прыкра. Ня ведае, як супакоіць яе. Пробуе ласкаць, гладзіць па галаве і шыі, як маленькую дзяўчынку. Гэта памагае. Мэра ад голаснага плачу пераходзіць да ціхага ўсхліпваньня і туліцца да Крушынскага... Яе цёплае дыханьне, мяккія белыя ручкі ўзгарачылі яго кроў. Ён пачынае яе цалаваць. У яго ў гэтыя хвіліны выгляд агіднага зьвера.

Доўга змагаецца з ёю...

* Чаго?

Яна застаецца ляжаць на пухкім моху каля бярозы. Крушынскі аглядваецца па баках, хуткімі крокамі выходзіць з лесу. Пах грыбоў казлыча ноздры.

З гадзіну ляжала Мэра на адным месцы, як няжывая. Потым пачула галасы. У лесе пераклікаліся людзі.

... Грыбы зьбіраюць,—была першая думка Мэры за ўвесь час. Да гэтага моманту галаву ахапіла пустата, нібы яе хтосьці аглушыў, нібы яна ўпала з вышыні і моцна пабілася.

Мэра ляніва паднялася з зямлі, папраеіла валасы, вопратку, атрасла з сябе мох і ціха, каб ніхто не заўважыў, пашла з лесу.

У вушох зьвінела. Здавалася, што гэта стукат Рахмількавага малатка аб кавадла.

«З-з-з-з!»—раздаваўся вакол ціхі звон.

Гэта каля рэчкі гудзелі чмялі, мухі, шумелі конікі.

Мэра ішла да рэчкі, не аглядвалася па баках. Ззаду з лесу да яе далятаті галасы:

— Марыля! Марыля! У грыбы пойдзем! Сёньня баравікоў многа.

Мэра не адварочвалася.

...Усёроўна...

Ні аб чым ня думала. Страшна было думаць. Толькі ў вушох зьвінела «Дзззынн-н». Нібы водгаласак моцнага ўдару.

Яна падышла да рэчкі. Ведала, дзе глыбокае месца пад назваю «Вір». Не заўважыла, што за ёю ўсьлед ідуць хлопцы і дзяўчаты з кошыкамі, поўнымі баравікоў.

Мэра кінулася з высокага абрыву.

Яе выцягнулі адразу. Яна стаяла ў мокрай вопратцы і дрыжэла ад холаду. На людзкі крык прыбегла многа народу. Зьявіўся і Марцін, які ўжо даўно яе шукаў.

XXII

— Я пачаў ехаць уніз,—гаварыў аднаго разу Крушынскі айцу Дзімітрыю.—Страціў многа грошай. Трэба кінуць гэты рызыкоўны занятак. Хоць з вобыскам пашанцавала, нават, і не падазраюць, але гэта ўсё да часу. Трэба асьцерагацца.

— Так, так. Асьцярожных і бог сьцеражэ!

Крушынскі доўга раіўся з айцом Дзімітрыем.

Пасьля гэтага ў Курганішчы пачалася новая праца: з вялізарнага току выносілі снапы ў другі будынак і пад камандай гаспадара майстравалі ў таку «тэатр». Пашоў у ход вялікі запас дошак, які ляжаў на гумне пад паветкамі.

Архітэктура і будова «тэатру» была лёгкая—з дошак зрабілі падмосткі для сцэны, будку для суфлёра. Было нарэзана многа кароткіх калодак, на якіх накладвалі дошкі. Такім чынам, былі гатовы і крэслы для публікі: доўгія лавы.

Усё было зроблена ў два дні.

Крушынскі паехаў у блізкае мястэчка і згаварыўся там з драматычным гуртком, каб паставіць у Курганішчы спэктакль для сялян. Павінна была прыехаць і пажарніцкая духавая оркестра. Усё ішло як па масьле. Гаспадар зьезьдзіў у Менск і прывёз адтуль многа піва, гарэлкі і закусак для гасьцей. Ён сам пашырыў програму вечару танцамі Стэфкі і дэклямацыяй вершаў стрыечнага брата, пролетарскага поэта Антона Цярэшкі. Стрыечны брат даў на гэта згоду.

Спэктакль павінен быў адбыцца ў нядзелю, калі ўсе суседзі вольныя ад працы. Пагалоска аб спэктаклі была пушчана шырокая. Па ўсёй ваколіцы Крушынскі разаслаў запрашэньні.

Рыхтаваліся цэлы тыдзень. Сам гаспадар нічым іншым не займаўся. Таксама настаўніца была на гэты час зволена ад працы з дзецьмі. У падрыхтоўцы да спэктаклю яна была галоўнай памочніцай Крушынскага. Яны разам меркавалі, разам аглядалі работу, разам апрацавалі програму. Стэфка была гэтым усім шчыра захоплена. А гаспадар захапляўся Стэфкай... Ён гатоў быў кожны тыдзень ладзіць спэктаклі, але разам з ёю без контролю жонкі.

Крушынскі любаваўся кожным рухам Стэфкі, кожным яе словам, выконваў усе яе проекты. Ён і тут займаўся агітацыяй. У гэтыя дні завірухі і дзейнасьці ён часта гаварыў Стэфцы аб новай, вольнай жанчыне:

— Адно з найвялікшых дасягненьняў савецкай улады—гэта вызваленьне кабеты. Не вызваленьне яе ад працы, бо яна цяпер працуе ня менш мужчыны, займаецца часам такой працай, якой раней толькі мужчына займаўся,—але тут ёсьць большае: вызваленьне духу кабеты. Яна цяпер вольная рабіць такія ўчынкі, пры якіх раней называлі-б яе брыдкімі імёнамі. Цяпер муж ані пікні! Захацела жонка—і кідае мужа, і жыве як хоча і з кім

хоча. Цяпер дзяўчыне ня жыцьцё, а рай. Вы можаце рабіць, што хочаце— і ніхто вам слова ня скажа. Каб мы вось палюбіліся, дык ніхто нам, Стэфка, не забараніў-бы жыць, як нам хочацца.

— Ого!—засьмяялася Стэфка.

Крушынскі заглядаўся на яе беленькія, дробныя зубкі. Гладзіў яе па валасох. Пробаваў абнімаць, але яна высьлізнула з яго рук, твар яе зрабіўся строгі, і яна чужым голасам гаварыла:

— Толькі бяз рук.

Калі аднаго разу пацалаваў яе, дык яна пачырванела і злавалася на яго некалькі гадзін.

— Папробуйце ў другі раз так зрабіць, Язэп Сымонавіч, дык пані Ганьне скажу!—пагразіла яна і махнула на яго пальцам, нібы дарослы чалавек на малое дзіцё.

Тады ён пачаў «агітацыю» трохі іншага характару:

— Трэба ўмець уваходзіць у новае жыцьцё, многія гэта ўмеюць, а яшчэ большая частка ня ўмее. Напрыклад, вы, Стэфка, хоць і маладая дзяўчына, хоць выгадаваліся, можна сказаць, на агні Кастрычніка, аднак рэволюцыя вам нічога не дала. Вы—адсталы элемэнт...

«Адсталы элемэнт» на гэта яму нічога не адказваў, але калі Крушынскі пацалаваў Стэфку другі раз, яна ня была ўжо такая строгая, толькі зьлёгку шлёпнула яго па губах.

Яна не ўваходзіла ў спрэчкі супроць яго разважаньняў і толькі ціха напявала песенькі.

Крушынскі пачаў надаваць песьням вялікае значэньне. Ён адчуваў, што песьні Стэфкі адносяцца да яго.

Стэфка часта пела:

Понапрасну, мальчик, ходишь,
Понапрасну ножкі бьеш...

Тады Крушынскі хмурыўся, быў вельмі нездаволены. Але затое рабіўся бадзёрым, калі яна пераходзіла да другой песьні:

Если красавица губки надует,
Тот не мужчына, кто не поцелует.

Пры такіх сьпевах ён пераконваўся, што «адсталы элемэнт» ня вельмі ўжо адсталы. Усё наладжвалася як лепей ня трэба. Але Стэфка зараз-жа аблівала яго ружовыя надзеі халоднай вадою новай песьні, якая канчалася словамі: «Кого люблю, того

здесь нет». Тады ў Крушынскага твар рабіўся пахмурным, нездаволеным, строгім. І Стэфка, каб паправіць кепскае ўражаньне, зацягвала ўрывак з іншай песьні:

Как люблю я вас,
Как страдаю я...

Пад чарамі гэтых слоў у Крушынскага вочы зноў задаволена зьзялі і ён дамагаўся абняць Стэфку.

Тады Стэфка давай свой «рэпэртуар» спачатку...

За гэтыя дні Стэфка пачала адчуваць у сябе нейкую захаваную сілу—уладу над такім чалавекам, як Крушынскі. Дзівілася яна гэтай «сіле», як той казачны асілак, які сіднём сядзеў на адным месцы трыццаць тры гады і ня мог увесь час крануць ад слабасьці ні рукой, ні нагой, а раптам пачаў падкідаць у неба жалезную булаву ў сто пудоў.

... У мяне нешта такое ёсьць... Нешта такое, што кідае Крушынскага ў гарачку і холад.

Ёй вельмі прыемна, што знайшла ў сябе такі цікавы, незразумелы ёй самой скарб. Ігра з Крушынскім ёй спадабалася. У працягу кароткага часу яна налаўчылася «граць» ня горш за сталую «красуню», якая «зубы зьела» ў фліртах.

Кожны яе рух, кожны сьмяшок, кожны бліск вачыма і зубамі быў разьлічаны на эфэкт.

Яна ведала, што Крушынскаму падабаецца яе тонкая ножка—дзяўчына як-бы незнарок выстаўляла ножку.

Аб спэктаклі ў Курганішчы была прыслана ў газэту «Савецкая Беларусь» корэспондэнцыя «Льва Талстога». Яна была напісана на поўаркушах паперы, разьлінаванай на вузкія слупікі:

СЬВЯТЛО Ў ГЛУХІМ КУТКУ.

Спэктакль для сялян на хутары Курганішчы.

Так. З кожным годам наша культура на вёсцы расьце і пашыраецца. Так. Калі пры окупацыі Беларусі белапалякамі нават у Менску беларускія спэктаклі адбываліся вельмі рэдка, бо цэнзура забараняла бадай усе беларускія п'есы, лічачы іх небясьпечнымі для паноў, бачачы ў іх зьмесьце прызывы да паўстаньня супроць белай шляхты і белых магнатаў, заўважаючы паміж радкоў

беларускіх п'ес рэволюцыйнасьць і бунтарскасьць беларускіх працоўных мас, дзяды і прадзеды якіх адбывалі прыгон у тутэйшых паноў (як вядома з нашых газэт. Так.), цяпер, дзякуючы савецкай уладзе і комуністычнай партыі, беларускія п'есы ставяцца ня толькі ў Менску, дзе працуе такая вялікая культурная адзінка, як Беларускі акадэмічны тэатр (у Маскве ёсьць і беларуская тэатральная студыя, з газэт. Так.), з беларускімі п'есамі знаёмяцца ня толькі па розных гарадох і мястэчках нашай рэспублікі, але нават па глухіх вёсках. Так.

Беларускія партызаны, якія пры польскай окупацыі хаваліся па лясох, пераймалі на дарогах польскіх паноў і жандараў, змагаліся з імі, дапамагалі Чырвонай арміі выганяць іх з межаў многапакутнай краіны, ведалі за што змагаліся: за свой дабрабыт, за разьвіцьцё культуры працоўнага люду. Партызаны не дармо працавалі. Так. Вось і вынікі. Так. Гэтымі днямі на хутары Курганішчы (адна з самых паказальных культурных гаспадарак) быў наладжаны для ваколічных сялян вечар. Так. Спачатку выступіў з чытаньнем сваіх працоўных вершаў беларускі поэта Антон Цярэшка. Многа гучных воплескаў ён зарабіў за сваю ўдалую пролетарскую проклямацыю. (Тоісь, дэклямацыю. Так). Я-бы ўставіў сюды яго вершы, але газэтны артыкул не дазваляе. Так.

Пасьля дэклямацыі прайшоў нумар танцаў менскай вядомай балярыны, настаўніцы ў Курганішчы—тав. Стэфкі Вярбіцкай. Пад гучныя воплескі працоўнай публікі яна танцавала працоўную «лявоніху» і «казачка». Так. Пры гэтым выконвала танцы на сваіх музычных інструмантах духавая оркестра пажарнікаў мястэчка N. Дзякую ім, музыкам—яны працавалі, не пакладаючы рук, часам, празьмеру стараючыся, нават перашкаджалі працоўнаму выконваньню. Так.

Пасьля музыкальна-лояльнай часткі вечару была пастаўлена вядомая п'еса Ф. Аляхновіча «Калісь». Выбар п'есы вельмі ўдалы. Так. Гэта частка, тоісь, п'еса «Калісь», вельмі спадабалася працоўнай, комуністычнай і пролетарскай публіцы. Яна тоісь, публіка, не, гэта значыць, п'еса, малюе рэволюцыю 1905 году. Так.

Таварышы з рэдакцыі «Савецкая Беларусь»! Няўжо-ж вы ня ведаеце, што гэты слаўны 1905 год на зямельцы нашай быў афарбаваны крывёю рэволюцыянэраў? Я пэўны, што ведаеце

і што некаторыя з таварышоў, як і я, памятаюць той слаўны і трагічны час, калі змагаліся за волю ўсе пакрыўджаныя. Так. Потым цар Мікалай крывавы, але газэтны артыкул не дазваляе спыніцца на гэтым.

П'еса «Калісь» выконвалася пад гучныя воплескі. Так. Гэта сьведчыць аб тым, што публіка з сялян успомніла тыя часы і ім, тоісь, ёй, працоўнай публіцы, вельмі спадабалася. Так. Іначай, чаго ёй было ў далоні ляскаць? Так. Некаторыя нават скардзіліся, што ад лясканьня рукі папухлі. А іншыя казалі, што лясканьне перашкаджала ігры. Артысты з мястэчка N, скуль і пажарнікі, тоісь, пажарніцкая духавая оркестра (вы там, таварышы з рэдакцыі, не наблытайце, прапускаючы мой артыкул праз машыну). Так. Артыстыя вельмі добра выконвалі пастаноўку. Гралі, што называецца! Тоісь, яны былі так апрануты і нафарбаваны ў тварах, што ня толькі мы, але і яны—артыстыя—самі сабе не пазнавалі напэўна. Так. Пасьля спэктаклю Язэп Крушынскі, гаспадар, тоісь, Курганішча, зазваў і працоўную публіку, і працоўных артыстаў на сытную, працоўную вячэру. Так. Было і тварыскае працоўнае піва. Гулянка скончылася аж пад раніцу, калі ўжо на ўсходзе чырванела зара, паламянела, як наш слаўны чырвоны сьцяг над чырвонаю зямелькай нашай. Так. Пісаў-бы яшчэ, бо аб гэтым вечары, тоісь, аб культуры на вёсцы, можна пісаць на цэлыя томы, але газэтны артыкул не дазваляе. Так.

Пры гэтым маеце гонар, тоісь, я маю гонар, пераслаць вам, таварышы «Савецкай Беларусі», першы том сваіх новых твораў на белмове. Перайшоў з расійскай мовы на беларускую, ня гледзячы на розныя жарты і кпінкі белай контррэвалюцыі. Я ўпэўнены, што як яны, тоісь, мае творы, праскочаць праз вашу рэдакцыйную пролетарскую машыну друку, яны зробяцца гладкія і цікава іх будзе пачытаць. Так. Гавораць-жа, тоісь, ёсьць такая пагаворка: «адна скаціна руб і палціна». Так. Гонарару я не патрабую. Можаце аддаць гонарар рабоча-сялянскай інспэкцыі, тоісь, на розныя там дабрафлёты. Так. Толькі надрукуйце як найхутчэй, бо многія з маіх чытачоў кажуць, што яны ахвотней будуць чытаць мае творы на друкаванай паперы, чымся на пісанай паперы. Так. Нашы вёскі кніг ня маюць. І прашу вас, паважаная цётка Рэдакцыя, тоісь, таварышка Рэдакцыя, зьвярнеце ўвагу на маю пісаніну. Я пішу не на сваю карысьць, а на

карысьць Рэспублікі. Так. Надрукаваную кнігу вы мне прышлеце па адрасу: Вёска Бліны. Мірону Гарбочыку. Марынаўскі сельсавет. Так. Гарбочыкаў, тоісь, такіх прозьвішчаў у нас многа, дык патурбуйцеся прыпісаць і маю клічку «Леў Талстой». Я не саромлюся гэтага імені. Не саромцеся і вы. Чакаю. Мірон Гарбочык, або, як людзі кажуць, «Леў Талстой».

У газэце была надрукавана гэта корэспондэнцыя ў перапрацаваным і скарочаным выглядзе. Буйным шрыфтам красаваўся новы загаловак:

ЯК НАЙБОЛЕЙ ТАКІХ ЯЗЭПАЎ КРУШЫНСКІХ!

Дзеля заахвочваньня ў культурнай працы на вёсцы газэта не пашкадавала яскравых выразаў і шчырай пахвальбы па адрасу Крушынскага. Рэдакцыі важны былі не падрабязнасьці вечару, а той факт, што па глухіх мясьцінах Беларусі ёсьць такія культурнікі, як Крушынскі, якія пакладаюць шмат энэргіі дзеля пашырэньня культуры сярод працоўных мас.

У гэтым напрамку была перапрацавана корэспондэнцыя «Льва Талстога» за подпісам «*Селянін Мірон Гарбочык*».

Была цёплая ноч.

Стэфка сядзела на ганку і глядзела перад сабою. Ад стомленасьці на спэктаклі яна не магла спаць ужо другую ноч. Думкі хадыром хадзілі. Трэба як найхутчэй напісаць ліст да цёці, якая жыве ў аднэй з расійскіх губэрняў у провінцыі.

А вось Стэфка ўсё ня можа пісаць. Як толькі бярэцца за пяро, дык зараз-жа сьлёзы туманяць вочы, пачынае хвалявацца і пяро выпадае з рук. Яшчэ і цяпер зьвініць у вушох бравурная музыка местачковай пажарнай оркестры. Яшчэ і цяпер, як задумаецца, дык здаецца, што вакол чуваць п'яныя галасы «публікі», якая пасьля спэктаклю вячэрала ў Крушынскага.

Сьвецяць зоркі. Міргаюць задумёнай цішай ночы, нібы тысячы вачэй. Пяюць пеўні. Перакллікаюцца між сабою пявуны з вёскі з пявунамі на хутары. Яны граюць на поўнач пятушыны марш. Зноў ціха. Так ціха, нібы ўся зямля застывае ад вялікай зморанасьці за летні дзень. Па сярэдзіне неба блішчыць нака-

лёная да чырвона падкова. Месячны водсьвет сьцелецца яркімі палосамі між будынкаў. Пахне кмінам і жытняй саломай.

Трэплюцца непакорлівыя валасы Стэфкі. Яна іх кожную хвіліну папраўляе на лобе, а яны казлычуць вочы, ня могуць супакоіцца. Ветрык носіць па дзядзінцы саломінкі. Ледзь чутна шуршаць яны, і здаецца Стэфцы, што хтосьці ходзіць па-за сьценамі будынкаў, крадзецца сюды, бачыць яе на ганку...

Стэфка паднялася, асьцярожна і павольна адчыніла дзьверы, каб ня рыпелі, засунула жалезны засаў і праз цёмную кухню прабіралася ў алькерык. Каля дзьвярэй свайго пакоіку спынілася. З спальні Крушынскіх чувацьбыло храпеньне гаспадара. Яго сон—здаровы і спакойны.

Стэфка ўвайшла ў пакоік, запаліла невялічкую газавую лямпачку і села за стол.

Тут, праз тонкую дашчаную сьценку, якая аддзяляла яе пакоік ад спальні гаспадароў, храпеньне Крушынскага яшчэ больш глушыла цішыню дому. Гэта храпеньне надавала настрой ціхай, сытай, спакойнай прытульнасьці.

Яна пачала пісаць. Пісала доўга. Каб атрамант хутка высыхаў, Стэфка кожны сьвежа-напісаны лісток трымала над шклом лямпачкі, ад чаго папера прыпякалася, жоўтыя плямачкі выступалі на пісаніне і пах атраманту і прыпечанай паперы казлыталі ноздры. Пачало ёй здавацца, што гісторыя, якую яна апісвае ў лісьце да цёці, здарылася колькі год таму назад, што гэта толькі ўспамін з тых часоў, калі яна была яшчэ маленечкай.

Стэфка ўсьміхнулася, пасьля ўздыхнула і давай нячутным, нутраным голасам чытаць напісаны ліст:

Дарагая цёценька, Аграфена Макараўна!

Выбачайце, што я вам так доўга ня пісала, мая любая, мая добрая, мая цярплівая... Апошні ліст я вам пісала, калі яшчэ была з бацькамі. Цяпер я ў Менску ня жыву. Я цяпер самастойная асоба. Зрабілася настаўніцай. Жыву на хутары, займаюся з дзецьмі. Гэта я-то жыву ў глухім месцы! Я-ж да гэтага ня прывыкла... Але што-ж рабіць! Бацькі цярпелі голад. А вось нядаўна я ім 20 рублёў паслала. Я вам у тым пісьме ня пісала, што маці ўжо зусім асьлепла. Дактары сказалі, што ніякай надзеі няма на тое, каб яна выздаравела. Бацька такі самы. Дактары кажуць, што ён ужо назаўсёды

вар'ятам застанецца. Маці часта гаворыць, што лепш было-б, каб ён памёр. А мне так шкода папы, што я вось пішу вам, цёценька, і плачу. Ня плачу, а сьлёзы неяк самі коцяцца па шчоках. Вось і атрамант расплыўся ад салонай кроплі. Выбачайце, цёценька, што я вам такія сумныя рэчы пішу. Вам-жа самой так цяжка жывецца...—бяз дзядзі. Цяпер у бацькоў адна Бронька бедная працуе, бо маці нічога рабіць ня можа. Бронька пісала мне, што сёлета ў нашым садзе вялікі ўраджай на яблыкі. Груш ані няма. Можа як прададуць яблыкі, дык будзе ёй на зімовае паліто. Пакуль што я ў сваім лісьце да мамы прасіла, каб Бронька сабе ўзяла 5 р. з тых 20 р., што я ім паслала. Прозьвішча майго гаспадара—Крушынскі, а хутар завецца—Курганішча.

І ведаеце, мілая цёценька, мне тут зусім ня нудна. Я вельмі паправілася на добрых харчох, бо яны людзі багатыя і не шкадуюць яды. Сам гаспадар вясёлы чалавек, часта жартуе са мною. Затое гаспадыня крывіцца, вечна нездаволена. Ці можа яна зайздросьціць мне? Я лічу сябе яшчэ малой дзевачкай. Два дні таму назад у нас тут, у Курганішчы, адбыўся спэктакль. Было так весела. Я выступіла на сцэне з танцамі. Памятаеце, цёця, я з самых малых гадоў любіла танцаваць. Вы самі гаварылі, што з мяне выйдзе балярына. У Менску ёсьць пры тэатры балетмэйстар Аляксютовіч, дык ён, пабачыўшы, як я танцую, тое самае сказаў. Тут, у глушы, я праславілася сваімі танцамі на ўсю ваколіцу.

Цяпер, цёценька, я вам раскажу вельмі цікавую гісторыю. Толькі слухайце, не палохайцеся, ня дзівіцеся і паверце мне, паверце ўсяму таму, што я вам пішу. На спэкталь прыехала з ваколіцы шмат народу. Прыехаў і агроном з раёну. Вельмі цікавы, інтэлігентны чалавек. Франт, хараша адзеты. Круглы, голены, гладкі твар. Завецца ён Іван Мацьвеевіч. Барады ранейшай у яго няма. Але, выбачайце, цёценька, што я забягаю наперад... Цярплівасьці няма, а вас прашу, мілая, майце цярплівасьць. Я пазнаёмілася з агрономам. Ён буркнуў мне сваё прозьвішча. Шапавалаў,—сказаў ён. У мяне ў вачох пацямнела, як зірнула на яго. Вочы яго мне паказаліся такімі знаёмымі. Над левай брывёю невялічкі шрам... Я толькі зьдзівілася, што ён так растаўсьцеў. Ён на мяне скоса зірнуў і рукі ў яго задрыжэлі. «Дзядзя»,—крыкнула

я,—«няўжо-ж гэта вы?!» «Не! Ня я»...—сказаў ён і язык у яго блытаўся. «Ці не памятаеце вы, Антон Сяргеевіч, як вы мяне на руках гойдалі?»—запыталася я ў дзядзі (гэта быў ён). Памятаеце, цёценька? Кожны раз, калі я да вас у госьці прыяжджала, дзядзя любіў забаўляцца са мною.

Дзядзя пры маіх словах зьбялеў і ня ведаў, дзе дзецца. Хутка яго ня стала на спэктаклі. За ім было пагнаўся адзін сівы селянін, падобны выглядам да Льва Талстога і крычаў: «Таварыш агроном! Мне рукапісы!» Але дзядзя нібы і ня чуў гэтага крыку. Мой гаспадар, Крушынскі, вельмі хваляваўся, думаў, што агроном за штосьці на яго пакрыўдзіўся!

Дык вось, мілая цёценька, дзядзя жыве. Ён цяпер Іван Мацьвеевіч Шапавалаў. Колькі вам і нам усім каштавала сьлёз раптоўная яго «сьмерць». Вот-жа ён, злы чалавек, прыдумаў хітра. Памёр і кончана! Каб ня было ў вас дзяцей, мілая, дык раіла-б плюнуць на яго і ня шукаць. Але-ж вам цяжка жывецца, дык прыдзецца дастаць у яго сродкаў на ўтрыманьне малых. Спачатку думала паслаць Вам тэлеграму, каб зараз прыехалі сюды, але не хацелася палохаць Вас. Сваім я пакуль-што ня пісала. Бывайце здаровенькі, мілая цёця! Чакаю вас! Прывітаньне ўсім! Цалую!

С. Вярбіцкая.

Марцін не дапытваўся ў сваёй жонкі Мэры аб прычынах, чаму яна кінулася ў рэчку. Прычына яўная: яго бацька назваў яе «жыдоўкай».

Аб учынку Крушынскага Мэра яму не расказала. Яна баялася, каб Марцін, даведаўшыся аб гэтым, ня кінуў яе. Тады яна, апаганеная ўсімі, нідзе прытулку мець ня будзе. Аб падзеях у Марцінавай хаце болей не гаварылі яшчэ дзеля таго, што Мэра захварэла на гарачку.

У той самы дзень яна лягла ў ложак. Вечарам у яе пачаўся брэд. З яе нязьвязных слоў на яўрэйскай мове Марцін нічога ня мог зразумець. Толькі час-ад-часу чуў зразумелыя для яго два словы:

«Рахмілька, Крушынскі».

Мэра ад гарачкі скідала з сябе коўдру. Твар яе гарэў, вочы блішчэлі чужым, няпрытомным блескам. Цяпер, калі жонка ляжала хворая і нават часам яго не пазнавала, Марцін не адыходзіў ад яе. Часта мяняў халодныя компрэсы, якія прыкладаў да яе галавы.

Надзвычайная чуласьць, няпрывычная для простага селяніна, зьявілася ў Марціна да Мэры. Ён адчуваў, што цяпер, яшчэ болей, чым раней, любіць сваю жонку. Яна такая прыгожая... Раней ён гэтага не заўважаў... «Можа ня выжыве»... Стараўся выкінуць гэту думку з галавы.

— Няўжо-ж узрадуюцца яе сьмерці і мае, і яе бацькі?

Марцін выскачыў на некалькі хвілін да суседа і прасіў запрэгчы каня і ехаць па фэльчара ў мястэчка. Каля ног круціўся сабака. Ён зазлаваўся і ўдарыў сабаку нагою ў бок. Сабака заскавытаў, падкруціў хвост і адышоў. І раптам шкода зрабілася сабакі, і брыдка неяк.

Падышла суседка...

— Як жонка?

Марцін нічога не адказаў. Пабег у хату.

Суседка яму ўсьлед кіўнула галавою і завалюхала да другой суседкі з гатовай, сьвежанькай навіною:

— Марцін галаву страціў дзеля гэтай жыдоўкі...

Мэра нават ня чула, як Марцін мяняў компрэсы на яе гарачым лобе. У хаце было змрочна. Да Марціна прышла яго малодшая сястра.

— Як бацька?—шэптам запытаўся Марцін.

— Злуецца, лае цябе, кляне...

— Зьбегай да Крушынскага, пазыч газы. Бачыш, мне прыдзецца сядзець пры ёй усю ноч. Газы няма. Во бутэлька! Хутчэй!

Дзяўчына пашла.

... А Мэра і ня ведала, ці сьветла ў хаце, ці цёмна. Перад яе вачыма нешта мітусілася. Яна сама хутка насілася нямаведама куды. Ёй здавалася, што яна—маленькая дзяўчынка.

Лета. Гарачы дзень.

Яна бегае па вуліцы недалёка ад кузьні.

«Мэра!» «Мэрка!»—крычыць з кузьні тата,—«скажы маме, што трэба паставіць самавар. Я зараз канчаю працу!»

Мэра ведае, што сягоньня пятніца. Мама рыхтуе на шабас смачную халу. Цэлы тыдзень яны белай булкі, што завецца

«хала», не каштуюць. А на шабас заўсёды ёсьць хала—смачная, жаўтком памазаная, чарнушкай абсыпаная.

У кожную пятніцу мама пячэ маленькія «халкі» для Рахмількі і Мэры. Яна, Мэра, кожны раз сварыцца з Рахмількам за «халку». Ёй усё здаецца, што ў яго большая і смачнейшая «халка».

Кожны раз у пятніцу тата раней канчае працу ў кузьні, каб пайсьці ў лазьню. Пасьля лазьні п'е гарбату і вельмі пацее. Успацелы тата такі сьмешны, нібы плача...

Марцін глядзіць на Мэру. Яна бармоча незразумелыя словы: «Майн халэ! Майн халэ!» *

— «Мэркелэ!»—заве тата,—«хадзі тохтэрке ** сюды! Набярэш гарачых вугольляў і занясеш маме. Няхай самавар наставіць».

Бацька загаварыўся з селянінам, які прывёз каня каваць, і не глядзіць, як малая «Мэркелэ» бярэ гарачае вугольле з горну. Яна сыпле гарачае вугольле сабе ў спаднічку і нясе праз вуліцу з кузьні ў хату. Спадніца (зусім новая) наскрозь прагарэла. Вугольле высыпалася на зямлю. Угледзеў тата і крычыць:

— Ой, нарышэ Мэркелэ ***, новую спадпічку спаліла!

Селянін, які гаворыць з татам, зарагатаў так гучна, ажна куры на вуліцы спалохаліся.

Мэрка заплакала горкімі сьлязьмі. Яе агарнуў жаль. Мама кожны раз, калі Мэра выходзіла з хаты ў новай спадпічцы, чытала ёй доўгія чытанкі, як асьцерагацца, каб новую спадпічку—«крывавы пот таты»—не запэцкаць і не парваць. Мэрка стаіць пасярод вуліцы і горка плача:

«Майн клэйдэлэ... Майн клэйдэлэ» ****.

Дзьве старыя бабы заглядаюць у вакно Марцінавай хаты. Як толькі Марцін зірне ў вакно, яны адскокваюць. Мэра ў гэты час горка плача. Марціну жудасна робіцца. Ён прыкладвае ёй да галавы сьвежы компрэс. А яна праз сьлёзы мармоча: «клэйдэлэ, клэйдэлэ».

*) Майн халэ—мая хала.
**) Тохтэрке – дачушачка.
***) Нарышэ Мэркелэ—дурная Мэрачка.
****) Майн клэйдэлэ—мая спаднічка.

... А. вось і Рахмілька прышоў з «хэдэра *, у яго акрываўлены твар. Усе,—і тата, і мама, і суседзі,—спалохаліся.

— Хто цябе, Рахміэль, так параніў?—пытаецца мама.

— Рэбэ мяне біў,—кажа Рахмілька.—Я кепска маліўся сягоньня, дык рэбэ кіпцюрамі падрапаў мне твар.

— Рэхт!—сказаў на гэта бацька.—Вэрт! Ня будзь гоем, дык рэбэ біць ня стане! Ты шчыра зарабіў!

Маці абмывае Рахмількаў твар вадою, плача і шэпча:

— Зунэлэ... зунэлэ... **

Мэра ва ўсім спагадае маме: плача разам з ёю!

— Ціха вы!—крычыць тата.—У вас вочы на мокрым месцы!

Мэра сьлёз сваіх стрымаць ня можа: плача, шэпча разам з мамай:

— Зунэлэ... зунэлэ...

Сястра Марціна прынесла газы. Запаліла лямпу і пашла дахаты. Марцін адзін з хворай Мэрай, няпрытомнай ад гарачкі. Ён завесіў вокны тканінамі, каб зацікаўленыя бабы не заглядалі. Лямпа стаіць на стале. Бледны водсьвет падае на твар Мэры: палова твару ў ценю, а палова асьветлена. Яна быццам двухістотная. Вока, што на асьветленай часьці твару, прыплюснута. Нібы вастрыня нажа, спаміж прыпухлага ружовага вейка блішчыць чарната зрэнкі. Другое вока—у ценю, у палахлівай таемнасьці. Дзеля гэтага Мэра здаецца Марціну надзвычайнай істотай са сваімі незразумелымі словамі. Яна чужая. Таму ён яшчэ больш любіць яе... Яго бацька лаяў Мэру, назваў яе «жыдоўкай». «Бедная»—шэпча Марцін. Сьціскае кулакі ад злосьці.

... Мэра варочаецца з боку на бок. Ня ведае, дзе дзецца ад гарачыні. Скідае з сябе коўдру. Ёй здаецца, што сунулі яе ў гарачую печ. Яна смажыцца на вугольлях. Але вось дзьмухнуў ветрык—прыемны такі, з халадочкам. Так добра, ажна Мэра ўсьміхаецца. Яна—Мэра—малюсенькая, лёганькая пярынка. Вецер нясе яе над мястэчкам, над старымі імшалымі дахамі мястэчковых хат. І Мэры зусім ня дзіўна, што яна не чалавек, а пярынка. Гэта звычайная рэч. Яна многа такіх пер'яў бачыла

* Хэдэр—школа.

** Зунэлэ—сыночак.

каля рэчкі, дзе гусі пасьвяцца—і яна такая. Яна ведае толькі, што калісьці яна была Мэрай. Тады галава яе была гарачая, а ўсё цела дрыжэла ад холаду. Яна ажна зубамі ляскала. Цяпер яна пярынка. І сьмешная рэч—Крушынскі гоніцца за ёю—за пярынкаю. Вось даганяе. Яна крычыць у вялікім спалоху.

«Крушынскі! Мужу скажу!»

... Чаго яна Крушынскага ўспамінае?

Накрывае яе коўдрай і кладзе на галаву сьвежы компрэс.

Даўно мінула поўнач. Марцін стомлены. Ходзіць па пакоі, каб не заснуць. Вельмі спаць хочацца... Па сьцяне рухаецца яго цень—вялікі і нязграбны.

... Так. Бацька яе «жыдоўкай» назваў. Нічога страшнага няма ў гэтым слове, але бацька сказаў-жа так наўмысьне, каб вылаяць яе... маю любую жонку.

Марцін пабачыў на сьцяне аграмадны вялікі гаршчок: цень уласнага кулака. Гэтым самым кулаком ён хляснуў па твары роднага бацьку... А той, бацька яго, спачатку зьдзівіўся. Потым пахіснуўся, ледзь ня ўпаў...

— На старасьці лет зарабіў ад роднага сынка...—усхліпнуў ён, як малое дзіцё, і неяк сьмешна прысеў...

... Ён маленькі... сівенькі...

... Што-ж там, калі сказаў «жыдоўка», ня зьеў ён жонку маю гэтым словам...

Ад злосьці на самога сябе Марцін голасна вылаяўся і стукнуў аб тапчан кулаком. Талерка, якая стаяла тут-жа, падскочыла на месцы і разьбілася на дзьве роўныя часткі.

У Марціна пры гэтым адпала злосьць.

Ён узяў у рукі абедзьве палавіны талеркі і, як-бы апраўдваючыся перад талеркай, сказаў спакойным, пацяшальным голасам:

— Заўтра склею.

Вось знаёмая дарога ў мястэчка. Мэра едзе да бацькоў у госьці. У яе на руках маленькі сынок—ад Марціна.

— А можа ад Крушынскага?.. Не!

Яна добра памятае лік месяцаў...

Бацькі памірыліся з ёю. Нават тата стары глядзіць на яе добрым, хоць сумным вокам. А маленькі хлопчык на яе каленях

перабірае ножкамі і ручкамі. Ён плача тоненькім, жаласьлівым галаском:

— Квэ-э-э... квэ-э-э...

— Усё добра,—кажа бацька, —толькі ня шкодзіла-б, каб нарыхтаваць «аідышн брыс» *...

Адзін абразок з дзіцячых гадоў неадчэпна лезе Марціну ў галаву. Яму ўсяго пяць год. Бацька вядзе каня на пашу. За бацькам бяжыць ён, Марцін, і крычыць, просіцца-моліцца:

— Татачка, пасадзі на каня!

Бацька лёгка падымае яго на рукі («о, які моцны быў тады тата») і садзіць конна.

— Баюся, татачка, баюся...—крычыць Марцінка, гледзячы ўніз са сьпіны каня.

Яму здаецца, што сьпіна каня вельмі высока ад зямлі. Калі ён, Марцін, зваліцца ўніз, дык будзе ляцець да зямлі некалькі дзён... Але тата—магутны і сьмелы—трымае яго і кажа лагодным голасам:

— Ня бойся, сынку!

Марціну прыкра ад гэтага ўспаміну. Яго правая рука ўздрыгвае. Гэтай самай ёй ударыў роднага бацьку—сівенькага, маленечкага...

Бярэцца пад дзень. Мэра заснула. За адну ноч завастрыўся яе твар.

Марцін падаслаў сабе кажух пад бок, загасіў лямпу і лёг на лаве пры стале.

Яму сьніцца надзвычайна прыгожая музыка. Грае на вуліцы сівабароды музыка. Трымае ў руках сьмешны музычны інструмант—паліўны конік. Дзівіцца Марцін, што такая дзіцячая цацка прыгожыя гукі выдае.

Зайграе на паліўным коніку сівы чалавек і ад музыкі расплываюцца па зямлі абрусы. Ледзь прыкметна мяняецца колер абрусоў: спачатку яны чорныя, пасьля робяцца сінімі, у канцы

* Яўрэйскія хрэсьбіны.

сьвятлеюць. На абрусох пачынаюць скакаць агоньчыкі, скачуць і коцяцца, а абрусы ад іх не запальваюцца.

Прачнуўся.

Праз рэдкую тканіну на вокнах пранізваецца ранічны водсьвет. Грае на бяроставай трубе пастух.

Марцін ускочыў.

— Хто карову сягоньня падоіць?

Яго сястра ўжо даўно стучыць у дзьверы. Яна схваціла дайніцу і бягом у хлеў.

Марцін зьняў тканіны з вокан.

Сонечная раніца льлецца ў хату, запаўняе ўсе куткі, нібы пасудзіну невядомым пітвом.

Мэра прачнулася.

З дзівам глядзіць па бакох. Слабымі рукамі папраўляе валасы, яны склеенымі чорнымі пасмамі лезуць у вочы.

— Марцінка... Яшчэ не пацямнела?

Яе голас слабы, шапатлівы, пяшчотны, цёплы...

— Гэта-ж ты ляжала ў гарачцы ўсю ноч. Я халодныя компрэсы прыкладваў табе да галавы. Цяпер раніца.

— Нічога ня помню... нічога...

Загрукацелі на двара калёсы.

Праз пару хвілін рыпнуў дзьвярыма фэльчар. Левым бокам наперад усунуўся ў хату. У левай руцэ ён трымаў невялічкі ручны чамаданчык. Паставіў на стол.

— Новы фэльчар,—падумаў Марцін.—Ранейшы быў тоўсты, стары. А гэты малады, высокі, з акулярамі на носе.

Але зараз аб гэтым забыўся.

Фэльчар зьняў успацелыя акуляры і давай выціраць шкелкі белай новай хустачкай, зложанай акуратна, як пакет.

Ён выцірае старанна, павольна, спакойна, нібы робіць сур'ёзную хірургічную опэрацыю.

Пры гэтай рабоце ён цягне носам паветра, моршчыцца, глядзіць на Марціна падсьлепаватымі, без акуляр, вачыма і цэдзіць праз зубы заспанае «дзень добры!»

Марцін з цікавасьцю прыглядаецца да яго носа, намуленага дачырвана дротам ад акуляр.

— Дзе хворая?—пытаецца фэльчар і зноў насоўвае на нос бліскучыя акуляры.

XXIII

— Трэба ўмець расплюшчанымі вачыма глядзець на сьвет божы! Часам перад табою ляжыць скарб, бадзяецца ў сьметніку золата, а ты думаеш, што гэта брудныя, старыя чарапкі. Тады чалавек сьляпы, бо вочы яго бачаць ня тое, што ў сапраўднасьці ёсьць. Чалавек павінен мець духоўны ўзрок.

Айцец Дзімітры гаварыў гэта тонам ні то настаўніка ні то прарока. Ён упіраўся асалавелымі ад лікёраў вачыма ў дзьверы, адкуль пані Ганна часта прыносіла ўсё новыя закускі; замасьленым з чорным пазногцем пальцам поп паказваў на столь, «дзе знаходзіцца бог», і доўга разам з ядою разжоўваў свае навучаньні.

Такое каштоўнае казаньне, вартае таго, каб сотні людзей слухалі яго з царкоўнага амбону, лілося мёдам у вушы толькі аднаму чалавеку.

Язэп Крушынскі слухаў уважна. Каб у яго было дваццаць вушэй, дык яны ўсе былі-б накіраваны да гэтых сьвятых слоў айца Дзімітрыя.

— Прыкладам кажучы,—гаварыў далей айцец,—наш такі сьмешны чалавечак пад назваю «Леў Талстой». Ён часта, здаецца, і раней гэтага спэктаклю бываў у Курганішчы, а вы, Язэп Сымонавіч, на яго ніколі ўвагі не звarачалі.

— Што вы, бацюшка! Заўсёды жонка карміла яго на кухні.

— Не на кухні трэба трактаваць такога чалавека, а пры сваім стале, паіць найлепшым пітвом, карміць найсмачнейшай ежай. Возьмем, напрыклад, заграніцай. Там кожны вялікі чалавек мае сваіх журналістых, свой орган друку. У асобе «Льва Талстога» вы таксама маеце такога.

— Пеце, бацюшка, во гэтае салодкае! Яшчэ напоім і органа друку «Льва Талстога»!

Крушынскі наліў у чарку айца Дзімітрыя з новай бутэлькі.

— Не мяне павінны вы паіць і карміць, а «Льва Талстога». Ён для вас скарб, ён для вас золата!

Голас айца мяняўся. Бас і альт змагаліся між сабою ў яго хмельных словах. То браў верх тоўсты, як гук трубы, голас, то панаваў галасок тоненькі, нібы флейта ў самых пісклівых сваіх нотках.

Пры выпіўцы некалькі разоў перачытвалася корэспондэнцыя аб спэктаклі ў Курганішчы ў газэце «Савецкая Беларусь». Кожнае слова бралася на смак, нібы цукерка.

— У сельсавеце чыталі?—дзелавым тонам запытаўся поп.

— А як-жа! Чыталі! Уся Беларусь, увесь Саюз Рэспублік, уся заграніца чытала!—выкрыкваў, нібы лёзунгі, Язэп Крушынскі.—Толькі ня поўнасьцю надрукавана ў газэце. А «Талстой» не шкадаваў паперы, падробна апісаў спэктакль. Тут былі і з райвыканкому, і пагранічнікі. Можна сказаць, усё начальства было.

Крушынскі зірнуў у вакно.

Дзень быў сонечны, трохі з ветрам. Па дзядзінцы насіліся саломінкі і пажоўклыя кляновыя лісты. На двары мітусіліся людзі. Рабілі «траску» на пакрыцьце сьвірну і току. Конь быў запрэжаны, як пры малацьбе. Падганяў Рыгор, а яго маладуха падхоплівала з-пад нажа аблупленую ад яловых калодак белую, як сыр, «траску» і складвала побач ля плоту роўнымі клеткамі. І Рыгор, і яго жонка спрытна спраўляліся з сваёй працай. Конь ішоў роўнамерным крокам, ня рваўся наперад і дрэва лушчылася акуратна бяз глуму, з-пад нажа высьлізгваліся гладкія палоскі, нібы папера.

— Што так заглядзеліся, Язэп Сымонавіч?

— Гляджу, як машына мая працуе. Я сам зрабіў гэту прыладу.

— У поце ліца твайго будзеш ты есьці хлеб свой. Гэта вядомая рэч. А што, ня відаць яшчэ «Льва Талстога»?

— Мабыць, зараз прыедзе. Я-ж фурманку паслаў.

— Во, во. Гэта разумна! Шануй бліжняга свайго і цябе шанаваць будуць!

Айцец Дзімітры падмацаваў гэтыя словы падсмажаным блінцом. Блінец плакаў паміж яго пальцаў кроплямі масла.

— Блінцы павінны плакаць, а людзі—сьмяяцца!—заўважыў поп глыбокадумна.

— І аб гэтым напісана ў сьвятых кнігах?—з ледзь прыкметнай усьмешкай запытаўся Крушынскі і заёрзаў вусамі.

— Хоць не напісана, але я гэта прачытаў, Язэп Сымонавіч, духоўным вокам.

— А можа, бацюшка, духоўным вокам бачылі Мэру, жонку Марцінаву? Ня ведаеце, яна памірае ці папраўляецца?

— Каб нават пры сьмерці была, дык мяне на споведзь усё-роўна не пакліча. Няхрышчоная.

— Але можа так чулі?

З валасатага твару папа зіркулі на Крушынскага жартаўлівыя вочы. Айцец кіўнуў на яго пальцам і строга-ласкавым голасам сказаў:

— Н-н-н-у-у-у!

Крушынскі адвярнуўся тварам да вакна і прагаварыў халодным тонам:

— А «Льва Талстога» яшчэ ня відаць!

Ён адчуў на твары чырвань. У памяці жыва ўсплыў лес, пах грыбоў, Мэра, пухкі, як пярына, мох. У гэту хвіліну яму вельмі хацелася, каб яна памёрла:

... Будзе спакайней... А то Марцін...

— Мэра папраўляецца. Я ўжо бачыў яе на вуліцы,—адказаў як-бы на яго думкі поп.

— А вось і «Леў Талстой»!—устрапянуўся Крушынскі. — Прыехаў!

— Вельмі добра. Вы зрабеце яго сваім прыяцелем. Тады не адну хвалебную корэспондэнцыю аб вас у газэты пашле.

«Леў Талстой» усунуўся ў пакой роўнай, упэўненай хадою. Пагладзіў бараду. У руцэ ён трымаў вялізны сшытак у цьвёрдай аправе.

— Дзень добры людзям добрым!

— Добрага дня!

Ён прывітаўся з айцом Дзімітрыем і Крушынскім.

— Сядайце!—папрасіў Крушынскі і паказаў рукою на крэсла.

— Акі пастыр духоўны з біблияй!—заўважыў айцец Дзімітры.

«Леў Талстой» павольна палажыў сшытак на канапу, сеў на кончык стула, агляднуўся па баках, зноў пагладзіў бараду і запытаўся:

— Ня так сабе, тоісь, не на гулянку хіба прыслалі па мяне фурманку, пане Крушынскі?

— А гулянка што, кепская справа? Якраз на гулянку і прасіў вас!

— Пры такой асобе, тоісь, пры духоўным прадстаўніку рэлігійнага культу ня шкодзіць і опіум для народу пакаштаваць з гэтых бутэлек. Гэта значыць, з чарак.

— Правільна!—пахваліў Крушынскі.

Айцец Дзімітры ўсьміхнуўся, падсунуў бутэльку да Крушынскага і сказаў:

— Дык налейце госьцю сівабародаму вільготны опіум з гэтай бутэлькі, бо ад майго папоўскага ён не павесялее і галава ў яго ня пойдзе хадыром.

— Я папізму не прызнаю, але што-ж! Можна з паднесенай духоўнай рукою, тоісь, з гэтай бутэлькі папробаваць.

Крушынскі наліў усім у чаркі. Гаспадыня прынесла чарговую закуску. Выпілі.

— Дык вы папізму не прызнаеце, сівабароды мой парафіянін, пад імем «Леў Талстой»?

— Тоісь, вы мяне не зразумелі. Самы антырэлігійны чалавек мае сваю асобу, гэта значыць, духоўную. Так. Кожны, хто і ня верыць у бога, моліцца камусьці і чамусьці. Але я супроць патэнтованых папоў! Да вас, айцец Дзімітры, нічога ня маю. Калі жыве яшчэ рэлігія, дык чаму вам ня жыць?

Выпілі яшчэ.

— Нашто цяпер аб гэтым гаварыць? Будзеце сто гадоў спрачацца і кожны пры сваім застанецца!—сказаў гаспадар.— Дзякую вам, даражэнькі суседзе, за такую харошую корэспондэнцыю ў «Савецкай Беларусі».

«Леў Талстой» зазьзяў вачыма.

— Няма за што дзякаваць. Дзякуй належыць вам, пане Крушынскі, ад усяго працоўнага сялянства нашай ваколіцы за спэктакль. Так. Пролетарскае прывітаньне за тое, што насеялі, тоісь, ня збожжа, а культуру! Я сваёй працоўнай корэспондэнцыяй выканаў сваю абвінавачанасьць, тоісь, свой доўг перад працоўнай рэспублікай. Так. Я тут зусім на старане. Так.

— Вы—наш летапісец (айцец Дзімітры падняў угару палец). Ад вас залежыць паказваць добра ў пісанінах сваіх нашае жыцьцё перад чытачамі газэт. На гэты раз добра паказалі. Будзьце заўсёды такім! Вось маё благаславеньне!

«Леў Талстой» гладзіў бараду, выцер рукавом вільготны ад поту лоб, глыбей расьсеўся ў крэсьле і голас яго стаў млявым і як-бы вільготным:

— Дваццаць гадоў быў я пісарам у земскага начальніка, і ён мяне гэтым самым словам, тоісь, летапісцам, абзываў! Дзякуй яму, у мяне цяпер вялікая кіпа блянкаў ад яго ў спадчыну засталася. Як ён уцёк у 1917 годзе ўвосень, я нічога не чапаў з яго кватэры, толькі чыстую паперу і блянкі, не запоўненыя, забраў. Так. І вось на паперы, якая была прызначана для контрэволюцыі, я цяпер праводжу рэволюцыю. Пішу, тоісь, свае творы. Так. У канцылярыі земскага я першы зрабіў пераварот. Так.

— Дык вы-ж заслужаны перад рэволюцыяй?—уставіў Крушынскі сваю заўвагу.

— Ну, так.

— Дык чаму-ж вы аб гэтым маўчыцё?

— А чаго мне крычаць? Мне-ж нічога не баліць. Вось у мяне ёсьць кніга, мая ўласная, сваёй рукою напісаў на паперы земскага начальніка, дык там аб усім гэтым напісана. Так. Завецца гэта кніга «Аповесьць аб тых часох, аб якіх некаторыя хацелі-б, каб вярнуліся». Так. Кніга гэта была на спэктаклі, я хацеў сказаць, што я быў на спэктаклі, а яна, тоісь, кніга, была са мною. Так. Я хацеў яе даць на прагляд агроному, але ён не пасьпеў са мною пагаварыць, тоісь, я з ім не пасьпеў, як ён раптам уцёк...

Пры гэтых словах Крушынскі ўздрыгануўся.

— Ён уцёк, як толькі пару слоў прагаварыў з вашай настаўніцай,—гаварыў далей «Леў Талстой».—Я выскачыў за ім на двор. «Пачакайце,—кажу яму,—аддайце мне мае рукапісы, альбом, тоісь». А ён на кані (конна прыехаў) ды як дасьць каню па вушах, ды як шугане з двара. Проста чэрці яго панесьлі. А вось мая новая кніга!

«Леў Талстой» узяў з канапы свой тоўсты сшытак.

— Я-б вам пачытаў, але доўга трэба чытаць, тоісь, доўга вам прыдзецца слухаць маю чытаніну. Так. Але вось у канцы кнігі ў мяне прыпісана корэспондэнцыя для газэты.

— Чытайце! Чытайце!

«Леў Талстой» выняў з кішэні акуляры. Замест адламаных аглобляў была прывязана да загнутых дроцікаў тоўстая нітка. Ён насунуў акуляры на нос і ніткай замацаваў на галаве. Монотонным голасам пачаў чытаць:

«Сяляне вёскі Гаўдачаны стукаюцца ў чырвоныя дзьверы соцыялізму».

— Гэта толькі назва колектыву, тоісь, артыкулу,—тлумачыць «Леў Талстой».

— Чытайце! Чытайце!

«Леў Талстой» настаўляе акуляры на сьпісаныя балонкі разгорнутага сшытку і кажа ў сваю бараду: «Та-ак!»

Потым пачынае чытаць ранейшым голасам:

«Савецкая ўлада вельмі трапна ўзбудзіла працоўнае сялянства, якая спала соткі і тысячы працоўных гадоў. Так. Сяляне рвуцца да лепшага жыцьця, да сьветлага жыцьця пасьля Кастрычнікавай рэволюцыі. Так. Такія прыклады бачым усюды, тоісь, не за межамі, дзе імпэрыялістычная акула душыць бедныя масы, няма такіх добрых прыкладаў, а толькі ў нас, дзе пануе комунізм. Так. А цяпер да самай справы, тоісь, да вёскі Гайдачаны. Так. Вёска гэта знаходзіцца ў абкружэньні контрабанды і контррэволюцыі, усяго пяць вёрст ад культурнай гаспадаркі Курганішча, дзе праводзіць працоўную культуру вядомы па газэтах Язэп Крушынскі. Так».

Пры гэтых словах «Леў Талстой» спыніўся і кашлянуў.

Крушынскі заёрзаў на сваім месцы і міргнуў айцу Дзімітрыю.

«Так,—пачаў далей чытаць «Леў Талстой».—Усе сяляне памянёнай вёскі, тоісь, Гайдачаны, бедныя. Ніводнага багатага пад назваю кулака няма. І вось вярнуліся ў вёску два хлопцы з Чырвонай арміі. Так. Тоісь, чырвонаармейцы з гэтай-жа вёскі, сыны гэтай-жа беднаты. На адным сходзе чырвонаармейцы гаварылі аб цемнаце вясковай, тоісь, аб тым, што гайдачане ня ўмеюць жыць, ня ўмеюць гаспадарыць па сельскай гаспадарцы, гэта значыць, ня ўмеюць быць працоўнымі. Вось дзеля чаго яны, гайдачане, бедныя. Так. Вось дзеля чаго ў іх рэдка хлеб бывае на стале, а які ёсьць, дык на самагон пераганяюць. Трэба, сказалі былыя чырвонаармейцы, наладзіць колектыўную працоўную гаспадарку ў выглядзе комуны. Так. Тады, значыць, калі яны гуртам, працоўнай чырвонай талакою будуць усе разам працаваць, будзе шмат лягчэй. Гэтай зімою сяляне згадзіліся рыхтавацца да комуны. Тоісь, думаюць організаваць організацыю з організаванай сьвядомай беднаты памянёнай беднай вёскі Гайдачаны. Так. Трэба, каб рэдакцыя сама зьвярнула на гэта ўвагу і зьвярнула-б увагу тых, каго яна знойдзе патрэбным, каб прыслалі агітатараў у гэтую вёску. Так. Патрэбны кніжкі на сельска-гаспадарчыя патрэбы. Патрэбны машыны

на сельска-гаспадарчыя патрэбы. Так. Патрэбен каморнік, патрэбен сумленны агроном. Бо наш раённы агроном, Іван Мацьвеевіч Шапавалаў, ялімэнт няпэўны. Анэгды я з ім аб гэтым хацеў пагаварыць, дык ён ад мяне ўцёк. Так. Гэта было на вядомым па газэтах спэктаклі ў Курганішчы. Таксама гэты ялімэнт, тоісь, агроном Шапавалаў, сконфіскаваў мае рукопісы і не дае іх да друку. Так».

У час чытаньня пані Ганна прынесла міску гарачай стравы, паставіла недалёка ад «Льва Талстога». Ад пары шкелкі яго акуляр адразу спацелі. Ён прымушаны быў іх зьняць з носа, каб выцерці.

— У гэткім выглядзе нельга друкаваць вашу корэспондэнцыю,—сказаў айцец Дзімітры.—Навошта гэтыя абгаворы вакол справы. Трэба гаварыць адразу аб справе.

— Там рэдакцыі відаць будзе. Я пішу толькі тое, што ведаю. Так. А рэдакцыя надрукуе так, як яна ведае. Так.

— А навошта вам чапаць нашага агронома?—запытаўся Язэп Крушынскі, увесь чырвоны ад выпіўкі і злосьці.—І прычым тут контрабанда, якой у нас няма?

«Леў Талстой» зьбянтэжыўся. Ён зусім не рыхтаваўся да такой строгай крытыкі.

— Я-ж пішу, суседзі, толькі тое, што ёсьць, толькі тое тоісь, што я прызнаю для друку. Так.

— Вам можа за гэта так уляцець,—пагрозьлівым тонам сказаў Крушынскі,—што самі пасьля шкадаваць будзеце. Што напішаш пяром—ня вырубіш тапаром!

«Леў Талстой» ня так спалохаўся пагрозьлівага тону Крушынскага, як блеску яго вачэй. У іх замільгалі аганькі, ад якіх у летапісца холад заёрзаў па сьпіне.

Айцец Дзімітры маўчаў. Ён толькі барабаніў аб стол двума пальцамі і многазначна паглядаў на Крушынскага.

— Вы закранаеце ў вашым артыкуле контрабанду. З гэтага відаць, што вы выказваеце, можа і ня хочучы, контррэволюцыйныя думкі. Бо, калі была-б тут сапраўды контрабанда, дык значыць, што пагранічнікі ня пільнуюць. Вы, такім чынам, наводзіце паклёп на вартаўнікоў граніцы нашай Рэспублікі! Далей: вам не падабаецца наш агроном толькі дзеля таго, што ён не хацеў з вамі пагаварыць. Зноў паклёп на савецкага працаўніка. Ён можа на вас падаць у суд за брахню. Пісаць трэба факты.

Газэты друкуюць толькі факты, а ня тое, што хтосьці думае. Гайдачане толькі думаюць наладзіць колектыўную гаспадарку, а вы ўжо аб гэтым пішаце. Вось калі ўжо будзе зроблена, тады можаце пісаць. Вы-ж аб маім спэктаклі ў Курганішчы напісалі толькі тады, калі ён быў ужо наладжаны, а не тады, калі я думаў яго ладзіць. Вось дзеля гэтага і надрукавалі!

«Леў Талстой» прыслухоўваўся да кожнага слова крытыкі Крушынскага. Зноў-жа яго непакоілі ня словы, а вочы Крушынскага—вострыя, з халодным блескам, з нямой нежартаўлівай пагрозай.

Летапісец вінаватага паглядаў навакол.

— Дык я не пашлю ў рэдакцыю. Я усёроўна платы за гэта не бяру.

— Плата? Глупства плата!—ажывіўся Крушынскі і тон гутаркі ў яго зрабіўся болей лагодным і мяккім.—Я магу вам заплаціць за тую надрукаваную корэспондэнцыю і за гэту ненадрукаваную. Вы яе парвеце.

— Вось гэта дык правільна!—згадзіўся і айцец Дзімітры.— Кожны раз, калі што-колечы напішаце для газэты, давайце раней па прагляд мне або Язэпу Сымонавічу. Тады, будзьце пэўны, ніякіх няпрыемнасьцяй у вас ня будзе. Вельмі разумна зрабілі, што прывезьлі сюды пачытаць вашу пісаніну!

— За гэта і я хвалю суседа!—сказаў Крушынскі.— За гэта самае мы цяпер і вып'ем!

Зусім п'янага «Льва Талстога» адвёз дахаты сам Крушынскі. «Леў Талстой» па дарозе сьпяваў «Оружьем на солнце сверкая». Ён глядзеў на бакі—на лес і поле, пазіраў уверх—на сонца. І ўсё, што ён бачыў, двaілася і траілася ў яго вачох. Пад ім ляжаў мяшок з жытам: гонорар за яго друкаваныя і недрукаваныя корэспондэнцыі.

— Бачыце, суседзе з высокаю назваю «Леў Талстой»,—гаварыў яму Язэп Крушынскі,—кожная сумленная чалавечая праца ў савецкай рэспубліцы павінна быць сумленна аплачана. Інакш, за што-ж мы ваявалі? Каб вы часам ня скардзіліся на нашу рэспубліку, каб не сказалі, што ваша пісаніна не дае вам карысьці, я насыпаў для вас мяшок жыта. Вы анэгды скардзіліся, што ў вас хлеба толькі да каляд хопіць.

— Дзякую, дзякую! «Аруж'ем на сонцы...»

— Вы пастарайцеся адгаварыць гайдачан ад іхнага неразумнага проекту. Скажэце старэйшым, што вось трымаліся іхныя гаспадаркі дагэтуль і далей трымацца будуць. А то рассыпяцца яны на ўзьвей вецер, як бульба з дзіравага мяшка, калі пачнуць мудрагеліць.

— Я з вамі згодзен, зусім згодзен, пане Крушынскі! «Аруж'ем на...»

— Скажэце гайдачанам, што дагэтуль яны былі гаспадарамі сваіх кавалкаў зямлі, а калі яны пойдуць у комуну, дык прападуць. Нават ніхто ня будзе гаспадаром уласнай кашулі, ня то што кароўкі. Яны парабкамі паробяцца.

— Усё скажу, пане Крушынскі! Усё ім гаварыць буду. «Аруж'ем на...» Магу нават у газэту аб гэтым напісаць... «Аруж...»

— Не, не, суседзе! Ня пішэце аб гэтым. Няможна!

Крушынскі абняў яго правай рукою так моцна, ажна дух захапіла ў «Льва Талстога».

— Ну і ня буду пісаць. Так. Ліха з імі! «Аруж'ем на...»

— Вось гэта разумна. А то, калі напішаце, дык шкоду рэспубліцы нашай і ўсяму працоўнаму люду зробіце...

— Ня буду. «Аруж'ем...»

«Леў Талстой» задрымаў на возе. Яго белая барада тырчэла ўгару, нібы пук сіўцу. Крушынскі пусьціў каня павальней, каб ня дрогаць старога на возе.

«Шаноўны Язэп Сымонавіч!

Ёсьць вельмі пільная справа. Вазьмеце з сабою пяцьсот рублёў і едзьце ка мне зараз-жа. Магчыма для Вас гэта важней, чым для мяне. Чакаю.

Ваш І. М. Шапавалаў».

Такую пісульку Язэп Крушынскі атрымаў ад агронома праз спэцыяльнага пасланца. Крушынскі адразу запрог каня і паехаў. Ніколі агроном раней лістоў яму не прысылаў. Кароценькая пісулька яго вельмі напалохала.

...Што гэта за справа? Няўжо-ж Марцін падаў у суд за зьдзекі над Мэрай? Ці можа гэта тычыцца контрабанды? А магчыма нешта ў сувязі з вёскай Гайдачаны, якая хоча пераходзіць на колектыўную гаспадарку.

Яму, Крушынскаму, вельмі не хацелася мець у блізкім суседзтве такую гаспадарку: небясьпечнае для яго суседзтва.

... І чаму гэта Іван Мацьвеевіч тады са спэктаклю ўцёк?

Крушынскі гнаў каня як толькі мог. Няпрытульнай здавалася на гэты раз дарога ў мястэчка. Бярозавыя прысады былі жоўтыя. Лісьцё плаўна і ціха сыпалася на дарогу, нібы маленькія паперкі ад цукерак. Сонца стаяла нізка над лесам.

... Што гэта за справа? Навошта пяцьсот рублёў?

Асеньні дзень быў спакойны. Пахла сьвежай узаранай зямлёю і дымам. Выбіралі бульбу каля дарогі. На мяжы дыміў корч. Пасьвілася карова і босаногі хлопчык старанна тупаўся каля агню, кійком пераварочваў печаную бульбу.

... Чаму Іван Мацьвеевіч не напісаў ясьней?

Пасярод дарогі наперадзе нехта ішоў. Крушынскі яшчэ здалёку заўважыў яго. Той выглядаў спачатку маленькай кропкаю, а потым, з кожным крокам каня, кропка расла і вырасла ў чалавечую фігуру.

... Здаецца, знаёмы...

Чалавек адвярнуўся, паглядзеў на яго, адышоў у бок. Крушынскі спыніў каня. Давай прыглядацца да сівога чалавека. Глядзеў на яго пільна, хоць было няпрыемна глядзець.

— Дзень добры, Лейба! Садзіся! Падвязу!

Голас Крушынскага быў салодкі, ільсьцівы.

Лейба маўчаў.

— Няўжо злуешся на мяне?

Спачатку вочы Лейбы былі мутныя, туманістыя, а пасьля ў іх заблішчэлі аганькі. Хацелася Крушынскаму сьцебануць каня і ўцячы ад старога, як ад страшнай здані, але нешта не дазваляла гэта зрабіць.

— Садзіся, падвязу!

— Разбойнік ты! Забіў Рахмільку!

— Апамятайся, Лейба! У цябе мазгі не на месцы!

— Твая контрабанда выкапала магілу майму сыну.

— Лейба, суседзе... Ён-жа сам займаўся. Ніхто нікога не прымушаў. Лепш садзіся, пагаворым...

Холад прайшоў па сьпіне Крушынскага.

— Не магу сядзець побач з разбойнікам. Няхай цябе бог заб'е!

Крушынскі паехаў. «Бог» яго трохі супакоіў.

... Калі Лейба пагражае толькі богам, дык яшчэ поўбяды.

Ужо сонца было на заходзе, калі Крушынскі пакіраваў каня на двор, дзе жыў агроном.

Звычайна, калі ён прыяжджаў да агронома, той, угледзеўшы яго праз вакно, адразу выходзіў на двор насустрач. На гэты раз Іван Мацьвеевіч толькі праз вакно кіўнуў яму галавою: ня вышаў.

... Нешта нядобрае...

Такога «нядобрага» набралася ў Кушынскага за апошнія дні многа. Ён іх зьбірае цяпер у адно—усе няпрыемнасьці, каб вылавіць з іх нешта болей выразнае і яркае ў сувязі з агрономам і яго пісулькай.

Крушынскі адчыніў дзьверы ў пакой Івана Мацьвеевіча.

— Дзень добры, Іван Мацьвеевіч! Вось я і прыехаў!

— Ня дзень добры, а вечар добры, Язэп Сымонавіч! Садзецеся!

— Атрымаў вашу пісульку, Іван Мацьвеевіч.

— Ведаю. Іначай вы так раптоўна ка мне ня прыехалі-б.

— У чым справа?

— Зараз раскажу, Язэп Сымонавіч. Будзьце цярплівы.

Адзін раз толькі Крушынскі кінуў вокам на халасьцяцкі пакой Івана Мацьвеевіча і зразумеў, што сапраўды нешта сур'ёзнае задумаў агроном. Пакой увесь бадай быў пусты. Толькі два чамадана запакаваныя, відаць, туга набітыя рэчамі, стаялі на пустым без пасьцельных рэчаў ложку. Але ня гэта зьдзівіла Крушынскага, а выгляд самога Івана Мацьвеевіча. Усяго толькі тыдзень, як яны ня бачыліся, а агроном за гэты час вельмі памізарнеў. На яго заўсёды гладкіх шчоках цямнелася кароткая густая шчаціна. У выразу вачэй, у голасе, у гестах і ва ўсіх манерах яго Крушынскі заўважыў нешта новае, незнаёмае, чужое.

— Што з вамі Іван Мацьвеевіч? Вы так зьмяніліся за гэтыя дні. Каб сустрэў вас ня ў вашай кватэры, дык, мабыць, не пазнаў-бы.

— Праўда?!

Іван Мацьвеевіч усьміхнуўся задаволенай усьмешкай. Але і ўсьмешка ня была падобная да ранейшай: затаёная, асьцярожная і робленая.

— Я вельмі рады, Язэп Сымонавіч, што так зьмяніўся. Я ўжо наогул ня той. Ня той з таго часу, калі раптоўна ўцёк з вашага спэктаклю.

— Чаму-ж вы ўцяклі тады? Я так занепакоіўся. Увесь гумар у мяне быў тады сапсуты.

— Што-ж, Язэп Сымонавіч, мне здаецца, што «Леў Талстой» сваёй корэспондэнцыяй у газэце «Савецкая Беларусь» паправіў ваш гумар...

Іван Мацьвеевіч зірнуў на Крушынскага калючымі чорнымі вачыма.

— Ня менш добры быў у мяне гумар і тады, калі ў «Беларускай Вёсцы» адзін добры прыяцель напісаў аб культурнай гаспадарцы ў Курганішчы, паважаны Іван Мацьвеевіч!

— Вось дзеля гэтых сваіх глупстваў, дзеля таго, што вы мяне ўвесь час абманвалі, Язэп Сымонавіч, я ўцёк і ад вашага спэктаклю. Вы мяне абманвалі заўсёды. Бачыце, я ўжо не нашу вопраткі з вашых матэрыялаў. Я толькі нядаўна даведаўся, што гэта контрабанда; даведаўся пасьля таго, калі Рахмілька быў забіты на граніцы...

У кожным слове агронома Крушынскі адчуваў нешта жорсткае, няпрыемнае. Словы калолі яго, нібы вострыя шпількі, аддалялі ад ранейшага прыяцеля на вёрсты, на мілі.

— Не разумею, што на вас раптам найшло, Іван Мацьвеевіч? Вы зусім ня той чалавек, якога знаў апошнія два гады.

— Ня той, кажаце?

З вялікай напружнай зацікаўленасьцю Іван Мацьвеевіч чакаў адказу на гэтыя словы.

— Зусім іншы чалавек...

— О, які я шчасьлівы! Гэта мяне так радуе!

Іван Мацьвеевіч засьмяяўся гучна і шчыра. У яго быў такі выгляд, нібы ён па-дзіцячаму пажартаваў над Язэпам Сымонавічам, а цяпер хацеў сказаць, што гэта толькі жарт, што нічога сур'ёзнага тут няма, што ён зараз на гэту тэму раскажа цікавы, вясёлы анэкдот.

Ад яго сьмеху Крушынскаму стала лягчэй на душы.

— Вы жартуеце нада мною, Іван Мацьвеевіч. Цяпер я вас пазнаю. Цяпер бачу ў вас свайго старага прыяцеля.

— Што? Я такі самы, як і раней? Я не зьмяніўся?—устрывожана запытаўся Іван Мацьвеевіч.

— Вы толькі схудалі і няголены.

Язэп Крушынскі заўважыў, што агроному прыямней, калі гаварыць, што зьмяніўся. І ён дадаў:

— Вы зусім ня той, але мы па-ранейшаму з вамі прыяцелі, Іван Мацьвеевіч? Я-ж вам нічога кепскага не рабіў...

— Кепска тое, што вы мяне абманвалі.

— Я вас не абманваў. Вось і пяцьсот рублёў прывёз...

Агроном ажывіўся.

— Мы, канечне, застанемся ранейшымі прыяцелямі. Я быў нездароў апошнія дні, дзеля гэтага я так выглядаю. Вы мяне выбачайце, Язэп Сымонавіч, што я з вамі гавару такім тонам. Ведаеце, у мяне нэрвы трохі расшрубаваліся ў часе хваробы. Я сябе кепска адчуваў тады на спэктаклі. Вось дзеля чаго я зараз-жа ўцёк, каб вам клопатаў лішніх не рабіць у такі вечар. Вельмі мне няпрыемна прасіць у вас, каб вы мне пазычылі пяцьсот рублёў, але я прымушаны. Мне трэба раптоўна паехаць адгэтуль на некалькі тыдняў. Аб прычынах паездкі я вам раскажу тады, як вярнуся і аддам вам доўг. Я вельмі, кажаце, зьмяніўся?

Крушынскі адчуў, што калі дасьць цяпер грошы агроному, дык яны ўжо ніколі ня вернуцца.

— Калі ласка, Іван Мацьвеевіч! Але больш двух сот рублёў даць вам не магу. У мяне цяпер вельмі скрутнае грашовае становішча. Мне трэба аддаць тут аднаму чалавеку доўг якраз у трыста рублёў.

— Язэп Сымонавіч, мы з вамі, як вы самі толькі-што сказалі, старыя прыяцелі. Калі вам так цяжка з грашыма, дык я ў вас нічога не вазьму. Я меркаваў раней, што вам ня так цяжка. Я зусім не падумаў, што, апрача мяне, яшчэ можа хто ведае, чыё золата знайшлі ў забітага Рахміලькі... Можа прыдзецца каго-колечы падмазваць, а я лезу цяпер да вас у гэткі час са словамі: «пазычай грошы!» Я-ж не разбойнік, а ваш прыяцель...

Крушынскі зноў адчуў у словах агронома нешта такое чужое і няпрыемнае, ад чаго на душы цяжка зрабілася.

— Калі вам так патрэбны грошы, дык я вам пазычу, Іван Мацьвеевіч, усе пяцьсот рублёў. Я так-сяк абыйдуся...

— Не, не!—Іван Мацьвеевіч замахаў рукамі.—Я ў вас нічога не вазьму.

— Іван Мацьвеевіч, прашу вас! Вы мне не адмовіце, возьмеце ў мяне грошы!

Раптоўнае аднекваньне і адмаўленьне ад грошай напалохала Крушынскага яшчэ болей.

— Не вазьму... Так можа будзе лепей...

— Іван Мацьвеевіч...

Крушынскі выняў з кішэні грошы і палажыў на стол.

Змрочна было ў пакоі. Зайшло сонца. Крушынскі адчуваў сябе нібы ён адзін. Заўсёды гутарлівы Іван Мацьвеевіч цяпер упарта маўчаў. Ён сядзеў на пустым ложку, прыпёрты да сьцяны, закрыў твар абедзьвюма рукамі, нібы зьбіраецца заплакаць.

— Іван Мацьвеевіч...

Агроном маўчаў.

... Мабыць, ня хоча, каб я тут заседжваўся,—падумаў Крушынскі.

— Бывайце здаровы, Іван Мацьвеевіч, еду дамоў.

— Бывайце...—ледзь чутным голасам шапнуў агроном і не крануўся з месца.

— Дык вы кажаце, што я да сябе непадобны?—шапнуў ён уздагон Крушынскаму.

Той ня чуў і не адказаў на гэта запытаньне.

На Харкаўскім вагзале. У цырульні.

— Вось тут усюды абгаліць і пакінуць бакенбарды.

— Ага. Добра!

Пасажыр, які галіўся, глядзеў у люстэрка і камандаваў цырульнікам:

— Яны павінны быць вузенькія, гэтыя бакенбарды.

— Вусы па-ангельску прыкажаце?

— Па-ангельску.

Малады цырульнік у белым халаце спрытна яго абыходзіў, за твар браўся далікатна і брытвы на твары ня чуваць было. Яна не скрабла, а вельмі пяшчотна гладзіла шчокі і бараду.

— Одэколёнчыку прыкажаце?

— Можна.

Ветрык ад салфэткі прыемна казлытаў голены, гладкі твар, асьвяжаў вочы.

— Пудры?

— Будзьце ласкавы!

Цырульнік працаваў над яго тварам так старанна, з такім захапленьнем, нібы скульптар, які наводзіць апошні глянц на сваім творы.

Пасажыр сядзеў у забыцьці з зачыненымі вачыма. Заглушаны гуд людзкіх галасоў слаба даносіўся сюды з агульнай вялізнай залі.

— Гатова!—сказаў цырульнік прывычна-ласкавым голасам і пакланіўся з усьмешкай аўтомату на твары.

— Дзякую!

Пасажыр глянуў у люстэрка.

Са шкла на яго пазіраў мужчына гадоў пад сорак, у круглых чарапахавых акулярах з тонкімі бакенбардамі і маленькімі вусікамі. Праз акуляры вочы здаваліся вострымі і бліскучымі, а твар чужы, незнаёмы і інтрыгуючы.

— Першы раз у сваім жыцьці акуляры надзеў. Доктар прыпісаў. З няпрывычкі нос муляюць. Калі ласка, за працу!

— Дзякую!—цырульнік цьфукнуў на серабро.—Вы ў мяне сягоньня першы кліент. Вядома, з няпрывычкі яны трохі непакояць—акуляры. Звыкнеце.

Пасажыр аглядаў сябе ў люстэрка з усіх бакоў. У фрэнчы, у галіфэ і жоўтых ботах ён быў падобны да савецкага франта часоў вайсковага комунізму, а тварам—да паштовага дарэволюцыйнага чыноўніка.

Пасажыр вышаў у залю і сеў пры століку. Ён заказаў сьняданьне ў чорнавусага афіцыянта. Часта мацаў двума пальцамі бакенбарды і вусікі, нібы яны былі прыклеены. Часта браўся за акуляры і пробваў, ці яны на месцы. Ад гарачай кавы спацелі шкелкі. Ён пачаў выціраць акуляры белай хустачкай.

Каля яго мітусілася шмат народу: афіцыянты насілі на тацах гарбату, закускі, спрытна падавалі на столікі. Адны пасажыры паўставалі з месц, новыя садзіліся. Насільшчыкі з бляшкамі на грудзёх, у белых палатняных хвартухох ёрзалі туды і сюды. У вялікім людзкім тлуме саракагадовы пасажыр з маленечкімі бакенбардамі адчуваў сябе вельмі добра. Спакойна аглядаў усіх. Час-ад-часу гладзіў бакенбарды і папраўляў акуляры.

Каля століка пасажыра прайшла кабета ў чорным капялюшы, у абшарпаным дэмісэзонным паліце, з старым чамадан-

чыкам у руцэ. Кабета праплыла па ім сінімі вачыма і пашла далей.

Пасажыр уздрыгануўся, пабялеў і заёрзаў на месцы. Ён пазваніў лыжачкай аб шклянку. Падскочыў афіцыянт.

— Дайце рэшты!

Кінуў трохрублёўку і ледзь чутна прашаптаў гэтыя словы. Нібы асьцерагаўся, каб ніхто ў шумлівай вялізнай залі не пачуў яго голасу.

Прыкметна была яго нецярплівасьць. Ён палажыў рэшту ў кішэню паліта, не азірнуўся па баках і сьпешнымі крокамі вышаў з залі.

Падаў дробны дождж. Пасажыр ішоў памалу, не зважаючы на дожджык. Відаць было, што яму ўсёроўна куды ісьці.

На выкрык хлапчука «пачысьць бацінкі!» ён махінальна паставіў нагу на падстаўку, потым нават ня зірнуў, якія срыбныя монэты кінуў хлопчыку за чыстку. На прапанову газэтчыка ён узяў газэту, сунуў у кішэню і таксама даў яму срыбную монэту. Кінуў дробязь жабраку, які сядзеў на мокрым памосьце бяз шапкі і гнуў голую галаву да самай зямлі, нешта мармычучы скавытлівым голасам.

Відаць было па ўсім, што пасажыр зусім далёк ад таго, што робіцца вакол. Часам ён з захаванай пад акулярамі апаскай аглядаўся назад, нібы хтосьці за ім гоніцца. Ён сутуліўся, ішоў бокам, як-бы стараўся праціскацца па пуставатай вуліцы сярод нявідочнага натоўпу, каб схавацца як найхутчэй ад пагоні.

... Яна такая самая...—прамармытаў ён.—Не пазнала мяне. Мабыць, і Крушынскі мяне-б цяпер не пазнаў.

Гэта быў агроном, цяпер—Сямён Пракопавіч Мікалаеў, раней—Іван Мацьвеевіч Шапавалаў, нараджоны Антон Сяргеевіч Мятлоў.

Пад новым выглядам і новым дакумантам ехаў на Каўказ. Ён быў вельмі ўсхваляваны. На вагзале сустрэў сваю жонку, Аграфену Макараўну. Яна зірнула яму ў вочы і не пазнала.

Даўно ня было ў яго такіх хваляваньняў, як у апошнія дні: ад сустрэчы з пляменьніцай на спэктаклі да сустрэчы з жонкаю.

... Куды гэта яна едзе? Няўжо Стэфка напісала ёй? Пэўна напісала.

Агроном спыняўся па вуліцах каля вітрын, дзе былі люстэркі, глядзеў на сябе з замілаваньнем, часта мацаў свой бумаж-

нік з новым дакумантам і шаптаў сваё новае імя і прозьвішча, нібы замову супроць зубнога болю:

— Сямён Пракопавіч Мікалаеў...

— Сямён Пракопавіч...

— Сямён Прак...

— Сям...

На тратувары цікавалі за ім два чалавекі: Антон Сяргеевіч і Іван Мацьвеевіч.

Новы чалавек у яго выабражэньні яшчэ ня быў афармлены ва ўсіх дэталях. Вырысоўвалася перад ім толькі верхняе аблічча Сямёна Пракопавіча: пушыстыя бакенбарды, вусы, акуляры і няпрывычная для яго вопратка. Аб нутраным зьмесьце Сямёна Пракопавіча ён яшчэ добра не памазгаваў. Аб гэтым пастанавіў падумаць у вагоне. Аднак, думкі аб гэтым і цяпер пакою не давалі.

... Мабыць, прыдзецца выкінуць анэкдотную частку. Самае лепшае—вострая сатыра. Глядзець на ўсё вакольнае з едкай кпінай. Гаварыць вострыя слоўцы аб кабетах. Аб політыцы зусім не гаварыць. З начальствам трымацца як роўны з роўным. Часам і памылкі паказваць, а часам з халоднай пашанай слухаць загады начальніка. Ня ільсьціць. На людзей староньніх глядзець незацікаўлена, але адносіцца да іх уважліва. Тады і мяне будуць шанаваць. Абавязкі выконваць акуратна. Быць строгім да самога сябе. Ні з кім лішне ня дружыць, ня быць ні з кім блізкім, як быў з Крушынскім, каб ня трэба было пасьля ўцякаць з новага месца.

Сямён Пракопавіч сам не заўважыў, што на Харкаўскіх вуліцах ён творыць новага чалавека: новы мастацкі твор, вышэйшы,—болей каштоўны за ўсе формы мастацтва.

Сямён Пракопавіч успамінаў герояў з літаратуры, з тэатру, з кіно, уяўляў сабе бачаных па розных музэях портрэтаў людзей, прыглядаўся да людзкога тлуму на вуліцах і браў для свайго новага твору па аднэй рысцы, па кавалачку з кожнага вартага ўвагі тыпу і героя. Спачатку яго твор—новы, жывы чалавек—выйдзе трохі ў стылі мозаікі, але з цягам часу гэта зробіцца няпрыкметным і яго новы чалавек завлюе поўнае права ня толькі на існаваньне, але нават на посьпехі ў жыцьці.

Ён быў ад гэтых думак у захапленьні, нібы компэзытар у экстазе творчасьці, калі гукі новай сымфоніі вандруюць у яго

выбражэньні і яшчэ не ўвайшлі ў жыцьцё праз музычныя інструманты і сьпевы.

Ён адчуваў сябе шчасьлівым, але шчасьце яго было трагічнае. Нібы цень чорных крыльляў вялізнага птуха ўрываўся ў сонечныя блікі: перад яго вачыма мільгалі строгія вочы жонкі. Галоўкі дзяцей—яго родных, любых—сьвяціліся перад ім, як анёлы на малюнку Рафаэля.

Сямён Пракопавіч часта выціраў акуляры...

Вечарам ён паехаў чыгункай у бок Растову.

У поезьдзе, у вагоне зноў людзкі тлум.

... Трэба быць напружным, трэба быць на варце...

Сямён Пракопавіч ляжыць на верхняй лаўцы, адчувае, як імчыцца поезд. Бяжыць наперад разгарачаны жалезны зьмей, і нямаведама, скуль ён зьявіўся і дзе ён спыніцца.

А за вокнамі—ноч.

Часам зірне яна праз вакно каляровым вокам ліхтара, замігцяць іскры ад паравозу і зноў асьлепне шкло сіняй сьлепатою. Тахкаюць калёсы, будзяць стэп:

— Тах-тах-тах-тах.

— Так-так-так-так.

Мабыць, стэп падбірае розныя словы і мэлёдыі пад рытм жалезных калёс.

Мабыць, адзінокі падарожнік, які цяпер вандруе па стэпу, радуецца, што ён не адзінокі, яго вітае жалезны зьмей цягніка часам тонкім сьвістам, часам басавым іржаньнем з чыгунным клёкатам калёс па рэйках...

— Добры вечар, дабрадзею! Тах-тах-тах!

— Добры вечар, казача! Так-так-так!

Мабыць, заўтра стэп будзе сонечны. Па ягоаграмадных абшарах вецер будзе сьцежкі пратоптваць і шукаць сьлядоў сівавусых бандурыстых, якія чаломкалі задумёнаму Дону перад тым, як напіцца.

Заўтра будзе сонца і вецер.

Часам праз вакно ўзіраецца ў вагон круглы, яркі месяц...

Ён цяпер у Доне купаецца, срыбрыць хвалі, чэша залатым грэбнем прыбярэжныя чубы кавылёў.

Часам жалезны зьмей зьбянтэжыцца ў ночным стэпу, тарганецца, сьвісьне і стане на месцы.

Сямён Пракопавіч абуджаецца. Праз вокны вагону сьвеціцца станцыя. Шумна. Новыя пасажыры лезуць у вагоны. Пасажыры заклапочаны, шукаюць месцы. Спрэчкі. Піскі і хіхат жанчын.

Сямён Пракопавіч прыслухоўваецца да людзкіх галасоў:

... Можа ў гэтым шуме і знаёмы голас пачую.

... Ці толькі здаецца? Галюцынацыя слуху?..

... Басок...

... Мала ёсьць падобных галасоў?..

... Каб кожны чалавек быў адораны прыродай сваясаблівым голасам, які ня быў да яго і пасьля яго ня будзе, дык гэта-ж было найвялікшым багацьцем тонаў...

... Няўжо галасы людзей ня могуць быць падобнымі адзін да аднаго?..

... Вось багаты музычны інструмант—людзкія галасы...

Так філёзофствуе Сямён Пракопавіч.

Ён прытаіўся, ляжыць на лаўцы, прытаіліся і думкі яго. Прыслухоўваецца. Хочацца зірнуць на суседнюю лаўку. Баіцца.

Адтуль два галасы—мужчынскі і жаночы.

... Мужчынскі вельмі знаёмы.

Мужчына часта кашляе.

... Ён ці ня ён...

Горача робіцца Сямёну Пракопавічу. Цягне паглядзець. Жмурыць вочы. Паказвае незнаёмаму акуляры і бакенбарды.

... Можа галюцынацыя зроку...

... Таварыш, аднакашнік... Высокі лоб. Тыя самыя вочы, валасы. Зусім не зьмяніўся за такі доўгі час. Яна, мабыць, яго жонка...

Цяпер для Сямёна Пракопавіча ня існуе ні стукат калёс, ні вагон, ні пасажыры—апрача *аднаго*... Апрача гутаркі гэтага *аднаго*..

Ён ловіць кожны гук «таго». Той да жонкі гаворыць:

— Тры дні пабудзем у Растове і назад. Тры дні.

Моцна кашляе.

— Ня кашляй так. Вось чакаляда.

— Надта, думаеш, памагае.

— Папрабуй.

«Той» есьць чакаляду. Зноў кашляе.

— Вось бачыш!

Гаворыць гэта з такім тонам, нібы рад свайму кашлю.

— Ссылка табе ня хаханкі!—тлумачыць «той» жонцы.

Сямён Пракопавіч затаіў дыханьне і слухае...

... Ён... Грышка...

І вось на пацьвярджэньне:

— Чаму, Грышутка, партыя цябе не пасылае лячыцца?

«Той» злуецца:

— Вечна лячыцца! Працаваць трэба! Штогод лячуся і што з таго?

Зноў кашаль.

— Вось, каб знайшоў таго провокатара, Мятлова, дык яго-б палячыў!

— Кінь ты! Вечна аб ім успамінаеш...

Сямёну Пракопавічу здаецца, што гэта сон—страшны і разам з тым цікавы.

— Гэта я! гэта я!!—хоча ён крыкнуць.

Губы гараць. Ён сьціснуў зубы. Халодны пот прыклеіў кашулю да сьпіны. Няпрыемна.

Ён забыўся пра Сямёна Пракопавіча і Івана Мацьвеевіча. Застаўся выразны, вядомы Антон Сяргеевіч—здрайца, трусьлівы, агідны самому сабе.

— А я не хачу быць трусьлівым!—крыкнуў ён на ўвесь вагон.—Не хачу! Вось я!

Падняўся з лаўкі. Стаў супроць старога таварыша, Грышы...

Падняўся і Грыша...

— Няўжо-ж гэта вы? Мяглоў?

Голас надзіва мяккі і ветлы. Вочы празрыстыя, бліскучыя.

Грыша тыкае на яго пальцам, закашляўся.

— Рукі я вам не падам!—кажа Грыша строгім голасам.

— Па-па-мылка м-моладасьць...—зайкаецца Мятлоў.

— Добрая памылка! Здраднік! Провокатар! Сволач! На першай станцыі вы будзеце арыштаваны.

— А я хацеў стаць новым чалавекам,—ляпеча Мятлоў.— Вось бачыце: бакенбарды, акуляры...

І рагоча хрыплым, грудным сьмехам сухотнага яго даўнейшы таварыш Грыша. Сарваў у яго акуляры, кінуў на падлогу так моцна, ажна шкелкі рассыпаліся ў дробныя кавалачкі.

— Новы чалавек!

Грыша закашляўся. Занепакоеная жонка дае выпіць вады з бутэлькі ад нарзану.

— Грышутка, супакойся!

Яе вочы спалоханыя і надзвычайна добрыя. Яна глядзіць на Мятлова з балючай жальбой.

. . . .

Як прачнуўся Сямён Пракопавіч, сонца сьвяціла праз вокны вагона. Стэп залаціўся.

... Так і ёсьць! Сонца і цёплы ветрык. Б-р-р-р, які гадкі сон. Я, здаецца, аб ім і ня думаў. А вось як жывенькі выплыў ва сьне... Мазгавыя клеткі, нібы фотонэгатыў, яго зноў надрукавалі. Ён назаўсёды будзе ў маёй памяці.

Мігаціцца стэп.

У Растове ён чакаў другога цягніка некалькі гадзін. Паехаў.

Зноў стэп.

А вось Азоўскае мора клінам у стэп урэзалася—бліскучым клінам мутнай сталі.

Армавір.

Каўкаскія горы—грозныя, чужыя і вабныя, нібы руіны вялічэзных старасьвецкіх замчышч. У даляглядзе пад яркім сонцам горы колеру паленай цэглы лезуць адна на адну, выступаюць у небе мутнаватымі воблакамі ў розныя ўзоры. Месцамі нагадваюць чарнёнае серабро.

... Будзь блаславёна, новая зямля...

... Прымі ў свае абоймы новага чалавека...

Твар Сямёна Пракопавіча змучаны, бледны. Ён часта мацае няпрывычныя бакенбарды і папраўляе на носе такія-ж няпрывычныя круглыя акуляры...

— Так-так! Так-так!—згаджаецца цягнік.

XXIV

Стэфка паглядае на дождж з вакна. Ён лье ўжо другія суткі: васеньні, густы, нудны без пяруноў і грымотаў. Яго доўгія мутнаватыя валокны цягнуцца з шэра-змрочных воблакаў да самай зямлі. Глеба набухла, як порхаўка. Трава прыбіта да зямлі, нібы градам. Лес,—які ў летнія дні так вабіў Стэфку, зваў у свой зялёны і шапатлівы прытул,—цяпер выглядае чу-

жым, грозным і няпрытульным. Не хацела-б Стэфка апынуцца цяпер за курганамі, за мутнай рэчкаю.

Дождж у перамешку з ветрам сьцёбае па дрэвах, зрывае лісьце і барабаніць аб шыбы вакна, нібы сотнямі тонкіх пальцаў.

Па дзядзінцы, калі-ні-калі, прабяжыць босая кабеціна. Толькі Крушынскі ў бразэнтным плашчы з капюшонам на галаве не зварачае на дождж ніякай увагі. Ён увесь час на дварэ па гаспадарчых справах. Нават учора езьдзіў у мястэчка другі раз. Ён за апошнія дні аж тры разы езьдзіў туды.

... Ніякага надвор'я не баіцца,—думае Стэфка.—Гэта такі чалавек, што, здаецца, жалезную сьцяну праб'е, калі толькі яму трэба будзе.

Стэфка паважае яго за энэргію, за руплівасьць. Але ёсьць у ім нешта такое, чаго яна баіцца, што адпіхвае ад яго. Яна сама ня можа сабе вытлумачыць прычыну такога адчуваньня.

... А ён, здаецца, такі далікатны і добры.

А вось і фурманка нейкая прыехала. Кабета зьлезла з воза.

— Цёця!—крыкнула Стэфка ў дзікім захапленьні.

— Цёця!—раздаўся яе голас у другі раз з прарэзьлівым віскатаньнем, з пералівамі на самых высокіх нотах.

Яна кінулася на двор з такім імпэтам, нібы трэба было кагосьці выратаваць ад страшнай сьмерці.

З цёцяй сустрэлася на ганку. Хацела кінуцца ёй на шыю.

— Пачакай, Стэфачка! Я ўся мокрая!—супакоіла яе цёця, Аграфена Макараўна.

Праз пяць хвілін усе хатнія ведалі, што да Стэфкі прыехала цёця, што гэта жонка Івана Мацьвеевіча, што сапраўднае імя агронома—Антон Сяргеевіч.

— Я ня ведаю, чаму ён ад мяне схаваўся, чаму выкінуў такі фокус з тэлеграмай. Гэта-ж цяпер бачу, што ён сам тэлеграму прыслаў аб сваёй сьмерці,—гаварыла Аграфена Макараўна.— Мы з ім увесь час так добра жылі...

Аграфена Макараўна плакала. Здавалася, што плач яе ня шчыры. Вочы часта высыхалі. Сінія і бліскучыя з выразам затаенай крыўды вочы жанчыны былі вельмі прыгожыя. Стэфка тулілася да яе, нібы малое дзіцё. Часта цалавала цёцю і плакала разам з ёю. Сьлёзы Стэфкі выглядалі чамусьці болей шчырымі, чымся ў цёці.

— Перастань плакаць, Стэфачка!—гаварыла з чуць прыкметнай кплівасьцю Аграфена Макараўна.—Ня думай, што я шкадую яго. Не шкадуй і ты свайго дурнога дзядзю. Вельмі благі жарт ён нада мною ўчыніў. Тады, як атрымала тэлеграму аб яго сьмерці, думала ехаць адразу хоць магілу яго паглядзець. Але нешта мяне стрымлівала. Чамусьці не хацелася ехаць. Як атрымала, Стэфачка, твой ліст, дык так спалохалася, як-бы нябожчыка з магілы пабачыла.

— А дзецям і дзядуні вы, цёценька, паказалі мой ліст?

— Не. Не хацела іх трывожыць. Няхай сабе думаюць, што памёр, што няма яго на сьвеце. Так будзе лепей. Я ім гаварыла, што еду ў госьці да тваіх бацькоў.

— Я-б ня вытрымала. Я-б ім сказала...

— Эт, дзіцё ты! Навошта гаварыць? Дык ён, кажаш, круглы, тоўсты? Гэта ў магіле ён адкарміўся! І навошта ён гэтак уздумаў рабіць? Няўжо-ж я-б яго пры сабе гвалтам трымала?

Аграфена Макараўна сьмяялася праз сьлёзы.

— Відаць, што дзядзя ад некага іншага хаваецца,—сказала Стэфка.—А магіла была тут някепская.

Стэфка шчыра зарагатала.

— Няма, Стэфачка, чаго сьмяяцца!—пакрыўдзілася Аграфена Макараўна.

Стэфка закусіла губы.

— Вы, цёця, засьмяяліся, дык і я стрымацца не магла.

— Ну, добра, дзетка, лепш сьмяяцца, чым плакаць.

Аграфена Макараўна зноў заплакала.

— А жыве ён адзін ці жонку мае?—запыталася яна.

— Ня ведаю. Я бачыла яго толькі адну хвіліну.

Крушынскі, які да гэтага часу маўчаў, умяшаўся ў гутарку:

— З кабетамі, як я ведаю, ён не валаводзіўся. Жанчын у яго ня было. Ён трымаўся вельмі прыстойна—Іван Мацьвеевіч.

— Ня Іван Мацьвеевіч, а Антон Сяргеевіч!—папраўіла са злосьцю ў голасе Аграфена Макараўна.—А дзе-ж яго цяпер шукаць?

— Ён уцёк. Я сам ня ведаю куды. Я вось гэтыя дні езьдзіў да яго на кватэру. Ён і мяне абшустаў. Пазычыў яму пяцьсот рублёў.

— Пяцьсот рублёў!? Навошта было даць?

— Мы з ім дружылі. Я лічыў яго прыстойным, чэсным чалавекам. Апошнія грошы аддаў. Вы, жонка, яго, павінны мне аддаць гэтыя грошы,—пробаваў ён жартаваць.

— А можа вы ня хочаце мне гаварыць дзе ён? Вы, пэўна, ведаеце... А грошы вы-ж далі ня мужу майму Антону Сяргеевічу, а нейкаму Івану Мацьвеевічу.

Аграфена Макараўна пільна, з падазронасьцю зірнула Крушынскаму ў вочы.

— Нічога ня ведаю. Няма ў мяне ніякай патрэбы таіць ад вас.

— Усе мужчыны адзін аднаго бароняць ад нас, жанчын.

Аграфена Макараўна не адрывала вачэй ад Крушынскага.

Пані Ганна ўвесь час толькі рукі ламала. Слухала ўсю гэту дзівосную гісторыю і шаптала:

— А божа-ж мой! А божа-ж мой! Вось які сьвет настаў. А-я-яй!

— Скажэце, калі ведаеце!—не адставала ад Крушынскага Аграфена Макараўна.—Дзё ён?

— Ну, чэснае слова, ня ведаю!

— Скажы, Язэп, калі знаеш, што табе!—ня стрымалася і пані Ганна.

— Во! Усе кабеты адна за адну гарою. Маўчы, Ганна, а то і я ад цябе паеду і дам тэлеграму, што намёр.

— Каб я больш бяды ня мела. Гаспадарку з сабою не забярэш! Падумаеш! Мала такіх па сьвеце бадзяецца. Едзь сабе да Івана Мацьвеевіча!

— Да Антона Сяргеевіча!—спачуваючы папраўляла памылку Аграфена Макараўна.

— Жарты—жартамі, а я ня ведаю, дзе ён дзеўся!—апраўдваўся Крушынскі.

— А навошта вы яму грошы далі на дарогу?—тонам сьледчага допыту запыталася Аграфена Макараўна.

Такое запытаньне на адну хвіліну зьбіла яго з панталыку.

... Нельга-ж вытлумачыць ёй, што я баяўся агранома, каб маіх сакрэтаў не раскрыў.

— Даў, бо адмовіць ня мог.

Ён глядзеў на Аграфену Макараўну «шчырымі вачыма».

— Ён рабіў на мяне ўражаньне чэснага чалавека, ваш Іван Мацьвеевіч.

— Антон Сяргеевіч!—паправіла Аграфена Макараўна.— Што-ж мне цяпер рабіць?

— Надрукуйце аб гэтым у газэтах! Я шмат такіх абвестак чытала. Жонка шукае мужа. Аб усім напішэце!

Так параіла ад шчырага сэрца пані Ганна.

— Ты, Ганна, толькі такой літаратурай і цікавішся ў газэтах: то жонка мужа шукае, то муж жонку!

Крушынскі сказаў гэта са злосьцю ў голасе.

— Саромлюся аб гэтым у газэты даваць...—як-бы сама з сабою гаварыла Аграфена Макараўна.

Стэфка заплакала.

— Ціха ты, дурная!—крыкнула на яе цёця.—Хадзем лепш у твой пакой. Раскажы, як ты жывеш? Адгэтуль паеду ў Менск да тваіх бацькоў.

Крушынскі быў выбіты з каляі рознымі няпрыемнымі весткамі.

... Які будзе цяпер агроном у гэтым раёне? Чаго добрага, новы агроном пазнаёміцца з маёй «культурнай» гаспадаркай...

Непакоіла яго і вёска Гайдачаны. Каморнік ужо мерае там зямлю.

... Як трымацца? Ці ня варта ладзіць колектыўную гаспадарку сярод сваіх Драздоў і Дзятлаў? А то чаго добрага пры новым агрономе мая «культурная» гаспадарка пераскочыць да будучай комуны Гайдачан... З кім параіцца аб гэтым? Айцец Дзімітры сказаў ехаць у Менск і пагаварыць з сваім стрыечным братам—з поэтам Антонам Цярэшкай. У яго добрыя знаёмствы.

... І яшчэ адна справа:

... Толькі ўчора даведаўся, што з Менску высылаюць кудысьці далёка многа контрабандыстых. Таксама з пагранічнай паласы высылаюць падазроных асоб.

— Ці не папаў і я ў гэты сьпіс?

Учынак агронома накіраваў яго на арыгінальную ідэю:

— Я пушчу погаласку, што захварэў на рак, што хутка памру. Буду ляжаць некалькі месяцаў, пакуль усё супакоіцца. У Менск еду цяпер нібыта да доктара.

Не зважаючы на дождж, Крушынскі запрог каня і паехаў.

Мутныя, заплаканыя даляглядзы васеньніх палёў і лясоў няпрыветна сустракалі Крушынскага па дарозе ў горад. Дождж сьцёбаў у твар. Брэзэнтавы плашч намок. Пранізваў холад. На тым месцы, дзе з старых часоў увесь час была гразь, дзе тапіліся коні і каламі прыходзілася выцягваць калёсы, была палажана новая грэбля. Абапал грэблі ракопаны канавы. Пахла сьвежым дрэвам і яловымі лапкамі.

Добра было ехаць на гэтым месцы. Але Крушынскага гэта чамусьці ня радавала.

Ён уехаў у маленькую вёсачку. З двара выскачыў селянін.

— Дзень добры!

— Дзень добры!

— Не пазнаеце, ці што? Гэта-ж я!

— А як-жа, пазнаю!—мармытнуў Крушынскі, успомніў пяцьдзесят рублёў, якія Рахмілька падкінуў гэтаму селяніну на дарозе.

— Пачакайце, адну хвілінку, ці што!

Крушынскі затрымаў каня.

— Як маецеся?

— Дзякую, ня зусім добра. Нездароў. Да доктара еду.

— Ну?!—зьдзівіўся стары.—Што рабіць. Трэба лячыцца. Як вам падабаецца наша грэбля?

— Вельмі добра было ехаць.

— Гэта-ж мой сын падгаварыў суседзяў і вось за некалькі дзён наладзілі.

— Малайчына ваш сын!

— За тое, што ён малайчына, завязеце яму торбачку. Зараз вынясу!

— Давайце. Толькі скарэй!

Цыпрук пабег у хату. Праз дзьве хвіліны вынес торбачку.

— Тут два сыры і кавалак сала. Старая запакавала. Тут і адрас у торбачцы ляжыць. Не забудзьце, ці што?

— Добра! Перадам!

— Калі ласка, у сене пад сядзеньнем запакуйце. Але я сам запакую, ці што?

Стары Цыпрук рупатліва ўкапаў торбачку ў сене.

Радаснымі вачыма зірнуў на Крушынскага. Па кажуронку старога кроплі дажджу расплываліся ў цёмныя плямы. На скомканай бародцы блішчэлі паадзіночныя, поўныя кроплі.

— Бывайце здаровы, ці што!
— Бывайце!
— Не забудзеце?
— Не забуду!
Крушынскі паехаў.

Стары Цыпрук стаяў яшчэ на дарозе пару хвілін, бараніў свой твар ад дажджу далоньню правай рукі. Трымаў яе, нібы брылік, над вачыма, як ад сонца ў летні дзень.

Фурманка Крушынскага аддалялася і мутнела ў дажджлівых туманістых валокнах.

1928—1929 г.
Менск.

Цана 3 руб.

Бел. Дз.